Ілля КОПЫЛ

# Нябышына

## АКУПАЦЫЯ ВАЧЫМА ПАДЛЕТКА



НЕИЗВЕСТНАЯ ИСТОРИЯ

НЕИЗВЕСТНАЯ ИСТОРИЯ

**Ілля Копыл**

# Нябышына

## Акупацыя вачыма падлетка

**Рыга**
**Інстытут Беларускай гісторыі і культуры**
**2014**

*Серыя заснавана ў 2009 годзе*
*Заснавальнік серыі «Невядомая гісторыя» А. Я. Тарас*

*Мастак Б. Г. Клюйка*

*Аўтар і рэдактар шчыра дзякуюць*
*Зміцеру Калесніку,*
*з дапамогай якога гэтая кніга пабачыла свет!*

**Копыл, І. П.**

К65 Нябышына. Акупацыя вачыма падлетка / Ілля Копыл. — Рыга : ІБГіК, 2014. — 288 с. : мал.

ISBN 978-9984-897-11-0.

Кніга І. Копыла ў 2009 г. была апублікаваная асобнымі выпускамі ў газеце «Народная воля». Яна выклікала вялікую цікавасць у чытачоў, а таксама моцную незадаволенасць сярод той часткі нашага грамадства, якая працягвае стаяць на платформе савецкай ідэалогіі.

Новы варыянт кнігі значна павялічаны за кошт 3-й часткі («Рэзананс»), якая адсутнічала ў папярэднім выданні. У ёй аўтар падрабязна разгледзеў зласлівыя выбрыкі сваіх апанентаў і даў вычарпальныя адказы на іх паклёпніцкія выдумкі.

**ISBN 978-9984-897-11-0**

© Копыл І. П., 2014
© ІБГіК, 2014

# «Замест птушыных песень...»

Словы беларускага мастака Васіля Шаранговіча: «Самая страшная трагедыя, якую толькі можна ўявіць сабе, – гэта трагедыя дзяцей вайны. Чалавек толькі зірнуў шырока расплюшчанымі вачыма на свет – і замест ласкавай матчынай усмешкі ўбачыў чорныя вачніцы смерці, замест птушыных песень пачуў аўтаматныя чэргі», – у якасці эпіграфа вельмі і вельмі пасуюць да кніжкі Іллі Копыла «Нябышына. Вайна (Акупацыя вачыма і падлетка)». Памерам кніжка – невялікая, але аўра кожнай яе старонкі сваёй шчырасцю, сумленнасцю і безагляднай праўдай пагружае цябе ў такі стан, што ты адчуваеш недахоп паветра ў грудзях.

Падзеі, якія абрынуліся на жыццё шасцігадовага хлопчыка, яго сям'і і роднай вёскі Нябышына, ахопліваюць перыяд з 1 верасня 1939 г. (менавіта тады для беларусаў пачалася вайна) па 3 верасня 1945 года (дата, калі капітулявала Японія і калі сям'я Копылаў атрымала «пахавальную», у якой паведамлялася, што 19 жніўня 1945 г. у Манчжурыі, пад Мукдэнам, загінуў Піліп Копыл – галава шматпакутнай сям'і.

Дарэчы, Піліп Копыл ужо быў непрызыўнога ўзросту і меў кепскі стан здароўя пасля кантузіі на Першай сусветнай вайне (у яго быў дрэнны слых). Адразу пасля адступлення нацыстаў камуністычная ўлада прапанавала яму, не камуністу, аднавіць калгас. Да вайны ён узначальваў калгасную гаспадарку. Але, пачуўшы цяпер ад аднавяскоўцаў: «Піліп. Няўжо зноў у нас будзе гэты ненавісны калгас, уноў галеча? Мы нават пры немцах жылі лепш» – ён катэгарычна адмовіўся ад прапановы ўлады. І вось за гэта Піліп Копыл быў накіраваны «дапамагаць СССР і яго непераможнай арміі дабіваць Японію».

Але вернемся да вогненнай вёскі Нябышына, у якой некалькі хат падпалілі немцы, а рабавалі яе, забівалі і дабівалі яе жыхароў (каб потым не было сведак), дапальвалі разам з людзьмі – паліцаі і былая мясцовая жыхарка са сваім мужам. «Вось такая была вайна: свае жахлівей, чым немцы», – так завяршае аўтар свой жудасны аповед «Трагедыя ў вёсцы».

Тут трэба дадаць, што лёс Нябышына загадзя быў прадвырашаны – спланаваны вышэйшым кіраўніцтвам партызанскага руху яшчэ ў Маскве. А на месцы трагічнай падзеі толькі справакаваны. Такіх жудасных аповедаў у кнізе – безліч. Асабліва ў першай яе частцы, названай – «Такая праўда». Яе складаюць 38 рэпартажаў памяці – дакументальна-мастацкіх запісак. Без перабольшанняў можна сказаць, што «Такая праўда» – гэта сапраўдны шэдэўр. І ён па шчымлівай праўдзе адкрытай

душы аўтара, па напоўненасці псіхалагічным, гістарычным і бытавым матэрыялам, па шматсказанасці пры нешматслоўі (кароткасць – сястра таленту), па дакладнасці мовы годна і пераканальна ўпісваецца ў шэраг такіх выдатных твораў, як «На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага, «Рэпартаж з пятлёй на шыі» Ю. Фучыка, «Дзённік Ганны Франк» Г. Франк. Як і ў пералічаных творах, у «Такой праўдзе» не знойдзеш ні аднаго моманту нейкай позы ці рысоўкі. Там толькі горкая і пякучая праўда.

Другую частку кнігі «Нябышына. Вайна» складаюць дыялектычна-аналітычныя разважанні пра трагічны лёс Беларусі і беларусаў падчас гітлераўскай акупацыі, паліцэйскага і партызанскага «самадурства і бязмежжа». Гэта частка асноўным сваім генезісам мае тую ж жудасную факталогію, што пададзена ў «Такой праўдзе». Як бачым, эмацыянальнае ўспрыняцце рэчаіснасці падлетка супадае з рацыянальным успрыняццем тых жа з'яў сталага чалавека.

І што паказальна. Гэтыя два ўспрыняцці пад пяром аўтара супадаюць яшчэ і ў сваёй высокай маральнасці, гуманізме. Як тут не ўспомніць эпізод, калі чырвонаармейскі афіцэр прапанаваў дзесяцігадоваму Іллі застрэліць палоннага немца, а падлетак адмовіўся. Праз многія дзесяцігоддзі І. Копыл напіша: «Дзякуй Богу, мая мараль аказалася вышэй за мараль таго афіцэра. Хоць слова «мараль» я тады яшчэ не ведаў». Ужо тады, як і пазней, яго душа пры розных нялюдскіх умовах жыцця працівілася асатанеласці. І, бадай, І. Копыл першым у нашым сучасным пісьменстве наводзіць на думку аб халакосце, які адбыўся для беларусаў.

Пры чытанні «Нябышына. Вайна» нявольна прыходзіць думка, што гэты твор не можа быць не заўважаны і ў іншамоўнай прасторы. І таму ёсць спадзева, што ён будзе перакладзены на іншыя мовы.

І колькі слоў пра аўтара выдання. Чалавек ён незвычайны, асоба неардынарная. Яму ўжо пайшоў 76-ы год, але і па знешнім выглядзе, і па светаадчуванні, ён значна маладзейшы. За яго нестандартныя паводзіны і ў войску яму, прафесійнаму вайскоўцу, як кажуць, даставалася, і ў адстаўку прыйшлося пайсці толькі ў званні маёра, а не, хаця б, палкоўніка ці падпалкоўніка. І. Копыл – высока адукаваны чалавек. Сярод асноўных яго зацікаўленняў – беларуская гісторыя, культура і літаратура. Ён – беларусацэнтрыст. Многія з яго знаёмых (і аўтар гэтых радкоў) казалі, што яму трэба было быць журналістам ці літаратарам. Не будзе перабольшаннем сказаць, што і як працаўнік пяра І. Копыл адбыўся. Ён многа друкаваўся ў СМІ, ён – пастаянны аўтар многіх радыёперадач на беларускай «Свабодзе», ён у інтэрнеце – актыўны. А цяпер вось і кніга, кніга звышадметная. І. Копыл – актыўны ўдзельнік амаль усіх масавых грамадзянскій акцый і культурных мерапрыемстваў; ён сталы падпісчык «Нашага слова».

У заключэнне варта падаць адзін абзац з «Нябышына. Вайна», які дае зразумець прыроду і стан унутранага ўкладу героя і аўтара гэтай невялікай кніжкі:

«Нарэшце мы прыйшлі на сваё папялішча. Яно ўжо зарасло травой. Бацька сказаў: «Нічога, адбудуемся. Галоўнае – мы жывы, хоць і не ўсе». Ён меў на ўвазе смерць Мікалая. «Я паставіў перад сабой мэту – выжыць і вас зберагчы. І мы гэтага дасягнулі – прадоўжыў свой маналог бацька, – гэта большае геройства і мужнасць, чым абстраляць з засады нямецкую машыну ці забіць немца з-за вугла». Потым, калі я ўспамінаў гэтыя словы, я пагаджаўся з імі. Мне не зразумела, для чаго Аляксандр Матросаў закрыў амбразуру сваім целам. Можна ж было закрыць яе шынялём, бушлатам ці закінуць у амбразуру гранату.

Але вернемся да папялішча. Бацька азірнуўся наўкола. А потым бадзёра прамовіў: «Хопіць марнаваць час, пачынаем будаваць жыллё».

***Яўген Гучок***

# Прадмова аўтара

*Пра Другую сусветную вайну і Вялікую Айчынную як яе частку напісана вельмі шмат, але, па-мойму, аднабакова, скажона і хлусліва, у асноўным пра гераічнае. Пачынаючы з 60-х гадоў мінулага стагоддзя, убачылі свет шматлікія мемуары генералаў і маршалаў – удзельнікаў вайны. Потым мемуары сталі пісаць усе, аж да радавога.*

*З дзесятак тых успамінаў прачытаў і я, але хутка зразумеў, што ўсе яны, як блізняты-браты. Гэта голая статыстыка – пералік ваюючых армій з абодвух бакоў і іх камандуючых, колькасць самалётаў і бранятэхнікі, колькасць гармат на адзін кіламетр фронту. Панікёрскае бегства Чырвонай Арміі ў першыя два гады вайны падаецца як запланаваны адыход. У мемуарах я не знайшоў звестак пра колькасць чырвонаармейцаў, што апынуліся ў нямецкім палоне. Такое ўражанне, што ў палоне быў толькі адзін генерал Карбышаў, які гераічна загінуў. У мемуарах не паказаны лёс асобнага чалавека, простага салдата. Людзі для генералаў былі гарматным мясам. Толькі мемуары генерала Гарбатава заслугоўваюць увагі[*]. Ён адзіны, хто рызыкнуў расказаць нам пра сталінскія рэпрэсіі, пра катаванні людзей, пра ГУЛАГ.*

*Памятаю, як у сярэдзіне 70-х гадоў мінулага стагоддзя мемуары генерала Гарбатава былі забаронены. У бібліятэку вайсковай часці, дзе я служыў, прыбылі прадстаўнікі Асобага аддзела і ўсе асобнікі кнігі канфіскавалі.*

*У сваіх нататках я запісаў тыя падзеі ваеннага ліхалецця, якія адбываліся побач са мной, у нашай вёсцы і вакол яе, і тое, што я пачуў ад свайго бацькі і ад аднавяскоўцаў. Я тады быў падлеткам, усім цікавіўся, запамінаў, упітваў у сябе навіны, як губка. Усё, аб чым пішу, – праўда, пабачаная на свае вочы.*

---

* Аляксандар Гарбатаў (1891–1973), кадравы афіцэр Чырвонай арміі, быў арыштаваны ў кастрычніку 1938 г., 22 месяцы знаходзіўся ў турме, прайшоў праз шматлікія катаванні, але не зламаўся. У 1940 г. яму далі прысуд – 15 год лагераў – і адправілі на Калыму. Але 5 сакавіка 1941 г. адпусцілі на волю і ўзнавілі ў войску. Вайну ён сустрэў на пасадзе намесніка камандзіра 25 стралецкага корпусу (Украін. ВА); скончыў камандзірам 3-й арміі. Герой Савецкага Саюза (з красавіка 1945 г.). Ягоныя мемуары «Гады і войны» былі выданыя ў 1965 г. – *Рэд.*

## Частка 1.

# УСПАМІНЫ

## 1. Перад вайной

Вёска Нябышына, у якой нарадзіўся і дзе прайшлі мае дзяцінства і юнацтва, уваходзіла ў склад Бягомльскага раёна Мінскай вобласці (зараз Докшыцкі раён Віцебскай вобласці). На той час гэта была апошняя беларуская вёска перад савецка-польскай мяжой. Наступная вёска – Восава, да якой было 6 кіламетраў, знаходзілася ўжо на польскім баку. Між гэтымі дзвюма вёскамі пралягала савецка-польская мяжа. Вяскоўцы, бывала, парушалі памежную тэрыторыю, натыкаліся на малапрыкметныя сігнальныя прыстасаванні. Але гэта былі не наўмысныя, а выпадковыя парушэнні: збор ягад, грыбоў, арэхаў. Нам пашанцавала, што памежнік Карацупа нёс службу на Далёкім Усходзе, а не ў нас*.

У той час мой бацька быў старшынёй калгаса, а гэта на вёсцы галоўная ўлада. Яму часта даводзілася ўладкоўваць канфлікты між памежнікамі і «парушальнікамі» мяжы – вяскоўцамі, але не заўсёды ўдавалася іх пагасіць. Памежнікі часта бывалі ў нашай хаце, я іх не палохаўся, яны нават бралі мяне на рукі, заводзілі гульні. Мы да іх прызвычаіліся. У нашай вёсцы не было шпіёнаманіі. Гэта толькі ў кніжках можна прачытаць, што дзеці і дарослыя ў памежных вёсках толькі тым і займаліся, што лавілі «лазутчыкаў». І ўсё-такі чалавек 20–25 нашых вяскоўцаў нкусаўцы забралі. Назад ніхто з іх не вярнуўся.

---

* Мікіта Карацупа (1910–1994) – знакаміты савецкі памежнік, Герой Савецкага Саюза (1965 г.). За 20 гадоў службы непасрэдна на памежжы (1932–52 гг.) ён забіў 129 так званых «парушальнікаў мяжы», а яшчэ 338 злавіў. Большасць з гэтых 467 чалавек былі звычайныя кантрабандысты, якіх тагачасная прапаганда паказвала як «агентаў» замежных выведак, альбо простыя люди, намагаўшыяся збегчы з савецкага «рая». Карацупа так любіў паляваць на людзей, што лепш за усё да яго падыходзіць вызначэнне «крыважэрны сабака». – *Рэд.*

Мы, дзеці, перад вайной гулялі ў вайну. Зброяй служылі палкі і рагаткі, камяні. Неаднойчы была праліта кроў, былі разбіты насы, галовы, многія не раз хадзілі з сінякамі і гузамі. Ад бацькоў свае раны па магчымасці хавалі. Мы падзяляліся на белых і чырвоных, выбіралі начальнікаў, займалі вызначаныя пазіцыі, і пачыналася бойка. Пацярпелыя (раненыя) не крыўдзіліся.

## 2. Пачатак вайны

Прыкладна 15 верасня 1939 года ў нашу вёску ўступіла і размясцілася тут вайсковая часць Чырвонай Арміі. Гэта былі вершнікі і нейкі абоз. Іншай тэхнікі: гармат, танкаў, аўтамабіляў – я не бачыў. На нашым гумне, якое пачыналася за хатай, і на выгане за вёскай было пастаўлена шмат палатак. Чырвонаармейцы чамусьці ўсе былі ў касках. У стасункі з вяскоўцамі, нават з намі, дзецьмі, яне не ўступалі, мабыць, каб не выдаць ваенныя сакрэты. Да палатак нас не падпускалі, калі я спрабаваў наблізіцца, вартавы спыняў мяне воклічам: «Стой! Назад!» А мне так хацелася пабываць унутры палаткі.

Таму за ўсім гэтым я назіраў праз плот са свайго двара. Мне запомніліся брызентавыя вёдры, з якіх чырвонаармейцы паілі вадой сваіх коней, і круглыя шчоткі для чысткі поўсці. 17 верасня раніцай на зямлю лёг вельмі густы туман, бачнасць была на 2–3 крокі. Калі туман парадзеў, то я ўбачыў, што наша гумно апусцела. Ні чырвонаармейцаў, ні палатак там ужо не было. Я пабег на тое месца, дзе стаялі палаткі, і знайшоў там з дзесятак драўляных лыжак. Мабыць, чырвонаармейцы іх у спешцы забылі, не заўважылі ў траве і тумане. Лыжкі былі пафарбаваныя ў светла-карычневы колер і пакрыты лакам. Яны былі зусім новыя і пахлі пакостам. Калі мама ўбачыла маю знаходку, чамусьці не абрадавалася, а, наадварот, напалохалася. Яна загадала мне палажыць лыжкі на месца, таму што чырвонаармейцы могуць вярнуцца за імі. Я зрабіў гэта з нежаданнем і вартаваў іх, каб хто іншы не забраў. Але чырвонаармейцам было не да лыжак. Яны пайшлі ў бок мяжы з Польшчай, адна калона – на Гняздзілава, другая – на Восава. Страляніны мы не пачулі, пераход мяжы адбыўся мірна. А тымі лыжкамі, якія я зноў прынёс у хату, уся наша сям’я карысталася вельмі доўга.

Хоць мяжа была ліквідавана, нашым вяскоўцам яшчэ доўгі час не дазвалялася наведаць сваіх сваякоў і знаёмых у Восаве, Докшыцах і іншых месцах Заходняй Беларусі. Калі мы, мой тата і я, у першы раз наведаліся ў Восава, то аслупянелі. Мы ўбачылі там чыстую роўную вуліцу, светлыя, добрыя хаты, двары, агароджаныя штакетнікам і прыгожа пафарбаваныя, стрэхі хат, пакрытыя чарапіцай ці адынкаванай бляхай. У нашай савецкай вёсцы Нябышына стрэхі былі саламяныя, двары агароджаны як папала. Мяне больш за ўсё ўразіла тое, што на вуліцы Восава я не ўбачыў кароў і іх ляпёшак. Вуліца ў нашай вёсцы была цалкам забруджана, асабліва раніцай, калі кароў выганялі ў поле. Убачыўшы ўсё гэта, мой бацька сам сабе тады сказаў: «Вось табе і польскі прыгнёт».

А тое, што заходніх беларусаў нкусаўцы пагналі на расстрэл у Катынь і Курапаты, што заходніх беларусаў эшалонамі адпраўлялі ў савецкі ГУЛАГ за Урал і ў Запаляр'е, ні мой бацька, ні я не ведалі.

Другая сусветная вайна для беларусаў пачалася 1 верасня 1939 года, але мы, усходнія беларусы, гэтага не заўважылі і не адчулі. І вайну тую супраць нас распачалі два агрэсары, два хаўруснікі – Сталін і Гітлер.

## 3. Новы паварот у вайне

Напрыканцы 1939 года некалькі нашых вяскоўцаў забралі на фінскую вайну, у тым ліку і нашага суседа Косцю Паўловіча. Праз нейкі час ён, паранены і абмарожаны, вярнуўся дадому.

22 чэрвеня 1941 года Германія напала на СССР. Магло адбыцца і наадварот. І Сталін і Гітлер чакалі зручнага часу для нападу адзін на другога.

Аб тым, што пачалася вайна, вёска даведалася ад майго бацькі. У той час у нас не было электрычнасці, не было радыё, не было аўтобуснага руху. Адзіны тэлефон быў толькі ва ўправе калгаса. Патэлефанавалі з Бягомля, перадалі, што пачалася вайна. Што рабіць, як быць далей, нічога не сказалі, сувязь парушылася і больш яна з раённым цэнтрам не аднавілася. У нашым двары вечарамі сталі збірацца вяскоўцы. Надвор'е было цёплае, але ўсе былі адзеты не па-летняму, быццам бы ўжо ніколі больш не вернуцца дадому. Людзі былі напалоханы, гаманілі напаўголаса. Нам, дзецям, было незразумела, чаму дарослыя так напалоханы

вайной. Мы ж кожны дзень гулялі ў вайну і нічога жахлівага ў гэтым не бачылі. Мы з цікавасцю яе чакалі разам з дарослымі, каб уключыцца ў гэтую агульную «гульню».

Можа, праз два-тры дні сталі чутны выбухі і былі бачны трывожныя зарніцы ў напрамку Докшыц. Потым гэтыя выбухі сталі перасоўвацца на поўнач, паўночны ўсход і зусім заціхлі дзесьці на ўсходзе. Мой бацька называў невядомыя мне гарады – Полацк, Віцебск, Лепель, Барысаў, куды, на яго думку, пасунуўся фронт.

У 1941 годзе мы так і не адчулі, што такое вайна. Мужчыны ўсе засталіся дома, на вайну нікога не забралі, мабілізацыя спазнілася. Апынуліся на вайне толькі тыя вяскоўцы, якія ў гэтыя дні былі па нейкіх справах у раённым цэнтры Бягомлі. Іх там проста пахапалі і павезлі на Барысаў. Сярод іх апынуўся і наш сусед Зміцер Маскалейчык, шафёр калгаснай палутаркі. Ён прайшоў амаль усю вайну і толькі ў канцы быў лёгка паранены.

Так склаліся абставіны, што праз нашу вёску ў 1941 годзе не адступала Чырвоная Армія, не наступалі немцы, не ішлі натоўпы бежанцаў, не гналі статкі буйной рагатай жывёлы на ўсход, каб яны не дасталіся ворагу. Нашу вёску не бамбілі, не абстрэльвалі з гармат, немцы не ўрываліся ў нашы хаты, нікога не забівалі, не рабавалі, не гвалтавалі. І калі, будучы дарослым, я чытаў творы пра вайну, бачыў кінастужкі, мая свядомасць уступала з гэтым у супярэчнасць. Я пражыў усю вайну ў акупацыі і добра ведаў, як усё адбывалася ў адной, асобна ўзятай вёсцы.

## 4. Роспуск калгаса

Фронт адсунуўся далёка на ўсход, а ў глыбокім тыле ў немцаў засталася наша вёска і некрануты, неразрабаваны калгас «Чырвоны расцвет», і старшынёй гэтага калгаса заставаўся мой бацька – Піліп Гіляравіч Копыл. Трэба адзначыць, што афіцыйна яго прозвішча па бацьку было Іларыёнавіч. Калі расейскія акупанты ў XIX стагоддзі перапісвалі нашу вёску, то іх чыноўнікам не падабалася імя майго дзеда – Гілярый і яго перайменавалі ў Іларёна. Відаць, гэта быў пачатак русіфікацыі ў нашай вёсцы, такіх перайменаванняў было шмат. Але новыя імёны не прыжыліся, яны засталіся толькі на афіцыйных паперах.

На пачатку вайны калгаснікі па-ранейшаму хадзілі на працу. Трэба было даглядаць скаціну. У калгасе былі коні, каровы, авечкі,

свінні. Малако здаваць не было куды, ім кармілі парасят, цялят, раздавалі калгаснікам. Ураджай у 1941 годзе ўрадзіўся небывалы, жыта шугала вышэй чалавечага росту.




*Бацька аўтара кнігі Піліп Копыл (злева) і яго сябра, жыхар суседняй вёскі Старае Запонне па прозвішчу Клоп. Эшалон з войскам ад Кенігсберга рухаўся на Далёкі Усход праз Маскву (1945 г.)*

Напрыканцы чэрвеня (а можа, на пачатку ліпеня) нарэшце ў нашу вёску завіталі прадстаўнікі нямецкай адміністрацыі: валасны староста і нямецкі афіцэр з перакладчыкам. Яны прыехалі на легкавой машыне. Іх суправаждала ахова з 6 чалавек на двух матацыклах з калясскамі. Валасны староста выклікаў майго бацьку і загадаў сабраць людзей на сход. Вёска Нябышына ў той час налічвала 120 двароў і была падзелена на дзве часткі шашой Бягомль – Докшыцы. Бацька адразу паслаў некалькі юнакоў у абодва бакі вёскі, каб заклікаць людзей на сход. Праз хвілін 15–20 усе вяскоўцы былі ў зборы, прыйшлі сем'ямі, нават з дзецьмі. І мяне, сямігадовага хлапчука, бацька ўзяў з сабой. Сход адбыўся на вуліцы, клуба ў вёсцы не было, а школа згарэла перад вайной.

Спачатку нямецкі афіцэр давёў да нас ваеннае становішча. Ён сказаў, што Мінск вызвалены ад камуністаў, нямецкая армія пад Смаленскам. Ён павіншаваў і нас з вызваленнем. Людзі стаялі

моўчкі. Потым дайшоў да пытання прызначэння старасты. Хосьці з натоўпу крыкнуў: «Няхай старастай будзе старшыня калгаса Піліп Гіляронак. Кіраваць людзьмі – для яго справа звыклая». Я з гонарам паглядзеў на бацьку, але на яго твары ўбачыў жах і разгубленасць. Нямецкі афіцэр і валасны староста параіліся паміж сабой і аб'явілі, што старшыню калгаса прызначаць старастай немэтазгодна і для яго самога – небяспечна.

Потым мой бацька казаў, што ён перажыў самы крытычны, самы небяспечны, самы жахлівы момант у сваім жыцці. Ён з цеплынёй успамінаў таго нямецкага афіцэра, які ўратаваў яго ад немінулай смерці, не прызначыўшы старастам. Праз нейкі час па беларускіх вёсках пачалі шастаць карнікі атрадаў асобага прызначэння НКУС СССР. Адным з такіх атрадаў камандаваў Ваўпшасаў*. Яны расстрэльвалі ўсіх, хто, каб пракарміць свае сем'і, уладкаваліся на працу да немцаў. Гэта былі медработнікі, настаўнікі, інжэнеры, журналісты, артысты, кухары і вялікі шэраг іншых. Галоўнай жа мішэнню з'яўляліся старасты.

А старастам нашай вёскі на тым сходзе празначылі Кастуся Шульгата. Гэта быў статны, высокі, шыракаплечы мужчына, які выдзяляўся ў натоўпе. Таму, відаць, немцы і звярнулі на яго ўвагу. Гэта быў вельмі сціплы, бяскрыўдны чалавек. Адказацца ад пасады было немагчыма, перад намі былі акупанты, хоць і паводзілі яны сябе міралюбна, але чакаць можна было ўсяго.

Прызначыўшы старасту, немец абвясціў аб роспуску калгаса. Коні, інвентар, зямля вярталіся іх уладальнікам – сялянам. Калгас распаўся на 120 індывідуальных гаспадарак. Нягледзячы на тое, што ўжо быў прызначаны староста, дзяліць калгас загадалі майму бацьку. Я не буду апісваць, як адбывалася гэта складаная

---

* Станіслаў Ваўпшасаў (1899–1976) – адзін з самых жорсткіх савецкіх «чэкістаў». У 1920–24 гг. узначальваў банду так званых «чырвоных партызан» (на самой справе дыверсійна-тэрарыстычную групу), якая ўчыніла шмат рабункаў і забойстваў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У 30-я гг. быў начальнікам лагера зняволеных, што будавалі канал Масква – Волга. У 1937–39 гг. узначальваў дыверсійна-тэрарыстычны аддзел у Гішпаніі падчас Грамадзянскай вайны. З сакавіка 1942 да ліпеня 1944 г. камандаваў спецыяльным атрадам НКДБ «Мясцовыя», які дзейнічаў у Мінскай вобласці. У 1944 г. атрымаў зорку Героя Савецкага Саюза. З 1946 г. служыў у органах МДБ Літоўскай ССР, дзе на працягу 8 гадоў (да 1954) ваяваў з «ляснымі братамі».

Станіслаў Ваўпшасаў – аўтар ілжывых успамінаў «На разгневанной земле», «Партизанская хроника», «На тревожных перекрестках». – *Рэд.*

справа. Яна працягвалася шмат дзён. Трэба было ўсё ўлічыць, нікога не пакрыўдзіць. З гэтай задачай мой бацька справіўся паспяхова, бо ніхто з вяскоўцаў не паскардзіўся на яго новай уладзе.

Куды падзяваліся каровы, свінні, авечкі, не памятаю, прашляпіў. Хутчэй за ўсё цалкам забралі немцы. Калі надышоў час дзяліць калгасных коней, бацька ўзяў з сабой і мяне. Дзялілі па жэрабі. Спачатку ўсталявалі чаргу. Калі падышла чарга майго бацькі цягнуць жэрабя, ён даручыў гэта мне. Бацька разгарнуў скручаную паперку, якую я выцягнуў, і з радасці пачаў скакаць.

Нам выпаў самы лепшы калгасны конь. Ён быў малады, але ўжо аб'езджаны, белай масці. Нам зайздросцілі, а я вельмі ганарыўся. Бацька адзеў на Бялька аброць, перадаў павадок у мае рукі і прамовіў: «Ну, гаспадар, вядзі каня дадому». У вёсцы той выпадак памятаюць і зараз. У лютым месяцы 1942 года ў нас каня ўкралі. Бацька аднёс заяву ў нямецкую камендатуру ў Докшыцы. Праз два дні немцы каня знайшлі і вярнулі яго нам.

## 5. Першая сустрэча з немцамі

У адзін з ліпеньскіх дзён, на пачатку месяца, мы, вясковыя падлеткі, купаліся і загаралі на пясчаным беразе ракі Поні ў 100 метрах ад моста. Нечакана мы ўбачылі, што з боку Докшыц рухаецца аўтамабільная калона, машын 10–15. Яна мінавала вёску і накіравалася ў наш бок да моста. На першай машыне справа спераду над кабінай развяваўся чырвоны сцяг. Хтосьці крыкнуў: «Нашы!» – і цераз мост мы пабеглі насустрач.

Перад мостам калона спынілася. Мы ўбачылі, што гэта немцы. Яны выйшлі з пярэдняй машыны і са словамі: «Гут, гут», – пасяброўску хлопалі далонямі па нашых голых спінах. Мы асмялелі, палезлі на падножкі машыны, адчынілі кабіну, націскалі на клаксон, сігналілі. Такія велізарныя машыны мы бачылі ўпершыню. У нашым калгасе была ўсяго адна грузавая машына ГАЗ-АА – палутарка. Немцы не сварыліся на нас, з цікавасцю нас разглядалі, сталі частаваць шакаладам, які мы таксама бачылі ўпершыню. Я быў менш баявіты, апынуўся ў хвасце і мне шакаладу не дасталося. Было крыўдна, на вачах накаціліся слёзы. Убачыўшы гэта, адзін немец дастаў з кішэні губны гармонік і падарыў мне. Потым немцы паказалі рукамі, каб мы вярталіся назад на бераг ракі: «Шнэль, шнэль». Мы пабеглі, а калона прадоўжыла рух у бок Бягомля.

## 6. Хрышчэнне

Хтосьці распусціў чуткі, што немцы будуць караць тых, хто не хрышчаны. У нашай вёсцы няхрышчанымі былі ўсе дзеці. Я нават не ведаю, ці была да вайны хоць адна дзеючая царква ў Бягомльскім райне. Хачу сказаць, што на самай справе немцы не займаліся высвятленнем, хто хрышчаны, а хто не. Аднак, далей ад ліха, мой бацька праявіў ініцыятыву і прывёз з Докшыц святара. Усіх нас, нехрысцяў, сабралі ў хаце Іллюка Спічонка і пахрысцілі.

Я памятаю, як той абрад адбываўся. На падлозе ў цэнтры хаты паставілі кадку з калодзежнай вадой. На дне кадкі ляжаў крыж. Нас групамі ставілі вакол кадкі. Святар чытаў малітву, макаў пальцы ў ваду, а потым кожнага з нас мазаў па лбе. Нарэшце ён абмакнуў у ваду венік і пабрызгаў на нас. Нацельных крыжыкаў нам не далі. Прыкмет, хрышчоны ты ці не, у нас не засталося. Але ў мяне з'явілася хросная мама. Неўзабаве ў суседняй вёсцы Вітунічы адчынілася царква. Раней у яе памяшканні было збожжасховішча. Аднойчы мама ўзяла з сабой у царкву і мяне.

## 7. Першы раз у першы клас

2 жніўня 1941 года мне споўнілася 7 гадоў, трэба было рыхтавацца да школы. Бацькі, не толькі мае, непакоіліся, ці будуць працаваць школы ва ўмовах акупацыі. Але ўсё склалася найлепшым чынам. У жніўні ў нашу вёску наведаліся дзве жанчыны з валаснай управы і ўзялі на ўлік усіх дзяцей школьнага ўзросту. Мой бацька яшчэ да вайны набыў мне буквар, сшыткі, алоўкі.

Як я ўжо згадваў, наша школа згарэла ў студзені 1940 года, у самыя моцныя маразы. Для малодшых класаў пабудавалі хатупяцісценку. Астатнія дзеці хадзілі ў школу за 2 кіламетры ў суседнюю вёску Вітунічы. Такі ж парадак застаўся і пры немцах.

1 верасня 1941 года я пайшоў у першы клас. Ніякай нацысцкай прапаганды ў школе не вялося. Настаўніца ні разу не называла ўслых прозвішчы фашысціх правадыроў Гітлера, Гебельса, Герынга. Яна нас проста вучыла чытаць, пісаць і лічыць. Прадстаўнікі нямецкай адміністрацыі ні разу не наведалі школу, каб пракантраляваць навучальны працэс.

Але вучыцца нам давялося нядоўга. У лістападзе (зямля ўжо была падмарожана, але снег яшчэ не выпаў) да школы падышла

група ўзброеных людзей. Школа стаяла асобна, крыху ў баку ад вёскі, і падысці да яе можна было непрыкметна з боку могілак. Гэта былі чырвонаармейцы, адстаўшыя ад фронту. Іх шмат блыталася ў навакольных лясах. Яны былі брудныя, абадраныя, нязголеныя, навялі на нас жах. Магчыма, яны шукалі ежу. У клас увайшлі трое, астатнія засталіся на вуліцы. Яны былі вельмі здзіўлены – ідзе вайна, немцы ўжо пад Масквою, а тут, як ні ў чым не бывала, у школе ідуць заняткі. Такое дапусціць нельга. Адзін з іх, магчыма, старэйшы, схапіў настаўніцу і закрычаў ёй у твар: «Ты фашысцкая прыслужніца, здрадніца!» – і штосьці яшчэ.

Потым ён успомніў пра нас і па-драпежніцку закрычаў: «А вы, фашысцкія ўблюдкі, марш дадому і каб вашага духу тут больш не было!» Яны размаўлялі па-руску. Можна сказаць, што гэта быў для нас першы ўрок рускай мовы і апошні ўрок заняткаў у школе. Мы, напалоханыя, пабеглі дадому, кінуўшы ў школе сваё адзенне, буквары, пісьмовыя прылады. Больш мы ў школу не пайшлі, было небяспечна. Што здарылася з настаўніцай – не ведаю.

У Вітунічах школа працавала да канца вучэбнага года.

## 8. Прымакі

«Пайшоў у прымы», – так у нашай вёсцы казалі пра мужчыну, які пасля шлюбу ішоў жыць у хату жонкі, ці ў хату бацькоў жонкі. Але я хачу расказаць зусім пра іншы, нечаканы выпадак.

У жніўні 1941 года праз нашу вёску ў бок Докшыц немцы гналі невялікую калону палонных чырвонаармейцаў, чалавек сто. У вёсцы яны прыпыніліся на гадзіну, каб адпачыць. Палонныя і канваіры размясціліся на зялёным лужку школьнай тэрыторыі. Навіна гэта абляцела вёску, і хутка сюды сабралася шмат вяскоўцаў, прынеслі з сабой ежу, у каго што было на той момант. Людзі спакойна раздавалі палонным хлеб, вараную бульбу, сала, сыр, малако, яйкі, гародніну. Хтосьці прынёс вядро вады і конаўку. Гэтым жа самым частавалі і немцаў-канваіраў. Што цікава, немцы нікога не штурхалі, не праганялі, не крычалі, як гэта я неаднойчы бачыў у савецкіх пасляваенных кінастужках. У канваіраў нават аўчарак не было.

Калі адпачынак закончыўся, палонных пастроілі, нямецкі афіцэр звярнуўся да жыхароў вёскі: «Каму для ўласнай гаспадаркі патрэбны работнікі, можаце браць палонных у свае сем'і». Але

мае аднавяскоўцы не рынуліся ратаваць палонных. Я не ведаю, як гэта патлумачыць. Магчыма, у першы год вайны мы яшчэ не ўбачылі, не адчулі яе жахаў і лічылі, што палонным нічога не пагражае. Гэтаксама лічылі і самі палонныя. А можа, людзі не забыліся, як пры савецкай уладзе тых, хто карыстаўся працай батракоў, выслалі ў Сібір, і таму зараз праявілі асцярожнасць?

І толькі тры ці чатыры незамужнія, а можа, удовыя жанчыны спрактыкаваным вокам выбралі сабе мужыкоў. Прывяла да сябе ў хату мужыка-прымака і наша суседка Наста Калмацкая. Ён быў прыгожы, статны мужчына. Яго звалі Фёдарам, родам з Украіны. Я пабег з ім знаёміцца, ён размаўляў са мной, як з дарослым. Адзін раз на месяц Федзя хадзіў у воласць адзначацца. У вёсцы прымакі пражылі да 1943 года. Калі партызаны зрабілі наша жыццё нязносным, усе яны пайшлі ў партызаны, а затым – у Чырвоную Армію.

Пасля вайны яны вярнуліся ў Нябышына, каб забраць на Украіну сваіх выратавальніц. Але толькі Фёдар увёз з сабой нашу суседку Насту. Яна прыслала з Украіны некалькі пісем. Фёдар пабудаваў для яе хату побач са сваёй. Сам ён быў жанаты, але яго жонка прыняла нашу зямлячку сардэчна, яны сталі сяброўкамі.

## 9. Наша вёска ва ўмовах акупацыі

Як я ўжо сказаў, наш калгас перастаў існаваць. Да гэтага ён праіснаваў гадоў 10–12. Яшчэ свежай была памяць людзей, як іх раскулачылі, сілком загналі ў калгас, а некаторых выслалі ў Сібір. Былі рэпрэсаваны Бобрык Дзяніс, Бобрык Аляксандр, Цецяронак Іван, Цецяронак Змітрок, Маскалейчык Даніла. Быў рэпрэсаваны і змагар за калгасы Кукуля Ціт. З яго сынам Сяргеем я сябраваў. Ніхто з іх назад не вярнуўся, сляды іх згубіліся дзесьці ў турэмных падвалах. Пашанцавала толькі Бобрыку Мірону, які вярнуўся з высылкі дадому.

І вось зноў, цяпер ужо з рук акупантаў, людзі атрымалі зямлю ў сваю ўласнасць, сталі гаспадарамі. Немцы абклалі ўсе двары цвёрдым падаткам у выглядзе здачы збожжа, жывёлы, фуражу. Мы своечасова ўбралі ўраджай 1941 года. Трэба адзначыць, што гэта быў ураджай калгасны, усіх тонкасцяў яго падзелу не ведаю. Нам дастаўся вялікі палетак жыта, а таксама па некалькі сотак ячменю, аўсу, гароху. Здаецца, бульбу, грэчку і лён не дзялілі, магчыма, ўсё гэта немцы забралі цалкам.

Але бульба ў нас была свая. Перад вайной прысядзібныя ўчасткі былі па 60 сотак, і мы іх звычайна засявалі бульбай. Я дакладна не ведаю памер падаткаў, якія здаваў мой бацька немцам, але добра памятаю, што для сябе заставалася значна больш, падаткі нельга было назваць рабаўніцкімі. Памятаю, як аднойчы бацька запрэг каня, закінуў на павозку трох авечак, папярэдне звязаўшы ім ногі, і павёз іх здаваць у Докшыцы. Я вельмі абрадаваўся, калі ён мяне ўзяў з сабой. На прыёмным пункце нам выдалі квітанцыю і нават грошы за здадзеных авечак. Грошы мой бацька браць адмаўляўся, таму што гэта былі савецкія купюры. Ён палічыў, што над ім пажартавалі. Загадчык прыёмнага пункту запэўніваў, што савецкія грошы ў хаду нараўне з акупацыйнымі маркамі, і параіў нам зайсці ў краму. Насамрэч, мы купілі соль, цукар, крупы і штосьці яшчэ, неабходнае ў гаспадарцы. Усё гэта мы пагрузілі на воз і паехалі дадому. Пасля гэтага людзі сталі даставаць савецкія грошы са сваіх сховішч і смела імі карыстацца.



*Маці аўтара, Еўдакія Кузьмінічна Копыл.*

Яшчэ мы здавалі немцам па кабану ў год, але акрамя гэтага была магчымасць і для сябе гадаваць па аднаму-два кабаны. Трэба прызнаць, што нямецкая адміністрацыя не кантралявала, якое ў гаспадарцы гадуецца пагалоўе жывёлы. Акрамя каровы, цяля, свіней мы гадавалі 15–20 авечак. Калі да акупацыі мы маглі дазволіць сабе мяса толькі па вялікіх святах: на Каляды, Вялікдзень, Тройцу, Дзяды – то ва ўмовах акупацыі мы маглі дазволіць сабе мяса кожны дзень.

Немцы да нас у вёску амаль не наведваліся. Мы – дзеці не адчувалі таго, што жывём пад акупацыяй. У вёсцы быў усяго адзін паліцай, 18-гадовы хлопец з мясцовых, бяскрыўдны. Калі немцы і прыязджалі ў вёску, то да старасты. Але такое здаралася не так і часта. У часы акупцыі нам, дзецям, для гульні заставалася менш часу: калі хочаш заможна жыць, трэба шмат працаваць. І мы, падлеткі, таксама ўключыліся ў працу. Бацька браў мяне ў поле. Я ў 7–8-гадовым узросце навучыўся ўпраўляцца з канём і нават

умеў баранаваць ворыва. Таксама я збіраў камяні на сваіх палетках, утварылася цэлая крушня з тых камянёў.

Так мы адносна спакойна пражылі да канца 1941 года, увесь 1942 год. Ужо з канца 1942 года сталі распаўсюджвацца чуткі пра партызан, адна трывожней другой. Мы заставаліся ў сваёй вёсцы да жніўня 1943 года.

## 10. Начны візіт

У снежаньскую ноч 1942 года мы пачулі грукат у шыбу, а затым у дзверы. Бацька запаліў лямпу, запытаў: «Хто там?», «Свае, адчыняй», – пачулася з вуліцы. У хату ўвайшло 10–12 чалавек, іх выгляд быў бандыцкі. Я напалохаўся і пачаў моцна плакаць. «Заткніце яму рот!» – закрычаў адзін з іх. Потым яны запыталіся, ці ёсць у вёсцы немцы. Бацька адказаў, што іх няма і не бывае, можа адзін-два разы на месяц прыедзе патруль у дзённы час і ўсё. Старэйшы сказаў: «Нам патрэбна адзенне, абутак, харч». Мама хутка падрыхтавала яешню, парэзала сала, каўбасу, хлеб, паставіла на стол салёныя грыбы, капусту – усё, што было. Ці то ў жарт, ці ўсур'ёз адзін запытаўся: «А дзе самагонка?» Але самагонкі ў нас не было. Пасля «трапезы» бацька аддаў ім боты, ватоўку, штосьці яшчэ. Але партызанам гэтага было мала: убачылі бацькаў кажух – забралі, сушыліся каля печкі валёнкі – забралі. Бацька ўпрошваў не забіраць кажух і валёнкі, селяніну без іх зімой вельмі цяжка пражыць. Старэйшы са злосцю прамовіў: «Зараз я цябе прыстрэлю, і не патрэбны табе будуць ні кажух, ні валёнкі».

Настрой у партызан сапсаваўся. «Дзе харчы?» – звярнуўся да мамы адзін з партызан. «Дык я ж вас пакарміла», – адказала яна. Пачуўшы гэты, як ім здалося, наіўны адказ, партызаны раз'юшыліся. Яны патрабавалі адчыніць клець, забралі сала, каўбасы, кумпякі – усё, што можна было несці і колькі можна было панесці. Гэта было звычайнае рабаўніцтва.

Нам пашчасціла, што ў іх не было транспарту і нават рэчавых мяшкоў. У нас засталося збожжа, бульба, у хляве стаяла жывёла. Пасля гэтага здарэння прадукты харчавання мы трымалі ў розных месцах, у тайніках. І вопратку на віду не трымалі. Мой бацька вельмі шкадаваў кажух і валёнкі.

Для параўнання хачу сказаць, што за ўвесь час акупацыі ў нашу хату ўсяго аднойчы зайшоў немец. Гэта было ў студзені 1942 года. Ён пераступіў парог і прамовіў: «Матка, яйка», – і чакаў, стоячы на палавіку ля дзвярэй. Са спалоху мама схапіла кошык з яйкамі і паднесла немцу. «Найн, найн», – сказаў ён і паказаў пяць пальцаў. Мама паклала на яго далонь 5 яек, ён сказаў: «Данке», – і выйшаў з хаты.

Праўда, у верасні 1941 года цераз нашу вёску ішла румынская часць. Яна прыпынілася на кароткі адпачынак. Румыны распалілі паходную кухню, але, відаць, у іх не было чаго закінуць у кацёл. Яны хадзілі па дварах і, не зважаючы ўвагі на гаспадароў, лавілі курэй. Курынае кудахтанне раздавалася па ўсёй вёсцы. Я і мая бабуля Наста сядзелі ў гэты час на прызбе сваёй хаты і назіралі за гэтым спектаклем. Бабуля ціха абуралася, а мне было смешна. Некалькі кур не далічыліся і мы.

Пасля начнога візіту партызан спакойнае жыццё скончылася. Кожную наступную ноч мы сустракалі з трывогай.

## 11. Аперацыя «Мост»

Уздоўж нашай вёскі працякае рака Поня. Цераз раку быў пабудаваны драўляны мост, вышыня якога над вадою была 2–2,5 метра. Немцы шашой Докшыцы–Бягомль, якая праходзіць цераз гэты мост, карысталіся рэдка. Шаша грунтовая, разбітая, лясная, зімой на ёй было шмат снежных заносаў. Але мост быў вяскоўцам патрэбны: для нарыхтоўкі дроў, сена, сувязі с суседнімі вёскамі. І трэба ж, аднойчы ноччу партызаны мост спалілі. Для нашай і навакольных вёсак гэта была калі не трагедыя, дык вялікая нязручнасць. Спаліць яго партызаны маглі бесперашкодна і днём – немцаў і паліцаяў у вёсцы не было, мост не вартаваўся. Каб яго спаліць, не трэба было праяўляць гераізм. Партызаны нанеслі шкоду не немцам, а нам, вяскоўцам. Ды партызанам гэтага не патлумачыш, невядома, дзе іх было шукаць. Пасля таго як мост згарэў, стараста паехаў у Докшыцы на паклон да немцаў. Яны прыслалі спецыяліста і тэхніку. Для адбудовы моста прыйшлі ўсе працаздольныя мужчыны. Толькі ўсё было дарэмна, што вяскоўцы днём будавалі, партазаны ноччу знішчалі. Нарэшце немцы плюнулі на гэтую справу, зімой мы ездзілі па лёдзе, а летам, калі рака мялела, – у брод.

А ў галоўны партызанскі штаб партызаны, відаць, адпраўлялі данясенні, што на акупаванай немцамі тэрыторыі знішчаны «стратэгічны» мост, спынены рух нямецкай тэхнікі на ўсход – рух, якога не было.

На маю думку, так у асноўным праваявалі партызаны ўсю вайну.

## 12. Першая ахвяра вайны

Наступіў 1943 год. Ён прынёс нам пакуты і небяспеку. Яна чакала нас як з боку немцаў, так і з боку партызан. Напрыканцы лютага 1943 года ў нашу вёску Нябышына нечакана, адкрыта днём, увайшоў партызанскі атрад. Ён рухаўся па шашы з боку Бягомля. Гэта быў унушальны санны абоз. Партызаны былі адзеты ўсе як адзін у новыя белыя кажухі (гэтым партазанам кажух майго бацькі быў бы не патрэбны). Усе яны былі ў аднолькавых зімовых шапках, пад кажухамі віднелася новая ваенная форма. У гэтых партызан адчувалася ваенная выпраўка. Яны былі ўзброены аўтаматамі, кулямётамі, мелі радыёстанцыі. Нават дзіцяці было зразумела, што гэта была добраўкамплектаваная армейская часць. Што ў Докшыцах, усяго ў 12 кіламетрах ад Нябышына, знаходзіўся моцны нямецкі гарнізон, іх не хвалявала. Убачыўшы такую моц, мы яшчэ не ўсвядомілі, ці нам радавацца, ці непакоіцца. Калі партызан лічыць нашымі абаронцамі, то абараняць нас на той час патрэбы не было. З 1941 па 1943 год немцы нас пальцам не кранулі (я маю на ўвазе нашу вёску).

Камандзірам гэтага атрада быў нехта Мядзведзеў, цёзка па прозвішчы таго легендарнага Мядзведзева, які быў закінуты для арганізацыі партызанскага руху ва Украіне. Атрад прыпыніўся на адпачынак у нашай вёсцы на некалькі дзён. У кожнай хаце размясціліся па некалькі чалавек. А ўсяго вёска, як я сказаў, налічвала 120 двароў. Пракарміць такую колькасць партызан было цяжкавата, давялося рэзаць авечак, цялят, курэй. Сам Мядзведзеў жыў у нашай хаце. Па-першае, наша хата была самая новая, мы яе пабудавалі ў 1940 годзе; па-другое, для партызан мой бацька заставаўся старшынёй калгаса. Менавіта яму аддаваліся загады, каб забяспечыць партызан усім неабходным. Першае, аб чым мой бацька папрасіў Мядзведзева, каб партызаны не чапалі старасту. З гэтай просьбай яму даводзілася звяртацца не аднойчы.

Вечарам партызаны ладзілі танцы. Аднойчы адзін з гэтых партызан, будучы п'яным, запрасіў на танец дзяўчыну, Фаню Пашэвіч. Яна адмовіла яму, сказала: «Я з п'янымі – не танцую», «Сука! – закрычаў ён. – А з п'янымі немцамі ты танцуеш?!» «Я іх ні разу не бачыла, немцы ў нас танцы ніколі не ладзілі», – спакойна адказала Фаня. Звар'яцелы партызан выхапіў пісталет і два разы стрэліў у Фаню. Гэта адбылося ў хаце Іллюка Спічонка на вачах вяскоўцаў і іншых партызан. Праз некалькі гадзін яна памерла. Фаня была самая прыгожая дзяўчына нашай вёскі, і гэта была першая ахвяра вайны ў нашай вёсцы. І адкрылі крывавы лік партызаны. Злачынцу не пакаралі. «Гэта мой лепшы кулямётчык», – сказаў камандзір атрада Мядзведзеў. І дадаў: «На вайне ахвяры непазбежны». Але ж гордую дзяўчыну Фаню забілі не ў баі. А мы вельмі востра адчулі, якую небяспеку нам нясуць партызаны.

## 13. Зноў партызаны

Ледзь скончылася прабыванне ў нашай вёсцы атрада Мядзведзева, як у красавіку 1943 года ў нашай вёсцы нечакана з'явіўся партызанскі атрад Шляхтунова. Гэта была вышкаленая вайсковая часць, якая выглядала больш грозна, чым нават атрад Мядзведзева. Гэтыя «партызаны» таксама былі апрануты ў новую форму. У іх мелася зброя: аўтаматы, кулямёты, супрацьтанкавыя ружжы і нават лёгкія пераносныя мінамёты. Частка атрада была на падводах, частка – верхам.

Шляхтуноўцы стаялі ў нашай вёсцы некалькі дзён. Для мясцовых жыхароў гэта было няпростае выпрабаванне. Маім бацькам адносна пашчасціла, мы ўтрымлівалі аднаго чалавека – камандзіра. Шляхтуноў, як і раней Мядзведзеў, абраў для сябе нашу хату, а наша сям'я, акрамя мяне, часова перабралася ў старую хату. Я заставаўся ў новай разам з камандзірам атрада. Ён адпачываў на ложку, а я на палку за грубкай. Раніцай прыходзіла мама і рыхтавала госцю сняданак. Днём на падлозе я распачынаў нейкія гульні, але ні Мядзведзеў, ні Шляхтуноў на мяне так і не звярнулі ўвагі. Для мяне гэта было крыўдна.

Аднойчы некалькі партызан сядзелі за хатай, грэліся на сонцы, як на дарозе з боку вёскі Далёкае стала бачна група ўзброеных людзей. Гэта маглі быць ці немцы, ці паліцаі, разгледзець было немагчыма, адлегласць да іх была больш за кіламетр. Партызаны

ў іх бок далі некалькі аўтаматных чэрг. Мой бацька кінуўся да партызан з крыкам: «Што вы нарабілі, навошта стралялі? Заўтра вы пакінеце вёску на волю лёсу, а паслязаўтра немцы спаляць маю хату». Так яно і здарылася, нашу хату спалілі цераз 20–25 дзён.

Шляхтуноў павёў свой атрад на захад у бок Докшыц. Нам гэта было незразумела, там жа моцны нямецкі гарнізон? У той жа дзень да нашай хаты прыскакалі 20–30 вершнікаў на чале з камбрыгам Дуброўскім. Ён хацеў сустрэцца з Шляхтуновым для нейкіх перамоў, але спазніўся. На нашым гумне яны спешыліся і прыселі на траву адпачыць. Я быў з бацькам у хаце, калі да нас увайшоў партызан, відаць, афіцэр, яго прозвішча – Андрыянаў. Ён прычапіўся да майго бацькі, схапіў за грудкі, стаў пагражаць пісталетам і крычаць, чаму бацька не ў партызанах, чаму яго не забілі немцы, як старшыню калгаса? Я напалохаўся і стаў крычаць. Праз адчыненае акно мой крык пачулі. У хату прыбеглі іншыя партызаны і ўтаймавалі раз'юшанага ваяку. Так я ўратаваў свайго бацьку. Вось так і жылі мы кожны дзень пад страхам.

## 14. Запылалі вёскі

Такім чынам у нашай вёсцы пабывалі партызаны Мядзведева і Шляхтунова. Яны пайшлі далей у Заходнюю Беларусь. Перад імі стаялі канкрэтныя задачы. Якія? Аб гэтым раскажу напрыканцы сваіх успамінаў. Але ж у нас былі і партызаны, замацаваныя за Бягомльскім раёнам – партызанская брыгада «Жалязняк». Што цікава, яны ні разу не наведалі нашу вёску днём, баяліся. Звычайна гэта рабілі ноччу, каб паздзекавацца над старастай і абрабаваць 2–3 хаты. Хутка нам стала зразумела, якую страшную небяспеку ўяўляюць партызаны.

Вясной 1943 года немцы ачапілі і спалілі разам з людзьмі вёску Шуняўку, што знаходзілася ў 4 кіламетрах ад нашай вёскі. Я добра памятаю, як мой бацька абураўся гэтым. У злачынстве ён абвінавачваў як немцаў, так і партызан. Адбылося ўсё наступным чынам. Партызаны з засады побач з вёскай у 4 гадзіны раніцы абстралялі нямецкую машыну. Я дакладна не ведаю, якую шкоду яны нанеслі немцам, але партызаны ў немцаў на віду ўцяклі ў бок вёскі і там іх след знік. Вёска ў гэты час безмяцежна спала, не ведаючы, што жыць ёй засталося апошнюю гадзіну. Недарэчнасць была яшчэ і ў тым, што партызаны для засады пераапрануліся ў ся-

лянскую вопратку. Немцы былі ўпэўнены, што засада – справа рук жыхароў вёскі, і выклікалі з Докшыц падмогу. Праз паўгадзіны да Шуняўкі пад'ехалі карнікі, ачапілі яе і знішчылі разам з жыхарамі.

Па такім сцэнарыі была прадпрынята спроба знішчыць суседнюю з намі вёску Вітунічы, што ў двух кіламетрах, толькі з другога боку ад ракі Поні. Зноў такая ж засада, у той жа час, сялянская вопратка, абстрэл і бегства на вачах у немцаў у бок вёскі. Але на гэты раз карнікі трохі прыпазніліся. Вёска ўжо прачнулася, і людзі своечасова ўбачылі небяспеку, схаваліся ў бліжэйшым лесе. Вёску спалілі разам з жыхарамі, якія прамарудзілі, не здолелі ўцячы. Загінула больш за 120 чалавек. Зараз Вітунічы адбудаваны, а макет Шуняўкі ўстаноўлены на мемарыяле Хатынь. Зараз мы дакладна ведаем, што і Хатынь знішчана па такім жа д'ябальскім сцэнарыі.

Пасля тых трагічных падзей да майго бацькі прайшлі стараста і яшчэ некалькі мужчын. Яны доўга размаўлялі, абмяркоўвалі пытанне, як ўратаваць жыхароў вёскі ад знішчэння як з боку немцаў, так і з боку партызан. Гэтыя мудрыя мужыкі ўжо тады прыйшлі да высновы, што ў злачынствах супраць насельніцтва ў часы акупацыі партызаны адыгрывалі не апошнюю, а можа, галоўную ролю.

## 15. Стараста

Як я ўжо казаў, старастай нашай вёскі прызначылі самага сціплага, бяскрыўднага чалавека Кастуся Шульгата. Немцам спадабалася яго ўнушальная камплекцыя. У яго не хапіла смеласці і рашучасці, каб паспрабаваць адмовіцца ад пасады. Ды і хто б рызыкнуў спрачацца з акупантамі? Пасля гэтага ён рэдка выходзіў на вуліцу, каб менш сустракацца з людзьмі. Пасада прыгнятала яго. Можа, ён адчуваў нейкую віну перад людзьмі? Але ў чым тут была яго віна? На яго месцы мог апынуцца любы вясковец.

Стараста шмат турбот дастаўляў майму бацьку. Калі да старасты прыязджалі прадстаўнікі нямецкай адміністрацыі, каб вырашыць якое-небудзь пытанне, напрыклад, атрымаць справаздачу па падатках ці арганізаваць выдзяленне падвод для гаспадарчых работ, Кастусь Шульгат так хваляваўся, што нічога не мог патлумачыць. Тады адзін з яго сыноў бег да майго бацькі і той ішоў яго выручаць. Добра, што немцы хоць і выказвалі незадавальненне, але старасту не білі. Дый наведваліся яны да нас у вёску не часта.

Больш жахліва і складана было, калі наступала ноч. У хату старасты ўрываліся партызаны і пачыналі над ім здзекавацца. Яны збівалі яго прыкладамі, кулакамі, нагамі, называлі яго здраднікам, нямецкім прыслужнікам. Яго сыны, Леанід ці Мікалай, беглі па начной вуліцы да нас, грукалі ў дзверы і крычалі: «Дзядзька Піліп, тату партызаны забіваюць!» Дзядзька Піліп, гэта мой бацька, хутка апранаўся і бег ноччу ратаваць старасту ад партызан. Усю вайну з твара старасты не сыходзілі сінякі, гузакі, кровападцёкі. Па яго твары можна было даведацца, былі ноччу партызаны ці не. Ратуючы старасту, мой бацька падвяргаў небяспецы і сябе. Не аднойчы партызаны чапляліся і да яго Але паступіць інакш ён не мог.

Калі нашу вёску вызваліла Чырвоная Армія, адразу прыехалі з Бягомля нкусаўцы, каб арыштаваць старасту. І зноў мой бацька яго абараніў. Ён сказаў нкусаўцам: «Тады бярыце і мяне, я ўсю акупацыю падтрымліваў старасту і дапамагаў яму». Больш Шульгата не чапалі, ён спакойна пражыў да глыбокай старасці. Калі я, ужо будучы дарослым, прыязджаў у сваю вёску на адпачынак, яго сыны, пры сустрэчы са мной, дзякавалі мне за добрыя, смелыя ўчынкі майго бацькі. З малодшым сынам Кастуся Леанідам мы былі аднагодкамі і сябравалі.

## 16. Аперацыя «Котбус»

Мы, жыхары вёскі Нябышына, гэту вайсковую аперацыю немцаў супраць партызан называлі першай нямецкай блакадай.

Я пісаў ужо, што на працягу 1941–1942 гадоў мы немцаў амаль не бачылі. Пачынаючы з 1943 года, калі з'явіліся партызаны, у нашай вёсцы было наладжана патруляванне. Так склалася, што адзін тыдзень патрулявалі немцы. Яны праязджалі цераз вёску на трохкалёсным матацыкле. Іх было 2–3 чалавекі. Яны, як правіла, не спыняліся і адразу паварочвалі на Докшыцы. Рэдка, але бывалі выпадкі, калі яны спыняліся і заходзілі да каго-небудзь у хату с пытаннем: «Матка, яйка?»

Наступны тыдзень вёску патрулявалі партызаны. Дакладней, гэта быў адзін партызан, і ён нёс службу нязменна. У яго таксама быў транспарт – веласіпед. У нашай вёсцы гэтага партызана ведалі ўсе. Яго прозвішча было – Звераў. Старэйшыя жыхары яго памятаюць і зараз. У нас склалася такое ўражанне, што графік

патрулявання немцы і партызаны распрацоўвалі сумесна.

На пачатку траўня 1943 года і немцы і партызаны патруляванне раптам спынілі. Мы гадалі: «Чаму?» Ад няяснасці стала неспакойна. А ў гэты час немцы рыхтаваліся да правядзення вайсковай аперацыі супраць партызан, якая называлася «Котбус». У гэты самы час партызаны рыхтавалі для сябе сховішча ў непралазных балотах і лясах, пакінуўшы каля вёсак невялікія групы, пераапранутыя ў вясковае адзенне. Іх галоўная мэта – збор інфармацыі аб дзеяннях немцаў і мясцовага насельніцтва. Падсвядома мы разумелі, што аперацыя супраць партызан патрэбна. Яны актыўна сталі правакаваць немцаў, каб падштурхнуць іх на карныя дзеянні супраць мірнага насельніцтва. Трагедыя ўжо накрыла Шуняўку і Вітунічы. Якая вёска ў партызан на чарзе, мы не ведалі, жылі як на гарачым вуголлі. Таму мы жадалі, каб партызаны былі як мага далей адсунуты ад нашай вёскі. Але мы не ведалі, як будуць ставіцца немцы да насельніцтва ў час правядзення вайсковай аперацыі. Мой бацька і большасць жыхароў вёскі вырашылі не рызыкаваць, а ратавацца.



*Дзеці вайны.*
*Мікалай Копыл,*
*родны брат Іллі.*
*Загінуў у партызанах*
*у сакавіку 1944 г.*

Зразумела, што вяскоўцы не валодалі інфармацыяй пра блакаду. Партызаны не папярэдзілі нас, што набліжаецца небяспека, у мяне засталося ўражанне, што гэта было не ў іх інтарэсах. Наадварот, яны ўвесь час нас «падстаўлялі». Ва ўсялякім выпадку так атрымлівалася. Гэта пазней, у пасляваенных кінастужках, мастацкіх творах, нам сталі расказваць байкі, быццам партызаны баранілі насельніцтва ад захопнікаў.

Аднойчы з вёскі Восава да дзядзькі Сцяпана, хата якога стаяла побач з нашай, прыбег сваяк, хлапчук, мой аднагодка. Яго звалі Уладзік. Ён расказаў, што ў іх вёску прыехала шмат немцаў і паліцаяў. Акрамя машын у іх з сабой маюцца танкі і гарматы. Хутка яны пойдуць цераз Нябышына ў бок Бягомля лавіць і знішчаць партызан. Так мы даведаліся, што блакада вось-вось пачнецца і з гэтага часу, як кажуць, сядзелі на чамаданах. Мы падрыхтавалі

ўзяць з сабой самае неабходнае: харч, адзенне, сярнічкі, сякеру ды іншае. Наша была размеркавана на кожнага. Мне дастаўся школьны ранец з сухарамі і нямецкі тэрмас з малаком. Увесь дамашні скарб мы ноччу закапалі ў ямы, каб ніхто не бачыў. Спалі ў вопратцы. Мужчыны па чарзе вартавалі вёску, сачылі за дарогай. Мой самы старэйшы брат Мікалай, 1922 года нараджэння, і іншыя хлопцы, нават непаўналетнія, яшчэ раней падаліся да партызан – інакш ім пагражала адпраўка на працу ў нямеччыну.

Бабуля Наста, маці майго таты, была ўжо старэнькая і ісці разам з намі не магла. Для яе за аселіцамі ў забалочаным хмызняку бацька збудаваў шалаш, спадзеючыся, што яна там перажыве блакаду. Раніцай, перш чым пакінуць сваю хату, мама ў апошні раз падаіла карову, потым мы ўсю сваю скаціну выгналі ў поле, вароты ў двор зачынілі, каб жывёла не змагла вярнуцца назад. Дзверы ў хаты (у нас было дзве хаты: старая – дзедаўская і новая) мы на замкі не запіралі, каб іх не зламалі. Усё гэта рабілася без спешкі, быццам мы збіраліся на адпачынак на прыроду.

Мы пакідалі вёску, а немцы ў вёску ўваходзілі. Тактыка вяскоўцаў была такой: аб'яднанне ў групы па 3–5 сямей, і потым кожная група самастойна павінна ісці сваім маршрутам у лясы і Лобацкія балоты. Мы не сталі пераправуляцца цераз раку Поню побач з вёскай, а загадзя выбралі брод у 2 кіламетрах ад яе ўніз па цячэнні. На беразе ракі ў зараслях трысця метраў 300 ад броду яшчэ напярэдадні быў падрыхтаваны тайнік для дзядзькі Сцяпана, роднага брата майго бацькі. Ён быў інвалід, замест ног у яго былі пратэзы. На гэтым месцы ён без прыгод і перасядзеў усю блакаду. Другі родны брат майго бацькі дзядзька Іван застаўся ў вёсцы – ён сам і яго жонка Юстына былі хранічна хворыя. Таму яны схаваліся ў хмызняку побач з вёскай.

Нам тэрмінова трэба было рухацца як мага хутчэй далей, але адбылася замінка. Я ўспомніў, што дома застаўся мой зусім маленькі сабачка, шчаня. Яго падарыў мне наш сусед дзед Барыс. У Барыса была ўласная сабака, звалі яе Мурза, я яе вельмі баяўся. Аднойчы яна мяне так напалохала, што я нават захварэў. І вось сусед, каб загладзіць сваю віну і каб я больш сабак не баяўся, падарыў мне шчаня.

Я скінуў з плячэй ранец, крыкнуў пра сабачку, і бацькі не ўспелі апамятацца, як я ўжо быў на другім баку ракі. Яны крычалі, каб я вярнуўся назад, але я ўжо ні на што не звяртаў швагі. Адлегласць у 2 кіламетры я пераадолеў вельмі хутка. Мне ўжо было

амаль 9 гадоў, і бегаў я добра. Вуліца вёскі была пустая, я нікога не сустрэў. Але наша хата, пуня і ўсе іншыя пабудовы былі ўжо ахоплены полымем. Такое відовішча назіраць было жахліва. Нават на вуліцы, далёка ад пабудоў было горача. Гарэлі хаты дзядзькі



*Дарога з Нябышына ў вёску Далёкае. Тут у 1943 годзе партызаны з брыгады Шляхтунова абстралялі немцаў*

Сцяпана, дзядзькі Івана і Нікіфара. Гэта была расплата немцаў за стралянiну з нашага двара партызан Шляхтунова.

Я куляй кінуўся назад з вёскі і зноў нікога ў ёй не сустрэў. Відаць ,я апынуўся ў ёй, калі немцы ўжо зрабілі сваю справу і пайшлі далей, а паліцаі яшчэ не прыйшлі. Гэта мяне і выратавала. Я так нёсся назад да родных, што аж вецер у вушах стаяў. Не збаўляючы хуткасці, кінуўся ў раку і неўзабаве далучыўся да нашай групы. Я думаў, што зараз усе на мяне будуць сварыцца, але бацька проста сказаў: «Ну што, усе ў зборы? Пайшлі за мной». У мяне нават ніхто не запытаўся, што я бачыў у вёсцы, і я пакуль што не сказаў, што наша і яшчэ тры хаты згарэлі.

Толькі пазней, калі я ўбачыў забітых і спаленых аднавяскоўцаў, мне стала зразумела, якой небяспецы я падвяргаў сябе гэтай неабдуманай выхадкай. Я мог апынуцца ў руках немцаў ці паліцаяў і загінуць. А што перажылі мае бацькі?

На балоце мы кожны дзень мянялі месца знаходжання. Агонь не палілі. Заўсёды ў першую чаргу будавалі з яловых галінак ша-

лаш для начоўкі. Аднойчы мама ўгаварыла бацьку распаліць маленькі касцёр, каб спячы аладкі. Запаслівая мама ўзяла з сабой крыху мукі і маленькую патэльню. Як толькі ўзвіўся дымок, у небе над намі з'явіўся нямецкі самаёт-разведчык «рама». Мы ўжо добра ведалі павадкі гэтага самалёта. Мы затапталі касцёр і затаіліся. Як толькі «рама» зрабіла над намі круг і адляцела, бацька скамандаваў: «Хапайце свае рэчы і хутчэй бяжым адсюль». Мы адбеглі ад шалаша на 300–400 метраў і ўбачылі, як у небе з'явіўся другі самалёт. Ён скінуў тры бомбы, адна з якіх трапіла ў шалаш. У ім я ў паспешлівасці забыў губную гармошку, тую самую, якую падарыў мне немец пры сустрэчы на мосце ў 1941 годзе. Я ўжо зноў ледзьве не кінуўся назад да шалаша, але пападанне бомбы ўсё вырашыла. Больш касцёр мы не палілі. У немцаў не хапала сіл, каб акружыць і прачасаць адразу ўвесь лясны ці балотны масіў. Яны гэта рабілі шырокімі палосамі. І пакуль яны пераходзілі на чарговую паласу, мы непрыкметна перабіраліся на пракантраляваную і там хаваліся. Трэбы адзначыць, што немцы непралазныя хмызнякі абыходзілі, адпускаючы ў іх бок некалькі аўтаматных чэрг. Тое ж было і на балотах. А мы, каб уратавацца, былі гатовы на любыя выпрабаванні.

## 17. Смерць партызана

У час блакады да адной групы вяскоўцаў далучыўся партызан. Ён заблудзіўся на балотных абшарах, адстаўшы ад свайго атрада, а мясцовасці не ведаў. Да слова сказаць, гэты партызан мне быў добра знаёмы. Ён быў мужам маёй стрыечнай сястры Клаўдзіі. Звалі яго Уладзімірам, родам ён быў з Ленінграда.

Клаўдзія яшчэ да вайны паехала ў гэты горад на працу і там хутка выйшла замуж. За тыдзень да вайны яны прыехалі ў нашу вёску на адпачынак. У нас была вельмі прыгожая прырода: лес, рэчка, лужкі, пакрытыя кветкамі, крыніцы і ручайкі. З кветкі на кветку пераляталі пчолы, чмялі, восы, усялякія матылькі, стракозы... Сярод травы і кветак стракаталі конікі. На ўсе лады спявалі птушкі. У рацэ вадзіліся рыбы і ракі, а ў лесе раслі ягады, грыбы, арэхі... Зараз нічога гэтага няма. Ужо пасля вайны па плану меліярацыі раку Поню спрамілі, пераўтварылі ў брудную канаву, і ўсё жывое загінула. Дажывае апошнія гады і наша вёска.

Дзядзька Лаўрэн, бацька Клаўдзіі, быў і рыбак, і грыбнік, і цікавы субяседнік. Уладзіміру наша вёска падабалася. Калі пачалася вайна, вярнуцца ў Ленінград магчымасці не стала. Так Уладзімір з Клаўдзіяй і жылі ў нашай вёсцы, пакуль гэта было магчыма. Я часта бегаў да дзядзькі Лаўрэна, каб паслухаць цікавыя аповеды пра вялікі горад Ленінград. Калі з'явіліся партызаны, Уладзімір і Клаўдзія адразу пайшлі да іх. І вось блакада. Убачыўшы знаёмых вяскоўцаў, Уладзімір абрадаваўся, папрасіў вывесці яго з балота, паказаць дарогу. Добраахвотнік адразу знайшоўся і павёў партызана. Праз хвілін 10–15 людзі пачулі адзіночны выстрал. Неўзабаве вярнуўся назад і «праваднік». Ён загадкава сказаў: «Я паказаў яму дарогу куды трэба. Больш ён сюды не вернецца». Як потым высветлілася, адбылося наступнае. Спачатку яны ішлі мірна, размаўлялі. Партызан быў вельмі стомлены. Калі «праваднік» прапанаваў яму дапамагчы паднесці вінтоўку, Уладзімір з радасцю яе перадаў. Ён адчуў палёгку, расслабіўся, згубіў пільнасць. А «праваднік» падлавіў зручны момант і стрэліў у партызана. Смерць наступіла імгненна. Потым, як ні ў чым не бывала, забойца далучыўся да сваёй групы аднавяскоўцаў. Чаму ён так паступіў, якая была ў тым неабходнасць, што яго падштурхнула на злачынства, на што ён разлічваў – я не ведаю. Але адказ на гэтае пытанне далі мне мае аднавяскоўцы, калі прачыталі маю кнігу. Партызаны яго некалькі разоў рабавалі і збівалі. Ён затаіў зло і крыўду на ўсіх партызан. І вось здарыўся выпадак, каб адпомсціць. Партызаны здзекаваліся не толькі над ім, але людзі трывалі, каб выжыць любым коштам.

Пасля блакады партызаны расстралялі злачынцу пасярод вуліцы нашай вёскі. Такі ж лёс чакаў і ўсю яго сям'ю, але партызаны яе не знайшлі. Жонка разам з дзецьмі змагла своечасова ад'ехаць да сваякоў у горад Быхаў, дзе яны і пражылі да канца вайны. Пасля вайны вярнуліся ў Нябышына, але больш іх ніхто не чапаў. Я вагаўся, ці называць прозвішча таго аднавяскоўца, які стаў злачынцам, забойцам, каб не напамінаць яго дзецям і ўнукам пра тую трагічную трагедыю мая 1943 года, у якой іх бацька і дзед быў галоўным вінаватым. Палічыў, што можна. У нашай вёсцы ўжо даўно няма яго нашчадкаў. Як расказалі мне вяскоўцы, старэйшы сын памёр у турме. За што ён быў асуджаны, ніхто не ведае. Раней я памылкова лічыў, што ён загінуў на фронце. Малодшы – Уладзімір меў буйны характар, п'янстваваў, учыняў бойкі, за што некалькі разоў сядзеў у турме, дзе і памёр. Яго ўнук (сын

Уладзіміра) працаваў міліцыянерам у Мінскім раёне, таксама быў асуджаны. Пра яго далйшы лёс нічога не ведаю. Усе яны насілі мянушку Самсура, прозвішча іх – Ляўко. Але ў вёсцы людзей ведалі і называлі па мянушках.

На жаль, прозвішча забітага партызана Уладзіміра я не ведаю. Што здарылася з Клаўдзіяй, жонкай Уладзіміра, маёй стрыечнай сястрой, даведацца не ўдалося. Яе сляды згубіліся. Пасля вайны ніякіх звестак пра яе мы не атрымалі.

## 18. Малыя дзеткі – малыя бедкі?!

На балоце ў час блакады адбылося яшчэ некалькі падобных адна на другую трагедый. Адна жанчына, маці-адзіночка, павесіла сваю маленькую дачку. У другой групе дзве жанчыны задушылі сваіх маленькіх дзетак. Балотныя вандроўнікі паставілі дзяцей у невыносныя ўмовы: хмары мошак і камароў, вільгаць, недаяданне, недасыпанне, хваробы. Дзеці пакутавалі, плакалі. Людзі замест падтрымкі сталі выказваць незадавальненне, папракаць: дзіцячы плач могуць пачуць немцы, а гэта канец. І тыя жанчыны, тыя маці, замест таго каб плюнуць на вяскоўцаў, з якімі нельга было знайсці паразумення, замест таго каб кінуць іх і ратаваць сябе і сваіх дзетак у адзіночку, пайшлі на крайні крок – пазбавілі сваіх немаўлятак, сваіх дзетак жыцця.

Мужамі дзвюх апошніх жанчын былі якраз тыя прымакі. Калі яны вярнуліся з вайны і даведаліся пра тое, што ўчынілі іх жонкі, яны кінулі іх і адразу ад'ехалі да сябе на радзіму. А жанчыны тыя ўсё жыццё да старасці ў адзіноце з цяжкім грузам на сэрцы, з цяжкім грахом на сэрцы так і пражылі.

Так гэты трагічны эпізод быў расказан мной у першым выданні кнігі. Але калі кнігу прачыталі мае аднавяскоўцы, яны мяне паправілі. Яны расказалі мне, што не праганялі гэтых трох жанчын са сваіх груп. У шмат якіх сем'ях былі маленькія дзеці і ўсе з гэтым мірыліся, вытрымалі і пержылі блакаду. Гэтыя тры жанчыны вырашылі ратавацца разам з партызанамі, думалі, што з імі бяспечней. Але партызаны паставілі ўмову: далучыцца да іх можна, але без дзяцей. Што адбылося далей, вышэй мной расказана ўсё правільна.

Мае землякі запыталіся ў мяне, чаму я ў сваёй кнізе не назваў імёны гэтых жанчын. Таму зараз я іх называю. Першую жанчы-

ну звалі Надзя. Ад вяскоўцаў я пачуў жудасныя падрабязнасці. У Надзі не было чым задушыць сваю дачку. Яна звярнулася да жыхара нашай жа вёскі 17-гадовага Рыгора Салянкі, каб ён пазычыў ёй сваю дзягу. Рыгор адмовіўся браць грэх на сваю душу, дзягу не даў. Тут я ўпершыню даведаўся, што дачцэ Надзі было ўжо 6 гадкоў. Уся гэта падрыхтоўка к злачынству адбывалася ў яе прысутнасці, на яе вачах і яна добра разумела, што рыхтуе для яе ўласная мама. Дзяўчынка стала прасіць: «Мамулька, не забівай мяне, я больш не буду плакаць, буду вясці сябе ціха». Але вырак ужо вынесены, і партызаны падштурхоўваюць: «Давай, Надзя! Хутчэй канчай, Надзя!» Пра ўсё гэта Рыгор расказаў пасля блакады.

Дзве другія жанчыны – дзве родныя сястры, Вера і Валя Мікалайка. Іх дзеткам было па годзіку з паловай, таму іх маці здзейснілі свае злачынствы лёгка. Гэтыя тры выпадкі дзетазабойства красамоўна характарызуе і партызан, якімі яны былі абаронцамі насельніцтва. У гэтых выпадках яны былі ініцыятарамі і саўдзельнікамі забойства дзяцей. Пасля вайны гэтых жанчын да адказнасці не прыцягнулі.

## 19. Трагедыя ў вёсцы

Пакуль мы хаваліся на балоце, у нашай вёсцы разгортваліся трагічныя падзеі. Свае хаты пакінулі не ўсе жыхары. На месцы засталіся хворыя і састарэлыя людзі, а таксама тыя, хто не пажадаў расставацца са сваёй маёмасцю. Былі і такія, хто лічыў, што ім нічога не пагражае. Большасць іх схавалася побач са сваімі хатамі ў ямах, у кустарніках, у высокай траве, у бульбяных баразнах, і нават на гарышчы сваіх хат. Такіх людзей у вёсцы засталося шмат, але колькі ўсяго, не ведаю.

Калі немцы ўвайшлі ў Нябышына, то першай жывой душой, якую яны ўбачылі, была мая бабуля Наста. Ёй надакучыла сядзець у адзіноце ў сховішчы і яна пайшла ў вёску да сваёй хаты. Тут і сустрэлася з немцамі. Як потым расказвалі людзі, якія назіралі са сваіх сховішчаў за падзеямі і ацалелі, немцы цераз перакладчыка паразмаўлялі з бабуляй, нечым яе пачаставалі і загадалі прайсці па вёсцы і сказаць людзям, каб яны нічога не баяліся. Але гэта было не зусім так. Хоць немцы зачыстку ў вёсцы і не рабілі, але калі яны выпадкова напароліся на некалькіх чалавек, то праца-

дольных тут жа накіравалі ў Докшыцы для далейшай адпраўкі на працу ў Нямеччыну. Старых і хворых адпусцілі, нікога не забілі.

А мая бабуля так і пайшла вольна па вуліцы, пакуль не зайшла ў хату да сваёй сяброўкі – аднагодкі паразмаўляць. Немцы ўпэўніліся, што ў нашай вёсцы партызанамі і не пахне, падпалілі чатыры крайнія хаты, у тым ліку і нашу, і пайшлі далей у бок Бягомля. Яшчэ раз напомню, што гэтыя хаты спалілі па той прычыне, што ў мінулым месяцы партызаны вялі стральбу з нашага двара па групе немцаў. Убачыўшы пажар, людзі, якія хаваліся побач з вёскай, прадбачліва кінуліся ў лес. Вось якраз у гэты момант я і прыбег да сваёй хаты, каб ўратаваць сабачку, але хата ўжо гарэла.

Між тым і ў гэты момант у вёсцы заставаліся жыхары. Праз нейкі час у яе ўвайшлі паліцаі. Іх было не надта многа, чалавек 15–20, можа, крыху больш, і з імі каля дзесятка падвод. Якая мэта была ў іх, можна здагадацца. Яны сталі рабаваць пустыя хаты і грузіць скарб на вазы.

Разам з паліцаямі рабаўніцтвам займалася і адна жанчына. Людзі, якія рызыкнулі і засталіся ў сваіх сховішчах побач з вёскай, здалёк пазналі яе. Гэта была наша нябышынская жанчына Надзя Прахаронак. Да вайны яна пайшла замуж у вёску з недалёкай Заходняй Беларусі. Яе муж якраз і быў начальнікам гэтай паліцэйскай каманды. Жанчына добра ведала хаты, у якіх можна было добра пажывіцца. Людзі, убачыўшы яе, асмялелі: гэта ж наша жанчына! Яны павылазілі са сваіх сховішчаў і накіраваліся да яе, як да выратавальніцы. Яны папрасілі спыніць рабаўніцтва, не здагадваючыся, што падпісваюць тым самым сабе смяротны прыгавор. Надзя была ўпэўнена, што вёска пустая, і гэта сустрэча з людзьмі была для яе нечаканай і непажаданай. Менавіта яна, Надзя Прахаронак, параіла свайму мужу-паліцаю зрабіць так, каб у вёсцы не засталося ніводнага сведкі. Паліцаі абшукалі вёску і яе наваколле. Усіх, каго злавілі, загналі ў пуню. Такіх было не менш 30 чалавек. Потым у пуню кінулі гранату і падпалілі. З пуні чуліся крыкі і плач. Кажуць, што Надзя Прахаронак не пашкадавала і сваіх бацькоў, яны загінулі ў той жа пуні. Хто спрабаваў збегчы, таго застрэлілі. Старых і хворых забівалі на месцы. Такі лёс напаткаў і маю бабулю. У пуні згарэў і стрыечны брат са сваёй народнай маці. Яму было ўсяго 5 гадоў, ён хварэў. Жанчына засталася з ім, каб даглядаць, і загінула разам. Яе муж Іван Стуль-

бёнак па прозвішчы Ананіч са сваімі сынамі Міхаілам і Мікалаем уратаваўся.

Дарэчы, Прахаронак – гэта таксама не прозвішча, а мянушка. Дзеда звалі Прохарам. Старэйшы брат Надзі, Аляксандр, загінуў у партызанах. Пахаваны ён на могілках у нашай вёсцы Нябышына. Памятаю, як труну з нябожчыкам перапраўлялі цераз раку Поня на чаўне, таму мост быў спалены. На яго магіле быў усталёваны замест крыжа слупок з пяціканцовай зоркай зверху. Калі я вучыўся ў школе, мы, вучні, разам з настаўнікамі даглядалі яго магілу. Але школу даўно зачынілі і нават будынак разабралі. Зараз, калі я пісаў гэтыя свае ўспаміны, паехаў у вёску, каб яшчэ раз пабачыць тое месца, удакладніць нейкія дэталі. Але магілу я не знайшоў. Ніхто з жыхароў вёскі таксама не змаглі ўспомніць, дзе тое месца. Вось такая «памяць» аб канкрэтным партызане Вялікай Айчыннай вайны. Тут назіраецца абыякавасць як жыхароў вёскі, так і мясцовай адміністрацыі.

Другі брат Надзі Прахаронак, Пётра пасля вайны з'ехаў да сваякоў на Украіну. Памятаю, ён называў і горад – Каменскае. Вось такая была вайна: часам свае былі жахлівей, чым немцы. Пра Надзю я больш нічога не чуў, нават не ведаю, ці шукалі яе і яе мужа-паліцая пасля вайны, каб аддаць іх пад суд. Якое ж было маё здзіўленне, калі я пачуў ад аднавяскоўцаў, што Надзя Прахаронак пасля вайны працавала ў леспрамгасе, жыла ў вагончыку разам з лесарубамі і дажыла да глыбокай старасці ў вёсцы Далёкае. Дарэчы, у гэтай вёсцы нарадзіўся і вырас бацька трохразовага алімпійскага чэмпіёна ў веславанні Уладзіміра Парфяновіча. Яго гэтак сама завуць Уладзімір Парфяновіч. Я з ім сябраваў і правучыўся разам з ім у адной і той жа школе з 1-га па 7-ы клас.

Зараз вёска Далёкае ўжо не існуе.

## 20. Канец блакады

Блакада працягвалася тыдзень, а можа, крыху больш. Увесь гэты час мы хаваліся на балоце. Кожны дзень мы перахадзілі на новае месца. Усе рашэнні на гэта прымаў мой бацька, ён вельмі добра арыентаваўся на балоце. У нашай групе было 13 чалавек: двое мужчын, пяць жанчын, шэсць дзяцей, з якіх самаму малодшаму было 8 гадоў. Мы пілі ваду з ручаёў. Харчы заканчваліся.

Калі «рама» перастала лётаць, мы сталі распальваць агонь. Шукалі птушыныя гнёзды і варылі птушанят.

Мой бацька часам адлучаўся, каб разведаць, што адбываецца ў вёсцы. Гэта было небяспечна, ён мог напароцца на засаду і назад не вярнуцца. Аднойчы, вярнуўшыся з разведкі, бацька сказаў: «Пара дадому, хопіць бадзяцца». Вось тут я і сказаў, што наша хата згарэла. Але бацька ўжо ведаў пра тое. Мы выйшлі з лесу, убачылі сваю вёску. Яна ўцалела амаль уся. І хоць наша хата згарэла, у нас павысіўся настрой. Мы забыліся пра пільнасць і са спазненнем убачылі на ўскрайку вёскі ўзброеных людзей. Да плоту былі прывязаны коні. Уцякаць было позна. Незнаёмцы падалі рукамі знак, каб мы падышлі да іх. Бацька спыніў групу і пайшоў адзін. Следам за ім, быццам хвост, увязаўся і я. Як высветлілася, гэта былі партызаны і сярод іх камісар 1-га атрада брыгады «Жалязняк» Спірыдон Бардзыка (пасля вайны я з ім сустрэўся яшчэ раз). Мы падышлі бліжэй. Перад намі адкрылася жудасная карціна: папялішча, на якім ляжала 15–20 абгарэлых чалавечых цел. Мяне апанаваў страх, стала мутарна і я схаваўся за спінай бацькі.

Бардзыка складаў «Пратакол аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у вёсцы Нябышына». Ён сам і ўсе астатнія падпісаліся пад пратаколам. Мой бацька ўдакладніў, што гэта злачынства здзейснілі не немцы, а паліцаі. «Якая розніца», – сказаў Бардзыка. Калі нас партызаны адпусцілі, мой бацька ідучы сказаў: «Адкуль яны так хутка з'явіліся і дзе яны былі, калі гэтых людзей забівалі?» Зараз на тым месцы няма ні помніка, ні памятнага знака. Так воддаль ад вялікіх гарадоў «ушаноўваецца» памяць ахвяр вайны.

## 21. У Нямеччыне

Як я ўжо казаў, частку нашых вяскоўцаў (іх набралася не надта многа) адправілі на працу ў Нямеччыну. Такі лёс напаткаў і сям'ю маёй роднай цёткі Алёшы. Яны схаваліся ў замаскіраванай зямлянцы паблізу вёскі. Калі іх сусед патрапіў у рукі немцаў, то і прывёў іх да гэтай зямлянкі. Лічу, што сям'і цёткі пашанцавала: калі б яны трапілі к паліцаям, іх лёс быў бы трагічным. Разам з цёткай Алёшай у Нямеччыну адправілі яе мужа – дзядзьку Тумаша і дзвюх дачок Веру і Лізу. Дзве другія дачкі, Марыля і непаўналетняя Аня, за некалькі хвілін да гэтага пакінулі зямлян-

ку і накіраваліся ў бліжэйшы лес, што іх і выратавала ад палону. Непаўналетні цётчын сын Ваня, калі пачалася блакада, прымкнуў да партызан, дзе яго сляды і згубіліся. Вось так вайна раскідала сям'ю на тры часткі.

Дзеці – удзельнікі партызанскага руху... Я не ведаю, як да гэтага ставіцца, але мушу сказаць, што гэта бесчалавечна. Дзеці павінны быць разам з бацькамі. Не я першы аб гэтым кажу, што



*Вёска Нябышына, сучасны выгляд.*

дзяцей, падлеткаў партызаны выкарыстоўвалі як разведчыкаў. Іх пасылалі ў вёскі і мястэчкі, каб дабыць для партызан неабходныя весткі. Разлік быў на тое, што немцы ці паліцаі на дзяцей не звернуць увагі. Хутчэй за ўсё такіх падлеткаў партызанскае кіраўніцтва не заўсёды заносіла ў спісачны склад сваіх атрадаў. Таму, калі яны гінулі, не вярталіся, знікалі, іх ніхто не шукаў. Менавіта так здарылася і з Ваней, сынам цёткі Алёшы. Калі пасля вайны паспрабавалі Ваню знайсці, то высветлілася, што ён нідзе не лічыцца. Ён проста растварыўся.

Дарэчы, хачу расказаць яшчэ пра адзін выпадак, які здарыўся ў час блакады ў вёсцы Нябышына. 11-гадовы Міша Бычок адстаў ад бацькоў і, калі немцы ўжо ўвайшлі ў вёску, кінуўся на ўцёкі ў бок ракі Поні. Немцы, убачыўшы, што гэта падлетак, страляць не сталі. Міша не ўмеў плаваць, хоць і быў на 4 гады старэйшы за мяне. Ён дабег да берага ракі і спыніўся. Тут немцы яго і ўзялі.

Пра далейшы лёс Мішы Бычка я нічога не ведаў. Я палічыў, што яго накіравалі на працу ў Нямеччыну. Але ўжо ў наш час, калі нямецкі ўрад стаў выдаваць беларускім грамадзянам кампенсацыю за прымусовую працу ў Нямеччыне ў часы Другой сусветнай вайны, Міша Бычок гэтай кампенсацыі не атрымаў – пра гэта мне сказала мая стрыечная сястра Вера Салянка. Узнікае пытанне, дзе Міша адсутнічаў з траўня 1943 года да канца акупацыі. Высветліць гэта ў яго самога ў мяне не атрымалася. У дзяцінстве я з ім не сябраваў, ён быў старэйшы за мяне, таму і зараз у мяне з ім няма ніякіх адносін. Бываючы ў сваёй вёсцы, я сустракаўся з Мішам Бычком, але гэтыя сустрэчы былі кароткія. Запытацца пра тое, што мяне цікавіць, рашучасці не хапіла. Я разумеў, што ўспаміны пра мінулае не заўсёды прыемныя.

Нечакана тайна Мішы Бычка перастала быць для мяне загадкай. У адной з перадач Радыё Свабода гісторык Сяргей Ёрш расказаў, што жыхар вёскі Нябышына падлетак Міша Бычок у час блакады папаў у рукі немцаў, але немцы адразу перадалі яго ў эскадрон Барыса Рагулі. Там да яго ставіліся вельмі добра, ён лічыўся сынам эскадрона. У эскадроне ён прабыў да канца вайны. Магчыма, дзякуючы гэтаму Міша Бычок і застаўся ў жывых. У адрозненне ад партызан Барыс Рагуля ні разу не пасылаў падлетка ў партызанскі тыл, каб дабыць разведдадзеныя, не падвяргаў яго небяспецы.

Была ў Нямеччыне яшчэ адна мая стрыечная сястра, Вера Салянка, дачка дзядзькі Лаўрэна. У час блакады яна адстала ад нашай групы, заблудзілася і трапіла да немцаў.

У 2004 годзе на Вялікдзень я быў у Нябышыне і на некалькі гадзін завітаў да Веры. Яна ўжо зусім старэнькая – 84 гады, дрэнны зрок і амаль не выходзіць на вуліцу. Вера сама завяла гаворку пра Нямеччыну. Яна атрымала кампенсацыю ад нямецкага ўрада і запыталася ў мяне, ці бачыў я «еўра»? Трэба адзначыць, што Вера была прыгожай дзяўчынай, але з нараджэння мела фізічны недахоп, як і яе бацька – яна гарбатая. Працавала Вера ў баўэра хатняй работніцай. Вялікая сям'я гаспадара ставілася да яе з павагай. Яе ні разу не пакрыўдзілі нават словам. Харчавалася яна за адным сталом з гаспадарамі. На святы яны дарылі ёй нейкія падарункі. Часам бралі яе з сабой у тэатр і кіно. У Веры быў свой пакойчык. Спецыяльна для яе наймалі краўчыху, каб пашыць адзенне, якое б рабіла яе горб не надта прыкметным.

У яе не было адчування, што яна знаходзіцца ў няволі. Праўда, быў смутак па дому, па родных мясцінах. Было вялікае жаданне ўбачыцца з бацькамі, братамі, сёстрамі – яна не ведала, які лёс іх напаткаў, як яны перажылі тую блакаду. Ёй хацелася схадзіць у свой лес па ягады і грыбы, выкупацца ў Поні. Яна кажа, што калі б была магчымасць у той час наведацца ў Нябышына да бацькоў, пасля пабыўкі яна б добраахвотна вярнулася ў Нямеччыну да сваіх гаспадароў, можа, не назаўсёды, але вярнулася б.

Тую мясцовасць, дзе была Вера, занялі амерыканцы. Пра амерыканцаў яна ўспамінае з захапленнем. «Усе яны такія пекныя, ветлівыя, далікатныя», – кажа яна. Вера ўпершыню ўбачыла «чорненькіх» салдат. Яе вельмі здзівіла і абрадавала, што сярод амерыканскіх салдат было некалькі беларусаў, было з кім паразмаўляць. Яна некалькі разоў сустракалася з імі. Жонка баўэра ўгаворвала Веру застацца ў іх на нейкі час, пакуль у свеце не стане больш стабільнае становішча. Але Вера рашыла вяртацца дадому. Разам з усімі такімі ж, як і яна. У дзень ад'езду яе праводзіла ўся сям'я баўэра, прыйшлі і яе новыя знаёмыя амерыканскія салдаты. Пры развітанні былі абдымкі, пацалункі, слёзы. «Я ніколечкі не шкадую, што папала ў Нямеччыну. Хоць пабачыла свет, пабачыла, як жывуць людзі ў іншых краінах», – падвяла рысу пад нашай размовай мая стрыечная сястра Вера. «Ну і дзе людзі жылі лепш, там ці ў нас?» – запытаў я. «Не задавай бязглуздых пытанняў», – паставіла мяне Вера на месца.

Але мяне цікавіла яшчэ адно пытанне, і я яго задаў: «Вера, амерыканцы цябе вызвалілі ў красавіку 1945 года, а дадому ты вярнулася толькі на пачатку чэрвеня 1946 года. Чаму ты так доўга дабіралася?» Яна адказала: «Ты ж ведаеш, як гэта рабілася. У амерыканскую зону акупацыі прыбылі прадстаўнікі савецкай адміністрацыі, павіншавалі нас з вызваленнем, з хуткім вяртаннем на Радзіму. Нас размясцілі ў пасажырскіх вагонах. Праваднікі нас сустракалі ветлівымі ўсмешкамі, частавалі гарбатай, было радасна да слёз. Але як толькі мы выехалі з амерыканскай зоны акупацыі і апынуліся ў савецкай зоне, прыветлівасць з твараў праваднікоў знікла. Яны раптам пераўтварыліся ў наглядчыкаў і канваіраў. Нас, як арыштантаў, перагрузілі ў таварныя вагоны-цялятнікі і адвезлі ў фільтрацыйны лагер, дзе цэлы год фільтравалі. Ад Сібіры мяне выратаваў мой фізічны недахоп».

Пасля вяртання дадому Вера ўладкавалася на працу правадніком вагона пасажырскага цягніка. Калі ў яе нарадзіўся сын

Аляксандр (Шура), яна звольнілася з працы і вярнулася ў вёску да сваіх бацькоў, стала працаваць паштальёнам. Сын падрастаў, закончыў школу. Пасля школы пераехаў у Мінск, уладкаваўся на працу, але цяжка захварэў і памёр у 40-гадовым узросце. Пахаваны ён на Паўночных могілках. Калі я прыязджаю ў Нябышына, Вера пытаецца ў мяне, ці быў я на магіле Шуры. Я ёй адказваю, што бываю, магіла дагледжана.

## 22. Радзіёнаўцы

Блакада скончылася раптоўна, як і пачалася. Даты дакладна я не памятаю, але мяркую, што тыя падзеі пачаліся 16–18 мая, а закончыліся 25–27 мая 1943 года. Хата наша згарэла, уся скаціна прапала, маёмасць, якую мы схавалі ў ямах, рабаўнікі знайшлі. У нас нічога не засталося. Але свае агароды і поле мы паспелі засеяць да блакады, была надзея на новы ўраджай. Як і калі адбылося пахаванне аднавяскоўцаў, якія загінулі ў час блакады, у тым ліку і маіх бабулі Насты і дзядзькі Івана, не памятаю. Чамусьці гэта адбылося без майго ўдзелу. Магчыма мае бацькі не ўзялі мяне з сабой на пахаванне, каб не траўмаваць маю псіхіку.

Ужо ў наш час, бываючы ў вёсцы, я спрабаваў высветліць, дзе іх магілы, але ніхто нічога не ведае. Няма магілы і Фані Пашэвіч, якую забіў раз'юшаны партызан. Мая стрыечная сястра Валя Салянка, якая пражывае ў Санкт-Пецярбурзе, у тэлефоннай размове патлумачыла мне, як адшукаць магілу бабулі Насты. Валя старэйшая за мяне на 2 гады і прысутнічала на пахаванні. Па прыкметах я знайшоў тое месца. Але замест магілы я ўбачыў неглыбокую ўпадзіну. Мая мара – аднавіць магілу бабулі Насты.

Часова нашу сям'ю прытуліў у сваёй хаце аднавясковец Цімафей Салянка. Жыццё працягвалася. Аднойчы на ўскрайку лесу я збіраў шчаўе і ўбачыў, што па жыце ідуць немцы. Іх было вельмі многа. Я бачыў толькі іх галовы на ўзроўні калосся. Прыгнуўшыся, я кінуўся ў лес, дабег да балота і там схаваўся. Колькі часу я там прасядзеў, не ведаю. Стала цямнець, а на балоце акрамя мяне больш нікога няма, боязна. Прыйшлося вяртацца ў вёску. Па вуліцы мірна, як ні ў чым не бывала, хадзілі людзі. Мяне апанаваў жах, калі я ўбачыў бацьку, які спакойна размаўляў з немцам! Рабіць было нечага і я накіраваўся ў іх бок. Убачыўшы мяне, бацька сказаў: «Ну вось, і ўцякач вярнуўся», – і яны засмяяліся.

Гэта быў першы прыход радзіёнаўцаў у нашу вёску. Усе яны былі апрануты ў новую нямецкую форму, былі добра ўзброеныя: аўтаматы, куляметы, гарматы, шматствольныя мінамёты, аўтамабілі, палявыя кухні, радыёстанцыі і шмат іншага. Хадзілі чуткі, што на іх галоўнай базе ў Докшыцах ёсць нават танкі, але я іх не бачыў. Нам, дзецям, усё было цікава, і яны, радзіёнаўцы (мы іх называлі яшчэ і народнікамі), давалі нам магчымасць патрымаць у руках зброю. Асабліва падабаліся аўтаматы і пісталеты. Калі гэтыя салдаты хацелі зайсці да каго-небудзь у хату, то пыталіся




*Аўтар кнігі каля роднай вёскі.*

дазволу. Людзі сустракалі іх ветліва, ахвотна ўступалі з імі ў размову. Яны ад нас нічога не патрабавалі – ні адзення, ні харчу, ні самагонкі, як гэта звычайна рабілі партызаны. Хутка мы зразумелі, што радзіёнаўцы для нас – самая надзейная абарона ад усялякіх нечаканасцяў. Мы былі абаронены і ад партызан, і ад паліцыяў, і нават ад немцаў. Радзіёнаўцы некалькі разоў пакідалі нашу вёску і вярталіся зноў. Нават калі мы ведалі, што яны знаходзяцца ў суседняй вёсцы, мы адчувалі сябе спакойна.

Аднойчы мой бацька да нас у хату (мы па-ранейшаму жылі ў Цімафея Салянкі) прывёў радзіёнаўца. Ён прывітаўся з намі і назваўся: «Цімафееў». Я вельмі здзівіўся, палічыўшы яго сынам нашага гаспадара Цімафея. А ён тым часам паставіў на стол бутэльку шнапса. Мама тое-сёе падрыхтавала закусіць. У нас было

вялікае жаданне ўбачыць і паслухаць самога Радзіёнава. Але ён разам са штабам брыгады знаходзіўся ў Докшыцах. Убачыць яго мне так і не ўдалося. Затое Цімафееў каротка расказаў нам захаплялльную гісторыю пра яго. Я перадаю з яго расказу ўсё, што мне ўдалося запомніць.

Сам Цімафееў – былы савецкі лётчык, капітан. Яго самалёт падбілі, і ён трапіў у палон. Зараз Цімафееў – ад'ютант Радзіёнава. Прозвішча самога Радзіёнава насамрэч – Гіль. Ён – былы падпалкоўнік.

Мы ўважліва слухалі Цімафеева.

У баі пад Талачынам Уладзімір Гіль быў кантужаны, страціў прытомнасць. Калі апрытомнеў, вакол была ціш, стралянiны не чуваць. Ён зразумеў, што фронт адсунуўся далёка на ўсход, не дагнаць. Што рабіць у тых абставінах? Нідзе не схаваешся. Адно выйсце – палон. А там будзе бачна. Характар у Гіля быў рызыковы, авантурны. Яму вельмі хацелася папаліць, але папяросаў не было. На полі нядаўняга бою ляжала шмат загінуўшых чырвонаармейцаў. Уладзімір Гіль звярнуў увагу на труп афіцэра. Ён быў раздзеты па пояс, гімнасцёрка ляжала побач. Праверыў кішэні забітага, але папяросаў там не было. Зірнуў у яго пасведчанне, гэта быў палкоўнік Радзіёнаў. Гіль прыняў рашэнне: калі ісці ў палон, дык лепш палкоўнікам Радзіёнавым, чым падпалкоўнікам Гілем, і пайшоў да лясной дарогі, па якой рухалася вялікая калона ваеннапалонных чырвонаармейцаў. Пякло сонца. Канваіраў было няшмат, але палонныя разбягацца не збіраліся. На павароце дарогі Гіль непрыкметна прыстроіўся да калоны. Праз некалькі дзён прыбылі на станцыю Сувалкі, дзе немцы арганізавалі фільтрацыйны лагер.

Камендант лагера выйшаў перад строем палонных і падаў каманду: «Камуністы, палітработнікі і камандзіры – выйсці са строю на 5 крокаў!» Над строем павісла цішыня. Усе даўно павыкідвалі свае пасведчанні і пазрывалі з каўняроў знакі адрознення. Ніхто не варухнуўся. І толькі падпалкоўнік Уладзімір Гіль выйшаў са строю цвёрдым крокам і прадставіўся каменданту: «Палкоўнік Радзіёнаў», – і падаў яму свой пісталет. Камендант аж аслупянеў ад нечаканасці і пабялеў (пісталет быў з патронамі), але хутка ўзяў сябе ў рукі і сказаў: «Гут, гут», – і нават паціснуў яму руку. Ён пранікся да Радзіёнава даверам і на наступны дзень вярнуў яму пісталет і прызначыў яго сваім намеснікам. А гэта ўжо зусім іншы

статус: улада, абавязкі, адказнасць і, часткова, свабода. Усім гэтым трэба карыстацца разумна.

Уладзімір хадзіў па тэрыторыі лагера і не аднойчы чуў у спіну: «Здраднік, нямецкі халуй». Яго гэта не бянтэжыла, а, наадварот, павышала настрой. Ён падабраў сабе надзейных памочнікаў, была створана картатэка, сабраны звесткі на кожнага палоннага. У галаве Гіля-Радзіёнава зарадзілася думка, якая перарасла ва ўпэўненасць: шлях на Радзіму можна пракласці толькі са зброяй у руках. Атрымаць яе ва ўмовах палону было магчыма толькі з рук немцаў. У пісьмовай форме Гіль звярнуўся да каменданта з прапановай стварыць з палонных рускі полк. Камендант пагадзіўся. Паслалі запыт у Берлін. Адтуль далі згоду на стварэнне не толькі палка, але і брыгады.

Гіль-Радыёнаў штабіст вопытны, таму ён у першую чаргу сфарміраваў штаб брыгады. Потым пачалася крапатлівая праца па камплектаванні часцей і падраздзяленняў. Гіль-Радзіёнаў гэту справу рабіў вельмі старанна. Тых палонных, якія былі гатовы заўзята служыць фашыстам, ён у склад брыгады не залічваў, а адпраўляў на працу ў Нямеччыну. Былі выпадкі, калі самых небяспечных пускалі ў расход. Урэшце фарміраванне закончылася. Колькасць асабовага складу брыгады па штату складала: баявыя падраздзяленні – 2500 чалавек, тылавыя – 300 чалавек. Потым пачалася цяжкая баявая падрыхтоўка, зладжванне падраздзяленняў і часцей. Адбыліся залiковыя тактычныя вучэнні, якія прайшлі паспяхова. Спачатку немцы трымалі брыгаду на другарадных ролях: ахова чыгункі, станцый, мастоў, складоў і іншае. Узбраенне было адпаведным. Калі ў немцаў не стала хапаць сіл, каб трымаць пад кантролем акупаваную тэрыторыю, яны звярнулі ўвагу на брыгаду Гіль-Радзіёнава. Яе пераапранулі ў новую форму, забяспечылі ўсім неабходным, узброілі аўтаматамі і кулямётамі, узмацнілі мінамётнай і гарматнай батарэямі, танкавай ротай, забяспечылі аутамабілямі і для перавозкі асабовага складу і коннай цягай. Пасля гэтага брыгадзе была пастаўлена задача на правядзенне баявых аперацый супраць партызан. Але што гэта былі за аперацыі, якія іх былі вынікі, ці закранулі яны мірнае насельніцтва, у якіх абласцях і раёнах Беларусі яны адбыліся, капітан Цімафееў нічога не сказаў.

Крыху памаўчаўшы, ён працягнуў свой расказ: «Мы добра ўзброены, мы – моцная баявая адзінка. Гэта разумеюць як партызаны, так і немцы. Пра Радзіёнава ведае Берлін. Гітлер яго

ўзнагародзіў двума жалезнымі крыжамі. Гэта вышэйшая нямецкая ўзнагарода». Але Цімафееў зноў прамаўчаў, за якія подзвігі Гіль-Радзіёнаў быў узнагароджаны. Толькі дадаў, што пра яго ведае і Масква, Сталін яго ўзнагародзіў ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга і прысвоіў яму званне палкоўніка. Так падпалкоўнік Гіль ураўняўся ў чыне з загінуўшым палкоўнікам Радзіёнавым. Я ў той час гэтаму не здзівіўся. Я не ведаў, хто такія Сталін, Гітлер, Ленін, у нашай сям'і пра іх ніколі нічога не ўзгадвалася. Толькі пра Варашылава і Будзённага я ведаў ад сваіх старэйшых братоў па гульням у вайну. Зараз, калі я пішу гэтыя нататкі, у мяне ўзнікае пытанне: за якія заслугі Гіль-Радзіёнаў атрымаў высокую ўзнагароду ад Сталіна? У мяне няма магчымасці знайсці адказ на гэтае пытанне.

Калі ж расказ капітана Цімафеева падышоў да канца, ён з нейкім смуткам сказаў: «Мы не ведаем, што нас чакае наперадзе. Не выключана, што пасля пра нас будуць складаць міты, будзе шмат хлусні. Мы такія як ёсць, так склаўся наш лёс. Можа, гэтыя хлапчукі (ён кіўнуў у бок мяне і майго брата Андрэя) выжывуць у гэтай вайне і калі-небудзь раскажуць пра нас». Я раблю гэта праз 62 гады, якія мінулі з таго часу. Я разумею, што капітан Цімафееў расказаў нам не ўсё. Магчыма, з яго расказу я штосьці ўпусціў. Але ўсё, што я прыпомніў, занатаваў праўдзіва, ад сябе я нічога не дадаў.

У сярэдзіне жніўня 1943 года брыгада Гіль-Радзіёнава перайшла на бок партызан. Як і чаму гэта адбылося, што гэтаму папярэднічала, я не ведаю. Радзіёнаўцы назаўсёды пакінулі нашу вёску. Без іх мы зноў сталі безабароннымі. Мы зноў апынуліся між молатам і кувалдай – між партызанамі і немцамі. Заставацца ў нашай вёсцы стала небяспечна. Мы не сталі чакаць, калі нас пасцігне лёс Шуняўкі ці Вітуніч, і перабраліся на правы бок Поні ў лясную вёску Забор'е, якая знаходзіцца ў 5–6 кіламетрах ад Нябышына. Нам здавалася, што там будзе жыць спакойней, бяспечней. У Забор'і былі расквартараваны партызаны. Я спадзяваўся убачыць тут і радзіёнаўцаў, але дарэмна. Я спрабаваў што-небудзь высветліць пра іх у тутэйшых партызан, але яны адмахнуліся ад мяне, як адназойлівай мухі.

Калі закончылася вайна, у вёску вярнуўся прымак Фёдар (я пра яго ўзгадваў). Ён на пачатку 1943 года пайшоў у партызаны, а пасля вызвалення апынуўся ў Чырвонай Арміі. І вось у канцы ліпеня ці пачатку жніўня 1945 года ён вярнуўся ў Нябышына. Я адразу пабег да яго. Мы не бачыліся два з паловай гады. Фёдар абрадаваўся

сустрэчы, а я тым больш. Мне ўжо споўнілася 11 гадоў, я лічыў сябе дарослым. Нездарма ж кажуць, што адзін год вайны залічваецца за тры. Галоўнае пытанне, якое я яму збіраўся задаць – што ён ведае пра далейшы лёс народнікаў-радзіёнаўцаў пасля пераходу іх на бок партызан? Далей распавядаю са слоў Фёдара.

Калі была дасягнута дамоўленасць аб пераходзе радзіёнаўцаў на бок партызан, прызначаны дзень, час і месца сустрэчы, партызанскае кіраўніцтва высунула ўмовы – расфарміраваць брыгаду, а асабовы склад размеркаваць па розных партызанскіх атрадах. Палкоўнік Гіль-Радзіёнаў рашуча адхіліў гэтыя прапановы як непрымальныя і высунуў свае: брыгаду як баявую адзінку захаваць у тым жа складзе; даць гарантыі бяспекі кожнаму салдату і афіцэру брыгады; вызначыць раён дыслакацыі брыгады. Але якія гарантыі мог даць камандзір партызанскага атрада? «Пакуль вы будзеце прымаць рашэнне, – сказаў Гіль-Радзіёнаў, – мне трэба вярнуцца ў Докшыцы, пакуль дзейнічае сённяшні пароль, забраць штабную дакументацыю і развітацца з начальнікам нямецкага гарнізона». На самай справе ён рашыў разграміць нямецкія гарнізоны ў Докшыцах і ў Круляўшчызне. Свой пераход на бок партызан ён увянчаў бліскучай перамогай над немцамі.

Пакуль Гіль-Радзіёнаў граміў нямецкія гарнізоны, Берыя аддаў загад Цанаве радзіёнаўцаў абяззброіць і пусціць у расход – расстраляць. Месцам для правядзення злачыннай акцыі была выбрана лясная паляна побач з Бягомльскім партызанскім аэрадромам. Фёдар сказаў, што там ужо рылі катлаваны для масавых пахаванняў. Толькі і па сёння незразумела, як збіраліся апрычнікі Берыі абяззброіць узброеную да зубоў, добра абучаную, зладжаную баявую адзінку, якая налічвала 2800 чалавек.

Ціткоў, камандзір партызанскай брыгады «Жалязняк», якая дзейнічала ў Бягомльскім раёне, меў сустрэчы з Гіль-Радзіёнавым і такога павароту падзей не чакаў. Ён тэрмінова адправіў радыёграму Панамарэнку, які ў сваю чаргу падрыхтаваў данясенне Сталіну і запрасіўся на прыём к гаспадару Крамля. На тым данясенні Сталін уласнаручна напісаў рэзалюцыю: Гіль-Радзіёнаву прысвоіць званне Героя Савецкага Саюза, увесь асабовы склад брыгады ўзнагародзіць баявымі ордэнамі, брыгаду захаваць у тым жа складзе, як самастойную баявую адзінку. Берыя і Цанава часова адступілі.

Брыгада паспяхова пачала змагацца супраць немцаў. Яе не аднойчы кідалі на самыя небяспечныя ўчасткі. Калі Чырво-

ная Армія стала набліжацца да межаў Беларусі, брыгаду Гіль-Радзіёнава перакінулі ў раён возера Палік у 30 кіламетрах на поўнач ад горада Барысава. Там брыгада ўвязла ў цяжкія працяглыя баі. Трагедыя заключалася ў тым, што на гэтым участку фронту Чырвоная Армія спыніла сваё наступленне і стала рыхтавацца да аперацыі «Баграціён». Гэта дало магчымасць немцам зняць з фронту некалькі дывізій і кінуць іх супраць Радзіёнава. Немцы добра ведалі, з кім маюць справу, некаторыя іх камдзівы ведалі яго асабіста, сустракаліся на розных нарадах. Супраць брыгады дзейнічала нямецкая авіяцыя. Радзіёнаву чакаць дапамогі было неадкуль. Камандаванне Чырвонай Арміі і партызанскага руху раўнадушна назіралі, як гіне брыгада. «Тое, што Берыі і Цанаве не ўдалося зрабіць уласнымі рукамі, было зроблена рукамі немцаў. Брыгада нанесла немцам вялікі ўрон, але і сама панесла незлічоныя страты. У адным з баёў, каб ім было зручней кіраваць, Радзіёнаў высунуў свой назіральны пункт (НП) на лёд возера. Ад разрыву снарада лёд праламаўся. Па словах Фёдара, цяжка паранены камбрыг пайшоў пад лёд. Гэта адбылося ў сакавіку 1944 года.

Пасля гібелі свайго камандзіра радзіёнаўцы працягвалі змагацца. Ніхто ў палон не здаўся. Колькі дзён, тыдняў працягвалася гэта крывавае пабоішча, Фёдар не сказаў. Калі, нарэшце, прыйшла дапамога, у жывых заставалася каля 800 чалавек, загінула больш за 2000. Усіх, хто застаўся ў жывых, абяззброілі і пад канвоем адправілі на Калыму. Што яны адчувалі, можна толькі гадаць.

Такім быў трагічны лёс радзіёнаўцаў і іх мужнага камандзіра палкоўніка Уладзіміра Гіля са слоў капітана Цімафеева і прымака Фёдара. Ці ёсць у свеце такая асоба, якая мае дзве вышэйшыя ўзнагароды ад Гітлера і дзве вышэйшыя ўзнагароды і званне Героя Савецкага Саюза ад Сталіна? Я такой асобы не ведаю.

І апошняе. Магчыма, Уладзімір Гіль наш зямляк, беларус? Гіль – прозвішча беларускае.

Калі гэта кніжка выйшла з друку, да мяне звярталіся чытачы і расказвалі мне аб тым, што Уладзімір Гіль быў не зусім такім, якім яго намаляваў я, што ён прымаў удзел у карных аперацыях і праяўляў жорсткасць да мірнага насельніцтва. Але я не стану дапаўняць свае ўспаміны новымі звесткамі, інакш гэта будуць ужо не мае ўспаміны. Я пішу толькі аб тым, што бачыў на свае вочы

і пра што пачуў у той час. Аб тым, што засталося па-за межамі «Успамінаў», я паспрабую расказаць у сваіх «разважаннях».

## 23. У нашу сям'ю прыйшла бяда

Як я ўжо сказаў, пасля пераходу радзіёнаўцаў на бок партызан мы перабраліся ў вёску Забар'е. Там нас прытулілі добрыя людзі, яны пачалі называць нас бежанцамі.

Гэта была восень 1943 года. У Забар'і размяшчалася рота аўтаматчыкаў (так яны называлі сябе самі) 3-га партызанскага атрада брыгады «Жалязняк». Асноўная частка атрада разам з камандаваннем размяшчалася ў вёсцы Будзілаўка. Там служыў і мой старэйшы брат Мікалай. Рота аўтаматчыкаў складалася з добра абучаных байцоў Чырвонай Арміі. Хутчэй за ўсё ўсе яны былі рускія, так выглядалі. Праўда, сярод іх быў адзін смуглы баец.

У Забар'і партызаны паводзілі сябе добра. Мы з імі суіснавалі побач, як кажуць, жылі адной сям'ёй. У хаце, дзе пражывалі мы, разам з намі было і трое партызан. 1–2 разы на тыдзень партызаны хадзілі на заданне. Вёску яны пакідалі, калі змяркалася. Назад вярталіся на досвітку і прыводзілі 2–3 каровы. Пасля вяртання снедалі, потым адпачывалі. Ежу рыхтавалі ў іншай хаце адразу на ўсю роту. Міска супу з іх стала даставалася і мне. Ён быў вельмі смачны, з аўсяных круп, і костачка, на якой было шмат мяса.

Некалькі разоў у часы адпачынку партызаны збіраліся ў хаце, у якой пражывалі мы. Яны прыносілі з сабой мяса, бульбу і прасілі маму, каб яна ўсё гэта пасмажыла. Потым ссоўвалі разам два сталы, мама ставіла на іх патэльню са смажанінай; партызаны садзіліся на лавы, даставалі з кішэняў бутэльку з самагонкай і пачынаўся баль. Самагонку разлівалі ў конаўкі, стаканаў не было, і пілі па чарзе. Потым яны пачыналі спяваць. Песні былі сумныя, жаласлівыя. У мамы цяклі слёзы. Я імкнуўся запомніць словы песень. Песні былі вельмі доўгія. І хоць у мяне адсутнічае музычны слых, я іх спяваў, калі заставаўся ў хаце адзін.

Аднойчы, ужо пасля вайны адну з тых песень я праспяваў на ўроку спеваў, калі навучаўся у 4-м класе. Каб выставіць адзнакі за чвэрць, настаўнік выклікаў кожнага вучня праспяваць. Дайшла чарга і да мяне. Я сказаў, што буду спяваць «Кацюшу». Але настаўнік не ведаў, што гэта зусім іншая «Кацюша». Каб чыта-

чы ведалі, якія песні мы спявалі пасля вайны, прывяду некалькі куплетаў:

**Новая Катюша**

*Расцветали яблони и груши,*
*Сад цветёт, белеет как в снегу.*
*Ну-ка выйди, милая Катюша,*
*У Днепра постой на берегу.*
*Спой мне песню «Новую Катюшу»*
*И припомни старую свою.*
*За тебя сражался, был контужен*
*Я под Берлином в яростном бою.*
*Я окреп в московском лазарете*
*И опять я в бой идти готов,*
*Драться там за Родину Советов*
*И громить проклятых немчуров.*
*Я узнал, и больно было слушать,*
*Что любовь мою не сберегла.*
*От кого ты, подлая Катюша,*
*От кого ты дочку родила?*

Калі настаўнік пачуў апошнія два радкі «Кацюшы», ён вельмі моцна крыкнуў: «Хопіць!!!» – і так ляснуў указкай па сталу, што яна разляцелася на кавалачкі. Я так напалохаўся, што ўсе куплеты песні, якія я не паспеў праспяваць, вылецелі з галавы. Я іх не памятаю.

Але зноў вернемся ў Забар'е. Калі ў партызан мяса заканчвалася, яны зноў ішлі на заданне. Наколькі мне вядома, за ўвесь час, што мы былі ў Забар'і, партызаны асобых страт не панеслі. І толькі аднойчы, калі яны вярнуліся з задання, мы ўбачылі, што сярод іх няма нацмена. Партызаны сказалі, што ён загінуў. Як гэта адбылося і дзе яго пахавалі, яны нам нічога не сказалі.

Праўда, быў яшчэ адзін выпадак, пра які раней я не ўпамінаў. У роту прыслалі нейкую цывільную асобу. Гэты грамадзянін неяк не ўпісваўся ў партызанскае асяроддзе. Ён адзіны быў апрануты не па форме. На ім было чорнае паліто, кепка (гэта зімой), хромавыя боты. Аўтамата ў яго не было. Часам і ён хадзіў на заданне. Было зразумела, што ён чужак сярод партызан. Я ні разу не бачыў, каб ён з кім-небудзь размаўляў. Сяброў у яго не было . Дык вось, аднойчы і ён з задання не вярнуўся. Партызаны гэта ніяк не патлумачылі. Хадзілі чуткі, што яны самі і забілі яго стрэлам у патыліцу.

У сакавіку 1944 года я і мой родны брат Андрэй, які быў старэйшы за мяне на 5 гадоў, адначасова захварэлі тыфам. Наш бацька паспрабаваў звярнуцца па медыцынскую дапамогу да партызан. Ён добра ведаў партызанскага лекара Сырнікава, які да вайны працаваў у Бягомлі. Але партызанскае кіраўніцтва ў дапамозе адмовіла. Я і Андрэй удвух ляжалі на адным ложку без лекаў, без медыцынскай дапамогі. Цікава, што акрамя нас двух у хаце пражывала яшчэ чацьвёра дарослых, 3-гадовая дзяўчынка і плюс трое партызан, але больш ніхто не захварэў. Праўда, партызаны з нашай хаты ў момант перабраліся ў іншае месца. Зараз я нават здзіўляюся, як мы выкарабкаліся з той хваробы.



*Дзеці вайны. Леанід Шульгат, сын старасты вёскі часоў акупацыі, сябра Іллі Копыла.*

Я і Андрэй па-ранейшаму хварэлі, калі да нас у Забар'е верхам на конях прыехалі некалькі партызан. Яны паведамілі, што трагічна загінуў мой самы старэйшы брат Мікалай. Як яны расказалі, Мікалай быў у начным патрулі, а днём у хаце адпачываў. У гэты самы час другі партызан паставіў на падлогу кулямёт для праверкі, па неасцярожнасці націснуў на спускавы кручок і кулямётнай чаргой цяжка параніў соннага Мікалая. Брату ампутавалі нагу па пах. Ён памёр на аперацыйным стале, магчыма, ад страты крыві, магчыма, ад балявога шоку – аперацыю рабілі без абязбольвання. Перад смерцю ён папрасіў, каб не каралі віноўніка гэтага трагічнага здарэння.

Цела Мікалая партызаны чамусьці не прывезлі. За ім паехалі дзве маіх стрыечных сястры: Аня, якая зараз жыве ў Мінску, і Марыля, якая жыла ў Малдове, але ў 2011 годзе памёрла. Бацька не паехаў сам, таму што трэба было зрабіць труну і выкапаць магілу, а ў час вайны гэта было зрабіць вельмі складана. Прывезлі цела Мікалая ў суправаджэнні партызан. Памятаю, як яны занеслі цела ў хату і паклалі на падрыхтаваную лаву. Бацька запытаў: «А дзе ампутаваная нага?» Партызаны збянтэжыліся, але паабяцялі прывезці яе. Слова сваё яны стрымалі. Праз нейкі

час к дому прыскакалі два вершнікі, паклалі на ганак пакунак з нагой і ўскакалі. Калі абмывалі цела, з яго выпадалі кулі. Труну з нябожчыкам паставілі ў тым жа пакоі, у якім стаяў ложак, дзе ляжалі хворыя я і мой брат Андрэй, толькі ў супрацьлеглай сцяны.

Мы былі так знясілены хваробай, што не маглі самастойна стаяць на нагах. Нас, падрымліваючы пад рукі, па чарзе падвялі да труны для развітання. Не ведаю, што адчуваў Андрэй (яго ўжо няма ў жывых, трагічна загінуў у 1984 годзе), што ж тычыцца мяне, то ў маім сэрцы, на маёй душы было пуста. Я быў не ў стане ўсвядоміць трагічнасць моманту, таго, што я больш ніколі не ўбачу свайго брата. У мяне нават не навярнуліся на вачах слёзы. Я быў так дакананы хваробай, так ёй прыгнечаны, што мне хацелася аднаго – хутчэй вярнуцца ў свой ложак. Толькі мама горка плакала. У хату сабралася шмат знаёмых і незнаёмых людзей. Пахаванне адбылося ціха, на змярканні, каб пазбегнуць абстрэлу. Пахавалі Мікалая ў Вітунічах побач з тым месцам, дзе яшчэ нядаўна стаяла царква, якую спалілі партызаны ў лістападзе 1942 года. Царква праіснавана нядоўга, была адчынена пры немцах у ліпені 1941 года, а да той пары служыла калгасным зернасховішчам.

Калі я ўжо быў афіцэрам і прыязджаў на адпачынак у сваю вёску Нябышына, абавязкова наведваўся ў Вітунічы на магілу брата. Аднойчы я прыйшоў туды, але магілы брата не адшукаў. Зніклі ўсе магілы (там было некалькі пахаванняў). Я ўбачыў толькі роўнае месца. Мама мне патлумачыла, што перад нейкай чарговай гадавінай Перамогі ўсе магілы ўскрылі і парэшткі загінуўшых перазахавалі ў агульную магілу, на якой паставілі помнік. Калі быць дакладным – мама сказала, што на новай магіле паставілі бетонны слуп. Я бачыў той помнік, на ім напісана некалькі прозвішчаў, але прозвішча Мікалая Копыла там не значылася.

Калі мама памерла, я доўгі час не наведваўся ў сваю вёску, бо служыў вельмі далёка, у Кіраўскай вобласці. Пасля звальнення з арміі я вярнуўся на сваю Радзіму ў Беларусь і праз некаторы час узяўся за справу, каб вярнуць імя брата на помнік, які ўсталяваны на брацкай магіле ў Вітунічах. У савецкі час усе пытанні вырашала КПСС. Таму я адаслаў свой ліст у Докшыцкі райкам КПБ. Атрымаўшы адмоўны адказ, накіраваў другі ліст. Я ўказаў канкрэтна, у якім партызанскім атрадзе знаходзіўся мой брат. Мая дзіцячая памяць спрацавала, што і дапамагло ў пошуках. На гэты раз у архіве знайшліся звесткі пра майго брата-партызана. На

помніку з'явілася імя Мікалая: «Копыл Н.Ф.». Цяпер у мяне ёсць месца, куды пакласці кветкі.

(Перапіска дадаецца)

Секретарю Докшицкого райкама КПБ.
от Копыла Ильи Филипповича, чл. КПСС с 1961 г.,
проживающего по адресу:
г. Минск, ул. Л. Беды 19–36

Заявление

Мой родной брат Копыл Николай Филиппович во время Великой Отечественной войны был партизаном. Погиб весной 1944 года. Похоронен в дер. Витуничи, где было несколько партизанских могил. В конце 60-х годов могилы были вскрыты и все останки перезахоронены в братскую могилу, но фамилии моего брата на памятнике не значится.

Прошу Вас оказать содействие в восстановлении фамилии и имени моего брата на памятнике, установленном на братской могиле в дер. Витуничи.

С уважением, Копыл.
18.12.1984 г.

Гр-ну Копылу Илье Филипповичу
г. Минск, ул. Л. Беды, д. 19, кв. 36.

Докшицкий райкам КП Белоруссии сообщает, что в списках партизанской бригады «Железняк», имеющихся в Бегомльском музее народной славы, и именном списке захороненных воинов и партизан, погибших в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг., в братской могиле, находящейся в деревне Витуничи Березковского сельского Совета, Копыл Н.Ф. не числится. При установлении факта участия Копыла Н.Ф. в партизанском движении надпись на братской могиле будет дополнена. По этому вопросу сделан запрос в партархив ЦК КПБ.

Секретарь Докшицкого райкама КПБ Н. Устин

Исх. № 11п
13 января 1985 года.
Отп. 3 экз.
Экз. № 1 – адресату. Экз. № 2 – в дело

Секретарю Докшицкого райкама партии

Здравствуйте, уважаемый товарищ Устин.

На Ваш ответ на моё заявление от 18.12.84 г. дополнительно сообщаю следующее: Мой брат Копыл Николай Филиппович нахо-

дился в 3-м отряде партизанской бригады «Железняк». Может эти сведения помогут найти следы моего брата в архивах.

С уважением, Копыл
16.01.85 г.

Гр-ну Копылу И.Ф. – 220040, г. Минск,
ул. Л. Беды, д. 19, кВ. 36

Докшицкий райкам КП Белоруссии сообщает, что действительно по учетным данным партархива Копыл Николай Филиппович с мая 1943 года по 23 мая 1944 года числится рядовым партизаном 3-го отряда бригады «Железняк». В марте т.г. именной список захороненных воинов и партизан, погибших в годы Великой Отечественной войны, на братской могиле в деревне Витуничи Березковского сельсовета дополнен фамилией Копыл Н.Ф.

Секретарь Докшицкого райкама КПБ Н. Устин

Отп. 2 экз. Экз. 1 – адресату. Экз. № 2 – в дело.
Исх. № 11
27 марта 1985 года

## 24. Зноў блакада

Чырвоная Армія наступала вельмі марудна. Толькі на пачатку 1944 года да нас дайшлі чуткі, што яна ўступіла на тэрыторыю Беларусі.

Я і мой брат Андрэй пайшлі на папраўку, хвароба адступала сама па сабе. Я ўжо самастойна выходзіў на вуліцу, садзіўся на прызбу і грэўся на сонцы. Але і ў Забар’і стала жыць неспакойна. Немцы пачалі дзейнічаць больш актыўна, каб засцерагчы ад партызан свае тылы ў прыфрантавой паласе, бамбілі навакольныя лясы. Дзякуй Богу, вёску яны не чапалі. Калі і прылятаў над вёскай самалёт, то не вельмі часта.

Аднойчы я сядзеў на прызбе сваёй хаты, калі над вёскай з’явіўся нямецкі самалёт. Ён ляцеў не надта высока, таму што неба было хмарнае. Зрабіўшы над вёскай круг, на другім заходзе ён скінуў бомбу. Я бачыў, яку яна падала, не вертыкальна ўніз, а пад нахілам у напрамку палёта самалёта. Бомба ўдарыла ў прасценак паміж вокнаў суседняй хаты і ўпала побач на зямлю. Выбух не адбыўся. Партызаны тую бомбу адвезлі кудысьці за вёску. Гаспадарамі па-

цярпелай, і ў той жа час шчаслівай (бомба не выбухнула), хаты былі Фаміны. Яны прытулілі ў сябе сям'ю Сідара Маскалейчыка з нашай вёскі Нябышына, неразлучнага сябра майго бацькі. З яго сынам Мішам сябраваў і я, але хадзіць да Фаміных баяўся. У іх хаце быў на пастоі нейкі партызанскі чын, па прозвішчы Аксючыц. Ён меў вельмі непрыемны выгляд, заўсёды быў п'яны, да ўсіх чапляўся, пагражаў пісталетам. Усе насельнікі хаты жылі ў страху і небяспецы. Асабліва пакутавалі дачка Фаміных і старэйшая дачка дзядзькі Сідара. Таму не я да Мішы, а Міша да мяне прыходзіў гуляць. Калі я захварэў, Мішу да мяне перасталі пускаць, каб не заразіўся тыфам. Зараз мне падумалася, што калі б тая бомба выбухнула, маглі б загінуць адразу дзве сям'і і ў тым ліку мой сябра Міша.

Мае бацькі некалькі разоў таемнымі сцежкамі хадзілі ў Нябышына, каб пасадзіць агарод. Мяне і Андрэя яны адводзілі ў лес за Забар'е і там астаўлялі на ўвесь дзень. Вярталіся яны позна вечарам і забіралі нас. Нашы бацькі маглі не вярнуцца назад, маглі апынуцца ў руках немцаў ці паліцаяў, маглі загінуць. Я з жахам думаю, што было б тады з намі – са мной і Андрэем. Аднойчы той лес, у якім нас пакінулі бацькі, сталі бамбіць нямецкія самалёты. Мы схаваліся ў яму, якая на шчасце была побач. Калі бамбёжка скончылася, мы не здолелі выбрацца з той ямы, не хапіла моцы. Сцямнела. З ямы мы бачылі кавалак неба, на якім ужо ззялі зоркі. Нарэшце з'явіўся бацька і выцягнуў нас. У вёсцы было бяспечней, але бацькі нас адводзілі ў лес на выпадак, калі раптам у іх адсутнасць вёску Забар'е займуць немцы.

Сталі распаўсюджвацца слухі, што немцы рыхтуюць чарговую блакаду. Аднойчы мы заўважылі, што з вёскі Забар'е зніклі апошнія партызаны. Мясцовыя жыхары адчулі палёгку, а мы, бежанцы, наадварот, адчулі небяспеку: раз партызаны ўцяклі, то гэта прамы сігнал, што вельмі хутка тут будуць немцы. Як звычайна, партызаны нас пра небяспеку не папярэдзілі. Мой бацька вырашыў перажыць чарговую блакаду ў лесе і на балоце. Мясцовыя ж жыхары не прыдалі значэння небяспецы, засталіся ў вёсцы, угаворвалі і нас застацца. Але ў нас ужо быў вопыт: у першую блакаду ўсе, хто пакінуў вёску, засталіся ў жывых, а хто застаўся ў ей – загінулі.

У адзін з дзён мы пакінулі Забар'е, а на наступны дзень прыйшлі немцы. Не знайшоўшы ў вёсцы партызан, яны пайшлі

далей, вяскоўцаў не чапалі, ніхто не пацярпеў, і вёску не спалілі. А мы забраліся ў глыб балота, спадзеючыся, што там нас ніхто не знойдзе. Усяго ў нашай групе было 15–20 чалавек. Магчыма, на трэці дзень нашага блукання мы сядзелі на балотных купінах, адпачывалі, як раптам убачылі немцаў. Мужчыны і старэйшыя падлеткі непрыкметна кінуліся ў непралазны хмызняк. Немцы гэтага не заўважылі. Жанчыны і дзеці засталіся на месцы. Мы сядзелі ціха без мітусні, чакалі, што будзе. Немцы рухаліся ў калонах па аднаму, між калонамі была шарэнга. Колькі было тых калон – не злічыць. Калі немцы дайшлі да нас, то прыпыніліся. Яны паводзілі сябе спакойна. Цераз перакладчыка афіцэр запытаўся ў жанчын, дзе зараз іх мужы? Усе дружна адказалі, што мужчыны на вайне. Потым ён паказаў на майго брата Андрэя і запытаўся, колькі яму гадоў. Мама адказала, што яму споўнілася 11. Насамрэч яму было 15 гадоў, але пасля хваробы ён меў выгляд, варты жалю. Як выглядаў я – не ведаю, не было люстэрка, каб паглядзецца. Потым перакладчык сказаў, каб мы вярталіся ў сваю вёску, ніхто там нас не кране, там больш бяспечна, там няма стральбы. Перакладчык быў у чырвонаармейскай форме без пагон.

Разам з немцамі ў калоне быў каржакаваты мужчына, апрануты па-вясковаму. На яго спіне была вялікая скрынка. У наш бок ён прамовіў: «Усыпаць бы вам па спіне бізуном». «За што?» – не ўстрымалася цётка Анэта. «А каб не ўцякалі, не блыталіся па лясах і балотах», – адказаў ён на нашай беларускай мове. Немцы пайшлі далей, а мы засталіся сядзець на балотных купінах. Нас неяк раптам пакінуў страх, я ў сваім целе адчуў расслабленасць і спакой. Не надта далёка страляў нямецкі 6-ствольны мінамёт. Мы яго называлі «шараваркай» за своеасаблівы працяглы гук выстрала. Калі вярнуліся мой бацька, дзядзька Сідар і ўсе астатнія, мы, паверыўшы немцам, вярнуліся ў Забар'е. Нас сустрэла гаспадыня хаты. У вёсцы панаваў спакой. Больш мы ўжо не бачылі ні немцаў, ні партызан, не чуваць было стральбы, перасталі лётаць самалёты.

## 25. Вызваленне

Дакладна не магу сказаць, колькі часу мы жылі вольна – без немцаў і без партызан – можа, тыдзень, можа, два, а можа, і больш. Я ўжо поўнасцю ачуняў ад хваробы і выходзіў гуляць на

вуліцу. Часта я бегаў к маяку, які знаходзіўся ў лесе з паўкіламетра ад Забар'я. Зараз я назваў бы яго геадэзічным пунктам. У вышыню ён дасягаў 20–25 метраў. Упершыню я ўбачыў яго яшчэ зімой, а потым адшукаў яго. Маяк знаходзіўся на ўзгорку. Ён стаяў на 4 апорах, к верху звужаўся, меў выгляд піраміды і меў некалькі пляцовак на рознай вышыні. Між сабой яны былі злучаны лесвіцамі. Я ўзлазіў на самую верхнюю пляцоўку і захапляўся цудоўным краявідам. Я часова забываўся пра тое, што ідзе вайна, дзесці гараць вёскі, гінуць людзі, ды і мне самому пагражае небяспека. Пра тое, што я бегаю к маяку і залажу на яго, я нікому не хваліўся – ні сябрам, ні старэйшаму брату Андрэю, ні бацькам. Інакш маю свабоду бацькі маглі абмежаваць. Гэта была мая тайна.

У адзін ясны цёплы дзень у вёску Забар'е ўвайшла часць Чырвонай Арміі. Было шмат салдатаў, аўтамабілі-«студэбекеры», гарматы, кацюшы і некалькі танкаў. Дзякуй Богу, вёску не абстрэльвалі, вызваліцелі ўвайшлі ціха і мірна. За ўвесь час акупацыі ў Забар'і не згарэў ніводзін дом. Жыхары вёскі сустракалі Чырвоную Армію стрымана. Я не бачыў, каб людзі кідаліся да вызваліцеляў у абдымкі з пацалункамі, каб кідалі на браню букеты палявых кветак, каб выходзілі насустрач з чыгунком гарачай бульбы ці збанком малака. Ды і не было з чым сустракаць. Партызаны выграблі ўсё да апошняга кураняці, да апошняга зерня.

Людзі моўчкі глядзелі на ваенную калону цераз платы сваіх двароў. Калона прайшла праз вёску Забар'е і спынілася перад вёскай Туменцы, да якой было ўсяго з паўкіламетра. Мне вельмі хацелася паглядзець на кацюшы зблізку, і я пабег туды. У лічаныя хвіліны ля ваеннай тэхнікі сабраліся падлеткі дзвюх суседніх вёсак. Нам пашанцавала. З адной устаноўкі салдаты знялі брызентавы чахол і сталі рыхтавацца зрабіць залп у бок Вітуніч і Нябышына. Потым камандзіры параіліся паміж сабой і залп адмянілі. Устаноўку зачахлілі, і калона рушыла далей.

Вось такім я запомніў дзень нашага вызвалення.

Магчыма дзесьці было інакш, больш урачыста. Такое магло быць там, дзе акупацыя не была такой працяглай, як у нас, дзе людзі не іспыталі, што азначае быць адначасова і пад немцамі, і пад партызанамі, не былі такімі замардаванымі, як мы.

Людзі, якія не бачылі вайны, судзяць аб ёй па мастацкім фільмам, якіх багата створана пасля вайны і ствараецца ў наш час.

Чым далей час аддаляе нас ад той вайны, тым больш з'яўляецца мітаў і няпраўды аб ёй.

## 26. Вяртанне дадому

На наступны дзень пасля прыходу Чырвонай Арміі мы адправіліся ў сваю вёску. Ад Забар'я да Нябышына – гадзіна хадзьбы. Маёмасці ў нас амаль не было, усе рэчы мы няслі ў руках. Нам здавалася, што ў мінулым засталіся ўсе пакуты акупацыі, жыццё на балоце, партызанскае і паліцэйскае рабаўніцтва, голад, холад, хваробы, страты блізкіх людзей. Як жа мы памыляліся.

Мы падышлі да берага ракі Поні і ўбачылі роднае Нябышына. Яно было спалена да тла. Увосень 1943 года мы пакінулі вёску цэлай. У першую блакаду немцы спалілі 4 крайнія хаты, у тым ліку і нашу за тое, што з нашага двара партызаны адкрылі страляніну ў іх бок. Хто на гэты раз спаліў усю вёску, ці немцы, ці партызаны, невядома. Людзі нават спрачаліся, хто з іх здзейсніў тое злачынства. Вёска мела стратэгічнае значэнне для немцаў, ім было выгадна, каб яна заставалася цэлай. Пад прыкрыццём вёскі, яны маглі ўшчыльную наблізіцца да ракі Поні з боку Докшыц, пераправіцца на правы бераг і стварыць прамую пагрозу партызанам. Партызаны добра ведалі пра гэту небяспеку. Каб засцерагчыся, ім было выгадна спаліць вёску. Гэтым самым далягляд для іх пашыраўся да 2 км. Немцы ў гэтым выпадку ўжо не маглі падысці непрыкметна да ракі.

Нарэшце мы прыйшлі на сваё папялішча. Яно ўжо зарасло травой. Мы паставілі свае рэчы і самі прыселі на зямлю. Бацька сказаў: «Нічога, адбудуемся. Галоўнае – мы жывыя, хоць і не ўсе». Ён меў на ўвазе смерць Мікалая. Пра лёс Сяргея мы яшчэ нічога не ведалі. Гэта быў мой сярэдні брат. «Я паставіў перад сабой мэту – выжыць і вас зберагчы. І мы гэтага дасягнулі, – прадоўжыў свой маналог бацька. – Гэта большае геройства і мужнасць, чым абстраляць з засады нямецкую машыну ці забіць немца з-за вугла».

Потым, ужо будучы дарослым, калі я ўспамінаў гэтыя бацькоўскія словы, я пагаджаўся з імі. Мне, напрыклад, не зусім зразумела, для чаго было таму ж Аляксандру Матросаву закрываць амбразуру сваім целам. Каб падавіць агнявы пункт праціўніка, ёсць шмат іншых метадаў. Але самы каштоўны герой – гэта мёртвы герой. На яго прыкладзе палітработнікі выхоўвалі сотні, а можа,

тысячы новых смяротнікаў з асяроддзя піянераў і камсамольцаў, учорашніх школьнікаў і студэнтаў. Дарэчы, такіх смяротнікаў, як Аляксандр Матросаў, і да яго і пасля яго было шмат, але не кожны з іх станавіўся героем – то прозвішча не падыходзіць, то не той нацыянальнасці, то не тая партыйная або класавая прыналежнасць.

Але вернемся да папялішча. Бацька азірнуўся наўкола, а потым бадзёра прамовіў: «Хопіць марнаваць час, пачынаем будаваць жыллё». Ён узяў у рукі сякеру і высек некалькі жардзін, лес быў побач. На гумне ў нас цудам уцалела капешка саломы. Да канца дня мы пабудавалі прасторны, утульны шалаш. Вечарам да нас завітаў мой стрыечны брат Міша Стульбёнак. Калі быць дакладней – Міша Ананіч, Стульбёнак – гэта вясковая мянушка, яе паходжанне мне невядома. Мішу мы з ахвотай прынялі ў свой шалаш, месца хапіла ўсім. Ён прыйшоў да нас з непустымі рукамі. На правым плячы ў яго вісеў нямецкі карабін, а на левым – вялікая торба з патронамі. Той карабін нас здорава выручаў, Міша вельмі хутка стаў трапным стралком. Ён страляў птушак, забіваў зайцоў і нават пры дапамозе стрэлаў глушыў рыбу. Я збіраў шчаўе ці свірэпу, і з усяго гэтага мама варыла вельмі смачную ежу. Міша і мяне навучыў, як абыходзіцца са зброяй і метка страляць. Дарэчы, Мішу ў той час было 14–15 гадоў.

На наступны дзень да нашага шалаша прыехала раённае начальства з Бягомля. Чыны загадалі майму бацьку: «Прыступай да працы, падымай калгас, цябе ад пасады старшыні калгаса ніхто не адхіляў». Як мне помніцца, размаўлялі злосна, у адказ нічога не далі сказаць. Але як калгас падымаць? Няма ні мужчын, ні коней, ні інвентару, ні насення. Замест хат і гаспадарчых будынкаў засталіся адны папялішчы. Як толькі чыноўнікі з'ехалі, адразу да нас прыбег мой сябра Лёня, сын старасты Кастуся Шульгата, і разгублена звярнуўся да майго бацькі: «Дзядзька Піліп, прыехалі нкусаўцы забіраць нашага тату». Мой бацька пабег яго ратаваць. Пра гэта я ўжо вышэй пісаў.

У той жа дзень мой бацька сабраў людзей, каб параіцца з імі, што рабіць далей, як падымаць калгас. Я быў разам з ім. На вуліцы ляжала тоўстае бервяно, і людзі садзіліся на яго. Каму не хапіла месца, сядзелі на траве. Тут былі старыя людзі, калекі. З тых, каго я запомніў, сярод іх былі Нікіфар, дзядзька Лаўрэн, Салянка Цімафей, Пётра і Міша Кузьмічы, Сідар і Змітрок Маскалейчыкі, Мікіта, Косця Паўловіч, дзед Барыс, Бычок Мікалай, Спічонак

Іллюк, Ляўко Аляксей, Іллюк Нямы. Ён на самой справе быў нямы, таму ў яго і была такая мянушка. Як яго разумелі людзі і як ён іх разумеў – не ведаю. Працаваў ён нараўне з усімі. У яго была вельмі прыемная жонка, у іх нарадзіліся нармальныя дзеці. Быў тут яшчэ Бікмулін, яго імя не памятаю. Усе яго звалі – Куба, але гэта хутчэй за ўсё – мянушка. З яго сынам, Наілём, я вучыўся ў школе ў адным класе. Гэта была адзіная ў вёсцы татарская сям'я, якая пражывала тут спрадвеку. Прыйшло сюды шмат жанчын. Мой бацька расказаў людзям пра візіт раённага начальства. Выслухаўшы яго, людзі абурыліся. Дзядзька Лаўрэн сказаў: «Піліп, няўжо зноў у нас будзе гэты ненавісны калгас, зноў галеча? Мы нават пры немцах жылі лепш, пакуль не з'явілася гэта партызанская нечысць». Усе разам загаманілі. Гэтыя жорсткія словы вырашылі лёс майго бацькі.

## 27. Мой бацька пайшоў на фронт

Пад уражаннем размовы з вяскоўцамі мой бацька на наступны дзень пайшоў у Бягомль да першага сакратара райкама партыі Манковіча. Яны добра ведалі адзін аднаго. Да вайны не аднойчы сустракаліся на раённых нарадах. У час акупацыі Манковіч быў камісарам партызанскай брыгады «Жалязняк». Вярнуўшыся з Бягомля, бацька расказаў, як прайшла сустрэча. Мы сядзелі каля вогнішча і слухалі. Я прывяду ўрывак з яго аповеду, які мне найбольш запомніўся.

**Бацька** (*прывітаўшыся*). Сцяпан Сцяпанавіч, я зайшоў да Вас, каб сказаць, што адмаўляюся ад пасады старшыні калгаса. Буду працаваць шараговым калгаснікам.

**Манковіч.** Мы тут не ў цацкі гуляем. Партыя загадала...

**Бацька** (*перабівае*). Прабачце, я – беспартыйны.

**Манковіч.** Скажы дзякуй, што ты да мяне зайшоў, што я цябе добра ведаю, мог бы загрымець...

**Бацька.** Сцяпан Сцяпанавіч, не будзем марнаваць час, я для сябе прыняў цвёрдае рашэнне, я настойваю на сваім.

**Манковіч** (*стукнуўшы далонню па стале*). На фронт пойдзеш!

**Бацька.** Я не прыгодзен для службы па стане здароўя. (На Першай сусветнай вайне яго кантузіла, таму ў яго быў дрэнны слых).

**Манковіч.** Гэта мы будзем вырашаць, годзен ты да службы ці не.

**Бацька**. Мой узрост не прызыўны.

**Манковіч**. І з узростам разбярэмся. Людзі за радзіму кроў праліваюць, змагаюцца з фашызмам, а ты прыкрываешся станам здароўя, узростам. Заўтра ў 12.00 быць у райваенкамаце. Я туды патэлефаную.

Бацька працягваў расказ, але мяне паклікаў Міша. Ён паказаў мне каршуна, які спакойна сядзеў на вяршаліне сасны. Міша даваў мне стрэліць ужо шмат разоў. Я нават трапляў у бляшанку з-пад кансерваў. Ён аддаў мне ў рукі карабін і сказаў, каб я пастараўся пацэліць у птушку. Ад мяне залежала, што будзе на вячэру. І я пацэліў, каршун упаў на зямлю. Міша мяне пахваліў. На вячэру мама зварыла бацвінне з птушыным мясам. Каршун быў вельмі тлусты.

Раніцай бацька абняў нас па чарзе і пайшоў у Бягомль, пайшоў не вуліцай вёскі, а аселіцамі, каб не сустракацца з людзьмі. Мы засталіся ў шалашы. З фронту ад бацькі прыходзілі лісты. Мама іх чытала ўслых, а мы, я з братам Андрэем і ўся сям'я дзядзькі Лаўрэна, уважліва лавілі кожнае слова, што бацька напісаў нам з фронту. Часам прыходзілі суседзі і звярталіся да мамы: «Дуня, калі ласка, пачытай нам, што піша Піліп з вайны». Пасля мая 1945 года мы лічылі дні, калі наш бацька вернецца дадому. Але, як высветлілася, СССР і яго непераможная Чырвоная Армія без майго бацькі не маглі разбіць Японію, і яго накіравалі туды.

Ён загінуў 19 жніўня 1945 года ў Манчжурыі пад горадам Мукдэнам.

А старшынёй калгаса прызначылі Мішу Кузьміча. З яго дачкой Клавай я вучыўся ў адным класе.

## 28. Выпадковыя ахвяры

Такім чынам, Чырвоная Армія вызваліла нашу мясцовасць ад немцаў, акупацыя закончылася. Людзі паціху сталі вяртацца ў вёску. Дарослыя хадзілі на працу ў калгас, а ў вольны час

ладкавалі сваё жыццё. Мы, дзеці, засталіся без нагляду. Бацькі папярэджвалі нас, каб мы не хадзілі ў лес па грыбы ці па ягады – там яшчэ блыталіся адстаўшыя ад фронту немцы. Гэтаксама ў 1941 годзе мы баяліся адстаўшых чырвонаармейцаў. Але мы не надта слухаліся бацькоў. Мы збіраліся ў купку і шукалі «трафеі». Паколькі баёў вакол нашай вёскі не адбывалася, то і трафеі былі бедныя: бляшанкі з-пад кансерваў, драўляныя скрынкі, кардонныя каробкі. Усё гэта мы неслі ў свае двары. Траплялiся і больш небяспечныя цацкі. Я ўжо пісаў, што ў майго стрыечнага брата Мішы быў нямецкі карабін і запас патронаў.

Адзін 10-гадовы падлетак знайшоў ракетніцу. Яна была зараджана. У час гульні ён націснуў на спускавы кручок, адбыўся стрэл і сігнальнай ракетай другому падлетку прапаліла штаны і абпаліла скуру на назе. Віноўнік уцёк дадому, а пацярпелы, наадварот, баяўся паказацца на вочы бацькам, але не з-за раны, а з-за прапаленых штаноў.

Аднойчы і я асабіста правёў небяспечны эксперымент. Я разабраў вінтовачны патрон, адсыпаў частку пораху, прапіхнуў кулю ўнутр гільзы, а зверху насыпаў той на порах. Потым порах падпаліў сярнічкай. Адбыўся стрэл. Куля паляцела ўвышыню на 15–20 метраў. На гэтым мае прыгоды не скончыліся. Я падняў кулю і вырашыў выплавіць з яе свінец на грузіла для вуды. Але я не ведаў, што куля была разрыўная. Адбыўся выбух, вогнішча раскідала ў розныя бакі. Дробныя асколкі прадзіравілі мне штаны і ўпіліся ў скуру ног. Пацякла кроў. Асколкі ад кулі я павыкалупваў лязом кішэннага нажа. Не толькі маме, але нікому я не расказваў пра гэты выпадак. Пішу пра гэта ўпершыню.

Сярод нашых знаходак часта былі капсулі-дэтанатары для толавых шашак. Мы іх кідалі ў агонь і разбягаліся ў розныя бакі. Бывала, што хто-небудзь непрыкметна кідаў у вогнішча патрон ці дэтанатар. І калі знянацку адбываўся выбух, нас гэта вельмі палохала, а «жартаўнік» рагатаў.

Але не ўсё нам сыходзіла з рук. Былі выпадкі вельмі трагічныя, са смяротным канцом. Так, 11-гадовы хлопец (звалі яго Ваня) знайшоў унітарны пушачны боепрыпас-снарад. Ён прынёс яго на свой двор, усеўся на прызбу і стаў аддзяляць снарад да гільзы. Маці была на працы, яму ніхто не перашкаджаў займацца гэтай небяспечнай справай. Хутка вакол Вані сабраўся цэлы натоўп падлеткаў. Ваня стукаў боепрыпасам аб зямлю, выбух мог адбыцца ў любы момант. Вынік быў бы непапраўны. Магчыма, і я не пісаў



*Дзеці вайны. Пасля заканчэння Нябышынскай сямігадовай школы (1951 г.)*

бы гэтыя радкі. Нас ад немінучай смерці выратавала тое, што зямля была рыхлая, а снарад быў фугасны, узрывацель быў закрыты металічным калпачком. Нарэшце гільза аддзялілася. Яна была запоўнена доўгім, як макароны-спагеці, порахам, даўжынёй 15–20 см. У гэты час на двор зайшоў 14-гадовы хлопец Валодзя (зараз ён жыве ў Бягомлі). Ён у сваёй руцэ трымаў толавую шашку з капсулем-детанатарам. Не хапала бікфордавага шнура. Убачыўшы доўгі порах, ён палічыў, што ім можна замяніць бікфордаў шнур, і прапанаваў падарваць шашку. Яе вага хутчэй за ўсё складала 200 грамаў. Мы ўсе накіравалі за вёску ў бок могілак. Уладальнік шашкі скруціў з махоркі цыгарку, закурыў, замацаваў у капсуль-дэтанатар адну трубачку пораху і ад цыгаркі падпаліў яе. Рабіў ён усё гэта не спяшаючыся. Порах задыміўся і патух. І тут на дапамогу прыйшоў Ваня: «Давай я падарву, у цябе рукі дрыжаць». Мы ўсе на ўсякі выпадак адбеглі на 25–30 метраў і залеглі. Ваня надзейна падпаліў порах і імгненна ў яго руках адбыўся выбух. Ваня загінуў. Ён быў адзіным дзіцём у сям'і. Мы з перапалоху разбегліся хто куды. Што засталося ад Вані пасля выбуху, не ведаю, на яго пахаванні мяне не было.

З гэтага здарэння мы не зрабілі высноў. Праз некалькі дзён другі хлопец, якому было гадоў 14–15, знайшоў супрацьтанкавую гранату. Ён сабраў нас і павёў да ракі глушыць рыбу. На беразе ракі ён выняў засцерагальную чаку і кінуў гранату на сярэдзіну плёсу. Але выбух неадбыўся. Тады ён раздзеўся і нырнуў у ваду. Я не памятаю, як таго хлапца звалі, таму што ён быў нашмат старэйшы за мяне. Адшукаўшы гранату, ён вылез на бераг. У яго хапіла розуму папярэдзіць нас, каб мы адышлі на 30–40 м і залеглі, што мы ўсе і зрабілі. У момант замаху для кідка граната выбухнула. Хлопца разнесла ўшчэнт. Гэта было жудаснае відовішча. Мы ляжалі за купінамі, баяліся паварушыцца. Ён таксама быў адзіным дзіцём у маці. Якраз у гэты час вербавалі людзей для засялення горада Кенігсберга, і Вольга, яго маці, ад'ехала туды адразу пасля пахавання сына. Міліцыя па гэтых няшчасных выпадках ніякага следства не праводзіла і нават не прыязджала ў вёску. Магілы гэтых двух хлопцаў знайсці ўжо немагчыма.

## 29. Я адмовіўся помсціць

Праз некалькі тыдняў, калі фронт быў ужо далёка на захадзе, праз нашу вёску рухалася невялікае армейскае падраздзяленне, чалавек 20–25 на 8–10 павозках. У кожную павозку было запрэжана па два кані. На нашым гумне яны спыніліся на прывал, распалілі паходную кухню і сталі рыхтаваць сабе абед. Я тут жа падключыўся да іх, стаў збіраць і падносіць дровы. За гэта атрымаў кавалак хлеба, чарпак супу, які налілі ў салдацкі кацялок, а ў накрыўку ад кацялка паклалі кашу. Ежа была смачная, з мясной тушонкай.

Сярод салдат быў палонны немец. Ён атрымаў на абед такую ж порцыю, як і ўсе. Пасля абеду камандзір стаў са мной размаўляць – колькі мне гадоў, дзе мой бацька. Потым запытаўся, ці ёсць у нашай сям'і загінуўшыя ў часы акупацыі. Я адказаў: «Так, ёсць», – і пералічыў усіх загінуўшых сваякоў. Ён сказаў, што наша сям'я моцна пацярпела ад акупантаў. Запытаўся, ці ўмею я страляць. Я адказаў, што ўмею, і мне прыпомнілася, як я пацэліў у каршуна. Афіцэр даў мне карабін і сказаў, што я за ўсё магу адпомсціць, магу застрэліць палоннага немца. Немец насцярожыўся, магчыма, ён зразумеў, аб чым ідзе гаворка. Я зірнуў на яго, а ён глядзеў на мяне шырока расплюшчанымі вачыма. Мне не хацелася помсціць ні гэ-

таму немцу, ні любому іншаму. Я сказаў афіцэру, што маіх сваякоў забілі паліцаі. Я хацеў яшчэ дадаць, што брата Мікалая забілі партызаны, але ён мяне спыніў і ўдакладніў, што немцы і паліцаі – усе яны фашысты. Я адчуў жахлівасць моманту, мне стала не па сабе, заныла пад лыжачкай. Дрыжачымі рукамі я паклаў карабін на зямлю і кінуўся на ўцёкі.

Прыйшлося прасядзець шмат часу ў кустах, пакуль салдаты не пакінулі наша гумно. Я пра гэта нікому не расказваў. І калі зараз прыпамінаю той выпадак, то с павагай стаўлюся да сябе. Я ўспамінаю таго немца і думаю, ці ўдалося яму выжыць і вярнуцца на сваю Радзіму ў Нямеччыну. І яшчэ, я ўспамінаю таго савецкага афіцэра, які паспрабаваў укласці зброю ў рукі 10-гадовага падлетка і скалечыць яго дзіцячую душу. Дзякуй Богу, мая мараль аказалася вышэй за мараль таго афіцэра, хоць слова «мараль» я тады яшчэ не ведаў.

## 30. Жыццё працягваецца

Бацька пайшоў на фронт, а мы – мама, брат Андрэй і я засталіся ў шалашы. Жыццё працягвалася. Але якое гэта было жыццё? Гады акупацыі ў параўнанні з ім маглі здацца раем. Нас чакалі цяжкія выпрабаванні. Знайшоўся бацька Мішы, і мой стрыечны брат разам са сваім карабінам пакінуў наш шалаш. Мы пазбавіліся хоць і мізэрнага, але мяснога рацыёна, які ён здабываў для ўсіх нас. Маму і брата Андрэя штодзённа ганялі на калгасную працу. За гэта нічога не плацілі, толькі ставілі палачкі-працадні. І людзі імкнуліся іх зарабіць, таму што была ўстаноўлена гадавая норма выпрацоўкі працадзён. За невыкананне нормы існавала пакаранне.

Кожную раніцу брыгадзір Іллюк Спічонак заходзіў у кожную хату і даваў загад, каму на якую працу трэба ісці ў гэты дзень. Так, майму брату ён часта казаў: «Андрэй, сёння пойдзеш прычэпшчыкам на трактар, а ты, Дуня – выкідваць гной з кароўніка». Гэта была вельмі цяжкая праца – катарга. Палеткі пуставалі, таму што па віне партызан не было магчымасці восенню 1943 года пасеяць азімыя, а вясной 1944 года – яравыя. Фармальна партызаны лічылі, што ўраджай можа дастацца немцам. Як будзе выжываць насельніцтва, іх не турбавала. Тое, што ўдалося пасадзіць на сваіх

палетках, не вырасла без дагляду. Наперадзе нас чакала халодная і галодная зіма, і яшчэ больш галодная вясна.

З Бягомльскай МТС прыгналі калёсны трактар ХТЗ, пачалі араць поле, рыхтваліся да сяўбы азімых. Мы, падлеткі, пільна сачылі, калі будуць араць поле, дзе раней расла бульба. Мы збіралі марожаную гнілую бульбу, якую называлі «лагуны», таму што лупіна лёгка здымалася. З такой бульбы мама пякла ляпёшкті, якія былі вельмі цвёрдыя і чорныя. Але тады здавалася, што яны вельмі смачныя. У першыя пасляваенныя гады ўдосталь наеліся травы. У ежу ішло ўсё: свірэпа, кветкі канюшыны, шчаўе і іншыя расліны.

Сем'і, у якіх былі мужчыны, пачалі будаваць сабе хаты. Першым пабудаваўся Аляксей Ляўко. Ён быў добрым цесляром. Пабудавалі сабе хаты Пётра Кузьміч, Кастусь Шульгат, Міша Кузьміч, Мікалай Бычок, Іллюк Спічонак. Мы, як і шмат іншых сямей, заставаліся жыць у шалашах і часовых пабудовах. На двары ўжо стаяла сярэдзіна жніўня 1944 года. Пара было рыхтавацца да школы. Мая хросная мама Юстына была добрай швачкай. У яе нейкім цудам збераглася даваенная швейная машына, і яна пашыла мне штаны з нямецкай маскіровачнай плашч-палаткі.

На ўзлесках, уздоўж дарог мы збіралі адзенне і абутак, кінуты чырвонаармейцамі ці немцамі, нават драныя, без падэшвы. Падэшвы мы высякалі і выстругвалі з асінавых чурак па форме і памеру ног і цвікамі прыбівалі да халяваў. У такім абутку хадзіць было нязручна, але іншага выйсця не было. Трэба дадаць, што абутак мы адзявалі на босую нагу, шкарпэтак не было. Аднойчы Міша Сідарчук, Сяргей Ціт, я і Віця Цяпкоўскі ў чарговы раз абшуквалі наваколле вёскі. Я і Віця былі аднагодкі, а Міша і Сяргей – на два гады старэйшыя.

Тут трэба патлумачыць – Міша, мой лепшы сябра, быў сынам Сідара Маскалейчыка і маёй хроснай маці Юстыны. З-за імя бацькі ён атрымаў мянушку – Сідарчук. Тое ж самае атрымалася з Сяргеем. Яго прозвішча Кукуля, а Ціт – гэта імя яго бацькі. Ціт быў кепскі гаспадар, яго сям'я жыла бедна. Але пры савецкай уладзе такія людзі былі ў пашане. Я лічыў, што ў нашай вёсцы не было ніводнага камуніста, але вяскоўцы мяне запэўнілі, што Ціт быў камуністам. Партыйнасць яго не ўратавала, яго арыштавала НКВД у 30-х гадах мінулага стагоддзя, адвезлі ў Мінск і там яго сляды зніклі назаўсёды.

Самым спрытным і кемлівым сярод нас быў Віця. Ён прапанаваў схадзіць на балота, паглядзець, ці паспелі журавіны. На балоце нас чакала незвычайная знаходка, мы знайшлі парашут. У Віці быў кішэнны нож, мы парашут разрэзалі на 4 часткі. Нашы маці пашылі з іх блузы, кофты, фіранкі.

## 31. Другі раз у першы клас

Наступіла 1 верасня 1944 года і я пайшоў у першы клас Нябышынскай сямігадовай школы, пайшоў у першы клас другі раз. Мне споўнілася 10 гадоў. У першым класе мне рабіць было нечага, я ўжо ўмеў лічыць, пісаць і чытаць. Яшчэ да вайны мне бацька купіў дзіцячую кніжку «Казкі дзядзечкі Рымуса». Кніжка была невялікая, 20–25 кароткіх казак, якія лёгка чыталіся і запаміналіся. Да мяне прыходзілі мае аднагодкі, і я для іх чытаў услых. Але ў нашай школе ў першы пасляваенны год былі створаны толькі 1-ы і 4-ы класы. Іншых класаў не было, так распарадзілася



*Дзеці вайны. Пасля заканчэння Нябышынскай сямігадовай школы (1951 г.). Злева направа, першы рад: Аляксандар Каляга, Леанід Русаковіч, Андрэй Копыл. Другі рад: Уладзімір Парфяновіч, Ілля Копыл, Віктар Астапенка, Пётр Шышла.*

вайна. Потым с кожным годам колькасць класаў павялічвалася, і к 1947 году школа была ўкамплектавана.

У школу я пайшоў з шалаша. Не было ні зэдліка, ні стала. Школу размясцілі ў хаце Аляксея Ляўко. Замест парт ён з дошак змайстраваў доўгія сталы і такія ж лавы. На лаве нас умяшчалася 6–8 чалавек. Першакласнікаў налічвалася 25–30 чалавек, а вучняў 4-га класа 10–12 чалавек. На ўвесь наш клас было два ці тры буквары, таму мы карысталіся імі па чарзе. Два класы вучыла адна настаўніца, звалі яе Вера Барысаўна. У 4-м класе таксама былі цяжкасці з падручнікамі. Так, увогуле не было хрэстаматыі па рускай літаратуры. Таму вучні чыталі на ўроках аповесць Леаніда Салаўёва «Иван Никулин – русский матрос». Чыталі па чарзе і ўслых, таму і мы запаміналі змест гэтага твора.

Быў у нас і дырэктар школы па прозвішчы Шылоў. Ён быў дырэктарам нашай школы да вайны і зараз разгарнуў дзейнасць, каб пабудаваць у Нябышыне новую прасторную школу. І ён свайго дасягнуў, будаўніцтва пачалося. Школы яшчэ не было, а мы ўжо па перыметры школьнай тэрыторыі пасадзілі дрэвы, якія растуць там і зараз. Школу пабудавалі. Яе адчынілі на першае верасня 1949 года. Але дырэктар школы Шылоў гэтага не дачакаўся. Яго забілі ў канцы мая 1945 года. Як нам казалі, забойства здзейснілі «зялёныя», ці «лясныя браты» – змагары супраць савецкай улады. Дырэктара пахавалі ў Бягомлі. Мы, школьнікі, у пахаванні не ўдзельнічалі, бо ад нашай вёскі Нябышына да Бягомля 15 км. Аўтобусы ў той час не хадзілі.

У канцы верасня 1944 года пасля ранення вярнуўся з вайны наш сусед Змітра Маскалейчык. Да вайны ён працаваў калгасным шафёрам. Ён разумеў, што да наступлення халадоў пабудаваць хату немагчыма, мала часу, а перазімаваць неяк трэба. Тады ён сабраў больш-менш працаздольных суседзяў і агульнымі намаганнямі за 2–3 дні быў выкапаны катлаван глыбінёй не менш за метр і плошчай 10–12 кв.м. Працавалі з натхненнем усе – і жанчыны і старэйшыя падлеткі, як мой брат Андрэй. Трэба дадаць, што гэтым яны займаліся, адпрацаваўшы ўвесь дзень у калгасе. Яшчэ праз некалькі дзён на гэтым месцы з'явілася зямлянка. Змітра добра ведаў гэтую справу, на вайне яму не аднойчы даводзілася будаваць зямлянкі. У зямлянцы размясцілася некалькі сем'яў, у тым ліку і наша. З шалашом я развітаўся. У зямлянцы было цяплей, не капала зверху, не прадуваў вецер, але па-ранейшаму не было элементарных умоў, каб падрыхтаваць урокі. У такіх

жа ўмовах знаходзіліся і дзеці Змітры – Валодзя, мой аднагодка і Валя, малодшая на два гады. Мы разам хадзілі ў першы клас. Спалі ўсе разам на саломе, не распранаючыся. Адным словам, пакуты працягваліся.

Напрыканцы кастрычніка, а можа, на пачатку лістапада, дзядзька Лаўрэн закончыў будаўніцтва сваёй хаты. Гэта была не хата, а хатка, і ўсё ж лепш, чым зямлянка. Дзядзька Лаўрэн прытуліў у сябе некалькі сем'яў, у тым ліку і нашу. Мы спалі на глінабітнай падлозе на саломе, усе былі хранічна прастуджанымі. Асабліва пакутаваў Пеця, сын дзядзькі Лаўрэна. У яго на целе з'явіліся скулы. На дзень салому ўбіралі. Мы па-ранейшаму спалі ў верхнім адзенні. Сподняй бялізны не было, як не было і прасцін. Але для мяне самым галоўным было тое, што ў мяне з'явілася магчымасць рабіць урокі за сталом. Акрамя таго, у хаце была печ, ля якой можна было пагрэцца. Вёска пакрысе будавалася, і хутка ў дзядзькі Лаўрэна засталіся толькі мы. Дзядзька Лаўрэн змайстраваў двухпавярховыя нары – палаці, і больш на падлозе ніхто не спаў. Тая хацінка стаіць і зараз, там дажывала свой век дачка Лаўрэна, мая стрыечная сястра Вера. Яна памёрла ў студзені 2007 года, ей споўнілася 87 гадоў.

У снежні 1944 года ў нас з'явіўся яшчэ адзін настаўнік – Пётр Аляксандравіч Бобрык. Ён вярнуўся з вайны інвалідам, не было нагі вышэй калена. Пакуль яму рабілі пратэз, мы кожны дзень вазілі яго ў школу на працу на саначках і пасля заняткаў дадому. Бывала, саначкі перакульваліся, але ён за гэта на нас не крыўдзіўся.

## 32. Хвароба за хваробай

Вайна тым часам адсунулася далёка на захад за межы нашай краіны. Пасля таго як Чырвоная Армія вызваліла нас ад нямецкай акупацыі, паліцайскага і партызанскага самадурства і бязмежжа, мы неяк расслабіліся. Тут і насунулася на нас новая навала – хваробы. Першай хваробай, якая напала на дзяцей, была свінка. На нашых тварах ад вуха да вуха цераз падбародак утварылася ці нейкая пухліна, ці ацёк. Магчыма, хвароба перадавалася ад аднаго да другога. Але нікога гэта не хвалявала: ні настаўнікаў, ні бацькоў. Ніякай медыцынскай дапамогі мы не атрымлівалі. Мы мелі непрыемны выгляд, адчувалі недамаганне, але хадзілі ў шко-

лу. Праз тыдзень я выздаравеў. Не паспелі мы ачуняць ад адной хваробы, як прыйшла новая. На гэты раз шмат дзяцей, у тым ліку і я, перахварэлі на адзёр. У мяне твар і ўсё цела пакрылася чырвонымі плямамі, тэмпература высокая, я адчуваў сябе кепска. Два тыдні я не хадзіў у школу. І зноў ніякай медыцынскай дапамогі не аказвалася. Шмат хто ў вёсцы перахварэў малярыяй, у тым ліку і мой брат Андрэй. Ён змог атрымаць медыцынскую дапамогу. Яму ўжо споўнілася 15 гадоў і ён самастойна схадзіў ў Бягомль за 15 км, каб наведацца ў паліклініку да доктара. Яму прапісалі прымаць пілюлі хіны. Мама нават пафарбавала хінай у жоўты колер фіранкі на вокны з парашутнага шоўку.

Нязносныя пакуты нам прычыняла кароста. Мы, каросліўыя, сядзелі на ўроках і ўвесь час чухаліся, сорамна было паказаць рукі, хавалі іх пад сталом. І зноў ніякай медыцынскай дапамогі і ніякіх парад. Выратаваў мяне дзядзька Лаўрэн, узяўшыся за маё лячэнне. Ён добра напаліў лазню, якую зусім нядаўна пабудаваў сваімі рукамі. Дарэчы сказаць, дзядзька Лаўрэн быў майстра на ўсе рукі. Ён мяне абстрыг нагала, я добра прапацеў і абмыўся. У лазні больш нікога не было. Маё чыстае цела з галавы да ног дзядзька Лаўрэн намазаў калёсным дзёгцем. Гадзіны дзве я прасядзеў у цёплай лазні, потым апрануўся ў самае горшае адзенне і два дні прасядзеў у хаце. Потым зноў была лазня. Я адмыўся ад дзёгця і выйшаў з лазні чысты – каросты як не было. Вось такім стаўся для мяне першы пасля вызвалення год. А вайна працягвалася.

## 33. Чакаем Сяргея

Заставаўся невядомым лёс майго старэйшага брата Сяргея, 1926 года нараджэння. Ён і яшчэ некалькі юнакоў з нашай вёскі пасля заканчэння сямігадовай школы ў 1940 годзе па наборы паехалі ў Ленінград на вучобу ў ФЗУ. Там іх і застала вайна. Пасля вайны ўсе хлопцы, акрамя нашага Сяргея, вярнуліся дадому. Адчувалася, што распавядаць пра блакаду ім было непрыемна. Мой стрыечны брат Валодзя, які таксама быў там, расказаў, што ён быў побач з Сяргеем, калі той паміраў. На пытанне мамы, дзе яго пахавалі, ці ёсць магіла, Валодзя адказаў, што не ведае, на наступны дзень труп забралі нейкія людзі і кудысці адвезлі. Яшчэ адзін вясковы юнак, Салянка Міша, які таксама навучаўся ў ФЗУ Ленінграда, сказаў нам, што Сяргей не вытрымаў, памёр з гала-

ду, таму што ён не змог есці не толькі чалавечыну, але нават сабак, кошак, пацукоў. Дзе ён пахаваны і ці пахаваны ўвогуле, Міша таксама не ведаў. Не хацелася верыць, што Сяргея больш няма. Асабліва балюча гэта было для мамы.

## 34. Дзень Перамогі

Якім ён запомніўся? Справа ў тым, што я яго ўвогуле не памятаю. Мне зараз нават давялося пацікавіцца, які гэта быў дзень тыдня. 9 мая 1945 года была серада. У гэты дзень усе мы былі на занятках, але настаўнікі нам не абвясцілі, што мы нарэшце дачакаліся дня перамогі. Магчыма яны пра гэта не ведалі. Звесткі пра тое, што немцы капітулявалі, да нашай вёскі дайшлі значна пазней. У нас не было радыё, яно з'явіцца ў нашых хатах праз 10–15 гадоў. Звесткі пра перамогу, пра канец вайны наша вёска сустрэла без бачнага трыумфу. Да гэтага часу амаль кожная сям'я атрымала пахаронкі.

Калі нашу вёску вызваліла Чырвоная Армія, усіх вяскоўцаў, хто быў у партызанах, забралі на фронт, нават непаўналетніх. Відаць, камандаванне палічыла так, што калі падлетак партызаніў са зброяй у руках, то яго можна кідаць у бой без ваеннай падрыхтоўкі. У першым жа баі амаль усе яны загінулі. Аб гэтым расказаў жыхар суседняй вёскі Старое Запонне. Я сам чуў яго расказ. На жаль, яго імя не памятаю, а вось прозвішча забыць нельга: Клоп. З яго сынам Анатолем я вучыўся ў адным класе і некалькі разоў быў у іх хаце. Клоп выжыў на вайне. Ён быў сталага ўзросту і таму яго накіравалі ў тылавое падраздзяленне. Дарэчы, і мой бацька папаў у тое ж самае падраздзяленне. У мяне ёсць фатаграфія, на якой мой бацька і Клоп разам, разам яны прайшлі да канца вайны.

Вось што расказаў Клоп, калі вярнуўся дадому з вайны: нашу мясцовасць Чырвоная Армія вызваліла ў першыя дні ліпеня 1944 года. Партызаны свае функцыі вычарпалі, засталіся без працы. Яны спадзяваліся, што іх распусцяць па дамах, асабліва мясцовыя, сярод якіх было шмат 16–17-гадовых падлеткаў і людзей сталага ўзросту. Многія не ведалі, што з іх сем'ямі.

Але спадзяванні былі марнымі. Прыбылі прадстаўнікі СМЕРШа, і ўсё стала на свае месцы. Паводзілі яны сябе вельмі нахабна. Уражанне было такое, быццам бы ўчарашнія партызаны, якія мелі неабмежаваную ўладу над насельніцтвам, рап-

там папалі у палон к ворагу. Партызан пастроілі і абяззброілі. Вакол стаялі байцы СМЕРШа, аўтаматы трымалі напагатове. Партызанскія начальнікі і камісары кудысьці зніклі. Шараговых партызан падзялілі на дзве часткі. Адна частка – тутэйшыя, другая – усе астатнія. На тутэйшых склалі спісы і пад канвоем накіравалі на фронт. Нашых землякоў на перадавой лініі нават не перапранулі ў ваенную форму, не кожнаму выдалі зброю. З іх сфарміравалі батальён і правялі разведку боем. Для гэтай мэты, як правіла, выкарыстоўваліся штрафныя батальёны. Разведка боем праводзіцца для таго, каб выявіць агнявыя пункты праціўніка. З такога бою жывымі не вяртаюцца. Клоп закончыў свой расказ, яго чакалі гаспадарчыя справы.

Такім чынам, савецкая камандаванне пераўтварыла нашых землякоў у гарматнае мяса аднаразовага карыстання. Мусіць, таму дзень перамогі (я наўмысна пішу з малой літары) для многіх жыхароў нашай вёскі хутчэй за ўсё стаўся днём смутку. Дый на дзяржаўным узроўні гэты дзень не ўпамінаецца як свята. Упершыню пра яго гучна напомнілі толькі 9 мая 1965 года. Гэта было зроблена пад асобу Л.І. Брэжнева, якога 14 кастрычніка 1964 года абралі Першым сакратаром ЦК КПСС. Трэба было тэрмінова паказаць яго вядучую роль у Вялікай айчыннай вайне.

Што тычыцца нашай сям'і, то мы шчыра радаваліся перамозе. Мы лічылі дні, калі вернецца з вайны наш бацька. Але не дачакаліся.

## 35. Я трапляю ў лагер

Не палохайцеся, у піянерскі. У канцы мая 1945 года я закончыў першы клас з Пахвальнай граматай. Загад аб гэтым зачытаў дырэктар школы Шылоў. Але тую грамату мне не ўручылі. Шылоў сказаў, што ён адвязе ведамасць паспяховасці ў раённы аддзел народнай адукацыі, а пасля я атрымаю Пахвальную грамату на рукі. Але дырэктара забілі, было не да граматы, пра яе забылі.

На пачатку летніх школьных канікул у нашу вёску на некалькі дзён завітала жанчына праведаць сваіх сваякоў. Гэта была малодшая сястра Марылі Кузьміч, жонкі старшыні калгаса. Яна дзесьці працавала настаўніцай, а на час летніх канікул яе прызначылі на пасаду начальніка піянерскага лагера. Яна сустрэлася з маёй мамай і сказала, што забярэ мяне ў лагер на першую змену. Зірнуўшы

на мяне, яна параіла, каб я змяніў гэтыя «фрыцаўскія» штаны на іншыя. Але іншых штаноў у мяне не было. Я адразу пабег да сваёй хроснай мамы і расказаў ёй пра праблему. Яна хутка адшукала прыдатны кавалак тканіны, з якога атрымаліся кароткія штанішкі на лямках. Калі падышоў да заканчэння тэрмін пабыўкі ў нашай вёсцы начальніка піянерскага лагера, раніцай мы пакінулі Нябышына. Да лагера было 30 км. Першыя 15 км да Бягомля мы пераадолелі лёгка і хутка. Дарэчы, наш раённы цэнтр да вайны людзі называлі па-рознаму: хто – Бягамля, хто – Бягомля. Пасля вайны гэта ўжо быў Бягомль. Далей я буду карыстацца новай назвай.

Пасля Бягомля мы павярнулі па шашы на Лепель. Другая частка дарогі далася цяжэй. Прыпякала сонца. Аўтобусы ў той час не хадзілі. Папутныя машыны нас не падабралі. Адлегласць у 30 км мы прайшлі за 7–8 гадзін. Трэба адзначыць, што я быў босы, падэшва ног смылела. Летняга абутку ў мяне ўвогуле не было. У той час мы ўсе як толькі сыходзіў снег і да восеньскіх маразоў хадзілі басанож.

Лагер мне не надта спадабаўся. Размясцілі нас у актавай зале школы. Там ужо былі расстаўлены жалезныя салдацкія ложкі. Пасцельны камплект быў такі: сяннік, напханы саломай, такая ж падушка, старая байкавая каўдра, вафельны ручнік. Прасцін і навалачак не было. Спалі мы ў верхняй вопратцы, паколькі на нас не было спадняй бялізны – ні маек, ні трусоў. Усе мы былі босыя, ногі нашы былі каравыя. За тры тыдні нас ні разу не вадзілі ў лазню, ні разу не вадзілі на рэчку. У нас не было ні мыла, ні зубных шчотак, ні зубнога парашку. На плоце вісела некалькі рукамыйнікаў. Вось і ўся гігіена. У адным і тым жа памяшканні спалі і хлопчыкі, і дзяўчынкі. Паколькі мы спалі ў верхнім адзенні, то не бачылі палавых адрозненняў і не праяўлялі цікаўнасці да іншага полу. Пра іншыя забавы і казаць няма чаго: ні кіно, ні радыё, ні кніг, ні гульняў, ні спаборніцтваў. Праўда, адзін раз нас звадзілі на экскурсію на мясцовы піваварны завод.

Кармілі нас кожны дзень аднолькава: раніцай і вечарам манная каша, прыгатаваная на вадзе, гарбата, кавалачак чорнага і кавалачак белага хлеба, два кавалачкі цукру. На полуднік бацвінне, каша ячная, кампот ці кісель, два кавалачкі хлеба. Мы з’ядалі ўсё, на талерках нічога не заставалася. Харчаваліся мы ў звычайнай вясковай хаце ў тры змены. Вёска даваенная, вайна

яе не закранула. Магчыма, гэта была зона, свабодная ад партызан. Абслугоўвала нас гаспадыня хаты. Сам гаспадар быў хворы, ён не размаўляў, а мычаў. Калі нас прыводзілі на прыём ежы, ён заўсёды стаяў у двары, трымаючыся за тын, сустракаў нас. Ён быў апрануты ў споднее адзенне. З яго рота на кашулю цякла сліна. Гэта нам вельмі моцна «падымала» апетыт. З цягам часу мы да яго прызвычаіліся.

Арганізацыйна мы былі раздзелены на тры атрады. Атрад складаўся з трох звён. На чале звяна стаяў звеннявы, на чале атрада – камандзір і начальнік штаба. Мая зямлячка (начальнік лагера) надзяліла пасадай начальніка штаба і мяне. Але я гэтаму не абрадаваўся. У мае абавязкі ўваходзіла строіць атрад, раніцай далажыць піянерважатай або начальніку лагера, што ўсе дзеці на месцы, у страі, здарэнняў не адбылося. Акрамя гэтага мы штодзённа па чарзе падымалі сцяг на флагшток.

Складанасць была ў тым, што ў нас, дзяцей з аслабленымі вайной арганізмамі, амаль ва ўсіх назіралася начное нетрыманне мачы. Так як мы спалі не распранаючыся, то раніцай на нашых штанах красаваліся мокрыя плямы. Я і мой камандзір атрада спалі побач, і мы дамовіліся, што свае няхітрыя абавязкі, такія ,як пастраенне атрада, даклад, пад'ём сцяга будзе выконваць той з нас, каму пашчасціць прачнуцца раніцай сухім. Але часцей выбару не было, мы абодва прачыналіся мокрымі. Было сорамна, але што зробіш. У такім жа становішчы былі і дзяўчынкі.

Трэба адзначыць, што за ўвесь час лагернага жыцця паміж намі, дзецьмі, ніводнага разу не ўзнікалі канфлікты. Мы мірна суіснавалі. Не было насмешак над тымі, хто па начах мачыўся пад сябе.

Нарэшце лагерны тэрмін закончыўся. Успаміны ад лагера засталіся адмоўнымі. Трэба было неяк дабірацца дадому.

## 36. Нам будуюць хату

Да Бягомля набралася цэлая група дзяцей. Нас падабрала папутная грузавая машына маркі «ЗИС-21». Яна прыпынілася, каб дазаправіцца. Дазапраўка – гэта шафёр проста закідваў бярозавыя цуркі ў газагенератар. Пасля вайны на Бягомльшчыне было шмат аўтамашын з рухавікамі, якія працавалі не на бензіне, а на драўнінных цурках. Знешне такія грузавікі выглядалі як

і «ЗИС-5». Ад Бягомля да Нябышына я дабіраўся пешшу. Дома мяне чакала прыемная навіна – нам пачалі будаваць хату. А справа пачалася наступным чынам. Яшчэ ў кастрычніку 1944 года ў нашу вёску прыбыў з Мінска ўпаўнаважаны, каб пракантраляваць,



*Хата сям'і Копылаў, якую пабудавалі ў Нябышыне у 1946 г.*

як ідуць справы ў калгасе. Тут нічога дзіўнага няма. Такія ўпаўнаважаныя наязджалі і да вайны кантраляваць сяўбу, жніво, малацьбу і асабліва нарыхтоўку збожжа для дзяржавы. Збожжа адразу паля арфавання насыпалі ў мяхі і на падводах вязлі ў Бягомль у «закрома Родины». Але так здарылася, што на гэты раз упаўнаважаным быў мой стрыечны брат Аляксандр Венядзіктавіч Капылоў. Яго бацька і мой – родныя браты. Аляксандр быў старэйшы за мяне на 25 гадоў. Ён быў на фронце з першага дня вайны, атрымаў званне маёра, быў паранены і ў 1944 годзе звольнены з арміі. Аляксандр зазірнуў у зямлянку, дзе мы жылі. Нас там было, як селядцоў у бочцы. Ён паразмаўляў з маёй мамай, паабяцаў дапамагчы і адбыў у Бягомль. Што адбылося ў Бягомлі, Аляксандр мне расказаў амаль праз 40 гадоў, пры нашай сустрэчы ў 1983 годзе пасля майго выхада на пенсію. Я вярнуўся ў Мінск

на пастаяннае месцапражыванне, і пасля ўладкавання наведаў брата.

Пабываўшы ў нас у зямлянцы і ўбачыўшы наша жабрацкае становішча, ён сустрэўся з 1-м сакратаром райкама партыі Манковічам – з тым самым, які адправіў майго бацьку на фронт. А потым, будучы камісарам брыгады «Жалязняк», натхняў партызан на тэрор супраць мірнага насельніцтва і сам удзельнічаў у такіх аперацыях. Пасля вызвалення раёна Чырвонай Арміяй ён зноў заняў пасаду 1-га сакратара райкама Бягомльскага раёна. Але мой стрыечны брат Аляксандр такіх падрабязнасцяў не ведаў. Пры сустрэчы з Манковічам ён сказаў: «Як вам не сорамна, сям'я франтавіка, нязменнага даваеннага старшыні калгаса жыве ў нязносных умовах. Трэба ім дапамагчы. Кіраўніцтва вобласці будзе трымаць гэта пытанне на кантролі».

Яго папярэджанне спрацавала. Улады раёна знайшлі дзесьці стары хлеў, разабралі яго і перавезлі на наша гумно. У нас з'явілася надзея, што хутка ў нас будзе свая хата. Будаўніцтва хоць і марудна, але рухалася. Талакой склалі зруб. Да восеньскіх дажджоў паставілі страху. Важным атрыбутам хаты з'яўляецца печ. Пра печ у мяне засталіся самыя цёплыя ўспаміны з дзяцінства. Прыдзеш з вуліцы, з марозу, і адразу туды, яна заўсёды была цёплая, утульная.

Для яе пабудовы патрэбна цэгла. Яе мы навучыліся вырабляць самі. Побач з вёскай ёсць залежы гліны. Яе мы здабывалі ўручную, добра размешвалі, фармавалі і гатовую цэглу раскладвалі на спецыяльны насціл для прасушкі. Але для такіх элементаў печы, як под і скляпенне (неба), патрэбна была вогнетрывалая цэгла. Рабіць яе мы не ўмелі. Я з мамай узялі ручную цялежку і пайшлі ў Вітунічы. Там на папялішчы спаленай школы набралі такой цэглы і пацягнулі яе дадому. Ад Вітуніч да Нябышына 2 км. Праз кожныя 100–200 м мы прыпыняліся, каб адпачыць. Мы выбіваліся з сіл. Нарэшце мы дабраліся да моста цераз Поню. І тут нам не пашанцавала. Якраз на сярэдзіне моста нам сустрэўся старшыня сельсавета Спірыдон Барздыка, той самы Барздыка, які быў камісарам 1-га атрада партызанскай брыгады «Жалязняк». Ураджэнец свярдлоўскай вобласці, рускі, адукацыя пачатковая, але камуніст. Дома яго чакала жонка, сям'я, але ў Беларусі яму было лепш, чым на Урале.

Калі гэтыя мае ўспаміны друкаваліся ў газеце «Народная воля», мне патэлефанаваў адзін чытач газеты, ураджэнец вёскі Гняздзілава. Ён памятае партызанскага камісара Спірыдона Барздыку і расказаў мне, што той прыкмеціў з гэтай вёскі маладую адзінокую жанчыну і зрабіў яе сваёй сужыцелькай. Трэба адзначыць, што Барздыка з твару выглядаў непрыемна, нават брыдка. Але яна не магла адмовіцца ад такой прапановы – гэта ж партызанскі камісар, ідзе вайна. Невядома, чым бы ўсё закончылася, калі б яна стала супраціўляцца. Барздыка асеў у нашай мясцовасці на нашу бяду. Савецкай уладзе патрэбны былі надзейныя кадры на ўсіх кіруючых пасадах. Сярод мясцовых беларусаў такіх не адшукалася, усе, хто жыў ва ўмовах акупацыі, траплялі пад падазрэнне, ім не ыло даверу.

Параўняўшыся з намі, Барздыка спыніў сваю брычку. Ён ездзіў, як пан, на брычцы, і стаў крычаць на нас, што мы раскрадальнікі дзяржаўнай маёмасці, што нас чакае Калыма. Ён адабраў у нас цялежку з цэглай і спіхнуў яе з моста на самае глыбокае месца ракі Поні. Пасля гэтага ён нас адпусціў. Мы ішлі дадому з пустымі рукамі. Было крыўдна. Мама плакала, а мне хацелася яму адпомсціць. Я нават уявіў сабе, як кідаюся на яго з кулакамі. Потым мой брат Андрэй нейкім чынам дастаў цялежку з дна ракі.

Наступіла першае верасня 1945 года. У другі клас я пайшоў з хаты дзядзькі Лаўрэна.

## 37. Гуманітарка

Дзіва, але і ў нашу вёску даходзіла амерыканская гуманітарная дапамога. Аднойчы старшыня калгаса Міша Кузьміч уручыў мне ватоўку, якую зараз бы назвалі курткай. Яна была светла-жоўтага колеру, велікаватая, але цёплая. Я яе насіў некалькі гадоў. Потым брат Андрэй прынёс мне боты. Яны былі карычневага колеру, халявы брызентавыя, а ніз скураны. Некалькі разоў нам даставаліся кардонныя каробкі з харчовымі наборамі. Сярод харчовых прадуктаў, якія мне запомніліся, была бляшанка павідла, бляшанка салёных арэшкаў, 3-кілаграмовая бляшанка гарохавай (а можа, соевай) мукі, яечны парашок, аскарбінавая кіслата і кава ў аднаразовых пакеціках з фальгі. Атрыманне гуманітаркі было радаснай падзеяй.

# 38. Весці з Манчжурыі

Вайна працягвалася. Мой бацька змагаўся з японцамі ў далёкай Манчжурыі. Мы атрымлівалі ад яго рэдкія лісты. Пасля ўрокаў я наведваўся да дзядзькі Сцяпана, ён выпісваў газету «Советская Белоруссия». У першую чаргу я знаёміўся з паведамленнем «От Советского Информбюро». 3 верасня 1945 года Японія капітулявала. Мы радаваліся, аднак у сярэдзіне верасня атрымалі ліст з Манчжурыі ад незнаёмага нам афіцэра, які паведаміў, што наш бацька загінуў 19 жніўня 1945 года пад горадам Мукдэнам. Праз нейкі час мы атрымалі і «пахавальную».

Памятаю, як мама нават пасварылася з дзядзькам Лаўрэнам. Яна палічыла, што калі б ён на тым сходзе не выказаўся так адмоўна супраць калгаса, то Пііп застаўся б старшынёй, і яго б не забралі на фронт. Дзядзька Лаўрэн прамаўчаў. Ён мог сказаць вострае слова, але быў добрым чалавекам. На абвінавачванне з боку мамы ён не звярнуў увагі. Мы па-ранейшаму пражывалі ў яго хаце.

Смерць бацькі асабліва цяжка ўспрыняла мама. Кожны дзень пасля працы ў калгасе яна ішла к аселіцам, дзе быў наш агарод ,і там давала волю слязам. Яна плакала па сыне Мікалаю, па сыне Сяргею, па мужу. Слухаць яе плач было нязносна. Гэта быў не проста плач – яна вымаўляла сказ за сказам, атрымлівалася бясконцая жалобная песня, якая брала за душу. Некалькі разоў я падкрадаўся да яе і, хаваючыся за кустамі, слухаў. Але ў мяне не хапала рашучасці, каб падысці да мамы і штосьці сказаць суцяшальнае. Здаецца, яна выплакала ўсе свае слёзы.

Праз нейкі час з вайны вярнуўся Клоп – жыхар суседняй вёскі Старое Запонне, які служыў з маім бацькам у адным і тым жа тылавым падраздзяленні. Ён расказаў, што наш бацька загінуў ад выпадковай кулі, якая папала яму ў галаву. Ужо некалькі дзён ніякіх баявых дзеянняў не адбывалася, стаяла цішыня. Яшчэ 14 жніўня 1945 года Японія афіцыйна прыняла ўмовы капітуляцыі, якія прадыктавалі ЗША. І вось 19 жніўня прагучаў адзіночны стрэл, і мой бацька загінуў. Хто страляў, не высветлена.

Пасля таго як гэтыя мае ўспаміны апублікавала газета «Народная воля», і ў адрас рэдакцыі і асабіста мне прыйшло шмат лістоў ад чытачоў. Вось адзін з іх ад Канстанціна Сярдзюка з Бабруйска:

«Я успел повидать многое, даже страшные лагеря в Коми. И по своему опыту могу сказать, что когда призывали на войну

таких людей, как ваш отец, то ставили в личной карточке такую закорючку, по которой любой военный оперативник знал, что этот человек живым вернуться не должен.

Ваш отец выжил в войне с немцами. Вот уже и с японцами всё идёт к окончанию, а он живой, пуля его не берёт. И тогда задачу по его устранению берёт на себя оперативник СМЕРШа. Такова была звериная логика той власти. Любой нормальный человек вызывал у неё подозрение и реакцию на уничтожение».

Хутчэй за ўсё так яно і было: віной майго бацькі было тое, што ён адмовіўся ад пасады старшыні калгаса, за гэта яго і забілі.

Тут я стаўлю кропку пад сваімі ўспамінамі. Перада мной стаяла мэта асвятліць тыя падзеі Другой сусветнай вайны, якія тычыліся мяне асабіста і маёй сям'і. Лічу, што гэта я выканаў.

Далей я крыху паразважаю, выкладу свае меркаванні аб Другой сусветнай вайне.

## Частка 2.

# РАЗВАЖАННІ

## 1. Беларусы ў Другой сусветнай вайне

Гэта ўжо не ўспаміны, а мае меркаванні, мае высновы, мой погляд на падзеі Другой сусветнай вайны. Гэта маё ўласнае, можа павярхоўнае, можа, у чымсьці недакладнае, але ўсё ж такі даследаванне.

У першую чаргу трэба адзначыць, што беларусы ўступілі ў Другую сусветную вайну 1 верасня 1939 года, калі на Польшчу, у склад якой уваходзіла значная частка Беларусі, напала гітлераўская Германія. А 17 верасня на Польшчу напаў СССР, хаўруснік Германіі. У складзе польскай арміі было шмат беларусаў. Беларусы змагаліся і за Польшчу, і за Беларусь. Германія і СССР у аднолькавай меры з'яўляюцца вінаватымі ў распальванні самай крывавай, самай бесчалавечнай вайны XX стагоддзя. 22 верасня 1939 года ў Брэсце адбыўся сумесны ваенны парад савецкіх і нямецкіх войскаў, прысвечаны разгрому і падзелу Польшчы. Парад прымалі з нямецкага боку генерал Гудэрыян, з савецкага боку камбрыг Крывашэін. Яны абмяняліся сцягамі. Гудэрыян уручыў Крывашэіну фашысці сцяг, а ўзамен атрымаў савецкі сцяг. Цікава, у якіх музеях зараз знаходзяцца гэтыя «рэліквіі»? Пасля параду палонных палякаў і беларусаў накіравалі ў савецкія канцлагеры, а потым расстралялі ў Катыні і іншых месцах.

Пасля савецкай акупацыі заходніх абласцей Беларусі, супраць заходніх беларусаў пачаліся поўнамаштабныя масавыя рэпрэсіі. У газеце «Народная воля» за 4.08.1998 г. прыведзены наступныя даныя: 3 верасня 1939 года па 22 чэрвеня 1941 года з Заходняй Беларусі на савецкую тэрыторыю (у Сібір, на Поўнач, у Казахстан) было дэпартавана:

– ваеннапалонных – 46 тысяч;

– грамадзян (мужчын), абвінавачаных органамі савецкай улады – 250 тысяч;

– іншых грамадзян, сем'яў абвінавачаных, людзей, папаўшых пад падазрэнне – 990 тысяч.

Да гэтага трэба дадаць, што за той жа перыяд было расстраляна 135 тысяч чалавек. Як можна, узважыўшы ўсё гэта, лічыць дзень 17 верасня днём вызвалення заходніх беларусаў ад польскага прыгнёту?! Наадварот, пасля «пераможнага» параду, супраць нашых суайчыннікаў працягвалася поўнамаштабная вайна. 19 чэрвеня 1941 года, усяго за тры дні да нападу Германіі на СССР, з Беларусі на Усход была адпраўлена апошняя партыя беларусаў колькасцю 22 тысячы чалавек. Гэта больш за 300 біткам напоўненых вагонаў-цялятнікаў, каля 20 эшалонаў. Толькі 22 чэрвеня 1941 года спынілася тое бязмежжа з боку савецкага рэжыму.

Пачалася так званая Вялікая Айчынная вайна. Паняцце «айчынная» – спрэчнае. Так, беларусы змагаліся за сваю Айчыну. Але за яе змагаліся і тыя, хто быў на баку Чырвонай Арміі, і тыя, хто быў на баку немцаў. Апошнія наіўна спадзяваліся, што з рук немцаў можна было атрымаць незалежнасць сваёй Айчыны – Беларусі. Яны ў другі раз наступілі на адны і тыя ж граблі. Так на пачатку XIX стагоддзя нашы продкі таксама спадзяваліся, што Напалеон падорыць ім на сподачку незалежнае ВКЛ. Тады таксама беларусы былі і ў войску Напалеона і ў войску Кутузава.

Які ўнёсак зрабілі беларусы ў ход Другой сусветнай і Вялікай Айчынай вайны? Калі нас вызваліла Чырвоная Армія з-пад акупацыі, мой бацька сказаў, што нас можна лічыць героямі, пераможцамі. Мы перамаглі, перахітрылі смерць. На нас была накіравана зброя з двух бакоў – з боку немцаў і з боку партызан. Мы лавіравалі між імі і ім назло выжылі ў неверагодных умовах. Мoжа, мой бацька меў рацыю, што Беларусь існуе ў першую чаргу дзякуючы той частцы насельніцтва, якая здолела выжыць ва ўмовах акупацыі.

Па даных дзяржаўных СМІ, у складзе Чырвонай Арміі змагалася ад 1,3 мільёна да 1,5 мільёна беларусаў. Загінула ад гэтай колькасці ад 800 тысяч да аднаго мільёна чалавек, сярод іх і мой бацька. Чаму такія вялікія страты, гэтае пытанне я ўжо вышэй закранаў.

Беларусы не надта імкнуліся ваяваць. У архіве Генеральнага сакратара ЦК КПСС (Асобая папка), які быў рассакрэчаны першым прэзідэнтам Расіі Барысам Ельцыным, захоўваецца даклад Панамарэнкі Сталіну. Сталін трымаў Беларусь пад асобым кантролем. Ён добра ведаў гісторыю, ведаў, як беларусы ліхаманілі

імперыю: паўстанне Тадэвуша Касцюшкі 1794–1795 гадоў, паўстанне 1830–1831 гадоў, паўстанне Кастуся Каліноўскага 1863–1864 гадоў.

Сталін не мог даравацць беларусам утварэнне БНР і Слуцкае паўстанне. Калі немцы акупавалі Беларусь, Сталін выклікаў Панамарэнку і загадаў яму падрыхтаваць даклад пра становішча ў Беларусі. Гэты даклад лёг на стол Сталіну ў верасні ці кастрычніку 1941 года. З даклада можна даведацца, што з 3,335 мільёна чырвонаармейцаў, якія здаліся ў нямецкі палон у першыя месяцы вайны, беларусы складаюць 1,5 мільёна, ці 40 адсоткаў. (Усяго ў нямецкі палон за 1941–1945 г. папала 5,754 мільёна чырвонаармейцаў.) Далей з даклада Панамарэнкі можна даведацца, што эшалоны з мабілізаванымі беларусамі, якіх везлі на ўсход для фарміравання і папаўнення воінскіх часцей, па дарозе разбягаліся, і эшалоны на месцы прызначэння прыбывалі амаль пустымі. Колькі было такіх эшалонаў, колькі было такіх уцекачоў, нашых землякоў – мне невядома. Безумоўна, архіўныя дакументы з «Асобай папкі» генсека асабіста я сам не чытаў, у сваіх руках яе не трымаў, не гартаў яе выцвілыя старонкі. Аб усім гэтым я даведаўся з тэлеперадачы журналіста, гісторыка Леаніда Млечына на тэлеканале ТВЦ. 50-хвілінная перадача, прысвечаная падзеям на Беларусі 1941 года, была паказана 28.06.2004 года.

Але ж беларусы змагаліся, і змагаліся не толькі ў складзе Чырвонай Арміі і прамаскоўскіх партызан. Шмат беларусаў змагалася ў партызанскіх атрадах Арміі Краёвай, якія дзейнічалі як на тэрыторыі Польшчы, так і на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Беларусы змагаліся і ў складзе Арміі Краёвай пад камандаваннем польскага генерала Андэрса, якая дзейнічала на тэрыторыі Італіі ў Паўночнай Афрыцы. У бітве за Монтэ-Касіна загінула 264 беларусы, за Балонію – 287 беларусаў, за Ларэту – 234. Агулам у Паўночнай Афрыцы і ў Італіі загінула 1583 беларуса ці ўраджэнца Беларусі. Больш падрабязна аб гэтым можна азнаёміцца ў часопісе «Беларускі гістарычны зборнік» № 17.

Шмат беларусаў было ў складзе польскіх фарміраванняў пад брытанскім камандаваннем. Яны ваявалі ў Францыі, Бельгіі, Галандыі, Нарвегіі, Нямеччыне і ў іншых краінах. Усяго ў войску саюзнікаў змагалася ад 24,5 тысячы да 35 тысяч беларусаў.

У арміі Андэрса ў Італіі змагаўся і наш знакаміты зямляк Пётра Конюх. На прывалах паміж баямі ён для жаўнераў спяваў беларускія песні. Пры бітве за Монтэ-Касіна быў паранены ў бя-

дро – вайна для яго закончылася. Ён атрымаў ваенную стыпендыю на навучанне ў Акадэміі мастацтваў Італіі, якую бліскуча закончыў. Пётра Конюх стаў сусветна вядомым спеваком.

У заключэнне хачу сказаць, што сцвярджаць, быццам бы Беларусь адыграла вядучую ролю ў разгроме фашысцкай Германіі і вызваленні Еўропы з-пад акупацыі, я б не стаў. У той час Беларусь не была самастойнай дзяржавай, не мела ўласнай арміі. Яна была прыдаткам СССР і сама нічога не вырашала. Другая справа, што Беларусь, нароўні з Польшчай, найбольш пацярпела ад вайны, панесла вялікія разбурэнні і страты. Але тыя разбурэнні і страты Беларусь панесла як па віне нямецкіх захопнікаў, так і па віне савецкага рэжыму.

Хачу адзначыць, што і мы, тая частка насельніцтва, якая апынулася пад нямецкай акупацыяй – героі. Героі таму, што ў неверагодна складаных умовах змаглі выжыць. Кожны пражыты дзень, асабліва пачынаючы з 1943 года, калі пачалося партызанскае бязмежжа – подзвіг. Але савецкая ўлада гэтага не ацаніла – мы сталі нядобранадзейнай часткай насельніцтва.

## 2. Міты пра партызанскі рух у Беларусі

Пра партызан, пра партызанскі рух складзена, прыдумана шмат мітаў. Тыя міты прыдумалі самі ж партызанскія начальнікі і камісары. Потым гэтыя міты падхапілі, выказваючыся сённяшнім жаргонам, «чэсныя» журналісты і прыдворныя пісьменнікі.

***Міт першы***, быццам бы партызаны нанеслі немцам велізарны ўрон. Насамрэч, калі страты і былі нанесены, дык хутчэй за ўсё не немцам, а мірнаму насельніцтву. Я ўжо прыпамінаў мост цераз раку Поню. А такіх жа мастоў і масткоў у Беларусі была не адна тысяча. Разбуры кладкі цераз ручэй і адсылай наверх данясенне, што знішчаны яшчэ адзін стратэгічны аб'ект. Прачытаў неяк мемуары камбрыга Ціткова «Брыгада Жалязняк». З іх я даведаўся, што партызаны ў маёй роднай вёсцы двойчы разграмілі нямецкі гарнізон. Але ж у вёсцы Нябышына за ўсю вайну ніколі не было нямецкага гарнізона. Немцы ў нас не прыпыняліся нават на некалькі гадзін. Як можна двойчы разграміць тое, чаго ўвогуле не існавала. Часова ў нас размяшчаліся «радзіёнаўцы», але супраць іх партызаны нават пікнуць баяліся.

***Міт другі***, быццам бы партызаны абараняпі насельніцтва ад немцаў. На маю думку, гэта хлусня. Калі немцы і паліцаі забівалі людзей у вёсках Шуняўка, Вітунічы, Нябышына, партызаны спакойна назіралі са сваіх сховішчаў, як праходзіць працэс. Яны пальцам аб палец не ўдарылі, каб абараніць людзей. Ніхто з іх не праявіў геройства і самаахвярнасці, не выступіў са зброяй у абарону вёсак і іх насельніцтва. А ведалі ж, што вось-вось адбудзецца трагедыя, інфармаваныя былі раней за немцаў. Ды і задачы такой – абараняць насельніцтва – перад імі ніхто не ставіў. На маю думку, самай надзейнай абаронай мясцовага насельніцтва ад акупантаў было б тое, каб партызан увогуле не было. Яны сваёй прысутнасцю стваралі небяспечныя ўмовы для існавання акупаваных вёсак і жыцця іх жыхароў і, магчыма, стваралі іх свядома і наўмысна. Калі гэта так, то партызан можна лічыць саўдзельнікамі ў злачынствах. Але самі яны спраўна складалі акты і пратаколы аб злачынствах нямецка-фашысцкіх акупантаў і адпраўлялі іх у Маскву. Аб гэтым больш падрабязна я скажу ніжэй.

***Міт трэці***, быццам бы партызанскі рух у Беларусі быў масавым, усенародным. І тут, мякка кажучы, да праўды вельмі далёка. Раблю такую выснову з прыкладу сваёй вёскі. Як гэтыя масавасць і ўсенароднасць забяспечваліся, аб гэтым таксама скажу.

## *Першы этап партызанскага руху*

На мой погляд, ён ахоплівае перыяд з чэрвеня 1941 года па снежань 1942 года. За гэты час з нашай вёскі ніводзін чалавек не пайшоў у партызаны. Нямецкая акупацыйная адміністрацыя паступіла прадбачліва, дазволіла сялянам трымаць паўнавартасную гаспадарку. Вёска добра памятала здзекі савецкай улады, калі людзей сілком заганялі ў калгасы, раскулачвалі, арыштоўвалі, высылалі на поўнач, у Сібір і Казахстан. Наша вёска звычайная, такая ж, як і большасць вёсак Усходняй Беларусі. Першым партызанам з нашай вёскі стаў паліцай, адзіны паліцай – наш аднавясковец. Я не ведаю, што падштурхнула гэтага 18-гадовага хлопца стаць паліцаем. Можа, права мець у сваіх руках зброю? Але ж тую зброю ён ні разу не прымяніў. Ён блытаўся па вуліцы з вінтоўкай на плячы, як непрыкаяны, ніхто на яго не звяртаў увагі. Часам ён заходзіў да каго-небудзь у хату, у тым ліку і да нас. Ён не пытаўся ў гаспадароў дазволу, каб увайсці, не вітаўся, садзіўся на лаву, прысланяў да сцяны вінтоўку і сядзеў

моўчкі. Гэта магло працягвацца 1–2 гадзіны. Аб чым ён думаў, што ў яго было на душы, сказаць цяжка. Як толькі здарылася магчымасць, ён са зброяй, якую яму ўручылі немцы, падаўся да партызан. Але партызаны не ацанілі яго «патрыятычны» ўчынак, хутка яго знайшлі забітым у патыліцу. Першыя так званыя партызаны былі чужынцамі на нашай тэрыторыі. Яны маглі існаваць толькі за кошт рабаўніцтва мясцовага насельніцтва. А мясцовы жыхар, якім быў наш аднавяскоўвец-паліцай, мог замінаць ім рабаваць, мог быць сведкай іх злачынстваў, таму яго і забілі.

Першыя партызаны, якімі былі брадзячыя групы адстаўшых ад фронту чырвонаармейцаў, не былі арганізацыйна аб'яднаны і таму надвор'я не стваралі. Як я ўжо казаў, яны па начах рабавалі і мардавалі насельніцтва, а сустрэч з немцамі пазбягалі. Яны мелі нейкую стралковую зброю, але боепрыпасаў у іх не хапала. Акрамя чырвонаармейцаў у лясах хаваліся партыйныя функцыянеры і чыноўнікі раённага маштабу. Па дадзеных мемуараў нкусаўца Ваўпшасава і камбрыга брыгады «Жалязняк» Ціткова на канец 1942 года (заўважце, што вайна ўжо працягваецца цэлых паўтара года) у лясах Бягомльскага раёна хавалася некалькі груп такіх вось псеўдапартызан агульнай колькасцю ўсяго толькі 122 чалавекі. Магчыма, такі ж самы малюнак назіраўся і ў іншых раёнах Беларусі. Надзеі Крамля на ўсенародны супраціў ворагу на акупаванай тэрыторыі не спраўдзіўся.

Каб высветліць, якое становішча склалася на акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі і Украіны, пад Масквой сталі тэрмінова фарміраваць «Асобую мотастралковую брыгаду асобага назначэння НКУС СССР». Як бачыце, назва вельмі ўнушальная. Брыгада складалася з некалькіх батальёнаў. Там рыхтаваліся высакакласныя спецыялісты шырокага профілю. Пасля падрыхтоўкі фарміраваліся групы па 30–40 чалавек і перапраўляліся на акупаваную немцамі тэрыторыю. Групы добра экіпіраваны ўсім неабходным, былі добра ўзброены. У іх склад уваходзіла па некалькі чалавек, падрыхтаваных на пасады камандзіраў партызанскіх атрадаў. Кожная група мела свой маршрут і замацаваную за ёй тэрыторыю ў тыле немцаў. Задачы груп: пашырэнне партызанскага руху, разведка, дыверсіі, іншыя асобыя задачы – расправа над тымі, хто працаўладкаваўся ў немцаў, каб неяк пракарміць свае сем'і. А гэта былі лекары, настаўнікі, артысты, журналісты, інжынерна-тэхнічныя спецыялісты, чыгуначнікі, дробныя служачыя і іншыя.

Адной з такіх груп з неабмежаванымі паўнамоцтвамі кіраваў нкусавец Ваўпшасов. Яны шукалі дробныя бадзяжныя групы чырвонаармейцаў, каб аб'яднаць іх у партызанскія атрады. У выпадку непадпарадкавання – расстрэл на месцы. Па начах група Ваўпшасава наводзіла жах на мірнае насельніцтва ў вёсках, карала «здраднікаў». Але колькасць партызан ад гэтага не павялічвалася, а наадварот, узрасла нянавісць да іх.

Сам Ваўпшасаў – гэта мацёры тэрарыст. Чаму менавіта яго накіравалі на тэрыторыю Беларусі? У даваенныя часы ён служыў тут у нкусаўскіх часцях і добра ведаў мясцовасць. У сваю чаргу ён падбіраў людзей такіх жа, як і сам, нкусаўцаў-тэрарыстаў з ліку камуністаў і камсамольцаў. Галоўным патрабаваннем к складу групы, акрамя фізічнай і прафесійнай падрыхтоўкі, было – воля і гатоўнасць забіваць, падрываць, падпальваць. Група Ваўпшасава перайшла лінію фронту ў сакавіку 1942 года.

Дарэчы, тут варта прыпомніць яшчэ аднаго савецкага тэрарыста – Кірыла Арлоўскага, ураджэнца вёскі Мышковічы Магілёўскай вобласці. Ён, пачынаючы з 1918 года, прайшоў усе ўніверсітэты тэрора: ЧК, ВЧК, ОГПУ, НКВД... Лічу вялікай памылкай, што гэтыя словы, жудасныя словы, перакладаюцца на беларускую мову. Ад перакладу яны губляюць свой злавесны сэнс. НКВД, КГБ... – гэтыя словы гучаць аднолькава на ўсіх мовах свету і наводзяць жах. Кірыл Арлоўскі – гэта высокапрафесійны тэрарыст, мацёры, халаднакроўны забойца. З 1920 года па 1925 год ён «партызаніў» на тэрыторыі Польшчы ў Заходняй Беларусі: узрываў масты, захопліваў чыгуначныя станцыі, мястэчкі, памешчыцкія сядзібы, спыняў пасажырскія цягнікі. І ўсё гэта суправаджалася забойствамі людзей.

Каб чытачы не палічылі, што я безпадстаўна абгаварыў двойчы героя – Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы, старшыню перадавога калгаса «Рассвет» Магілёўскай вобласці Кірыла Арлоўскага, прывяду вытрымку з яго аўтабіяграфіі, якую ён напісаў уласнаручна 10 лютага 1941 года: «За один только 1924 год по моей инициативе и лично мной было убито больше 100 человек жандармов и помещиков». Але ж у 1924 годзе СССР і Польшча паміж сабой не ваявалі, у 1921 годзе была падпісана рыжская мірная дамова. Можа НКВД (НКУС) і Арлоўскі пра гэта не ведалі?

Як прафесіянала, у студзені 1937 года Арлоўскага накіравалі ў Іспанію, каб дапамагчы іспанцам у братазабойчай вайне. Якой

была тая «дапамога», ён шчыра выклаў у сваім данясенні Цэнтру ад 23 ліпеня 1937 года. Гэта падрывы таварных і пасажырскіх цягнікоў, аўтамашын, пабудоў, электраліній і шмат чаго іншага. І ўсё гэта суправаджалася забойствам людзей. Вось вельмі цікавая вытрымка з «данясення»:

> «Ночью, вернее в 10 часов вечера, 11 июня 1937 года мною взорван пассажирский поезд... Упомянутый взрыв не дал значительного разрушения и жертв... В это время я с группой находился в 300 метрах от поезда в лесу, я ... настаивал быстро пойти к поезду и перебить хотя бы командный состав противника, но большинство испанцев в группе относится к фашистам, от которых партизанам, в частности мне с группой на каждом километре приходилось получать поддержку».
>
> (*Народная газета 25–27.02.1995 г.*)

Шаноўныя чытачы, вы што-небудзь зразумелі? Арлоўскі ў Іспаніі «змагаўся» супраць фашыстаў, у склад яго групы ўваходзілі фашысты і на кожным кіламетры ён атрымліваў падтрымку ад фашыстаў. Тут напрошваецца высновa, можа, Арлоўскаму і была пастаўлена задача змагацца не з фашыстамі, а на іх баку супраць таго крыла рэспубліканцаў, якое не пажадала гуляць пад дудку СССР і вяло незалежную палітыку?

6 ліпеня 1944 года Арлоўскі напісаў Заяву Сталіну. Вось фрагмент с той Заявы:

> «... с 1918 по 1943 год мне посчастливилось 8 лет работать в тылу врагов СССР в качестве командира партизанских отрядов и диверсионных групп, нелегально переходить линию фронта и государственную границу свыше 70 раз, выполнять правительственные задания, убивать сотни отъявленных врагов Советского Союза как в военное, так и в мирное время...»

У траўні 1942 года Арлоўскага на чале разведвальна-дыверсійнай групы перакінулі за лінію фронту на тэрыторыю Баранавіцкай вобласці. На працягу 1942 года дзесяткі такіх вось разведвальных, дыверсійных, тэрарыстычных груп, атрадаў было закінута на тэрыторыю Беларусі. Зразумела, што партызанамі іх назваць нельга. Вось так я характарызую Першы этап партызанскага руху.

## *Другі этап партызанскага руху*

Ён ахоплівае перыяд са студзеня 1943 года па ліпень 1944 года. Кіраўнікі Крамля зразумелі, патрэбна іншая, больш жорсткая тактыка. Каб выгнаць насельніцтва са сваіх хат, са сваіх вёсак і загнаць у лес да партызан, трэба было ўжыць больш дзейсныя рэпрэсіўныя меры. Як на злосць, немцы не надта зверствавалі, для іх было значна важней, каб сяляне працавалі, спраўна плацілі падаткі. Велізарнае войска трэба было карміць. Я абапіраюся на прыклады з жыцця маёй вёскі ва ўмовах акупацыі.

Крамлю не пашанцавала і з гаўляйтэрам Беларусі. Кубэ быў мяккі, наколькі такое магчыма ў ваенны час, ліберальны інтэлігент. Ён шляўся па тэатрах і музеях, якія былі адноўлены ў Мінску, дзякуючы яго асабістым намаганням. Ён быў пісьменнікам, драматургам, аўтарам п'ес, якія ставіліся не толькі на падмостках мінскіх тэатраў, але і ў шмат якіх краінах Еўропы. Кубэ быў няздатны. Нават вырашэнне габрэйскага пытання ён некалькі разоў адкладваў, марудзіў час. Крэмль абураўся і было чаго. Атрымлівалася, што заслоны НКВД (НКУС) дарэмна кулямётнымі чэргамі вярталі натоўпы габрэяў назад у Мінск, не дазволіўшы ім эвакуіравацца, асудзілі іх на немінучую гібель. Што ўсё адбывалася менавіта так, прывяду прыклад. 26.09.2004 года на расейскім тэлеканале ТВЦ была паказана тэлеперадача «Вокзал Победы. Последний из гетто». У перадачы прагучаў расказ габрэйкі, якая да вайны і ў часы акупацыі пражывала на тэрыторыі Беларусі, а зараз пражывае ў Расіі: «На второй день войны мы хотели эвакуироваться, но все дороги с Беларуси на восток были перекрыты отрядами НКВД. При попытке пройти или проехать заградительные отряды НКВД открывали стрельбу. НКВД нас вернул в руки немцев».

Дзеяннямі Кубэ былі незадаволены і ў Берліне. Не ў першы раз у двух дыктатараў, у Сталіна і Гітлера, супалі думкі, мэты, намеры. Кубэ пара адхіляць ад пасады, а самы лёгкі спосаб для гэтага – проста яго знішчыць. Супраць Кубэ была дэталёва падрыхтавана і здзейснена тэрарыстычная, на маю ўласную думку, сумесная аперацыя гестапа і НКВД (НКУС). Наіўна лічыць, што ў рэзідэнцыю Кубэ можна было пранесці выбуховае прыстасаванне без маўклівай згоды гестапа. Забойства Кубэ адмоўна і трагічна адбілася на лёсе беларусаў. На яго месца прыйшоў генерал СС Курт Готберг, які задавальняў і Маскву і Берлін.

Калі немцы не чыняць рэпрэсіі і злачынствы на акупаванай Беларусі або чыняць іх не ў тых маштабах, як хацелася б Маскве, іх (немцаў) трэба к гэтаму прымусіць, справакаваць. Пачалася падрыхтоўка да другога этапа. Каб планаваць рэпрэсіўныя аперацыі супраць насельніцтва, патрэбны быў планавы орган. Крэмль 30.05.1942 года стварыў Цэнтральны Штаб партызанскага руху на чале з Першым Сакратаром ЦК кампартыі Беларусі Панамарэнкам, ураджэнцам Краснадарскага краю, па нацыянальнасці ўкраінцам.

Звяртаю ўвагу чытачоў на тое, што Штаб быў створаны не ў чэрвені 1941 года, калі пачалася вайна, а амаль праз год, калі спадзяванні Крамля, што ўсенародны партызанскі рух пачнецца сам сабой, правaліліся. Штаб распачаў падрыхтоўку непасрэдных выканаўцаў злавесных планаў Крамля. І для майго Бягомльскага раёна былі сфарміраваны партызанскія атрады. Іх фарміраванне пачалося ў ліпені 1942 года, на тэрыторыях Кіраўскай, Маскоўскай і Тульскай абласцей. Гэта быў касцяк будучай партызанскай брыгады «Жалязняк». Штаб брыгады фарміраваўся ў падмаскоўнай Барвісе. Камандзірам брыгады быў прызначаны камандзір сапёрнага батальёна маёр Ціткоў, туляк. Потым усе гэтыя фарміраванні, так званыя партызанскія атрады, а на самай справе паўнавартасныя добраўзброеныя армейскія падраздзяленні, пераправілі праз лінію фронту на тэрыторыю акупаванай Беларусі. Да месца свайго базіравання ў Бягомльскіх лясах атрады пaступова прыбылі ў канцы кастрычніка 1942 года. Да канца года ішло ўладкаванне іх баз сталага знаходжання.

Пачатак 1943 года – гэта пачатак «актыўных» дзеянняў партызан. Але супраць каго іх дзеянні былі накіраваны? Дастаткова і неглыбокага аналізу, каб высветліць, якія задачы стаялі перад партызанамі. Ды яны і самі не надта гэта хавалі. А задачы, на маю думку, наступныя:

1. Барацьба супраць партызан Арміі Краёвай, у складзе якой былі як палякі, так і беларусы.

2. Расправа з той часткай насельніцтва, якая «супрацоўнічала» з немцамі (уладкавалася на працу, каб пракарміць сям'ю) ці ставілася да іх лаяльна.

3. Арганізацыя правакацый, каб падштурхнуць немцаў на правядзенне рэпрэсій супраць мірнага насельніцтва.

4. Пры дапамозе рэпрэсій з боку немцаў і сваіх уласных прымусіць насельніцтва Беларусі пакінуць сваё жыллё і падацца ў лясы, гэтым самым папоўніць шэрагі партызан.

5. Пераключыць увагу сусветнай супольнасці са злачынстваў савецкага камуністычнага рэжыму супраць свайго насельніцтва на злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў (Хатынь супраць Катыні).

6. Схаваны працяг генацыду супраць беларускага народа з боку маскоўскага рэжыму.

Партызаны Арміі Краёвай змагаліся супраць немцаў па-сапраўднаму, яны не займаліся імітацыяй. Таму немцы спрыялі прамаскоўскім партызанам у іх барацьбе з АК. Яны прапускалі іх на захад праз свае гарнізоны без адзінага выстрала. Так узгаданыя мной партызанскія атрады Мядзведзева і Шляхтунова без перашкод былі прапушчаны ў Заходнюю Беларусь праз мястэчка Докшыцы, дзе знаходзіўся моцны нямецкі гарнізон.

Тады мы гэта ўспрымалі, як геройскі ўчынак партызан. Мы і не здагадваліся, што гэта была змова, што тут адбылося супадзенне інтарэсаў Масквы і Берліна. Для Крамля партызаны Арміі Краёвай у Беларусі былі больш небяспечнымі ворагамі, чым нямецка-фашысцкія захопнікі. Крэмль, ачуняўшы ад 1941 года, ужо планаваў, якой будзе Еўропа, якой будзе Польшча пасля вайны. Партызаны Арміі Краёвай маглі заблытаць усе планы.

Колькі «здраднікаў» забілі партызаны, магчыма, такая лічба дзесьці ў архівах існуе, але яна для даследчыкаў хутчэй за ўсё недаступна. Вось што піша Марк Бартушка ў сваёй кнізе «Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг.»: «На падставе сваіх, звычайна дакладных, звестак яны (*партызаны. – І.К.*) знішчылі шмат якіх прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі, часта разам з іх сем'ямі». Адчыняць такія архівы было нявыгадна, таму што пасля вайны да ўлады ў Беларусі прыйшлі тыя ж самыя партызанскія начальнікі, якія выконвалі і самі аддавалі злачынныя загады. Яны ж не маглі «ачарняць» саміх сябе. Яны толькі і маглі складаць самі пра сябе «гераічныя» міты. Такое ж самае становішча існуе і зараз. Выхаванне моладзі ў духу патрыятызму, вывучэнне ў школах і ВНУ гісторыі Другой сусваетнай вайны і ў наш час працягваецца ўсё па тым жа хлуслівым мітам.

Як жа вырашаліся савецкай уладай і партызанамі іншыя важныя задачы (арганізацыя правакацый, рэпрэсіі, генацыд)?

Я прыпамінаю размовы, якія вёў мой бацька са старастам Кастусём Шульгатам ды іншымі вяскоўцамі. Гэтыя мудрыя мужыкі вельмі хутка зразумелі, што партызаны – такія ж самыя ворагі, як і немцы, а часам яшчэ больш небяспечныя. Але што гэтыя вясковыя бяззбройныя мужыкі маглі змяніць? Партызанам не запярэчыш, у іх размова кароткая – паставяць да сцяны і заб'юць. Таму вяскоўцы самі вырашалі праблему, як выжыць у гэтай бойні і выратаваць свае сем'і.

На падставе разважанняў майго бацькі і нават неглыбокага аналізу дзеянняў партызан, можна зрабіць выснову, што, каб стварыць на акупаванай Беларусі партызанскі рух, магчыма, быў распрацаваны план – вельмі просты, накіраваны супраць насельніцтва, бесчалавечны. Галоўнае – трэба было справакаваць немцаў на пачатак рэпрэсій. Такі план мог быць распрацаваны ў Цэнтральным штабе партызанскага руху па загаду з Крамля. Хутчэй за ўсё, спачатку быў акрэслены і складзены спіс вёсак, якія падлягалі знішчэнню. Вёскі гарэлі не ўсе падрад, не хаатычна. Яны былі раўнамерна размеркаваны па ўсёй тэрыторыі акупаванай Беларусі, каб чуткі пра зверствы немцаў, якія хутка пачнуцца, імгненна распаўсюджваліся ва ўсе куткі рэспублікі. Трэба было як мага мацней напалохаць насельніцтва.

Як гэта адбывалася? Побач з вёскамі, якім партызаны вынеслі прысуд, у начны час ладзіліся засады. Перад засадай партызаны пераапраналіся ў вясковае адзенне. Потым пачыналася доўгае чаканне прыдатнай для абстрэлу целі – адзіночная машына, матацыкл, малаколькасная група салдат. Самы зручны час для абстрэлу – гэта 4–5 гадзін раніцы, калі вёска спіць моцным сном. Калі на дарозе з'яўлялася доўгачаканая цэль, партызаны наўгад кідалі гранату, давалі ў белы свет аўтаматную чаргу, а потым на вачах у немцаў уцякалі ў бок вёскі, дзе іх след знікаў. Немцы былі ўпэўнены, што засада – справа рук вяскоўцаў. Хутка к немцам прыбывала выкліканая падмога. Яны ачаплялі вёску, якая спала, і знішчалі яе разам з жыхарамі. Менавіта такога выніку партызаны і чакалі. Немцы, як шчупакі, праглынулі прынаду, закінутую крамлёўскай вудай. Аднак я не магу сцвярджаць, што немцы нічога не разумелі. Магчыма, яны проста прынялі правілы гульні, прапанаваныя Крамлём. А мы, бездапаможнае, безабароннае насельніцтва, апынуліся пасярэдзіне, як між молатам і кавадлам.

Калі прасачыць, калі загінулі вёскі, якія пакояцца на тэрыторыі мемарыяла Хатынь, то можна ўбачыць, што іх знішчэнне па-

чалося з 1943 года, што супадае па часе з перакідкай прамаскоўскіх партызан на тэрыторыю Беларусі. Не сакрэт, што амаль усе вёскі знішчаліся па адным і тым жа сцэнарыі, пра які я расказваў вышэй. Дэталі ўдакладняліся на месцах. Немцам даставалася завяршаючая крывавая фаза сцэнарыю. Але часцяком і яны даручалі гэту справу паліцаям.

Можна прыйсці да высновы, што за знішчэнне беларускага насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны нясуць адказнасць як немцы, так і партызаны, як Нямеччына, так і СССР. Чыя віна большая, чыя меншая, судзіце самі. Людзі былі вымушаны кідаць свае хаты, сваю маёмасць і ўцякаць у лясы, каб не быць зажыва спаленымі ў сваіх хатах. Значная частка мужчын прымкнула да партызан. У Крамлі ад гэтага пацíралі рукі – масавасць партызанскага руху ў Беларусі нарэшце дасягнута. Якім коштам – іх не цікавіла.

Колькасць злачынстваў, здзейсненых немцамі па сцэнарыю партызанскага кіраўніцтва, з 1943 года стала рэзка ўзрастаць. Нарэшце наступіў пералом, якога так доўга чакаў Крэмль. З'явілася магчымасць паднімаць на ўвесь свет лямант пра злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія распачаліся на самай справе. Гэтым самым злачынствы савецкага рэжыму супраць уласнага народа адышлі на задні план. Сусветная супольнасць пераключыла сваю ўвагу з Катынскай трагедыі на трагедыю Хатыні.

Савецкая ўлада з самага пачатку вайны рыхтавалася выяўляць злачынствы нямецкіх акупантаў на савецкай тэрыторыі. Так, яшчэ 06.01.1942 года Савецкі ўрад заявіў, што савецкія органы вядуць падрабязны ўлік злачынстваў гітлераўскай арміі. Але злачынствы фашыстаў не былі масавымі. І толькі праз 10 месяцаў пасля гэтай заявы і праз 1 год 4 месяцы ад пачатку вайны, калі цераз лінію фронту былі перакінуты «партызанскія атрады» – падбухторшчыкі, а часам і выканаўцы злачынстваў, 2 лістапада 1942 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР была заснавана «Надзвычайная дзяржкамісія па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў». Членамі камісіі і сталі камісары і палітрукі партызанскіх атрадаў. Яны складалі пратаколы ці акты, вялі падлік нямецкіх злачынстваў. Весці той падлік цяжкасцяў не было,бо партызаны загадзя ведалі пра плануемыя фашыстамі злачынствы, самі ж іх і планавалі. У Надзвычайную дзяржкамісію на разгляд паступіла 304 тысячы пратаколаў і актаў аб нямецкіх злачынствах на акупаванай тэрыторыі.

Пад шумок была спроба спісаць на немцаў і злачынствы НКУС – расстрэлы ў першыя дні вайны зняволеных савецкіх турмаў. Так, 25 чэрвеня 1941 года каля вёскі Трасцянец нкусаўцамі было забіта каля 2 тысяч вязняў мінскай турмы. 26–28 чэрвеня 1941 года ва ўрочышчы Цагельня каля г. п. Чэрвень нкусаўцы расстралялі 2 тысячы палітвязняў з мінскай і іншых турмаў. У ліпені 1941 года, адступаючы з Віцебска, нкусаўцы аблілі бензінам турму і спалілі яе разам з палітвязнямі. Гэтыя звесткі ўзяты з кнігі Сымона Струменскага «Страты Беларусі...». Напрыканцы 80-х і ў пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя Савецкая, а зараз і сённяшняя ўлады і КДБ імкнуліся «павесіць» на немцаў і Курапаты, шукалі там нямецкі след. Але рабіць гэта было бессэнсоўна. Калі на кожнае злачынства немцаў у самай глухой вёсцы партызанамі тут жа складаўся пратакол, то схаваць масавыя расстрэлы ў наваколлі Мінска было б проста немагчыма. Падпольшчыкі, калі яны існавалі, абавязкова склалі б такі пратакол. Можна працягваць гэту тэму бясконца.

Я тут нічога не згушчаю і ні ў якім разе не апраўдваю немцаў. Але пра нямецкія злачынствы напісана вельмі шмат, а партызаны застаюцца гэткімі чыстымі, пушыстымі. Пара сказаць праўду і пра іх.

## 3. Расклад сіл на акупаванай тэрыторыі Беларусі

### *Немцы*

У часы акупацыі гэта была самая моцная ўзброеная сіла на нашай тэрыторыі. Колькі іх было, дакладнай лічбы я не знайшоў. Хутчэй за ўсё іх колькасць вагалася з цягам часу. Трэба ўлічваць і тое, што Беларусь у часы акупацыі не была адзінай адміністрацыйнай тэрыторыяй, яна была падзелена на некалькі частак.

У цэнтры вакол Мінска была створана Генеральная акруга «Беларусь». Генеральным камісарам акругі быў прызначаны Вільгельм Кубэ. У яе склад увайшло 68 з 200 раёнаў даваеннай Беларусі з насельніцтвам 3,1 млн. чалавек. Генеральная акруга «Беларусь» была падзелена на 9 больш дробных акруг – гэбітаў: Баранавіцкая, Вілейская, Ганцавіцкая, Глыбоцкая, Лідская, Мінс-

кая, Наваградская, Слонімская, Слуцкая. Горад Мінск быў выдзелены як 10-я акруга.

У Тылавы раён групы армій «Цэнтр» увайшлі Віцебская і Магілёўская вобласці, большая частка Гомельскай, усходнія раёны Мінскай і некалькі раёнаў Палескай вобласці.

У склад Беластоцкай акругі ўвайшлі Беластоцкая вобласць і Паўночная частка Брэсцкай вобласці.

Паўднёвыя раёны Брэсцкай, Гомельскай, Пінскай і Палескай абласцей апынуліся ў складзе Рэйхскамісарыята «Украіна».

Паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці і частка Баранавіцкай увайшлі ў Генеральную акругу «Літва».

Усё трагічнае, што адбывалася на акупаванай Беларусі, шмат якія гісторыкі – даследчыкі Другой сусветнай вайны, пісьменнікі, прапагандысты ды іншыя звязваюць з асобай Вільгельма Кубэ. Але як я сказаў вышэй, у Генеральную акругу «Беларусь», дзе ён быў Генеральным камісарам, уваходзіла ўсяго 68 раёнаў даваеннай Беларусі, што складала ўсяго 34% ад агульнай іх колькасці. Трэба адзначыць і тое, што Генеральны камісарыят Беларусі на чале з Вільгельмам Кубэ быў органам грамадзянскай адміністрацыі. І гэты орган не яўляўся такім усемагутным, як нам спрабавала прадставіць савецкая прапаганда.

На акупаванай Беларусі існаваў самастойны ваенны апарат групы арміяў «Центр», які не падпарадкоўваўся Генеральнаму камісарыяту. У яго склад уваходзілі вайсковыя часці вермахта і СС, а таксама паліцыя і абвер.

Паралельна з ваеннымі ўладамі на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі і самастойныя органы СС, куды ўваходзілі вайсковыя часці СС, паліцыя бяспекі, жандармерыя, нямецкія паліцэйскія фарміраванні ды іншыя.

Як бачна з усяго сказанага, становішча на Беларусі было складанае. На яе тэрыторыі размяшчаліся разнашэрсныя фарміраванні, перад якімі стаялі свае задачы: ахова чыгункі, мастоў, складоў, бяспека руху эшалонаў з ваеннымі грузамі, падтрыманне парадку на акупаванай тэрыторыі ды шэраг іншых задач. Нямецкія гарнізоны і камендатуры размяшчаліся ў гарадах, раённых цэнтрах, на чыгуначных станцыях. Трымаць пад кантролем кожную вёску ў немцаў, магчыма, не хапала сіл і сродкаў. Ды і такой неабходнасці не было. Насельніцтва на акупаванай тэрыторыі ніякага супраціву не аказвала. Дробныя, адстаўшыя ад фронту, групы чырвонаармейцаў і групы партыйных функцыянераў

і чыноўнікаў, якія хаваліся ў лясах, для немцаў ніякай пагрозы не складалі. Рэальная пагроза з іх боку была толькі нам, мірнаму насельніцтву.

Да 1943 года мы з немцамі суіснавалі мірна. Аб гэтым я сужу па становішчы, якое склалася ў маёй вёсцы Нябышына. Я магу пералічыць на пальцах адной рукі, колькі разоў я бачыў немцаў на працягу ўсёй акупацыі.

## *Партызаны прамаскоўскія*

Пра іх досыць падрабязна я ўжо расказаў у папярэдніх раздзелах. Але гэта быў мой уласны досвед, які я атрымаў за часы нямецкай акупацыі. Таму, рыхтуючы 2-е выданне, я вырашыў пашукаць звесткі пра партызанскі рух у афіцыйных крыніцах. Пры знаёмстве са шматлікімі энцыклапедычнымі даведнікамі і сайтамі па гэтай тэматыцы, я ўсялякі раз натыкаўся на адну і тую ж фразу, што партызанскі рух на Беларусі з першых дзён вайны меў масавы агульнанародны характар. Пры гэтым прыводзіцца лічба, што к канцу 1941 года колькасць партызан дасягнула 12 тысяч. Дык якая тут масавасць? Дзе тут агульнародны рух? 12 тысяч чалавек – гэта партыйныя функцыянеры і чыноўнікі, якія не паспелі эвакуіравацца і хаваліся ў лясах, гэта купкі адстаўшых ад фронту чырвонаармейцаў, гэта групы і атрады дыверсантаў і так званых арганізатараў, якіх за 1941 год было падрыхтавана 7200 чалавек і перакінута праз лінію фронта на тэрыторыю акупаванай Беларусі. У асноўным гэта былі нкусаўцы. Яны аргіназоўвалі ў партызанскія атрады самі сябе.

Калі і назіраўся масавы рух у першы год вайны, дык гэта масавы рух здачы Чырвонай Арміі ў нямецкі палон. Так з 22 чэрвеня 1941 года па снежань 1941 года ў нямецкі палон пайшло 3 335 000 чалавек! Вось гэта масавасць! Тыя 12 тысяч партызан проста варты жалю. Прычым у сваёй большасці гэта былі не беларусы.

Гісторыкі, даследчыкі вайны, партызанскі рух у Беларусі падзяляюць на тры этапы.

***Першы этап:*** чэрвень 1941 года – лістапад 1942 года. За гэты перыяд колькасць партызан з 12 тысяч узрасла да 56 тысяч. Прычына росту крыецца ў тым, што на тэрыторыі Беларусі праз лінію фронта працягвалася перакідка вайсковых частак і падраздзяленняў, падрыхтаваных для вядзення партызанскай

вайны на акупаванай тэрыторыі. Вышэй я ўжо распавядаў, як стваралася партызанская брыгада «Жалязняк» на тэрыторыі Бягомльскага раёна. Такі ж малюнак назіраўся паўсюду. Так у красавіку 1942 года на тэрыторыі Уладзімірскай вобласці былі створаны спецыяльныя курсы, на якіх рыхтавалі дыверсантаў і арганізатараў партызанскіх дзеянняў. Праз курсы прайшло 3000 чалавек. З іх былі створаны 14 партызанскіх атрадаў і 92 арганізатарскія групы. Усе яны былі перакінуты праз лінію фронту на тэрыторыю акупаванай Беларусі.

***Другі этап*** партызанскага руху: лістапад 1942 года – снежань 1943 года. За гэты час колькасць партызан на тэрыторыі Беларусі павялічылася да 153 тысяч чалавек. Рост адбываўся па дзвюх прычынах. Па-першае, працягвалася перакідка цераз лінію фронту на акупаваную тэрыторыю новых вайсковых частак. Па-другое, вясной–летам 1943 года немцы правялі шэраг карных аперацый супраць партызан, а цярпела ад гэтага насельніцтва. Для моладзі не было іншага выйсця, як папоўніць шэрагі партызан, інакш яе чакала адпраўка на працу ў Нямеччыну. Савецкія гісторыкі, ідэолагі, прапагандысты, ды й сучасныя гэтак сама, любяць агучваць спрэчны факт, што к канцу 1943 года партызаны кантралявалі 108 тысяч кв.км, што складала 58,4% тэрыторыі рэспублікі. Калі гэта было сапраўды так, тады ўзнікае законнае пытанне: чаму пры такой партызанскай моцы палалі вёскі, гінулі людзі, у тым ліку і на тэрыторыях, кантралюемых партызанамі? Прычым, трэба адзначыць, што масавае знішчэнне вёсак пачалося ўсё ў тым жа 1943 годзе, у самы бязмежны разгул партызаншчыны.

***Трэці этап*** партызанскага руху: снежань 1943 – ліпень 1944 года. Колькасць партызан узрасла да 374 тысяч чалавек. За якіх-небудзь паўгода колькасць партызан у параўнанні з 2-м этапам узрасла больш чым у два разы. Адкуль жа такі бурны рост? За кошт насельніцтва зрабіць гэта ўжо было немагчыма. Засталіся толькі жанчыны, дзеці ды састарэлыя мужчыны. Дык адкуль рост? Адказ вельмі просты. Чырвоная Армія ад Сталінграда і Масквы чарапашымі крокамі нарэшце дапаўзла да межаў Беларусі. Рыхтавалася так званая аперацыя «Баграціён». Праз лінію фронту на тэрыторыю Беларусі ў нямецкі тыл масава перапраўляліся рэгулярныя вайсковыя часткі. Называць іх партызанамі – вялікая памылка.

А зараз давайце пазнаёмімся бліжэй з партызанскімі камандзірамі, паглядзім, якія яны беларусы... Вышэй я ўжо ўзгадваў пра Ціткова Івана Піліпавіча, камандзіра партызанскай брыгады «Жалязняк», якая базіравалася на тэрыторыі Бягомльскага раёна.

Ціткоў І.П. – ураджэнец Тульскай вобласці. Па нацыянальнасці – рускі. У 1936 годзе закончыў Тамбоўскае ваенна-інжынернае вучылішча. У чэрвені 1942 года капітан Ціткоў адкліканы з фронту і накіраваны ў распараджэнне Штаба партызанскага руху Заходняга фронту. Закончыў курсы партызанскай вайны ў Барысаве і перапраўлены цераз лінію фронту на тэрыторыю Беларусі. Так што называць яго беларускім партызанам не даводзіцца. Ціткоў І.П. даслужыўся да палкоўніка. Пасля вайны служыў у КДБ, пражываў у Маскве. У яго біяграфіі ёсць цікавы момант – ён выступіў супраць уводу савецкіх войск на тэрыторыю Венгрыі ў 1956 годзе, за што быў звольнены з шэрагаў КДБ.

Яшчэ адзін «беларускі» партызан – Данукалаў Аляксей Фёдаравіч. Ураджэнец Саратаўскай вобласці, па нацыянальнасці ўкраінец. Яго бацькі – запарожскія казакі-перасяленцы. У 1936 годзе закончыў тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі. Быў накіраваны ў горад Омск на пасаду начальніка майстэрань МТС. У 1937 годзе прызваны ў Чырвоную Армію, займаў пасаду памочніка палітрука. У часы службы ўзнікла жаданне стаць кадравым ваенным. У сакавіку 1940 года накіраваны на курсы ў Іркуцкае ваенна-палітычнае вучылішча. Пасля вучобы быў прызначаны палітруком палка ў Забайкальскай ваеннай акрузе. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, дывізію, у якой служыў Данукалаў, перакінулі на Заходні фронт. Удзельнічаў у баях пад Лепелем, Воршай. Пад Смаленскам папаў у акружэнне. Змог аб'яднаць некалькі груп салдат і стварыць з іх партызанскі атрад «Родина», які сам і ўзначаліў. Атрад дзейнічаў на тэрыторыі Смаленскай вобласці. У сакавіку 1942 года кіраўніцтва Заходняга фронту пераправіла атрад Данукалава на тэрыторыю Ліозненскага раёна Віцебскай вобласці. Вось так палітрук Данукалаў зрабіўся «беларускім» партызанам, вось так павялічвалася колькасць партызан на тэрыторыі Беларусі.

Яшчэ адзін прыклад таго, хто партызаніў на тэрыторыі Беларусі. Гэта Флегантаў Аляксей Кандзіевіч, ураджэнец Чыцінскай вобласці, казак. Удзельнік грамадзянскай вайны, камандаваў дывізіяй. Пасля падзення Далёка-Усходняй рэспу-

блікі ўдзельнічаў у партызанскай вайне. У першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны камандаваў партызанскім атрадам у Падмаскоўі. У 1942 годзе генерала Флегантава прызначылі камандаваць атрадам НКУС СССР, які перапраўлілі на тэрыторыю Беларусі. Вось як апісаў гэты атрад Лівенцаў, які ў той час ужо быў камандзірам іншага партызанскага атрада: «без малого полтораста конников в армейской форме, с положенными знаками различия – рейдовый кавалерийский отряд». Атрад меў у сваім складзе 127 добраўзброеных вершнікаў. Ён здзяйсняў рэйды па Чэрвенскаму, Пухавіцкаму, Асіповіцкаму, Бабруйскаму, Маларыцкаму, Дзвінскаму раёнах Беларусі і па некаторых раёнам Украіны. Які крывавы, разбуральны след аставіў за сабой гэты атрад – справа даследчыкаў.

Толькі што я ўпамінаў Лівенцава, камандзіра партызанскага атрада. Падумалася, што, можа, з ім мне пашанцуе, што, можа, ён сапраўдны беларускі партызан. Стаў шукаць звесткі пра яго, і вось што ўдалося знайсці. Лівенцаў Віктар Ілліч, 1918 года нараджэння, рускі, ураджэнец Варонежскай вобласці, па прафесіі настаўнік. У 1938 годзе прызваны ў Чырвоную Армію, служыў на тэрыторыі Беларусі. У 1941 годзе закончыў Гродзенскае ваенна-палітычнае вучылішча. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з першага дня. Папаў у акружэнне ў горадзе Бабруйску. З акружэнцаў арганізаваў партызанскі атрад, які ў 1943 годзе быў пераўтвораны ў 1-ю Бабруйскую партызанскую брыгаду.

Калі ў ліпені 1944 года Беларусь была вызвалена ад нямецкай акупацыі, беларусаў у масавым парадку мабілізавалі і адправілі на фронт. А вось для кадравага ваеннага 26-гадовага Віктара Лівенцава знайшлася праца больш важная. Для Беларусі тэрмінова патрабаваліся спецыялісты па русіфікацыі. На Беларусі трэба было тэрмінова ліквідаваць спадчыну, якую пакінуў тут «кат» беларускага народа гаўляйтэр Вільгельм Кубэ. Галоўнае яго злачынства заключалася ў тым, што ён усяляк спрыяў беларусізацыі Беларусі. І, дзякуючы гэтаму, за часы акупацыі ўдалося шмат чаго зрабіць. Навучанне ў школах вялося на роднай беларускай мове, людзі размаўлялі па-беларуску, выпускаліся беларускія газеты і часопісы і шмат чаго іншага. Для маскоўскіх акупантаў, якія вярнуліся на змену нямецкім, такое становішча было недапушчальным. Таму пасля вызвалення ў Беларусі ўсе кіруючыя пасады ад верху да самага нізу занялі партызанскія камандзіры і камісары, беларусаў сярод якіх было няшмат. Што

тычыцца Лівенцава, то з 1944 года ён займаў пасаду 2-га сакратара ЦК ЛКСМ Беларусі.

Прывяду яшчэ некалькі прыкладаў, хто ж партызаніў на тэрыторыі Беларусі.

Няклюдаў Валянцін Леанідавіч, ураджэнец горада Омска, супрацоўнік органаў бяспекі. Напрыканцы чэрвеня 1941 года капітана Няклюдава залічылі ў Брыгаду асобага прызначэння НКУС СССР. Пасля спецыяльнай падрыхтоўкі быў сфарміраваны атрад, які ў лютым 1942 года цераз лінію фронта быў перапраўлены на тэрыторыю Беларусі для вядзення дыверсійнай, разведвальнай і спецыяльнай дзейнасці на акупаванай тэрыторыі. Ужо маёр Няклюдаў быў камісарам атрада, а з ліпеня 1942 года – яго камандзірам. Атрад здзяйсняў рэйды па Віцебскай вобласці і па Літве. Пасля вызвалення Беларусі ў 1944 годзе гэтага бясцэннага кадра безумоўна на фронт не накіравалі, яго прызначылі ў органы дзяржбяспекі БССР. Не беларусам жа даручаць «бяспеку» БССР. Ураджэнец Омска для Крамля больш надзейны, чым беларус. Трэба адзначыць, што атрад фарміраваўся ў Маскве і першым яго камандзірам быў ст. лейтэнант Гарачаў. Але камісар атрада Няклюдаў зрабіў на яго данос, а потым заняў яго месца.

Галушкін Барыс – камандзір спецатрада НКДБ СССР, дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай і Віцебскай абласцей. Галушкін Барыс Лаўрэнцьевіч – ураджэнец горада Шахты Растоўскай вобласці. Потым пражываў у горадзе Грозным. Па нацыянальнасці рускі. З 1937 па 1941 год навучаўся ў Маскоўскім інстытуце фізкультуры і спорту. Ваяваў на Ленінградскім фронце. І вось у 1942 годзе перакінуты на тэрыторыю акупаванай Беларусі для выканання спецыяльнага задання. Спецатрад НКДБ, які ён узначальваў, называўся «Помощь». Якія ён выконваў спецыяльныя заданні на нашай тэрыторыі і якую і каму аказваў «помощь», можна толькі здагадвацца.

Яшчэ адзін прадстаўнік «партызанскага руху» ў Беларусі – Булат Барыс Адамавіч. Ураджэнец горада Тулы, рускі. Закончыў Ваенную школу «ВЦИК РСФСР». Стаяў у каравуле ў Маўзалея на Чырвонай плошчы Масквы. У 1940 годзе закончыў Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзэ і быў накіраваны на службу ў Беларускую ваенную акругу. Калі пачалася вайна, Барыс Булат знаходзіўся пад Беластокам. На пяты дзень вайны ён быў паранены і папаў у нямецкі палон. Праз нейкі час яму і яшчэ двум палонным удалося збегчы.

У часы вайны і асабліва пасля вайны савецкім ідэолагам і прапагандыстам вельмі хацелася паказаць, што на акупаванай Беларусі з першых дзён вайны сталі стыхійна ўзнікаць партызанскія атрады і што партызанскі рух пачынаўся знізу. І вось гэту тройцу (Булата Барыса і яго двух спадарожнікаў) гучна назвалі партызанскім атрадам. Як яны маглі выжыць – загадка. Ну не маглі ж яны, абяссіленыя, без зброі нападаць на нямецкія харчовыя сховішчы, абозы ці палявыя кухні, каб дабыць харчаванне? Але група выжыла. Калі на пачатку 1942 года на тэрыторыю акупаванай Беларусі для арганізацыі партызанскага руху і іншых мэт сталі сотнямі закідваць спецыяльныя групы і атрады НКУС і НКДБ СССР, то Барыса Булата заўважылі. Яго як кадравага афіцэра з ваеннай акадэмічнай адукацыяй прызначылі камандзірам створанай партызанскай брыгады «Вперёд». Брыгада дзейнічала на тэрыторыі Мінскай і Баранавіцкай абласцей. У 1944 годзе ён быў паранены і эвакуіраваны на лячэнне ў Маскву. Пасля лячэння кадравага афіцэра на фронт не накіравалі. Гэта чарговы каштоўны кадр на кіруючую пасаду для Беларусі. Як толькі Мінск быў вызвалены з-пад акупацыі, Барыса Булата прызначылі на пасаду намесніка старшыні Мінскага гарадскога савета.

Вось так у партызанскіх атрадах, якія былі перапраўлены на тэрыторыю акупаванай Беларусі, рыхтаваліся кадры для пасляваеннай Беларусі. Камандзіры, камісары, начальнікі штабаў партызанскіх брыгад і атрадаў пасля вызвалення Беларусі сталі першымі і найлепшымі кандыдатурамі на кіруючыя пасады. Па афіцыйных звестках, на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 1256 партызанскіх атрадаў, якія часткова былі аб'яднаны ў 213 брыгад і палкоў. Гэта атрымліваецца 4407 кандыдатур. А калі сюды дабавіць сакратароў партыйных і камсамольскіх арганізацый? Колькі ж гэта атрымліваецца? І вось гэтыя партызанскія начальнікі, якія на працягу акупацыі, тры гады мардавалі мірнае насельніцтва, размаўлялі з насельніцтвам пры дапамозе маўзера, ППШ і кулака, пасля вызвалення засталіся тут кіраўнікамі. Я не згушчаю фарбы, гэта мой уласны досвід. Я ўсё гэта перажыў, бачыў уласнымі вачыма. Вышэй я ўжо прыпамінаў камісара 1-га атрада брыгады «Жалязняк» Спірыдона Барздыку.

Я прывёў некалькі прыкладаў, хто партызаніў на тэрыторыі Беларусі. Пакуль што ніводнага беларуса я не знайшоў. Так, я згодзен, ёсць шэраг прозвішчаў партыйных функцыянераў-

беларусаў, якія ці не паспелі эвакуіравацца, ці былі пакінуты для працы ў нямецкім тыле. Яны ж пасля вызвалення занялі вядучыя пасады. Хоць гэта і беларусы, але яны людзі Масквы. Прыйшлося звярнуцца за дапамогай да знаёмых. Першы тэлефонны званок я атрымаў з Гомеля. Мне сказалі, што ў Гомельскай вобласці з першых дзён вайны ўжо дзейнічаў мясцовы партызанскі атрад. Яго камандзірам быў Емяльян Барыкін. Шукаю звесткі, і вось што я пра яго знайшоў:

Барыкін Емяльян Ігнатавіч, ураджэнец Бранскай вобласці, рускі. Служыў у чыгуначным палку Чырвонай Арміі ў горадзе Гомеле. Пасля службы закончыў курсы памочніка начальніка станцыі ў горадзе Курску. З 1937 года Барыкін на партыйнай працы, яго прызначылі сакратаром парткама Беларускай чыгункі. З сакавіка 1941 года ён – сакратар Гомельскага гаркама партыі. Калі пачалася вайна, ён становіцца камісарам партызанскага атрада «Бальшавік». І тут я не знайшоў нічога беларускага. Барыкін, па нацыянальнасці рускі, у Беларусі пражываў часова, яго сюды прызначылі на працу. Яго прызначэнне прыпадае на 1937 год. Магчыма, беларускія кадры былі расстраляны бальшавікамі, а на іх месца прыбывалі кадры з Расіі. Гэта адна з форм русіфікацыі.

Адзін мой знаёмы нагадаў мне пра Варанянскага, што ён наш, беларус, і вуліца ў Мінску носіць яго імя. Насамрэч, як жа я яго выпусціў з віду? Шукаю звесткі пра яго. І вось што я знайшоў: Васіль Трафімавіч Варанянскі нарадзіўся ў вёсцы Дзіканькі Палтаўскай вобласці. Да гэтага часу я лічыў, што «Дзіканькі» – гэта прыдумка Гогаля, а яны існуюць на самай справе. У Чырвонай Арміі Варанянскі з 1919 года. Напярэдадні вайны камандаваў батальёнам сувязі ў горадзе Магілёве. Калі пачалася вайна, ён з групай салдат папаў у акружэнне. Паспрабавалі дагнаць фронт, але фронт каціўся к Смаленску і к Маскве значна хутчэй за іх, таму што карыстаўся дарогамі. Акружэнцы ж ішлі лясамі. К верасню дайшлі да Лагойска. Ісці далей не было ні сэнсу ні сіл. Хаваліся ў мясцовых лясах. Як яны выжывалі, судзіце самі. Як я ўжо вышэй сказаў, на пачатку 1942 года на акупаваную Беларусь было перакінута безліч груп і атрадаў НКУС СССР. Адной з іх задач было аб'яднанне акружэнцаў у партызанскія атрады. Так і з групы Варанянскага быў створаны партызанскі атрад «Мститель», а яго прызначылі камандзірам. Толькі вось каму яны помсцілі? Як

бачыце, і Варанянскі не беларус. Па волі лёсу ён часова апынуўся на тэрыторыі Беларусі.

У мяне апусціліся рукі. Няўжо я не змагу знайсці камандзіра партызанскага атрада, беларуса? Не партыйнага функцыянера, а простага, кемлівага беларуса. І зноў мяне выручыў мой знаёмы, ён нагадаў мне пра Заслонава. Як жа я сам не здагадаўся? Я чытаў тоўсты раман пра Заслонава, які напісаў знакаміты беларускі пісьменнік. Твор напісаны таленавіта. Адчуваецца, што пісьменнік ставіцца да свайго героя з цеплынёй і павагай, як да сапраўднага сына сваёй Айчыны. Стаў шукаць звесткі пра Заслонава і я. Вось што ўдалося знайсці. Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч – ураджэнец горада Асташкаў Цвярской вобласці. Яго бацька Сяргей Гаўрылавіч з горада Невеля Пскоўскай вобласці, маці Ганна з горада Асташкава. У 1924 годзе Канстанцін Заслонаў закончыў школу у горадзе Невелі. У 1927 годзе паступіў у прафцехшколу чыгуначнага транспарту ў Вялікіх Луках, якую закончыў у сакавіку 1930 года. Прызначаны на працу ў дэпо чыгуначнага вакзала горада Віцебска. Тут ён у 1933 годзе ажаніўся на дачцэ гаспадыні, у якой ён кватараваў. У 1935 годзе Заслонава накіравалі ў Новасібірск на пасаду памочніка начальніка паравознага дэпо чыгуначнай станцыі. Хто ж ён такі - гэты Канстанцін Заслонаў? Чаму менавіта яго з Віцебска накіравалі за 3960 км у Новасібірск? Прычым на такую нязначную пасаду. Магчыма, яму было дадзена нейкае заданне, выканаўшы якое, ён вярнуўся ў Віцебск.

З 1937 года ён працуе начальнікам паравознага дэпо чыгуначнай станцыі Раслаўль Смаленскай вобласці, а з 1939 года – начальнікам дэпо чыгуначнай станцыі Орша. Пры набліжэнні немцаў да Оршы Канстанцін Заслонаў эвакуіраваўся ў Маскву, дзе працаваў у адным з маскоўскіх чыгуначных дэпо. У верасні 1941 года ў Маскве быў сфарміраваны спецыяльны атрад з чыгуначнікаў і нкусаўцаў колькасцю 41 чалавек. Камадзірам атрада прызначаны Канстанцін Заслонаў. У кастрычніку цераз лінію фронта атрад пераправілі на тэрыторыю акупаванай Беларусі для арганізацыі дыверсій. У лістападзе 1941 года Заслонаў паступіў на працу ў аршанскае чыгуначнае дэпо начальнікам рускіх паравозных брыгад. Была створана падпольная група.

Далей ва ўсіх крыніцах, якія я змог знайсці, дадзены звесткі проста непраўдападобныя. Падпольная група дзейнічала ўсяго тры месяцы. Але за гэты час, калі верыць афіцыйным крыніцам,

група ажыццявіла каля сотні крушэнняў цягнікоў, падарвала 93 паравозы, вывела са строю сотні вагонаў і цыстэрнаў. І ўсё гэта здзейснена пры дапамозе самаробных мін, замаскіраваных пад вугаль. Трэба дадаць, што Заслонаў прывёў з сабой у Оршу ўсяго 7 чалавек з 41. Астатнія загінулі, памерлі ад хвароб, ці адсталі абяссіленыя. Каб здзейсніць столькі дыверсій, колькі іх здзейсніла група Заслонава за тры месяцы, трэба было кожную ноч рабіць па 4–6 дыверсій, што немагчыма фізічна. Па-першае, і чыгуначнае дэпо і персанал, які там працаваў, знаходзіліся пад пільным наглядам нямецкіх спецслужб. Па-другое, падпольная група Заслонава была малакалькаснай. Па-трэцяе, самаробныя, замаскіраваныя пад вугаль міны хутчэй за ўсё былі маламоцнымі. Магчыма, феномен Заслонава – гэта міт, створаны партызанскім кіраўніцтвам, ваеннымі журналістамі, пісьменнікамі, кінематографам, прапагандыстамі.

Хачу нагадаць яшчэ пра адну дэталь, пра якую распавядаецца ў некаторых крыніцах. Справа вось у чым: група Заслонава дзейнічала ў начны час, калі адбываліся налёты савецкай авіяцыі на чыгуначную станцыю Орша. У такое можа паверыць толькі наіўнае дзіця. Налёт авіяцыі, бамбёжка – гэта адзін з самых жахлівых відаў бою. Падчас яго любы чалавек, у тым ліку і салдат і камандзір забывае пра ўсё, толькі б знайсці любое месца, каб укрыцца. А вось для падпольшчыкаў групы Заслонава налёт авіяцыі, выбухі бомб – гэта як святочны феерверк. Не ведаючы страху, яны кідаюцца ў самае пекла. У кішэні самаробная вугальная міна велічынёй з бульбіну, пры дапамозе якой быццам бы можна падарваць паравоз. А раніцай пасля такой цяжкай і небяспечнай ночы падпольшчыкі, як ні ў чым не бывала, прыбывалі к акупантам на працу і рыхтавалі паравозы для адпраўкі к фронту цягнікоў з тэхнікай і папаўненнем для нямецкіх дывізій.

А зараз давайце на хвіліну ўявім сабе, што тыя «каля сотні цягнікоў і 93 паравозы» на самай справе былі пушчаны пад адхон ці ўзарваны. Узнікае пытанне, які лёс напаткаў паравозныя брыгады? Я не чыгуначнік, магу памыляцца, але мяркую, што ў склад паравознай брыгады ўваходзіла 5–6 чалавек: машыніст, яго памочнікі, качагары, слесары... А гэта азначае, што ў выніку дыверсій, здзейсненых падпольнай групай Заслонава, загінула каля тысячы, а можа і больш, ні ў чым не павінных людзей, пераважна беларусаў, вопытных чыгуначнікаў, якіх так не хапала пасля вайны. Трэба дадаць, што, магчыма, пасля кожнай дыверсіі

акупацыйная адміністрацыя шукала вінаватых і расстрэльвала людзей, якія да гэтага не мелі ніякага дачынення. Хтосьці лічыць, што вось такія дыверсіі – гэта подзвіг, геройства падпольшчыкаў. А на маю думку, мякка кажучы, – гэта неабдуманыя дзеянні. Калі сказаць прама, гэта злачынства супраць мірнага насельніцтва. Дзень вызвалення не наблізілі, а людзей пагубілі.

Падпольная група Заслонава дзейнічала нядоўга. На пачатку сакавіка 1942 года з-за пагрозы арышту падпольшчыкі ўцяклі ў лес. Гэта і было пачаткам стварэння партызанскага атрада. 14 лістапада 1942 года Канстанцін Заслонаў загінуў. 7 сакавіка 1943 года яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна.

Канстанцін Заслонаў – адзін з самых вядомых падпольшчыкаў, камандзіраў партызанскіх атрадаў. Адразу пасля вайны пра яго напісаны раманы, аповесці, п'есы. У 1949 годзе на экраны кінатэатраў выйшаў мастацкі фільм «Канстанцін Заслонаў», у галоўнай ролі якога здымаўся папулярны кінаартыст Уладзімір Дружнікаў. Савецкія людзі вывучалі гісторыю Вялікай Айчыннай вайны па мастацкіх творах. Фантазіі пісьменнікаў, журналістаў, кінарэжысёраў яны ўспрымалі як рэальныя падзеі. Імя Героя Савецкага Саюза і кінагероя Канстанціна Заслонава стала масава прысвойвацца чыгуначным станцыям, навучальным установам, вуліцам. Так, я знайшоў 26 гарадоў Расіі, 17 гарадоў Украіны, 9 гарадоў Беларусі, у якіх вуліцам прысвоена імя Канстанціна Заслонава. І гэта добра. Сваімі героямі трэба ганарыцца. Але трэба памятаць, што адна і тая асоба для адной часткі насельніцтва можа быць героем, для другой злачынцам.

Вышэй я назваў некалькі прозвішчаў камандзіраў партызанскіх атрадаў. Я іх не выбіраў спецыяльна, браў адвольна. І сярод іх ніводнага беларуса. Амаль усе яны і іх атрады закінуты на тэрыторыю акупаванай Беларусі па аднаму і таму сцэнарыю. Партызанскі рух на Беларусі – гэта з'ява не беларуская, яна навязана звонку. У кнізе Марка Бартушкі «Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг.» я знайшоў такія звесткі: «Савецкія партызаны дзейнічалі таксама і за межамі тэрыторыі СССР. Каля 25 тысяч іх змагалася ў Польшчы і Чэхаславацкай Рэспубліцы, дзе яны падтрымлівалі камуністычнае падполле...» Я не думаю, што палякі, чэхі, славакі гэтых савецкіх партызан лічылі польскімі, чэшскімі, славацкімі. Так і ў нас маюцца ўсе падставы, каб не лічыць савецкіх партызан беларускімі.

Сяргей Захарэвіч у сваёй кнізе «Партызаны СССР. Ад мітаў да рэальнасці» паставіў тры галоўных пытанні і даў адказы на іх:

«Пытанне 1-е. Ці з'яўляецца партызанскі рух усенароднай з'явай? Адказ: не». Я поўнасцю згодзен з гэтым. І гэта добра разумеюць нават тыя, хто спрабуе даказаць адваротнае. Але яны не здольны адмовіцца ад мітаў, якія самі для сябе стварылі.

«Пытанне 2-е. Ці быў партызанскі рух эфектыўным з ваеннастратэгічнага пункту гледжання? Адказ: не». Тут я хацеў бы паспрачацца з Сяргеем Захарэвічам. Мой адказ на яго 2-е пытанне:

«І не і так». Каб адказаць адназначна, трэба ўдакладніць, якая задача ставілася Крамлём перад савецкімі партызанамі. Калі дапусціць, што перад імі стаяла задача змагацца з акупантамі, то я згодзен з Сяргеем Захарэвічам – гэтая мэта не дасягнута. А калі дапусціць, што перад партызанамі была пастаўлена задача змагацца супраць мірнага насельніцтва, то тут яны дасягнулі вялікіх поспехаў. Гэта падцвярджае і сам Сяргей Захарэвіч сваім 3-м пытаннем: «Чым увогуле быў партызанскі рух для акупаваных рэгіёнаў?» І ён жа дае адказ: «Працягам даваеннай рэпрэсіўнай палітыкі савецкай улады».

Так ці інакш, ніжэй я яшчэ буду вяртацца да партызанскай тэмы. У сваіх разважаннях я не асвятляю падзеі, я выказваю свае меркаванні пра падзеі Другой сусветнай вайны, якія закранулі мяне, маю душу. Пагаджацца са мной ці не – гэта справа чытачоў. Кожны мае права на сваю думку. Хтосьці скажа, што я злоснічаю, прыніжаю вялікі подзвіг савецкага народа. Менш за ўсё я хачу кагосьці пакрыўдзіць. Я проста хачу, каб гісторыя вайны была праўдзівай. Зараз мы маем замест гісторыі вайны прымітыўныя міты.

## *Партызаны Арміі Краёвай*

Гэта з'ява больш польская, чым беларуская, хаця шчыльна датыкнулася да Беларусі. Усім вядома, што ў верасні 1939 года на Польшчу напалі два крыважэрных агрэсары – Германія і СССР. Немцы перайшлі польскую мяжу 1-га верасня. Калі пачалася вайна, насельніцтва Заходняй Беларусі (Крэсы Всходне) адсунула на потым свае прэтэнзіі да Польшчы, паводзіла сябе мірна да палякаў. Беларусы не ўхіляліся ад прызыва ў Польскае войска і нават ішлі ў яго ахвотна. Яны разам з палякамі змагаліся за Польшчу.

Савецкая прапаганда распаўсюджвала чуткі, быццам бы Польшча не аказвала немцам ніякага супраціву. Я не згодзен з гэтым. Польская армія аказала мужны супраціў захопнікам. Простыя салдаты і афіцэры, – палякі, украінцы і беларусы праяўлялі на палях бітвы гераізм. Так, ужо 9-га верасня немцы паспрабавалі авалодаць Варшавай, але спроба была безпаспяховай. Было праведзена яшчэ некалькі штурмаў сталіцы Польшчы, апошні адбыўся 27 верасня. І на гэты раз у немцаў нічога не атрымалася. Але з-за адсутнасці забеспячэння горада боепрыпасамі, харчаваннем штаб абароны Варшавы прыняў пастанову капітуляваць. Гэта адбылося 28–29 верасня 1939 года. Вось яшчэ прыклад гераізму: 7 верасня нямецкая 40-тысячная групіроўка пад камандаваннем Гудэрыяна пачала атаку польскіх умацаванняў пад Візнай. Жменька польскіх салдат і афіцэраў, усяго 720 чалавек, трымалі абарону да 10 верасня.

Польшча яшчэ змагалася, баі працягваліся да 6-га кастрычніка, а ў Маскве яе ўжо падзялілі – 28 верасня была падпісана дамова «Аб сяброўстве і межах паміж СССР і Германіяй».

Безумоўна, нямецкая армія была мацней за польскую, але, як бачым, не настолькі моцная. Немцам патрэбна была перадышка, каб перагрупіраваць сілы, падцягнуць сілы. Яны панеслі адчувальныя страты: 8400 салдат і афіцэраў забітымі, 4500 зніклых бяз вестак, 30000 параненых. Палякі нанеслі немцам значны ўрон і ў тэхніцы: знішчана 993 танкі і бронемашыны, 400 гармат, 900 самалётаў. Польшча магла яшчэ нейкі час пратрымацца і дачакацца дапамогі ад Францыі і Англіі. Але тут руку дапамогі працягнуў СССР. Рука дапамогі была працягнута не заходнім беларусам і заходнім украінцам, СССР працягнуў руку дапамогі свайму хаўрусніку – фашысцкай Германіі. Гэта адбылося 17 верасня 1939 года. СССР груба парушыў Рыжскі мірны дагавор ад 18 сакавіка 1921 года.

Ужо з першых дзён акупацыі ў Заходняй Беларусі пачаўся супраціў савецкім акупантам, а ў Польшчы – нямецкім. Можна лічыць, што гэта і стала пачаткам узнікнення Арміі Краёвай. Афіцыйна АК і партызаны АК былі створаны загадам польскага эміграцыйнага Урада ў Лондане 14 лютага 1942 года. Перад гэтымі ваеннымі ўтварэннямі стаяла задача – аднаўленне Польскай дзяржавы ў даваенных межах. Да 1943 года партызаны савецкія і польскія між сабой захоўвалі нейтралітэт. Напачатку 1943 года сітуацыя змянілася. У лютым месяцы ўсяму свету стала вядома

пра Катынскую трагедыю. Жыхары акупаванай Смаленшчыны паказалі немцам месца, дзе былі пахаваны польскія палонныя афіцэры, расстраляныя савецкімі органамі НКУС. Немцы стварылі міжнародную камісію і правялі эксгумацыю астанкаў цел. Злачынствы, здзейсненыя савецкім рэжымам, былі пацверджаны. Адносіны паміж польскім і савецкім урадамі пагоршыліся. На тэрыторыі Заходняй Беларусі прамаскоўскіх партызан было няшмат. Але калі на свет з'явілася Катынская справа, партызанскае кіраўніцтва стала тэрмінова перакідваць туды новыя атрады. Вышэй я ўжо казаў, што і цераз маю вёску Нябышына напачатку 1943 года прайшлі на захад партызанскія брыгады Шляхтунова і Мядзьведзева. Калі ў Заходніх абласцях сілы былі накоплены, выйшаў загад Цэнтральнага штаба партызанскага руху ад 22.06.1943 года за подпісам Панамарэнкі, які прадугледжваў разрыў адносін з партызанамі АК і іх раззбраенне. Па сваёй сутнасці загад быў злачынным, ён прадугледжваў нават ліквідацыю тых палякаў, якія былі ў складзе прамаскоўскіх партызанскіх атрадаў. З гэтага часу на тэрыторыі Заходняй Беларусі паміж партызанамі АК і прамаскоўскімі партызанамі пачаліся сапраўдныя баі. Гэта быў сапраўдны падарунак немцам. Хачу адзначыць, што ў маю вёску Нябышына партызаны АК ні разу не заходзілі. Таму ў мяне пра іх няма асабістага ўражання. Але зараз пра гэта можна прачытаць – на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя пра Армію Краёву і партызан АК напісана шмат кніг і ў СМІ з'явіўся шэраг публікацый. Так у 1994 годзе ўбачыла свет кніга Яўгена Сямашкі «Армія Краёва на Беларусі». Перакладзена з польскай на рускую мову кніга Уладзіслава Андэрса «Без последней главы». З'явілася шмат публікацый у друкаваных СМІ. Так газета «Звязда» на сваіх старонках змясціла артыкулы ў нумарах:

– за 11.02.1993 г. Сланеўскі А. «Армія Краёва: Стрэл з мінулага»;

– за 30.01.1993 г. Хацкевіч А. «Армія Краёва: што мы пра яе ведаем»;

– за 23.10.1993 г. Корсак А. «Страсці вакол Арміі Краёвай разгараюцца».

У «Беларускім гістарычным часопісе» ў нумарах 1–2 за 1994 год змешчаны артыкул А. Хацкевіча «Арышты і дэпартацыя ў Заходніх абласцях Беларусі (1939–1941)».

Шмат артыкулаў на гэту тэму можна знайсці і ў іншых выданнях. З высновамі аўтараў артыкулаў можна пагаджацца, можна не

пагаджацца. Гэта залежыць ад таго, якое ў каго стаўленне да гэтага перыяду гісторыі Беларусі і Польшчы. Адны лічаць, што 17 верасня 1939 года СССР працягнуў руку братняй дапамогі заходнім беларусам, якія марылі ўз'яднацца з БССР. Другія лічаць, што 17 верасня СССР здзейсніў акт агрэсіі супраць Польшчы, што заходнія беларусы замест польскага прыгнёту атрымалі больш жорсткую савецкую акупацыю. І першыя і другія маюць рацыю. Асабіста я на баку апошніх.

## *Паліцэйскія фарміраванні*

За ўвесь час нямецкай акупацыі мне давялося бачыць толькі аднаго паліцая – нашага аднавяскоўца. Нічога кепскага пра яго я сказаць не магу, таму што ў сваёй вёсцы ён нікому шкоды не нарабіў. А вось у час блакады ў маі 1943 года паліцаі, якія прыбылі з боку Докшыц, абрабавалі нашу вёску і забілі чалавек 25–30. Аб гэтым вышэй я ўжо расказаў. Пасля вайны, калі я вучыўся ў школе, на афіцыйным узроўні не ўспаміналі ні пра вайну, ні пра партызан, ні пра немцаў, ні пра паліцаяў. Наступіла зацішша. Так, паявіліся літаратурныя творы, кінафільмы, але, мякка кажучы, яны былі далёкія ад праўды. Памятаю, у 1952 годзе ў Бягомлі адбыўся суд над былым паліцаем, але ён прайшоў без асаблівай агалоскі.

З беларускіх пісьменнікаў, на маю думку, сама яскрава вывеў вобраз паліцая Алесь Адамовіч у сваёй аповесці «Карнікі». Ён паказаў, што гэта з'ява інтэрнацыянальная. У яго аповесці ёсць паліцаі-беларусы Карасёў, Дабраскок, Сілін. Ёсць украінская рота, у складзе якой «галіцыйцы, бандэраўцы». Яе камандзір – Мельнічэнка. Камандзір рускай роты – былы камадзір узвода Чырвонай Арміі малодшы лейтэнант Белы, ураджэнец Краснаярскага края. «Змрочны ён, гэты сібірак Белы...», – такую характарыстыку дае яму Алесь Адамовіч. Руская рота складаецца з паліцаяў-«маскалёў». Сказаць такое, што паліцаі маскалі, ці маскалі паліцаі – гэта смелы ўчынак пісьменніка, бо кніга выйшла ў «застойным» 1981 годзе. Упамінаецца паліцай па нацыянальнасці француз. Ён больш гуманны, чым свае «савецкія паліцаі», адчувае на сваёй душы цяжар, калі яму загадваюць расстрэльваць мірных людзей. Ён звяртаецца да паліцая, па прозвішчу Тупіга, каб той зрабіў гэтую справу за яго. Тупіга – ураджэнец Днепрапятроўскай вобласці, але з 1933 года пражываў у Беларусі. Мне здаецца, што

гэта галоўны персанаж аповесці, яе стрыжань. Не было б Тупігі, не атрымалася б і аповесці. У сваіх думках ён часта размаўляе сам з сабой. Аўтар шмат разоў карыстаецца гэтым прыёмам. Але ж як ён мог прачытаць думкі Тупігі? Для гэтага трэба паставіць сябе на месца паліцая і ўявіць, як бы ты сам пастуціў у тых абставінах. Хутчэй за ўсё аўтар вось так змадэліраваў тыя думкі і ўклаў іх у галаву і ў вусны «героя» ці «антыгероя» аповесці.

Чытаючы аповесць Алеся Адамовіча «Карнікі», можна прыйсці да высновы, што ў пэўных умовах чалавек можа стаць і партызанам і паліцаем, і патрыётам і здраднікам. Мы ж бачым, што сярод паліцаеў шмат ваеннапалонных – былых чырвонаармейцаў. І ў ролі камандзіраў паліцэйскіх падраздзяленняў выступаюць былыя афіцэры Чырвонай Арміі. Мне не надта падабаецца слова «здраднік». Тут трэба разбірацца, што прымушае чалавека станавіцца на такі шлях. Бывае і так, што для адной часткі насельніцтва – гэта здраднік, а для іншай – гэта герой. Слова «злачынец» больш універсальнае. Паліцай Тупіга – кулямётчык. Ён не расстаецца з кулямётам, але ў яго ёсць і пісталет. Часам у глыбіні яго душы прачынаецца «спачуванне» да чарговай ахвяры. Так ён двума стрэламі з пісталета забівае гадавалае дзіця, каб не паліць яго жывым. Згарэць у агні – смерць больш пакутлівая.

Алесь Адамовіч сцвярджае, што сярод паліцаяў былі людзі рознай веры – «католікі, лютэране, праваслаўныя, атэісты, магаметане...» Як я вышэй ужо казаў, у паліцыі былі людзі рознай нацыянальнасці. Аповесць «Карнікі» я чытаў даўно, дзесьці ў 1985 годзе, таму не памятаю, хто быў па нацыянальнасці Тупіга, – ці то ўкраінец, ці то беларус. Часцей за ўсіх у аповесці ўпамінаюцца паліцаі-ўкраінцы. Гэта Грабоўскі - Вінніцкая вобласць, Мураўёў – Днепрапятроўская вобласць, Мельнічэнка – ураджэнец горада Кіева, Багрый – Палтаўская вобласць, Сіротка з Адэсы, Хільчанка – Чэркаская вобласць. Гэта не азначае тое, што паліцаі-беларусы лепшыя за іншых. Проста, магчыма, беларускія паліцэйскія фарміраванні ў той самы час дзейнічалі ва Украіне, у Літве, у Латвіі ды ў іншых месцах. Немцы па савецкаму ўзору ладзілі абмен «спецыялістамі» паміж акупаванымі тэрыторыямі. Не пашанцавала Украіне і са спаленай беларускай вёскай Хатынь. Савецкая прапаганда запэўнівала нас, што і Хатынь і ўсе іншыя вёскі спалілі непасрэдна немцы. Калі ў сакавіку 1965 года Першым сакратаром стаў Машэраў, перад ім, як і перад любым кіраўніком, паўстала пытанне, што б такое грандыёзнае зрабіць,

пабудаваць, каб гэта надоўга запомнілася людзям. Ідэя ўзнікла хутка. Як былому партызану тэма акупацыі была яму блізкай. Так усплыла на паверхню забытая, як і ўсе спаленыя вёскі, Хатынь. Праз два гады пасля заступлення на пасаду, у сакавіку 1967 года было аб'яўлена аб будаўніцтве мемарыяла, а 5 ліпеня 1969 года адбылося адкрыццё гэтай дзіўнай пабудовы. Але, як высветлілася, пад мемарыялам была закладзена міна запаволеннага дзеяння. У любы момант магла адкрыцца праўда пра Хатынь, што яе разам з людзьмі спалілі не немцы, а 118-ты карны паліцэйскі ўкраінскі батальён. Ён фарміраваўся пад Кіевам, а потым перакінуты на сталае месца дыслакацыі ў беларускі горад Навагрудак. Партыйным уладам Украіны і Беларусі ўдалося дамовіцца, каб скрыць праўду пра Хатынь. Але калі наступіла Гарбачоўская перабудова і галоснасць, праўда адкрылася. Галоўным злачынцам і віноўнікам у знішчэнні Хатыні аб'яўлены Рыгор Васюра, былы старшы лейтэнант Чырвонай Арміі, хоць ён быў начальнікам штаба батальёна, а не камандзірам. Як жа склаўся далейшы лёс Рыгора Васюры? У 1952 годзе ён быў асуджаны трыбуналам да 25 гадоў пазбаўлення волі, але праз 3 гады ў верасні 1955 года па амністыі выйшаў на свабоду. Пасля гэтага ён доўгі час працаваў намеснікам дырэктара саўгаса на Кіеўшчыне. У красавіку 1984 года ўзнагароджаны медалём «Ветэран працы». Часта выступаў у школах перад піянерамі, расказваў, як ваяваў на фронце. Нават быў ганаровым курсантам Кіеўскага вышэйшага ваенна-інжынернага вучылішча сувязі. Але КДБ знайшоў новыя ўлікі. Рыгора Васюру арыштавалі і ў снежні 1986 года асудзілі да расстрэлу. Суд адбыўся ў Мінску. Яшчэ адзін фігурант тых падзей, камандзір узвода 118-га паліцэйскага ўкраінскага батальёна, былы лейтэнант Чырвонай Арміі Васіль Мялешка ў 1975 годзе быў асуджаны да расстрэлу.

Савецкай уладзе не надта хацелася прызнаваць той факт, што на акупаванай немцамі тэрыторыі СССР існавалі паліцэйскія роты, батальёны, эскадроны, палкі, брыгады і складаліся яны з савецкіх грамадзян. Таму ў пасляваенны час савецкая прапаганда распаўсюджвала інфармацыю, што паліцаямі, здраднікамі, нямецкімі прыслужнікамі былі адзінкі – гэта крымінальнікі і дэградзіраваныя элементы. Я асабіста сам прысутнічаў на такіх прапагандысцкіх лекцыях, слухаў выступы, чытаў такія артыкулы і мастацкія творы, глядзеў фільмы пра вайну. Але я, як чалавек, перажыўшы акупацыю, ведаў, што гэта не зусім так. На тэрыторыі акупаванай Беларусі акрамя 118-га паліцэйскага ўкраінскага

батальёна дыслацыраваліся: 51-ты паліцэйскі ўкраінскі батальён у мястэчку Валожыне, 54-ты і 102-гі паліцэйскія ўкраінскія батальёны ў горадзе Барысаве, 57-мы паліцэйскі ўкраінскі батальён у горадзе Баранавічы, 115-ты ўкраінскі паліцэйскі батальён у Слоніме. Акрамя ўкраінцаў у Слоніме размяшчаўся 3-ці літоўскі паліцэйскі батальён. 12-ты і 15-ты літоўскія паліцэйскія батальёны дыслацыраваліся ў горадзе Ліда. У горадзе Слуцку размяшчаўся 271-шы латышскі паліцэйскі батальён. І гэта яшчэ не ўсё. На тэрыторыі Беларусі дзейнічаў 633-ці Усходні батальён, які камплектаваўся з палонных чырвонаармейцаў – выхадцаў з сярэднеазіяцкіх рэспублік СССР. Быў яшчэ 600-ты казацкі полк. Пра брыгаду палкоўніка Гіля-Радзіёнава я падрабязна расказаў вышэй у сваіх успамінах. Трэба дадаць, што на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 2-гі і 31-шы паліцэйскія палкі, у складзе якіх былі нямецкія, аўстрыйскія, французскія, венгерскія ды іншыя роты. Вось такі расклад. Але з гэтай колькасці паліцэйскіх фарміраванняў на слыху былі толькі 118-ты ўкраінскі паліцэйскі батальён, яго начальнік штаба Рыгор Васюра і батальён Дзірлевангера. Усе яны засвяціліся пры знішчэнні вёскі Хатынь. Калі на месцы спаленай вёскі ўзнік мемарыял, то нават пасля гэтага савецкая ўлада не адважылася назваць сапраўдных злачынцаў. Вышэй я ўжо казаў, што аб гэтым стала вядома толькі ў часы Гарбачоўскай перабудовы і галоснасці. Адной з прычын, што ўсё гэта трымалася ў тайне, было тое, каб не нашкодзіць «дружбе» народаў СССР.

Але што гэта я ўсё пра ўкраінцаў, літоўцаў, латышоў... Пара сказаць і пра нашых землякоў – беларусаў. Летам 1942 года пачалося фарміраванне 49-га беларускага паліцэйскага батальёна ў Астрашыцкім Гарадку. Батальён дасягнуў колькасці да 2000 чалавек. Спачатку камандзірамі былі немцы. Беларусы не ведалі нямецкай мовы, таму паявіліся непаразуменні. На гэтай глебе пачалося дэзерцірства. Тады нямецкіх камандзіраў замянілі эстонцамі, якія ведалі рускую мову. Але для беларусаў эстонцы, як і немцы, былі чужынцамі, і руская мова была чужой. Тады сталі шукаць афіцэраў-беларусаў. Іх вельмі хутка знайшлі і дэзерцірства спынілася. У 1943 годзе пачалося фарміраванне яшчэ некалькіх батальёнаў. Так у вёсцы Урэчча Слуцкага раёна быў сфарміраваны 36-ты паліцэйскі беларускі полк. Потым яго перавялі ў мястэчка Валожын. У Баранавічах у той жа самы час быў сфарміраваны 60-ты паліцэйскі батальён. Калі пачалося фарміраванне 48-га

паліцэйскага беларускага батальёна ў Слоніме, то за кароткі тэрмін прыбыло 5 тысяч добраахвотнікаў. Нават немцы былі здзіўлены такой актыўнасцю. Акрамя гэтага ў Баранавічах быў сфарміраваны ахоўны паліцэйскі беларускі батальён.

На пачатку 1943 года пачалося фарміраванне ў горадзе Мінску 13-га беларускага паліцэйскага батальёна СД. Яго фарміраваннем займаўся Францішак Кушэль. Ён адразу паставіў перад немцамі шэраг умоў:

– Камандны склад батальёна павінен быць беларускім.

– Каманды павінны давацца на беларускай мове.

– Бытавая мова зносін – беларуская.

– Выхаванне і прапаганду праводзяць беларускія спецыялісты.

– Узбраенне, форма, забеспячэнне па нямецкім ваенным нормам.

– Знакі адрознення на мундзірах – беларускія.

– Батальён павінен дзейнічаць толькі ў Беларусі і толькі супраць савецкіх партызан.

За кароткі тэрмін з добраахвотнікаў было сфарміравана дзве роты па 200 чалавек. Людзі прыбывалі, і хутка ў батальёне налічвалася каля 1000 чалавек, усяго пяць рот. Праз нейкі час батальён перавялі ў Вілейку. Не ведаю, усе ці не, але ўмовы, высунутыя Кушэлем, немцы выконвалі. Так, прапагандыстам батальёна быў беларус лейтэнант Чабатарэвіч. Беларусы Бураўка, Мазур, Орсіч, Хмяльніцкі, Якубёнак былі камандзірамі рот. Дарэчы, камандзіры-беларусы клапаціліся аб сваіх падначаленых, адстойвалі іх правы. Напрыклад, камандзір 2-й роты Мазур паводзіў сябе настолькі смела і незалежна, што немцы вымушаны былі яго арыштаваць. Ён загінуў у засценках СД. Дык хто ён? Здраднік ці герой? Пытанне спрэчнае.

Акрамя гэтага на тэрыторыі Беларусі быў створаны паліцэйскі батальён чыгуначнай аховы. Роты батальёна былі размешчаны ў Мінску, Полацку, Баранавічах, Лідзе, Круляўшчызне, Стоўбцах і нават на тэрыторыі Расіі. Беларускія паліцэйскія батальёны на баку немцаў змагаліся ўсюды. Так, 100-ты паліцэйскі беларускі батальён вёў баявыя дзеянні ў Італіі. У Аўстрыі гэтаксама была створана беларуская брыгада. Адзін батальён брыгады прымаў удзел у баявых дзеяннях пад Монтэ-Касіна. Там жа змагаліся жаўнеры Слонімскага беларускага паліцэйскага батальёна. Так што пад

Монтэ-Касіна беларусы змагаліся супраць беларусаў. Трэба дадаць, што ў Еўропе дзейнічала Грэнадзёрская штурмавая брыгада СС «Беларусь». Колькі загінула беларусаў, якія змагаліся на баку немцаў, невядома. Але на нямецкіх могілках у Італіі на помніках шмат беларускіх прозвішчаў.

## *Мірнае насельніцтва на акупаванай тэрыторыі*

У мяне няма даных, якая колькасць насельніцтва Беларусі была эвакуіравана ва ўсходнія раёны СССР. Я думаю, няшмат. Беларусь была акупавана немцамі маланкава. Сталіца рэспублікі горад Мінск быў заняты немцамі на шосты дзень вайны. Ва ўмовах такой скарацечнасці падзей аб эвакуацыі не магло быць нават гаворкі. Кіраўніцтва рэспублікі і абласцей так мітусліва ўцякала, што на сталах іх кабінетаў засталіся ляжаць сакрэтныя, зусім сакрэтныя, асобай і дзяржаўнай важнасці дакументы, якія вельмі дапамаглі немцам усталяваць на захопленай тэрыторыі свой, з элементамі савецкага, парадак. Магчыма, гарадское насельніцтва з усходніх абласцей рэспублікі часткова было эвакуіравана. Напрыклад, сям'я майго будучага цесця, жыхара горада Оршы, была эвакуіравана ва Ульянаўскую вобласць. Стыхійныя гурты бежанцаў, якія рухаліся па дарогах на ўсход, вымушаны былі вяртацца назад, паколькі нямецкая армія наступала значна хутчэй і абганяла іх. Сельскае насельніцтва хутчэй за ўсё цалкам засталося на акупаванай тэрыторыі.

У сваіх успамінах і разважаннях я кіруюся досведам са сваёй вёскі Нябышына. На пачатку вайны, апынуўшыся ў акупацыі, мы і ў думках не мелі, каб уцякаць са сваёй вёскі, са сваёй хаты, дзесьці хавацца. Мы не адчувалі небяспекі. Тым больш, мы і ў думках не мелі змагацца з акупантамі. У нас не было зброі, і ніхто не імкнуўся, каб яе набыць. Гэтым можна было наклікаць бяду не толькі на сваю сям'ю, але і на ўсю вёску. У нас было адзінае памкненне – выжыць. Мая вёска Нябышына была звычайнай вёскай, як і ўсе вёскі Беларусі, у якіх пражывалі такія ж самыя мірныя людзі. Я не чуў, каб хоць у адной з навакольных вёсак людзі ўзялі ў рукі зброю і выступілі адкрыта супраць акупантаў. Калі з'явілася чужая для нас партызанская навала, мая маці малілася Богу, каб у гэтую ноч партызаны абмінулі нашу хату. Выжыць ва ўмовах акупацыі было вельмі цяжка. На маю думку, кожны чалавек, які выжыў ва ўмовах акупацыі – гэта больш, чым герой. Шукаючы

інфармацыю, я натыкнуўся на дакумент – «Партызанскую прысягу». Вось адзін пункт прысягі: «Я клянусь, што хутчэй загіну ў жорсткім баі з ворагам, чым аддам сябе, сваю сям'ю і беларускі народ у рабства крываваму фашызму». Сказана моцна, але гэта пустыя словы. Насамрэч, нічога не рабілася для абароны насельніцтва.

Яскравы прыклад – дзеянні невялікага партызанскага атрада «Бацькі Міная», камандзірам якога быў Мінай Шмыроў. Дарэчы, гэта быў прыроджаны баец. Ён служыў у царскай арміі, удзельнік Першай сусветнай вайны, узнагароджаны 3-ма Георгіеўскімі крыжамі. З 1918 па 1920 год – удзельнік Грамадзянскай вайны. З 1921 года па 1923 год Мінай Шмыроў – камандзір атрада па барацьбе з «бандытызмам» на Віцебшчыне. Слова бандытызм я ўзяў у двукоссе таму, што, на маю думку, тыя «бандыты» – гэта нашы землякі, гэта тыя беларусы, якія першымі зразумелі, што нясе нам бальшавіцкая савецкая ўлада. Яны змагаліся з ёй, як маглі. Яны – патрыёты нашай Айчыны. А Мінай Шмыроў арганізоўваў і ўзначальваў асабіста сам карныя аперацыі супраць нашых землякоў, жорстка распраўляўся з імі, забіваў. І вось гэты былы карнік, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, клянецца, што хутчэй загіне «ў жорсткім баі з ворагамі, чым аддасць сябе, сваю сям'ю і беларускі народ у рабства крываваму фашызму». Трэба адзначыць, што ён адзін з першых, ужо ў ліпені 1941 года, стварыў партызанскі атрад. У склад атрада ўваходзілі партыйныя актывісты і службоўцы кардоннай фабрыкі, дырэктарам якой перад вайной і з'яўляўся Мінай Шмыроў. Таму стварыць партызанскі атрад у яго складанасці не было, гэтыя людзі залежалі ад яго. Усяго ў атрадзе было 25 чалавек. З цягам часу колькасць вагалася – адны людзі атрад пакідалі, іншыя далучаліся. Атрад «Бацькі Міная» нападаў на невялікія групы немцаў, разбураў нязначныя драўляныя масты. Памятаецца, тое ж самае адбывалася вакол маёй вёскі Нябышына. Урон немцам быў нанесены нязначны. Але сваімі неабдуманымі правакацыйнымі дзеяннямі супраць немцаў Мінай Шмыроў стварыў нязносныя ўмовы для выжывання, смяротную небяспеку для мясцовага насельніцтва.

Зразумела, што людзі не ўспрымалі і нават ненавідзелі партызан, шукалі паратунку ў немцаў. Пра гэта адкрыта сказана ў «Дзённіку атрада «Бацькі Міная», ліпень 1941 г. – люты 1942 г.». Вось запіс, зроблены 21 ліпеня 1941 года:

«Правакатары, даведаўшыся пра партызан, данялі аб гэтым у Сураж немцам». Вось яшчэ адзін запіс ад 20 жніўня 1941 года: «Правакатары дапамагаюць немцам шукаць стаянкі партызан». А як трэба паступаць з правакатарамі? Правільна, знішчаць. Гэта па-савецку. І Мінай Шмыроў прысвоіў сабе права вызначаць, хто правакатар, а хто не. У шэрагу «правакатараў» мог апынуцца любы чалавек з любой вёскі. Гэта тыя, да каго немцы ці паліцаі завіталі ў хату і пры гэтым не нарабілі ніякай шкоды; гэта тыя вяскоўцы, якіх немцы пры сустрэчы спынялі на вуліцы, каб штосьці высветліць, а потым мірна адпускалі; гэта тыя вяскоўцы, хто паслухмяна здаваў падаткі акупацыйнай адміністрацыі, і шмат іншых прычын. Мінай Шмыроў прысвоіў сабе права караць "правакатараў". Пачалося паляванне на людзей. Зноў падмацую гэта прыкладамі з «Дзённіка атрада «Бацькі Міная», чэрвень 1941 г. – люты 1942 г.»:

10 жніўня 1941 года расстралялі правакатара Карабуліна з вёсчкі Мялыні.

23 жніўня 1941 г. партызаны здзейснілі налёт у Суражы на кватэру правакатара Фамzнкова, кінулі некалькі гранат, разбурылі частку дома.

25 жніўня 1941 года быў затрыманы правакатар Фадзей Балыкаў і расстраляны.

13 верасня 1941 года пачалі дзейнічаць па знішчэнню правакатараў у Суражы.

22 верасня 1941 года расстралялі старшыню калгаса Марозава з вёскі Смолаўка.

Можна працягваць гэтыя дзённікавыя запісы. Але хопіць і гэтага, каб паставіць законнае пытанне: «Супраць каго ваявалі партызаны? Адказ ляжыць на паверхні – супраць мірнага насельніцтва. Так, як я сказаў вышэй, партызаны з засад, часам, абстрэльвалі нешматлікія групы немцаў, псавалі ці разбуралі нейкія нязначныя аб'екты. Але і гэтыя іх правакацыі абарочваліся супраць насельніцтва. І гэту сваю выснову падмацую выпіскай з «Дзённіка...»:

14 жіўня 1941 года спалены мост у вёсцы Пудаць. Немцы за гэта спалілі некалькі дамоў.

28 кастрычніка 1941 года за сувязь з партызанамі немцы спалілі вёску Захаранкі.

А зараз прыкіньце ў сваіх галовах, колькі ў першыя месяцы вайны з'явілася на тэрыторыі акупаванай Беларусі вось такіх бяздумных і бяздушных «шмыровых»? Самае меншае, па аднаму на кожны раён, таму што ў кожным раёне быў райкам, і былі партыйныя актывісты, якія хаваліся ад акупантаў у навакольных лясах. Але гэта быў толькі пачатак. Як я ўжо казаў раней, пік партызанскага бязмежжа прыпаў на 1943 год. Як у тых умовах выжывала наша насельніцтва, гэта нават немагчыма ўявіць.

Памятаю, як падчас святкавання нейкай гадавіны з Дня Перамогі ў тэлеперадачы на адным з тэлеканалаў прагучалі радкі з верша Аркадзя Куляшова «Балада аб чатырох заложніках».

*«Перад бацькам Мінаем*
*Станьце, усе бацькі, на калені.»*

Магчыма, я выклікаю абурэнне ў свой адрас, але я выкажу сваю думку: я не стану на калені перад Бацькам Мінаем. Я зрабіў бы гэта і паклаў бы кветкі на яго магілу, калі б ён ратаваў сваіх дзяцей, сваякоў, насельніцтва нават коштам свайго жыцця. Ён гэтага не зрабіў і не паспрабаваў зрабіць. Потым ён скажа, што не меў права рызыкаваць жыццём партызан дзеля вызвалення сваіх дзяцей. Дзеці ўтрымліваліся ў раённым цэнтры Сураж. Але ж, калі не было ніякай патрэбы нападаць, ён нападаў на Сураж і нават 3 гадзіны трымаў яго ў сваіх руках. Тады ён пра жыццё партызан не думаў. 14 лютага 1942 года фашысты расстралялі ні ў чым непавінных чацвёра непаўналетніх дзяцей Міная Шмырова: 14-гадовую Лізу, 10-гадовага Сяргея, 7-гадовую Зіну, 3-гадовага Мішу.

На прыкладзе атрада «Бацькі Міная» я імкнуўся паказаць, як няпроста было выжываць ва ўмовах акупацыі. Смяротная небяспека для насельніцтва існавала як з боку немцаў, так і з боку партызан.

## *Яўрэі Беларусі*

Яўрэі складалі значную частку даваеннага насельніцтва Беларусі. Па дадзеным гісторыкаў Эмануіла Іофэ і Іллі Альтмана ,напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі

пражывала каля 1 мільёна яўрэяў. Яўрэі апынуліся ў больш цяжкім становішчы, чым іншыя грамадзяне Беларусі. Я думаю, яны ведалі пра планы фашыстаў па іх пагалоўнаму знішчэнню. На тэрыторыі Германіі і ў акупаваных краінах Еўропы ўжо дзейнічалі канцлагеры. Той жа Асвенцым на тэрыторыі Польшчы быў адчынены 20 траўня 1940 года. Трэба адзначыць, што немцы свае канцлагеры стваралі па савецкаму ўзору. Яны былі дапушчаны ў савецкія ГУЛАГі для атрымання вопыту. Фашысты былі таленавітымі вучнямі савецкай карнай сістэмы.

Безумоўна, яўрэі маглі б эвакуіравацца, але падзеі развіваліся вельмі хутка. Як я вышэй ужо сказаў, Мінск быў заняты немцамі 28 чэрвеня 1941 года. А кіраўніцтва рэспублікі пакінула сталіцу вечарам 24-га чэрвеня 1941 года, моўчкі, без аб'яўлення эвакуацыі. Стыхійная эвакуацыя адбывалася, але безвынікова. Немцы наступалі хутчэй, чым рухаліся тоўпы ўцекачоў. Была створана яшчэ адна перашкода, якая зрабіла стыхійную эвакуацыю немагчымай. Падмацую гэта выказванне прыкладам. Прашу прабачэння за паўтор, але прыклад вельмі важны.

26.09.2004 г. на тэлеканале ТВЦ паказалі перадачу: «Вокзал Победы. Последний из гетто». Я запісаў расказ яўрэйкі, удзельніцы перадачы:

> «На второй день войны мы хотели эвакуироваться, но все дороги с Беларуси на Восток были перекрыты отрядами НКВД. При попытке пройти или проехать отряды НКВД открывали стрельбу. НКВД нас вернуло в руки немцев».

Што тут можна сказаць? Магчыма, погляды па яўрэйскаму пытанню ў нямецка-фашыскага і савецкага кіраўніцтва супалі.

Калі я пачаў знаёміцца з матэрыяламі пра генацыд, Халакост яўрэйскага насельніцтва, то прыйшоў да высновы, што асабліва жорстка знішчалі яўрэяў на тэрыторыі акупаванай Беларусі. Забойствы яўрэяў пачаліся з першых дзён акупацыі. Спачатку іх размяшчалі ў спецыяльна выдзеленых для пражывання месцах – гета. Былі ўведзены для іх спецыяльныя знакі адрознення – нашыўкі жоўтага колеру ў выглядзе шасціканцовай зоркі, якія размяшчаліся на адзенні спераду і ззаду. Ужо 28 чэрвеня 1941 года ў Беластоку было забіта 2000 яўрэяў. Расстрэлы працягваліся і ў наступныя дні. 10 ліпеня немцы расстралялі ад 5 тысяч да 10 тысяч яўрэяў у горадзе Брэсце. У Пінску з 5 па 7 жніўня было забіта 10 тысяч яўрэяў. Расстрэлы адбываліся ў Віцебску

і ў іншых месцах па ўсёй тэрыторыі Беларусі. 8 кастрычніка 1941 года ў выніку ліквідацыі віцебскага гета было забіта 16 тысяч яўрэяў. 30 кастрычніка 1941 года расстраляна 4,5 тысячы яўрэяў у нясвіжскім гета. 8 снежня 1941 года ў Навагрудку з 7 тысяч яўрэяў, якія там пражывалі, забіта 4,5 тысячы. Расстрэлы працягваліся і ў 1942 годзе. Так на працягу студзеня ў Беларусі было расстраляна 33200 яўрэяў. На працягу 1942 года былі расстраляны ўсе яўрэі ў гета мястэчак Клецка, Косава, Гарадзеі, Ляхавічаў, Міра, Нясвіжа і ў іншых месцах. 8 лютага 1943 года было ліквідавана слуцкае гета, усіх, хто там утрымліваўся, расстралялі. 12 сакавіка 1943 года было цалкам знішчана яўрэйскае насельніцтва горада Гродна, гэта больш за 25 тысяч чалавек. Нават у «Дзённіку атрада «Бацькі Міная»» зафіксаваны выпадак расстрэлу яўрэяў. Вось дзённікавы запіс ад 6 жніўня 1941 года: «Учора ў Суражы немцы расстрэльвалі яўрэяў. Яўрэяў групамі тапілі ў рацэ. Мужчын прымушалі пераплываць раку, калі яны падплывалі да берага, іх забівалі і тапілі. Дзяцей выкідвалі з вокан. Правакатары і марадзёры выдавалі яўрэяў. Крывавая расправа наводзіла жах, ад убачанага і пачутага кроў застывала ў жылах. Усяго за адзін дзень знішчана ў Суражы 670 яўрэяў...» Вось гэта расправа немцаў над яўрэямі ў Суражы на партызан атрада «Бацькі Міная» навадзіла жах, кроў стыла ў жылах, але яны нават пальцам не кранулі, каб ратаваць яўрэяў. Проста яны дзесьці паблізу назіралі за працэсам – запіс у «Дзённіку...» дэталёвы.

Колькі ўсяго загінула яўрэяў у часы вайны на тэрыторыі Беларусі, звесткі разыходзяцца. Часцей за ўсё прыводзяцца лічбы ад 600 тысяч да 800 тысяч чалавек. А гэта складае 74–82% ад агульнай колькасці яўрэйскага насельніцтва Беларусі. Доктар гістарычных навук прафесар Эмануіл Іофэ, даследчык гісторыі Халакоста, прыводзіць лічбы ахвяр на аснове ўласных даследаванняў. Ён сцвярджае, што «ў 1941–1944 гг. на беларускай зямлі на тэрыторыі 277 населеных пунктаў існавала 299 гета. Тут загінула 940 тысяч яўрэяў, дэпартаваных сюды з еўрапейскіх краін. У сучасных межах Беларусі гэта лічба складае 805 чалавек (715 тысяч + 90 тысяч)».

Самымі буйнымі канцлагерамі на тэрыторыі Беларусі былі адзін у раёне вуліцы Шырокай горада Мінска, другі ў вёсцы Малы Трасцянец. Гэты канцлагер быў створаны ўвосень 1941 года на тэрыторыі калгаса імя Карла Маркса. Тут адбывалася самае маса-

вае знішчэнне яўрэяў. Акрамя Малога Трасцянца ў склад канцлагера ўваходзілі ўрочышчы Благоўшчына і ўрочышча Шашкова.

Што тычыцца дакладнай лічбы, колькі людзей знішчана ў гэтым канцлагеры, то вакол гэтага адбывалася нейкая гульня. У сумесным акце Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі і Мінскай абласной камісіі ад 14 ліпеня – 13 жніўня 1944 года засведчана: «Камісія, улічваючы паказанні сведак, колькасць і размеры магіл, колькасць трупаў і аб'ём попела і костак у магілах, лічыць, што па самых мінімальных падліках у межах лагера Трасцянец фашысцкімі людаедамі знішчана 546 тысяч чалавек». Але потым аднекуль у канчатковым тэксце з'явілася лічба 206500 чалавек знішчаных. Хачу заўважыць, што камісія па самых мінімальных падліках назвала лічбу знішчаных у 546 тысяч чалавек. З гэтага вынікае, што ў лагеры смерці Трасцянец знішчана людзей нашмат больш, і ў асноўным гэта былі яўрэі. Аднойчы ў складзе групы я наведаў месца масавага знішчэння людзей як фашысцкім так і бальшавіцкім рэжымамі. У Трасцянцы адзін гісторык у сваім выступе расказаў, якім чынам з'явілася на свет лічба ў 206500 чалавек, знішчаных на гэтым месцы: Надзвычайная дзяржаўная камісія прад'явіла свой выніковы акт Панцеляймону Панамарэнку. Азнаёміўшыся, ён сказаў, што 546 тысяч – гэта занадта вялікая лічба. Трэба яе перагледзець. І перагледзелі. Вось так абыякава кіраўніцтва рэспублікі паставілася да працы камісіі, да яе выніковага акта, да лічбаў, за якімі стаяць сотні тысяч ахвяраў вайны. Дарэчы, у складзе камісіі былі такія знакамітасці, як Міхась Лынькоў і Кандрат Крапіва.

А вось у надпісу на абеліску ў Трасцянцы зусім іншая лічба: «Тут, в районе деревни Тростенец, немецко-фашистские захватчики расстреляли, замучили, сожгли 201500 человек мирных граждан, партизан, военнопленных Советской Армии в 1941–1944 гг. » Што, аўтары абеліску правялі дадатковыя даследаванні і ўдакладнілі лічбы, абвешчаныя камісіяй, а потым Панамарэнкам? Хутчэй за ўсё гэта памылка, якую не палічылі патрэбным выпраўляць. Панамарэнка паменшыў лічбу загінуўшых у Трасцянцы, прадстаўленую яму камісіяй, на 339500 чалавек, а тут згубілі ўсяго 5 тысяч. Ці варта звяртаць увагу на такую дробязь? І заўважце, у надпісу на абеліску пра яўрэяў ні слова.

Для татальнага знішчэння яўрэяў, цыган і іншых, па вызначэнню фашыстаў, «расава непаўнацэнных» народаў, былі створаны спецыяльныя Айнзатцгрупы. Упершыню яны з'явіліся нават

у 1938 годзе, калі Аўстрыя была далучана да Германіі. Гітлер, магчыма, лічыў, што аўстрыйцы – гэта тыя ж немцы і трэба было ачысціць новую тэрыторыю ад «расава непаўнацэнных». У самой Германіі нацысты пазбаўляліся ад яўрэяў больш-менш без вялікай крыві. Яшчэ ў верасні 1935 года яны прынялі «Закон аб грамадзянстве Рэйха». На аснове гэтага Закона яўрэі былі пазбаўлены права займаць шэраг пасад, пазбаўляліся маёмасці, уводзіліся іншыя абмежаванні. Ім нічога не заставалася, як пакідаць краіну.

У 1939 годзе Айнзатцгрупа была створана для дзеянняў на тэрыторыі акупаванай Польшчы.

Перад нападам на СССР, у траўні 1941 года былі створаны яшчэ 4 новых групы. Айнзатцгрупа-В была прызначана для дзеянняў у Беларусі. Яе штаб у розны час размяшчаўся ў Ваўкавыску, Слоніме, Мінску, Смаленску. У складзе групы налічвалася 655 чалавек. Большасць складалі ваеннаслужачыя СС, якіх налічвалася не менш як 220 чалавек. Галоўным відам транспарту ў іх былі матацыклы, 100–110 адзінак. Акрамя гэтага ў склад айнзатцгрупы ўваходзіла каля 20 чалавек ад службы СД, 20–25 чалавек ад крымінальнай паліцыі, 60 чалавек ад гестапа, 50–60 – дапаможная паліцыя, 90–95 чалавек – паліцыя парадку. У склад групы ўваходзілі перакладчыкі, тэлеграфісты, радысты, ды іншыя спецыялісты. Айнзатцгрупа-В у сваю чаргу складалася з 7 больш дробных адзінак па 70–120 чалавек: 3 зондэркаманды і 2 айнзатцкаманды. Зондэркаманды дзейнічалі ў прыфрантавой паласе і рухаліся следам за наступаючай на Маскву групай арміі «Цэнтр». У верасні 1941 года яны ўжо былі за межамі Беларусі. Так, зондэркаманда-7а размяшчалася ў Смаленскай вобласці, зондэркаманда-7в – у горадзе Арле і зондэркаманда-7с прызначалася для працы ў Маскве. Такім чынам, ад айнзатцгрупы-В непасрэдна на тэрыторыі Беларусі заставалася ўсяго дзве каманды: айнзатцкаманда-8 у горадзе Магілёве і айнзатцкаманда-9 у горадзе Віцебску. Каманды, у сваю чаргу, падзяляліся на падкаманды па 20–30 чалавек. Чаму я столькі ўвагі ўдзяляю гэтым камандам? Як я сказаў вышэй, айнзатцгрупы былі створаны для татальнага знішчэння яўрэяў. Але на тэрыторыі Беларусі немцы пакінулі ўсяго дзве раздробленыя каманды агульнай колькасцю каля 200 чалавек. Знішчыць такую колькасць насельніцтва на тэрыторыі Беларусі, а гэта больш за два мільёны чалавек, у тым ліку ад 600 тысяч да 940 тысяч яўрэяў, яны проста фізічна не маглі. Яны, хутчэй за ўсё, дзейнічалі так, як зараз дзейнічае

АМАП. Гэта мабільныя каманды, іх накіроўваюць туды, дзе штосьці здараецца. Я хачу, каб чытачы мяне зразумелі – я не абяляю нацыстаў, акупантаў. Я проста разважаю, імкнуся расставіць усё на свае месцы. Мне пашанцавала азнаёміцца з адным нямецкім дакументам таго часу. Яны добрасумленна фіксавалі ўсё, што рабілі, дзень за днём. Вось вытрымкі з «Данясення аб паліцэйскай дзейнасці Айнзатцгрупы-В з 9 па 16 ліпеня 1941 года для камандавання групы армій «Цэнтр»: «...у Беластоку былі арыштаваны і ліквідаваны 37 чалавек. Гэта былі: 4 камісары РККА, 7 рускіх за камуністычную агітацыю, 3 беларуса – члены кампартыі, 8 палякаў за камуністычную дзейнасць і марадзёрства, 12 яўрэяў за камуністычную дзейнасць і варожыя к немцам адносіны, 3 палякі беглыя зняволеныя за марадзёрства. У Гродна мясцовая айнзатцкаманда арыштавала 16 яўрэяў, якія пры саветах працавалі ў органах НКУС... Пошуку такіх асоб перашкаджае думка насельніцтва, што гарады, якія ў руках немцаў, могуць быць узяты назад Чырвонай Арміяй. Але насельніцтва агітуецца да супраціўніцтва. Даносы, якія паступілі, дэманструюць, што беларусы ўжо пачалі ўдзельнічаць у пошуку функцыянераў». Як сказаў адзін «класік» палітычнага жанру: «Працэс пайшоў».

Можна меркаваць, што ўсе гэтыя затрыманні і ліквідацыі адбываліся па даносах нашых суайчыннікаў. Паспяхова сталі стварацца паліцэйскія роты і батальёны з мясцовых жыхароў. Яны і ўзялі на сябе галоўны цяжар па масаваму знішчэнню яўрэяў. Немцы ахвотна перадавалі ім свае крывавыя функцыі. Але знішчыць такую масу людзей адным беларускім паліцэйскім фарміраванням было не пад сілу. І тут своечасова на дапамогу прыйшлі рускія і ўкраінскія паліцэйскія батальёны. Яны ўшчыльную ўключыліся ў працэс знішчэння яўрэяў на тэрыторыі Беларусі. Таксама дапамагалі рабіць гэтую крывавую справу літоўскія і латышскія паліцэскія батальёны. Можна знайсці шмат крыніц, у якіх усё гэта задакументавана. Так, сотні беларускіх паліцэйскіх знішчалі яўрэяў у гета Баранавічаў, Мінска, Карэлічаў, Нароўлі, Зембіна і ў іншых месцах. Доктар гістарычных навук Л. Смілавіцкі адзначае, што роль беларускай паліцыі ў масавых забойствах стала асабліва заметнай з лютага-сакавіка 1942 года, калі паліцэйскія структуры былі ўкамплектаваны, а нямецкія фарміраванні былі адпраўлены на фронт.

У знішчэнні яўрэяў усходняй часткі Беларусі прымалі ўдзел рускія калабаранты з Рускай нацыянальнай народнай арміі

(РННА). Яе штаб у сакавіку 1942 года знаходзіўся ў пасёлку Асінторф Дубровенскага раёна. Рота гэтай арміі, колькасцю 100–150 чалавек, 2 красавіка 1942 года ў мястэчку Ляды Дубровенскага раёна забілі каля 2000 яўрэяў. У пачатку 1942 года пад кіраўніцтвам начальніка рускай паліцыі Андрэя Сямёнава была праведзена акцыя па знішчэнні яўрэяў у вёсцы Палынкавічы Магілёўскай вобласці. З 20 па 22 кастрычніка 1941 года батальён рускіх паліцэйскіх колькасцю 200 чалавек расстралялі 7 тысяч яўрэяў Барысаўскага гета з 9 тысяч, якія тут утрымліваліся. Самым бязлітасным быў паліцай Канстанцін Панін, ленінградзец. Не адставалі ад яго Архіп Арлоў, Пётр Арцёмаў, Генадзь Васільеў, Леанід Глазаў, Уладзімір Гарбуноў, Уладзімір Карасёў, Рыгор Конанаў ды іншыя. Увогуле, рускае прозвішча Конанаў – нейкае злавеснае. Паліцай Рыгор Конанаў забіваў яўрэяў у горадзе Барысаве, а партызан Васіль Конанаў забіваў мірных людзей, у тым ліку і цяжарную жанчыну, у латвійскім хутары Малыя Баты.

Часта даводзіцца чуць меркаванне, што яўрэі ў час Другой сусветнай вайны не праяўлялі намаганняў, каб ратаваць сваё жыццё. Але гэта не зусім так. Беларусы таксама нічога не прадпрымалі, каб ратавацца, сядзелі ў сваіх хатах і чакалі, што будзе далей. Я гэта сцвярджаю, таму што маю досвед, як усё адбывалася ў маёй вёсцы Нябышына. Беларусам усё ж было лягчэй – іх не заганялі ў гета і не знішчалі, як гэта рабілі з яўрэямі. І ўсё ж яўрэйскі супраціў нацыстам існаваў, аб гэтым сведчыць шэраг дакументаў. І супраціў яўрэяў у Беларусі ўзнік раней, чым яўрэйскае паўстанне ў варшаўскім гета. У шмат якіх гета існавалі падпольныя арганізацыі.

У верасні 1942 года ў мястэчку Лахва Лунінецкага раёну адбылося першае выступленне яўрэяў у ходзе Другой сусветнай вайны. Яўрэяў прывялі да месца расстрэла, але па сігналу яны разам накінуліся на канвой і разбегліся. У выніку каля 600 чалавек схаваліся ў лесе, але каля 2000 чалавек загінула. Такое ж адбылося і ў мястэчку Радунь, якое знаходзіцца ў Воранаўскім раёне. У траўні 1943 года групу яўрэяў прывялі на расстрэл, але яны кінуліся на ўцёкі. Выратавалася 160 чалавек, 20 загінула. У жніўні 1943 года адбылося паўстанне ў Глыбоцкім гета, частка яўрэяў вырвалася на волю. Такія ж выступы адбыліся ў Клецкім, Нясвіжскім, Капыльскім гета і ў іншых месцах. Акрамя гэтага, на тэрыторыі Беларусі існавалі яўрэйскія партызанскія атрады, якія не ўпісваліся ў сістэму прамаскоўскіх партызан. У той час,

калі прамаскоўскія партызаны правакавалі немцаў на знішчэнне мірнага насельніцтва, яўрэйскія партызаны ратавалі людзей.

Адным з самых вядомых партызанскіх яўрэйскіх атрадаў быў атрад братоў Бельскіх. Калі пачаліся масавыя расстрэлы яўрэяў, браты Бельскія – Туўя, Асаэль і Зусь – сабралі сваіх сваякоў і ў снежні 1941 года скрытна вывелі іх у лес. Недалёка ад сваёй вёскі Станкевічы, што паміж Лідай і Навагрудкам, яны абсталявалі месца, дзе можна было б схавацца. Напачатку іх налічвалася ўсяго 17 чалавек, а зброя – адзін пісталет і некалькі патронаў. Гэта яшчэ нельга было назваць партызанскім атрадам. К жніўню 1942 года ў атрадзе налічвалася 250 чалавек, ён папоўніўся за кошт тых яўрэяў, якія вырваліся з Навагрудскага гета. Атрад пачаў дзейнічаць. Гэта адчулі немцы і заўважылі савецкія партызаны. Але галоўнай мэтай Туўя Бельскі лічыў не змаганне супраць немцаў, а ратаванне яўрэяў. У атрад прымаліся ўсе: і жанчыны, і дзеці, і старыкі, і хворыя. Туўя казаў, што лепш выратаваць адну бабульку-яўрэйку, чым забіць дзесяць нямецкіх салдат. Вось за гэта асабіста я з павагай стаўлюся да партызанаў – братоў Бельскіх.

На маю думку, толькі яўрэйскія атрады на тэрыторыі акупаванай Беларусі можна лічыць сапраўднымі партызанамі. Яны дзейнічалі на карысць беларускім яўрэям, а гэта азначае, на карысць Беларусі. Прамаскоўскія партызаны – гэта дыверсанты і правакатары, якія нанеслі Беларусі, беларускаму насельніцтву вялікую шкоду. У весну 1943 года атрад Бельскіх ужо налічваў 750 чалавек, а к чэрвеню 1944 года атрад дасягнуў 1230 чалавек. Але трэба заўважыць, што ўзброеных байцоў было ад 350 да 500 чалавек, а астатнія – мірнае насельніцтва. Галоўнай задачай узброеных байцоў была абарона мірнага насельніцтва, а не цкаванне немцаў.

Меў вядомасць і партызанскі яўрэйскі атрад, якім камандаваў Шалом Зорын. У ім налічвалася 600 чалавек, у тым ліку 137 узброеных байцоў. Існавалі і іншыя партызанскія яўрэйскія атрады. Становішча яўрэў на акупаванай немцамі тэрыторыі было значна горшым, чым у іншага насельніцтва, яшчэ і таму, што ў СССР, як і ў фашысцкай Германіі, квітнеў антысемітызм. Беларусь не была выключэннем. «Талерантныя», «гасцінныя» беларусы-паліцаі былі больш бязлітаснымі, чым немцы. На гэта іх падштурхоўваў шэраг прычын. Тут і той жа антысемітызм, і спроба паказаць немцам сваю ім адданасць, і ап’яненне ўладай, і жаданне атрымаць ад

акупантаў матэрыяльную ўзнагароду за сумленную службу, і магчымасць злачынным шляхам прысвоіць маёмасць яўрэяў. Вельмі прыкра, што тыя паліцаі часам былі суседзямі яўрэяў, знаёмымі, даваеннымі сябрамі, нават сваякамі.

Мірнае мясцовае насельніцтва ў сваёй большасці таксама адвярнулася ад яўрэяў. І справа не ў тым, што акупанты выдалі загад расстрэльваць тых, хто паспрабуе хаваць яўрэяў. Хавалі ж у сябе чырвонаармейцаў, хоць гэта было яшчэ больш небяспечна. Прычына ў антысемітызме. Выдавалі немцам яўрэяў, якія спрабавалі эвакуіравацца, пакінулі месца жыхарства і апынуліся сярод чужых людзей. Але ж, як я сказаў вышэй, і ад сваіх знаёмых не было паратунку. Выдавалі і тых яўрэяў, якія ўцякалі з гета.

І ўсё ж былі і такія беларусы, якія, рызыкуючы сваім жыццём, ратавалі яўрэяў. Шмат беларусаў атрымала званне «Праведнік свету», якое прысвойваецца ізраільскім інстытутам «Яд ва-шэм». Колькі ўсяго такіх беларусаў, розныя крыніцы называюць розныя лічбы, але часцей сустракаецца – 569. Па гэтаму паказніку Беларусь займае 8-е месца пасля Польшчы, Галандыі, Францыі, Украіны, Бельгіі, Літвы, Венгрыі. Беларусы, «Праведнікі свету», асабліва пачалі выяўляцца пасля 1987 года. Справа ў тым, што тэма Халакосту ў СССР з 1948 года па 1987 год была пад забаронай. Баючыся за ўласную бяспеку, людзі хавалі сваю датычнасць да ратавання яўрэяў. Памятаю, як у 60-я гады мінулага стагоддзя мне пад вялікім сакрэтам далі перапісаць вершы Яўгена Еўтушэнкі «Бабій Яр». Верш быў забаронены, таму што ў ім распавядалася пра генацыд яўрэйскага насельніцтва, пра Халакост. Тэма была непрыемная для савецкага рэжыму. Чаму? Рабіце высновы самі.

Першымі беларусамі, якім было прысвоена званне «Праведнік свету», сталі ў 1965 годзе Андрэй Нікалаеў і яго жонка Наталля Станько, якія выратавалі сям'ю Казінца. Чаму раптам было дадзена паслабленне ў гэтым пытанні? Як я вышэй ужо казаў, у 1965 годзе з прыходам да ўлады Л. Брэжнева ўпершыню дзень 9-га мая быў аб'яўлены святочным – Днём Перамогі. А к новаму святу патрэбны і новыя героі. Крэмлёўскае кіраўніцтва падлічыла, колькі герoеў для гэтай мэты патрабуецца. У рэспублікі накіравалі разнарадку. Так як у БССР на кіруючых пасадах былі былыя кіраўнікі падпольных абкамаў КП(б)Б і партызанскія функцыянеры, то і героі павінны быць з гэтага асяроддзя. Так у гэты спіс папаў і Казінец. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 мая 1965 года яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем

названы плошча і вуліца ў горадзе Мінску. І хоць у героі яго высунула беларускае кіраўніцтва, але ў беларускім спісу Героеў Савецкага Саюза Казінца я не знайшоў. Тут нічога дзіўнага няма. Казінец на тэрыторыю Беларусі папаў, можна сказаць, выпадкова. Вось некалькі фактаў з яго біяграфіі.

Казінец Ісай Пінхусавіч нарадзіўся ў 1910 годзе ў Херсонскай вобласці. З 1922 года сям'я пражывала ў Батумі. У 1936 годзе закончыў Кіеўскі інстытут нафты. Працаваў у Калініне, а потым у Горкім. Член ВКП(б) з 1938 года. Пасля таго як 17 верасня 1939 года ў Заходняй Беларусі на змену польскай акупацыі прыйшла савецкая, Ісая Казінца перакінулі тэрмінова ў Беласток на пасаду галоўнага інжынера прадпрыемства «Нафтазбыт». Не давяраць жа такую адказную пасаду беларусу, ды яшчэ заходняму. Савецкі рэжым лічыў заходніх беларусаў польскімі, англійскімі, нямецкімі... шпіёнамі. Іх чакалі тры дарогі: у Курапаты, у Катынь, у савецкія ГУЛАГі. Ісай Казінец, калі наступіла 22 чэрвеня 1941 года, разам з адступаючай Чырвонай Арміяй спрабаваў эвакуіравацца, але змог дабрацца толькі да Мінска. Уцякаць далей не было магчымасці, таму што немцы абагналі і былі далёка наперадзе. Заблытаць свае сляды ў вялікім горадзе лягчэй, і Ісай Казінец застаўся ў Мінску. Падрабязнасцяў аб яго дзейнасці ў акупаваным Мінску адшукаць не давялося. У даведніках я знайшоў звесткі, што ён займаўся падпольнай працай і дыверсіямі. Якая канкрэтна была праца, колькі дыверсій ён здзейсніў, якую шкоду нанёс немцам, мне невядома. У сакавіку 1942 года нямецкія службы бяспекі арыштавалі яго. 7 траўня 1942 года Ісай Казінец быў павешаны, разам з ім было павешана яшчэ 28 чалавек.

Я адмоўна стаўлюся да дыверсій, нават калі яны маюць патрыятычную афарбоўку, у выніку якіх гінуць невінаватыя людзі. Вось і гэтыя 28 чалавек, якіх павесілі разам з Казінцом, хто яны? У чым была іх віна? Яны ўдзельнікі дыверсіі, ці проста апынуліся побач з тым месцам у тую самую ракавую хвіліну і папалі пад нямецкую аблаву? Узнікае пытанне, хто ж ён, Ісай Казінец, герой ці злачынца? Пытанні, пытанні... Я задаю іх сам сабе і сам сабе спрабую даць адказ на іх. І справа тут не ў Ісае Казінцу. Такіх дыверсантаў было закінута на тэрыторыю акупаванай Беларусі тысячы, дзесяткі тысяч. І яны, нараўне з акупантамі, няслі пакуты мясцоваму насельніцтву. Але я адхіліўся ад галоўнай тэмы, не закончыў свае разважанні пра антысемітызм. Як сцвярджаюць гісторыкі – даследчыкі Халакосту, антысемітызм існаваў не

толькі на бытавым узроўні сярод насельніцтва, у партызанскіх атрадах, але і на ўзроўні партызанскага кіраўніцтва, на ўзроўні ўсіх эшалонаў савецкай улады. Аб гэтым сведчыць шэраг крыніц. Так доктар гістарычных навук прафесар Давід Мельцэр піша, што з ведама Сталіна напачатку лістапада 1942 года Масква накіравала радыёграму падпольным партыйным органам і камандзірам партызанскіх фарміраванняў, якая забараняла прымаць у атрады выратаваўшыхся яўрэяў. І гэта патрабаванне выконвалася. У дакладных запісках, якія пасылалі падпольшчыкі кіраўнікам падпольных абкамаў адзначалася, што партызанскія атрады не дапамагаюць яўрэям і не прымаюць іх у свой склад, а часам адымаюць зброю, вяртаюць назад у гета ці нават расстрэльваюць. З гэтага можна зрабіць выснову, што сустрэча з партызанамі паратунку яўрэям не абяцала.

Аб гэтым жа падрабязна распавядае ў сваёй працы «Катастрофа яўрэяў у Беларусі, 1941–1945 гг.» гісторык, даследчык генацыду яўрэяў Леанід Смілавіцкі. Ён канстатуе, што яўрэйскае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі было асуджана на гібель. Леанід Смілавіцкі прывёў шмат прыкладаў сустрэч яўрэяў з партызанамі – сустрэч, якія заканчваліся трагічна. Так нядаўні студэнт Якаў Рубенчык уцёк з Мінскага гета. Сустрэўшы партызан, палічыў, што нарэшце прыйшло выратаванне. Але як жа ён памыляўся, партызаны яго расстралялі. Вясной 1942 года сям'я Хаі Рабіновіч з гета Пінскай вобласці сустрэла партызан. Камандзір пагадзіўся ўзяць у атрад толькі двух старэйшых дзяцей. А пажылую жанчыну з непаўнагадовымі дзецьмі партызаны кінулі на волю лёсу.

У шэрагу выпадкаў кіраўнікі партызанскіх атрадаў пазбаўляліся ад яўрэяў. Так паступілі ў атрадзе Антонава, які дзейнічаў у Глыбоцкім раёне. Калі ў кастрычніку 1943 года немцы распачалі карную аперацыю супраць партызан, камандзір атрада Антонаў загадаў 9 яўрэям пакінуць атрад. Можа, партызанскае камандаванне не хацела кампраметаваць сябе ў вачах немцаў, што ў іх складзе ёсць яўрэі? А вось калі іх прагналі з атрада, немцы, можа, ацэняць гэта, дадуць палёгку? А можа, і скрынку шнапсу прышлюць для камандзіра атрада Антонава і камандзіра брыгады Шырокава ў знак удзячнасці? Атрымліваецца, што нядаўнія хаўруснікі заставаліся імі, нават знаходзячыся ў стане вайны паміж сабой? Пытанні вельмі непрыемныя. Яўрэі пратэставалі супраць таго, што іх выгналі з атрада, прычым у іх адабралі зброю. Яны

звярталіся да камандзіра партызанскага атрада Антонава, каб іх лепш расстралялі на месцы, таму што ім без зброі, без харчоў, без сродкаў на існаванне няма куды ісці. Яўрэі спрабавалі рухацца за атрадам, але іх папярэдзілі, што будуць страляць.

Былі выпадкі, калі прамаскоўскія партызаны з крыкамі: «Бей жидов!» – нападалі на яўрэйскія атрады. Напады працягваліся да канца вызвалення Беларусі з-пад нямецкай акупацыі.

Леанід Смілавіцкі ў сваіх даследаваннях прывёў такі факт, як камандзір яўрэйскага партызанскага атрада Туўя Бельскі напісаў скаргу на імя генерала Платона. Скарга на мове ваенных – гэта рапарт. Дык вось, рапарт Бельскага – гэта быў крык адчаю. Ён напісаў генералу, што камандзір партызанскай брыгады імя Дзяржынскага таварыш Шышкін не прапускае партызан яўрэйскага атрада па мосце цераз Нёман, адымае ў іх падводы і коней. Гэта пагражала людзям Бельскага голадам і катастрофай. Справу правяраў памочнік генерала Платона Сакалоў. У выніковым па гэтай справе загадзе было сказана, што праверкай выяўлены выпадкі масавага тэрора ў адносінах да партызан-яўрэяў з боку савецкіх партызан. Што тут можна сказаць? Чытачы могуць мяне асуджаць, але я набяруся смеласці сцвярджаць, што ў адносінах да яўрэяў і немцы, і паліцаі, і прамаскоўскія партызаны рабілі адну і тую ж сумесную справу – знішчэнне яўрэяў.

Яшчэ прывяду адзін прыклад, які я адшукаў у даступных крыніцах. Анатоль Рубін з Мінскага гета ўвосень 1943 года сустрэў партызан. Анатоль расказаў ім, што бацькоў расстралялі, а ён сам хаваўся ў адной з вёсак Клецкага раёна. Зараз ён жадае помсціць немцам. На тварах партызан з'явіліся іранічныя ўхмылкі і рэплікі з яўрэйскім акцэнтам: «А што ты будзеш рабіць у партызанах? Страляць? Але ў нас няма крывога ружжа». Потым яму параілі прызнацца, што ён нямецкі шпіён, інакш паабяцалі зрабіць другое абразанне. Юнаку паказалася, што ён сустрэў не партызан, а паліцаяў. Калі зірнуць праўдзе ў вочы, то мы ўбачым, што яўрэі ваявалі не горш за іншыя народы. 110 тысяч беларускіх яўрэяў змагаліся на фронце ў складзе Чырвонай Арміі, 48 тысяч з іх загінулі. 23 беларускія яўрэі сталі Героямі Савецкага Саюза, двое – поўнымі кавалерамі ордэнаў «Славы»(Рыгор Багарад і Яфім Мінкін).

А які лёс напаткаў братоў Бельскіх? Асаэль у 1944 годзе ўступіў у Чырвоную Армію, загінуў на тэрыторыі Германіі незадоўга да канца вайны. Туўя і Зусь пасля вайны, ратуючыся ад перас-

леду з боку НКУС, уцяклі ў Польшчу, а потым у Ізраіль. У 1965 годзе пераехалі ў ЗША. Летам 1986 года выратаваныя братамі Бельскімі яўрэі ў гатэлі Хілтан у Нью-Ёрку арганізавалі банкет. 600 чалавек стоячы віталі 80-гадовага Туўю Бельскага. У снежні 1986 года ён памёр. Пахаваны з ваеннымі ўшанаваннямі на гары Герцля ў Іерусаліме.

## *Народнікі*

Так мы, вяскоўцы, называлі жаўнераў брыгады палкоўніка Гіля-Радзіёнава*. Цікава, што больш такой назвы я не сустрэў ні ў адной крыніцы па гэтаму пытанню, якія мне ўдалося знайсці. Магчыма, назва «народнікі» існавала толькі ў межах маёй вёскі Нябышына. І гэтая назва ўзнікла і прыжылася, таму што радзіёнаўцы прыхільна ставіліся да жыхароў вёскі, абаранялі і ад партызан, і ад паліцаяў, і нават ад немцаў. Як кажуць, былі разам з народам. Аб гэтым я падрабязна ўжо расказаў вышэй у сваіх успамінах.

Пасля выхаду з друку 1-га выдання маіх успамінаў некаторыя чытачы выказалі нязгоду са мной, што я занадта ідэалізую радзіёнаўцаў. Яны сцвярджалі, што брыгада актыўна ўдзельнічала ў карных аперацыях супраць насельніцтва. Але падцверджанняў гэтага я не знайшоў. Гэта пры тым, што партызаны і падпольшчыкі пратакаліравалі ўсе карныя дзеянні акупантаў супраць насельніцтва.

Авось крыніцы, у якіх радзіёнаўцы характарызуюцца станоўча, ёсць. Так, былы сакратар Мінскага падпольнага абкама партыі і камандзір партызанскага злучэння Раман Мачульскі ў сваіх мемуарах напісаў, што ў траўні–чэрвені 1943 года «1-я Руская нацыянальная брыгада» была прыцягнута нямецкім камандаваннем да буйной карнай аперацыі супраць партызан у паўночных раёнах Мінскай вобласці. Партызаны былі акружаны, аднак прарвалі

* Уладзімір Гіль-Радзіёнаў (1906–1944) у 1941 г. быў падпалкоўнік, начальнік штаба 229-й стралковай дывізіі РСЧА. Паранены трапіў у палон. З 1942 да 15.08.1943 узначальваў «дружыну», полк, брыгаду так зв. Рускай нацыянальнай народнай арміі, якую немцы сфарміравалі з ваеннапалонных. 16 жніўня 1943 г. гэтая брыгада перайшла на бок партызан. Праз месяц Гіль-Радзіёнаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і атрымаў чын палкоўніка. У красавіку – траўні 1944 г. немцы ў ходзе аперацыі «Веснавое свята» разбілі брыгаду, Гіль-Радзіёнаў памёр ад ран 14 траўня. – *Рэд.*

акружэнне на ўчастку брыгады Гіль-Радзіёнава. Я мяркую, што ён проста даў магчымасць партызанам выйсці з акружэння. Мачульскі звяртае ўвагу на тое, што як у час блакады, так і пасля яе салдаты і афіцэры брыгады Гіль-Радзіёнава лаяльна ставіліся да мясцовага насельніцтва. Я поўнасцю далучаюся да слоў Р. Мачульскага, як сведка тых падзей. Аб гэтым жа піша і Анатоль Бурдо ў сваёй працы «Лёс камбрыга В. Гіль-Радзіёнава».

## 4. Структуры грамадзянскай адміністрацыі ва ўмовах акупацыі

Пра нямецкую грамадзянскую адміністрацыю на тэрыторыі акупаванай Беларусі ў сваіх разважаннях вышэй я ўжо прыпамінаў. Нейкія паралельныя структуры кіравання з прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва ці з эмігрантаў, якія сталі вяртацца ў Беларусь пасля яе акупацыі, немцы ў першыя месяцы вайны ствараць не спяшаліся. Яны спадзяваліся на паспяховае завяршэнне «бліцкрыгу» і адкладвалі вырашэнне гэтага пытання на канец вайны з СССР. Калі стала зразумела, што «бліцкрыг» не адбыўся, у Беларусі былі створаны розныя структуры, якія займалі нішу паміж нямецкай акупацыйнай адміністрацыяй і мірным насельніцтвам. Гэта такія структуры, як БНС, БСА, СБМ, БЦР ды іншыя. Трэба адзначыць, што ўсіх тых грамадзян, хто супрацоўнічаў з немцамі, з акупацыйнай уладай савецкая прапаганда аб'явіла здраднікамі. На гэтых людзей партызаны і падпольшчыкі распачалі паляванне, забівалі іх без суда і следства. Зараз замест слова «здраднік» часцей ужываецца слова «калабарант», на французскі манер. Звесткі пра дзейнасць вышэйназваных структур да маёй вёскі, вёскі Нябышына, не дайшлі, таму пра іх мы нічога не ведалі. Пра БНС, БСА, СБМ, БЦР я ўпершыню даведаўся напрыканцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя, калі прачытаў кнігу В. Раманоўскага «Саўдзельнікі ў злачынствах», выдавецтва «Беларусь», 1964 год. Змест кнігі ад пачатку да канца пранізаны лютай нянавісцю да ўсіх тых беларусаў, якія нейкім чынам прымусова ці добраахвотна, супрацоўнічалі з акупацыйнай адміністрацыяй, ці проста ўладкаваліся на працу, каб выжыць. «Стаўленнікі акупантаў...», «гітлераўскія найміты...», «нікчэмныя лакеі фашызму...», – так гэтых людзей характарызуе аўтар кнігі, выконваючы заказ савецкай прапаганды.

## *БНС – Беларуская народная самапомач*

Гэта самая першая арганізацыя, якая стала дзейнічаць на тэрыторыі акупаванай Беларусі. Яе дзейнасць пачалася ў кастрычніку 1941 года. Першым яе кіраўніком быў Іван Ермачэнка. В. Раманоўскі ў сваёй кнізе «Саўдзельнікі ў злачынствах» называе Ермачэнку «махровым белагвардзейцам», закаранелым агентам германскага фашызму, заклятым ворагам беларускага народа. Мяне зацікавіла гэтая асоба і я стаў шукаць хоць якія-небудзь звесткі. Я не буду спыняцца на падрабязнасцях біяграфіі Івана Ермачэнкі, а прывяду толькі асноўныя вехі яго жыцця. Нарадзіўся ён 13 траўня 1894 года ў вёсцы Капачэўка Барысаўскага павета Мінскай губерніі, у сялянскай сям'і. Удзельнік Першай сусветнай вайны. У 1914 годзе скончыў школу прапаршчыкаў. У часы грамадзянскай вайны ў Расіі знаходзіўся ў белай арміі, у гушчы падзей – быў ад'ютантам генерала Врангеля. Ратуючыся ад крывавай разні, якую ў Крыму падрыхтавалі бальшавікі і Міхаіл Фрунзэ, Бела Кун і Разалія Зямлячка, Ермачэнка іміграваў у Турцыю. І зрабіў ён гэта своечасова. Разам з Чырвонай Арміяй у Крым прыйшоў «красный террор».

У Турцыі Іван Ермачэнка далучыўся да беларускіх суполак. К гэтаму часу ён ужо насіў пагоны палкоўніка. У 1921 годзе ўрад БНР прызначае яго сваім прадстаўніком у Канстанцінопалі, а потым і генеральным консулам на Балканах. Яго намаганнямі былі заснаваны консульствы БНР у Балгарыі і Югаславіі. У 1922 годзе Ермачэнку прызначаюць на пасаду намесніка міністра замежных спраў БНР, урад якой месціўся ў Коўне. Пасля пераезду ў Прагу Ерамачэнка паступае, а ў 1929 годзе заканчвае медычны факультэт Карлава ўніверсітэту. Тут ён знаходзіць час, каб удзельнічаць у выданні часопісу «Іскры Скарыны» і працуе ў палітычных партыях. У 1938 годзе Іван Ермачэнка арганізуе беларуска-нямецкае супрацоўніцтва. Нічога кепскага ў гэтым я не бачу, з немцамі супрацоўнічаў і савецкі ўрад. Як мы зараз ведаем, СССР і Германія разам развязалі Другую сусветную вайну, як заклятыя хаўруснікі.

Як я вышэй ужо сказаў, у кастрычніку 1941 года Ермачэнка ўзначаліў БНС на тэрыторыі акупаванай Беларусі. Гэта дабрачынная арганізацыя, перад якой была мэта аказваць дапамогу тым беларусам, што пацярпелі ад ваенных дзеянняў і таксама ад панавання савецкага і польскага рэжымаў. Гэтым дзейнасць БНС не абмяжоўвалася. Планавалася дапамога, і яна аказвала-

ся, у адбудове нашай краіны, зруйнаванай чужынцамі, у развіцці і пашырэнні беларускай культуры. Трэба адзначыць, што БНС узнікла не на пустым месцы. На тэрыторыі Германіі знаходзілася 70 тысяч беларусаў. Гэта тыя беларусы, якія служылі ў польскім войску і ў верасні 1939 года папалі ў нямецкі палон. На маю думку, немцы праявілі да іх гуманнасць, што не перадалі іх савецкаму боку пасля падзелу Польшчы. Інакш бы савецкае НКВД у адпаведнасці з пастановай Палітбюро ЦК ВКП(б) ад 5.03.1940 года расстраляла б у Катыні не 21857 чалавек, як сведчаць архівы, а на 70 тысяч больш. Рэжым утрымання палонных беларусаў быў не надта жорсткім, што давала магчымасць наладзіць для іх дапамогу ў пытаннях аб'яднання і ўладкавання на працу. На гэта адгукнуліся эмігранты першай хвалі, якія пражылі ў Германіі ўжо па 15–20 гадоў. Іх намаганнямі ў лістападзе 1939 года ў Берліне было адчынена Беларускае прадстаўніцтва. А ў сярэдзіне 1940 года Мікола Шкялёнак, які па адукацыі быў юрыстам, дамогся дазволу ад Берліна на заснаванне БКС – Беларускага камітэта самапомачы. Першапачаткова планавалася назваць арганізацыю Беларускім нацыянальным камітэтам. Але нямецкія ўлады такую назву забаранілі, таму што гэта магло нашкодзіць савецка-нямецкай дружбе. Суполкі БКС былі створаны як на тэрыторыі Германіі, так і ў акупаваных немцамі краінах.

Ермачэнка быў заснавальнікам і кіраўніком БКС у Празе. Калі немцы акупавалі тэрыторыю Беларусі, ён прыступіў да стварэння такой арганізацыі і тут. Ён быў мэтанакіраваным, палітычна незалежным чалавекам, карыстаўся аўтарытэтам сярод эміграцыі, меў добрыя стасункі з уплывовымі асобамі Берліна. Пасля перамоў рэйхсміністр усходніх акупаваных тэрыторый Розенберг даў згоду на дзейнасць БНС на тэрыторыі Беларусі, а Ермачэнку прызначыў яе кіраўніком. Дарэчы, сам Альфрэд Розенберг нарадзіўся 12 студзеня 1893 года ў горадзе Рэвеле Расійскай імперыі. Зараз гэта горад Талін, Эстонія. Увосень 1910 г. паступіў у Вышэйшую тэхнічную школу горада Рыгі. Але закончыць вучобу не паспеў, у 1915 годзе разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Маскву. Ішла 1-я сусветная вайна і нямецкі фронт наблізіўся да Рыгі. Тут працягнуў вучобу, увосень 1917 года закончыў МВТУ з дыпломам інжынера-архітэктара. Прыхільна ставіўся да бальшавікоў. У лютым 1918 года вярнуўся ў Рэвель, дзе хацеў уступіць у нямецкую армію, але яго не прынялі, як рускага. Розенберг пераехаў у Германію. І вось ён – рэйхсміністр.

Але я адхіліўся ад галоўнай тэмы, прашу прабачэння ў чытачоў. Вернемся ў акупаваную Беларусь. Ермачэнка распачаў актыўную дзейнасць. БНС займалася зборам грашовых і матэрыяльных сродкаў, прадуктаў харчавання, зімовай вопраткі і абутку. Аргіназацыя, акрамя аказання матэрыяльнай дапамогі пацярпелым ад вайны, займалася ўстановамі аховы здароўя. І што вельмі важна, БНС спрыяла і дапамагала выдавецкай справе, дастаўляла і распаўсюджвала друкаваную прадукцыю па ўсёй Беларусі. Гэта былі кнігі, часопісы, газеты на роднай беларускай мове.

Хацелася б больш падрабязна расказаць пра дзейнасць БНС, але я паставіў перад сабой іншую мэту. Я проста імкнуся выказаць свае адносіны, сваё асабістае стаўленне да падзей таго часу і да асоб – удзельнікаў тых падзей.

Ермачэнка на з'яўляўся аднаасобным кіраўніком БНС. Была створана рада, у склад якой уваходзілі такія вядомы асобы, як Ян Станкевіч – намеснік кіраўніка, Вінцэнт Гадлеўскі, Радаслаў Астроўскі, Вацлаў Іваноўскі, Антон Адамовіч, Уладзіслаў Казлоўскі, Надзея Абрамава, Франц Кушаль ды іншыя.

Непасрэднай працай займаліся спецыяльна створаныя аддзелы, якіх было 12. Вось некаторыя з іх: адміністрацыйны, сацыяльнай дапамогі, аховы здароўя, школьніцтва, жыллёвы, жаночы, дзіцячы, культуры, прапаганды, судовы, ваенны... Нават гэты няпоўны пералік аддзелаў паказвае, наколькі разнастайнай была дзейнасць БНС. Для вырашэння важных маштабных пытанняў праводзіліся з'езды. Так, на пачатку 1942 года адбыўся з'езд усіх лекараў Беларусі. На ім была прынята пастанова стварыць лекарскую прафесійную арганізацыю – прафсаюз, адчыніць беларускі медыцынскі ўніверсітэт, арганізаваць матэрыяльную дапамогу мясцовым дактарам.

БНС утрымлівала шмат шпіталяў, займалася рассяленнем людзей, якія не мелі жылля, арганізоўвала прытулкі для дзяцей, якіх вайна пазбавіла бацькоў. Было ўладкавана да 10 тысяч такіх дзяцей.

У ліпені 1942 года адбыўся з'езд БНС. Дэлегаты з'езду дамагаліся ўнясення зменаў у Статут, каб зацвердзіць права БНС на самакіраванне. А ў сакавіку 1943 года на чарговым з'ездзе БНС быў распрацаваны Мемарандум з патрабаваннем поўнай аўтаноміі Беларусі, стварэння беларускага ўрада і войска, выхаду са складу СССР і аб'яўлення яму вайны. Трэба адзначыць, што Гаўляйтар Беларусі Вільгельм Кубэ прыхільна ставіўся да БНС, усяляк

падтрымліваў яе дзейнасць. Але і над Кубэ і над Ермачэнкам сталі згушчацца хмары. Савецкая прапаганда імкнулася павесіць на Гаўляйтэра ўсе злачынствы, якія адбываліся ў Беларусі і да якіх ён не меў дачынення. Наадварот, ён не пагаджаўся з органамі СС і СД у пытанні па знішчэнню яўрэяў, пярэчыў. Тады кіраўніцтва СС і СД увогуле перастала паведамляць нямецкай грамадзянскай адміністрацыі пра плануемыя карныя акцыі. Вільгельм Кубэ настолькі стаў замінаць нямецкім спецслужбам, што з сакавіка 1943 года СС і СД сталі рыхтаваць аперацыю па яго ліквідацыі. Акупацыйная ўлада сваім распараджэннем ад 18.03.1943 года абмежавала дзейнасць БНС, пакінуўшы ёй толькі пытанні аховы здароўя і матэрыяльнай дапамогі. А ў красавіку 1943 года Ермачэнку адхілілі ад усіх пасад і выслалі за межы Беларусі, у Прагу. Пасля забойства Вільгельма Кубэ к яго бліжэйшаму атачэнню, куды ўваходзіў і Ермачэнка, спецслужбы ставіліся з недаверам. Гестапа Ермачэнку арыштавала, але праз нейкі час вызвалілі. У 1945 годзе ён з'ехаў у Нямеччыну. Уваходзіў у склад БЦР. У 1948 годзе з'ехаў у ЗША, пражываў у Флорыдзе, працаваў пекарам. Ён адзін з заснавальнікаў «злучэння беларускай ЗША». Памёр 25 лютага 1970 года.

БНС працягвала працаваць, хоць нямецкія ўлады значна абмежавалі сферу яе дзейнасці. Новым яе кіраўніком з 30 чэрвеня 1943 года быў прызначаны бургамістр Мінска Вацлаў Іваноўскі. Ён, як і яго папярэднік, імкнуўся праяўляць самастойнасць, наколькі гэта было магчыма. На сваіх пасадах ён служыў у першую чаргу насельніцтву, а не акупацыйнай уладзе.

Вацлаў Іваноўскі карыстаўся аўтарытэтам як сярод эміграцыі, так і ў мясцовага насельніцтва. Ён працягваў змаганне за аўтаномію Беларусі. Калі б ён дасягнуў гэтай мэты, то быў бы першай кандыдатурай на пасаду кіраўніка краіны. Яго рашучасць, настойлівасць у вырашэнні беларускага пытання не надта падабалася немцам. Ім не патрэбна самастойная ці аўтаномная Беларусь, як была ім не патрэбна БНР у 1918 годзе.

7 снежня 1943 года на Вацлава Іваноўскага быў здзейснены замах, яго забілі. Партызаны і падпольшчыкі тут жа паспяшылі запісаць тое забойства ў свой актыў. Забіць «здрадніка», «нямецкага прыслужніка» – лічылася гераічным учынкам. За гэта можна было медаль атрымаць і нават ордэн, у залежнасці ад рангу ахвяры. Але на думку некаторых гісторыкаў, у гэтай справе назіраецца нямецкі след.

Пасля таго як газета «Народная Воля» надрукавала мае ўспаміны, мне патэлефанаваў адзін рэжысёр з кінастудыі «Беларусьфільм», прозвішча называць не буду, і папрасіў сустрэцца. Сустрэліся. Ён звярнуўся да мяне з прапановай даць згоду на стварэнне фільма па матэрыялах маёй кнігі з маім удзелам для тэлеканала «Белсат». Каб падмацаваць мой давер да яго і яго прафесійнасці, рэжысёр перадаў мне дыскі з ужо зробленымі тэлефільмамі. Адзін з фільмаў быў пра Вацлава Іваноўскага. Я пераглядзеў яго некалькі разоў. Асабліва ўразілі мяне сцэны пахавання. Каб правесці свайго бургамістра ў апошні шлях, сабралося ўсё насельніцтва Мінска. Немцы не перашкаджалі. На маю думку, калі б Вацлаў Іваноўскі быў «здраднікам» і «нямецкім прыслужнікам», як сцвярджала савецкая прапаганда, людзі на яго пахаванне не прыйшлі б.

А ўдзельнічаць у тэлездымках я адмовіўся.

29 кастрычніка 2010 года, у Дзень памяці ахвяр палітычных рэпрэсій, у складзе групы я наведаў месцы пахаванняў тых ахвяр. Я ўпершыню пабачыў магілу Вацлава Іваноўскага. Для мяне было вялікай нечаканасцю, што яго магіла ўцалела за савецкім часам, калі ўсё знішчалася, знішчалася людская памяць. Тут, у магілы адбыўся невялікі мітынг. Выступоўцы, а гэта былі вядомыя гісторыкі, пісьменнікі, мастакі і проста неабыякавыя людзі расказалі пра яго жыццёвы шлях. У яго адрас прагучалі добрыя і цёплыя словы. Вацлаў Іваноўскі – вядомы палітычны і грамадскі дзеяч Беларусі.

Ён нарадзіўся 7 чэрвеня 1880 года ў Гродзенскай вобласці. У 1899 годзе паступіў у Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Пасля заканчэння вучобы застаўся ў ім працаваць, стаў таленавітым вучоным. К 1913 году ён ужо доктар тэхнічных навук, дацэнт. Акрамя навуковай працы ён займаўся і палітычнай дзейнасцю. Выступоўцы на гэтым мітынгу паведалі, што Вацлаў Іваноўскі быў энергічным арганізатарам. Ён з'явіўся адным з заснавальнікаў і кіраўнікоў партый Беларуская рэвалюцыйная грамада, а потым Беларуская сацыялістычная грамада. Калі імператар Расіі Мікалай Другі выдаў Указ ад 12 снежня 1904 года, якім скасаваў ранейшыя абмежаванні ў карыстанні мясцовай мовай на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю, Вацлаў Іваноўскі скарыстаў гэты момант. Ён заснаваў у Пецярбургу першае легальнае беларускае выдавецтва, якое назваў «Загляне сонца і ў наша аконца». Яно праіснавала з 1906 па 1916 гады. Выдавецтва выдавала газеты,

часопісы, кнігі, падручнікі на беларускай мове. Вацлаў Іваноўскі лічыў, што пашырэнне беларускай адукацыі, фарміраванне нацыянальнай свядомасці – гэта будзе моцным падмуркам будучай дзяржаўнай незалежнасці. З 1918 года Вацлаў Іваноўскі становіцца міністрам адукацыі ва ўрадзе БНР.

Пасля заключэння так званай Рыжскай мірнай дамовы 1921 года, у выніку якой Беларусь была падзелена паміж РСФСР і Польшчай, Вацлаў Іваноўскі пераехаў у Варшаву. З 1922 па 1939 год ён на пасадзе прафесара Варшаўскага палітінстытута. У 1939 годзе, калі Польшча была акупавана Германіяй і Савецкім Саюзам, Вацлаў Іваноўскі пераехаў у Вільню, дзе працаваў выкладчыкам Вільнюскага ўніверсітэта. Пасля акупацыі немцамі тэрыторыі Беларусі, Вацлаў Іваноўскі ў лістападзе 1941 года прызначаны бургамістрам горада Мінска. У выступах тут над магілай была дана ацэнка яго дзейнасці, што гэта быў лепшы граданачальнік Мінска. Мяне ўразіла тое, што Вацлаў Іваноўскі быў адным з лідараў падпольнай Партыі беларускіх нацыяналістаў, падтрымліваў тайныя сувязі з Арміяй Краёвай. Гэта было небяспечна. Немцы маглі здагадвацца пра яго падпольную дзейнасць. Магчыма, гэта было адной з прычын, што яго забілі.

На магіле Вацлава Іваноўскага звычайны помнік, якіх шмат можна ўбачыць на любых могілках. Гэта вертыкальная бетонная пліта, на якой замацавана шыльда з тэкстам... На маю думку, такая асоба, як Вацлаў Іваноўскі, кіраўнік горада Мінска ў вельмі складаны час нашай гісторыі, які зрабіў значны ўнёсак у справу беларускага нацыянальнага адраджэння, варты ўсталявання на галоўнай плошчы сталіцы Беларусі манументальнага помніка.

З той паездкі па месцах пахаванняў ахвяр савецкага і фашысцкага рэжымаў запомніўся яшчэ адзін момант. Гэта наш прыпынак у Крыжа, які ўсталяваны на мяркуемым месцы расстрэла ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага. Калі мы прыехалі сюды, нас ужо чакалі прадстаўнікі нейкіх спецслужб. Але мітынг у Крыжа адбыўся, было шмат выступоўцаў. Усё здымалася і запісвалася на тэлекамеру спецслужбы.

Вінцэнт Гадлеўскі – каталіцкі святар, кіраўнік нацыяналістычнага беларускага падполля ў часы нямецкай акупацыі, ідэолаг беларускай нацыянальнай ідэі. Ён быў адным з самых аўтарытэтных, самых буйнейшых дзеячаў Заходняй Беларусі ў 1930-х гадах пад польскай акупацыяй.

Вінцэнт Гадлеўскі нарадзіўся 16 лістапада 1888 года ў вёсцы Шурычы Ваўкавыскага павета. У 1912 годзе закончыў Віленскую духоўную семінарыю. Пасля гэтага паступіў у Пецярбургскую каталіцкую духоўную акадэмію, якую закончыў у 1916 годзе. Накіраваны на службу ў кафедральны касцёл горада Мінска. Ён быў удзельнікам Усебеларускага з'езду 1917 года, уваходзіў у склад рады БНР. Пасля Рыжскай дамовы пераехаў на Віленшчыну. За нацыянальную дзейнасць у 1925 і 1927 гадах арыштоўваўся польскімі ўладамі. Пасля агрэсіі супраць Польшчы і яе раздзелу паміж Германіяй і СССР Вінцэнт Гадлеўскі застаўся пражываць у Вільні. Ён быў ініцыятарам стварэння Беларускага нацыянальнага фронту, выдаваў газету «Беларускі фронт».

Калі двое хаўруснікаў, двое драпежнікаў шчапіліся паміж сабой – Германія не стала чакаць, калі СССР нападзе на яе, напала на яго першай, Вінцэнт Гадлеўскі прыбыў у акупаваную немцамі Беларусь. Ён стаў займацца справамі адукацыі, таму яго прызначылі на пасаду галоўнага інспектара беларускіх школ. Гэта давала яму магчымасць свабодна наведваць любыя раёны акупаванай Беларусі. Але яго цікавіў не толькі вучэбны працэс, хоць гэта было важнай сферай яго дзейнасці. Галоўным было тое, што ён ствараў нацыянальны супраціў як нямецкаму, так і савецкаму акупацыйным рэжымам. Вінцэнт Гадлеўскі быў кіраўніком БНП – Беларускай незалежнай партыі. Партыя хутчэй за ўсё магла складацца з тых грамадзян Беларусі, якія так ці інакш працаўладкаваліся ў немцаў. Вінцэнт Гадлеўскі актыўна выступаў супраць угону насельніцтва на працу ў Германію. Нямецкая адміністрацыя спачатку папярэдзіла яго і прапанавала пакінуць Беларусь і з'ехаць у Рыгу. Але ён адмовіўся. У канцы 1942 года ён быў арыштаваны і загінуў у засценках гестапа.

Новым кіраўніком БНС пасля смерці Вацлава Іваноўскага быў прызначаны Юры Сабалеўскі. Але арганізацыя к гэтаму часу была вельмі аслаблена, яе дзейнасць была абмежавана, а з 1 сакавіка 1944 года яна згубіла сваю самастойнасць, пераведзена ў падпарадкаванне БЦР.

У падсумаванне вышэй сказанага хачу яшчэ раз падкрэсліць, што БНС згуляла значную ролю ў жыцці мірнага насельніцтва ва ўмовах акупацыі, памагла выжыць, ацалець, асабліва ў гарадах і буйных мястэчках. Падмацую гэтыя свае высновы ссылкай на матэрыялы гісторыка – даследчыка часоў акупацыі. У «Народнай газеце» за 1.07.1993 года было надрукавана вельмі грунтоўнае

даследаванне кандыдата гістарычных навук на той час Галіны Кнацько «Мінск у гады акупацыі». У гэтым даследаванні няма эмоцый, а ёсць спасылкі на архіўныя дакументы, ёсць табліцы, канкрэтныя лічбы. З гэтага матэрыялу бачна, якую велізарную працу выконвала БНС: бытавыя ўмовы жыцця мінчукоў, выплаты пенсій, арганізацыя харчавання, медыцынскае абслугоўванне, дзіцячыя ўстановы, арганізацыя прытулкаў і бясплатных абедаў для бяздомных і шмат што іншае.

Трэба адзначыць, што нямецкая акупацыйная ўлада пакінула ў Мінску савецкія парадкі. Дзве палітычныя сістэмы – савецкая і нацысцкая былі настолькі падобны адна на адну, што нават можна было нічога не мяняць. Каб не ваенныя дзеянні, не разбурэнні, насельніцтва нічога не заўважыла б. Дзейнічалі савецкія пашпарты, прапіска, аплата камунальных паслуг, аплата лістоў непрацаздольнасці, тыя ж самыя памеры заробкаў і пенсій, тыя ж кошты на тавары першай неабходнасці. Савецкія грошы хадзілі нароўні з акупацыйнымі дойч-маркамі. Працавалі прадпрыемствы і ўстановы, людзі як і раней хадзілі на працу. Мая стрыечная сястра Копыл Ніна, дачка дзядзькі Банэдыка, перад вайной працавала ў 5-м паштовым аддзяленні горада Мінска, на тым жа месцы працавала і ў гады акупацыі, а потым і пасля вайны да выхада на пенсію.

Праўда, у маёй вёсцы Нябышына змены адбыліся: падзялілі калгас на дробныя гаспадаркі. Але шмат якія крыніцы сведчаць, што немцы ў некаторых мясцовасцях калгасы зберaглі.

## *БСА – Беларуская самаахова*

Ідэя стварэння БСА належала кіраўніку БНС Івану Ермачэнку. Ён уваходзіў у бліжэйшае атачэнне Гаўляйтэра Беларусі, таму і Вільгельм Кубэ захапіўся гэтай ідэяй. Не пярэчыў гэтаму і Карл Цэнер – кіраўнік СС і паліцыі ў Беларусі. 29 чэрвеня 1942 года на паседжанні рады БНС Вільгельм Кубэ абвясціў аб стварэнні Беларускага корпуса самаахoвы. Ён падкрэсліў, што задача БСА – барацьба з партызанамі. З гэтай нагоды быў падрыхтаваны Зварот да беларускага народа, пад якім паставілі свае подпісы Іван Ермачэнка, Вінцэнт Гадлеўскі, Вацлаў Іваноўскі ды іншыя. Кіраўніком БСА быў прызначаны Ермачэнка, які меў ваенную падрыхтоўку, удзельнік Першай сусветнай і Грамадзянскай войн, а начальнікам штаба – падпалкоўнік Я. Гуцько. Для непас-

рэднай арганізацыі БСА была створана спецыяльная камісія. У яе склад увайшлі Іван Ермачэнка, Юліян Саковіч, Іван Касяк, Франц Кушаль ды іншыя. Праект арганізацыі БСА распрацаваў дэталёва і прафесійна беларускі ваенны дзеяч Франц Кушаль. Па яго плану першапачаткова самаахова павінна была складацца з 3 дывізій з іх дыслакацыяй у Мінску, Баранавічах і Вілейцы. Фактычна Іван Ермачэнка, кіраўніцтва БНС пры падтрымцы Вільгельма Кубэ падрыхтавалі ўмовы для стварэння Беларускай арміі. Але нямецкія спецслужбы напалохаліся канцэнтрацыі беларускіх узброеных фарміраванняў у адным месцы і кардынальна змянілі праект Франц Кушаля. Было дазволена трымаць у кожным павеце ўзброеныя падраздзяленні БСА ад роты да батальёна. Пачаўся набор добраахвотнікаў. За кароткі тэрмін было сфарміравана 20 батальёнаў, у якіх налічвалася ад 15 тысяч да 20 тысяч чалавек. У Мінску былі адчынены афіцэрскія курсы, у якіх прайшлі навучанне 270 афіцэраў. Усе яны – беларсы. Таксама было падрыхтавана некалькі тысяч унтэр-афіцэраў з беларусаў.

Кіраўнікі БНС, БСА Іван Ермачэнка, Вацлаў Іваноўскі, Франц Кушаль, Барыс Рагуля і іншыя імкнуліся стварыць сапраўдную, моцную, нацыянальную армію, якая была б патрэбна для будучай незалежнай Беларусі. Асабіста ў мяне не павернецца язык, каб называць гэтых людзей здраднікамі, нямецкімі прыслужнікамі, калабарантамі. На маю думку, гэта патрыёты. Яны як маглі ў тых складаных умовах змагаліся за Беларусь, за беларускае насельніцтва. І калі ў сакавіку 1943 года на з'ездзе БНС было прынята патрабаванне аб самастойнасці Беларусі, немцы ўбачылі ў гэтым пагрозу сваім інтарэсам. А праз месяц ад нямецкіх улад паступіў загад аб расфарміраванні БСА. Усе падраздзяленні Беларускай самааховы былі перападпарадкаваны іншым ведамствам.

## *СБМ – Саюз беларускай моладзі*

У маёй вёсцы Нябышына такой арганізацыі не існавала, хоць моладзі было шмат. Кожная сям'я, за выключэннем нямногіх, мела па трое-чацвёра дзяцей. Да нас нават не дайшлі чуткі пра СБМ. Таму ўласнага досведу пра гэты Саюз не маю, прыйшлося шукаць звесткі ў даступных крыніцах. Чытаць савецкія прапагандысцкія дакументы бессэнсоўна, там мала праўды, там больш злосці і абразы. Вось цытата з кнігі «Саўдзельнікі ў злачын-

ствах», аўтар В. Раманоўскі, выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1964 год:

> «Акупанты і іх памагатыя спрабавалі стварыць антысавецкую нацыяналістычную маладзёжную арганізацыю, так званы «Саюз беларускай моладзі» («СБМ»). Гэты «саюз», па задуме гітлераўцаў, павенін быў аб'яднаць маладых людзей з тым, каб выхаваць іх у фашысцкім духу, а пасля прыцягнуць да ўзброенай барацьбы супраць Савецкай краіны. Захопнікі пры дапамозе гэтай арганізацыі спадзяваліся папоўніць свае воінскія і ахоўныя фармірванні...»

СБМ заснавана ў чэрвеі 1943 года. Дзейнічала арганізацыя легальна з дазволу і пры падтрымцы акупацыйных улад. Сябрамі СБМ была моладзь ва ўзросце ад 10 да 20 гадоў. Савецкая прапаганда залічыла ўсіх сяброў СБМ у здраднікі. Мне здаецца, што і зараз нічога не змянілася. Вельмі дзіўна, як гэта можна 10-гадовага падлетка і тым больш дзяўчынку лічыць здраднікам? Я перагартаў шмат крыніц пра гэту арганізацыю, але не знайшоў пацвярджэння, што моладзь выхоўвалася ў фашысцкім духу. Такая мэта перад СБМ не стаяла. Выхаванне ў антыбальшавіцкім духу – тут можна было б пагадзіцца. Але ж і гэта не насаджалася. Магчыма, немцы глядзелі на моладзь СБМ, як на будучых сваіх прыхільнікаў і памочнікаў. Аднак трэба ўлічваць тое, што СБМ стваралі не немцы, а беларускія дзеячы, якія знаходзіліся як у Нямеччыне, так і ў Беларусі. Яны ставілі мэту, каб праца СБМ была накіравана на абуджэнне нацыянальнай свядомасці ў моладзі і патрыятычнага пачуцця адказнасці за сваю Айчыну. Моладзь СБМ вучылі любіць Беларусь, яе мову, культуру. Вось знайшоў у інтэрнэце дакумент СБМ, які называецца: «Дзесяць запаветаў юнака і юначкі». Прывяду некалькі вытрымак з гэтага дакумента:

Любі свой народ і родны край...

Вывучай слаўную мінуўшчыну свайго народа...

Шануй сваю родную мову, родныя песні і казкі і дбай аб развіцці і пашырэнні беларускай культуры.

Дбай аб здароўі і чысціні свайго цела і сцеражыся п'янства, курэння і разбэшчанасці...

Шануй і любі працу...

Будзь мужным і гордым змагаром за свае ідэалы...

Трымай высока свой гонар...

Шануй старэйшых...

...Памятай, што ты будучы грамадзянін, вучыся сумленна жыць, шчыра працаваць і мужна змагацца...

Памятай, што шчасце, гонар і слава Бацькаўчыны вышэй і даражэй за дабрабыт і жыццё адзінкі і хто памірае за Бацькаўшчыну, той вечна жыве ў яе народзе!

*(Часопіс «Жыве Беларусь!», № 1 1943 г.)*

У гэтых Запаветах я не ўбачыў ні здрады, ні фашызму. Я упэўнены, што стваральнікі «маральнага кодэксу будаўніка камунізму» трымалі ў сябе на стале «Дзесяць запаветаў юнака і юначкі».

Колькі ўсяго было сяброў СБМ, дакладнай лічбы я не знайшоў. Розныя крыніцы называюць іх колькасць ад некалькіх дзесяткаў тысяч да 100 тысяч. У мяне больш даверу да лічбы, якую назвала Вераніка Катковіч, адна з кіраўніц юначак СБМ – гэта 45 тысяч чалавек.

Сябры СБМ падзяліліся на тры групы па ўзросту:

– ад 10 да 14 год – малодшыя юнакі і юначкі;
– ад 15 да 18 год – юнакі і юначкі;
– ад 19 да 20 год – старэйшыя юнакі і юначкі.

Штосьці нагадала мне, што падобны падзел існаваў пры савецкім ладзе. Толькі ў СССР муштраваць дзяцей пачыналі з дзіцячага садка. Потым акцябраты, піянеры, камсамольцы. У адрозненне ад СБМ, у камсамоле ўзрост знаходжання ад 14 да 28 год.

Даводзілася чуць і чытаць, быццам СБМ быў вярбоўшчыкам моладзі на працу ў Нямеччыну. Так, такая праблема існавала. Але калі з Берліна паступіла прапанова пераўтварыць СБМ у такога вярбоўшчыка, Кубэ не пагадзіўся з гэтым. Ён быў перакананы, што беларускую моладзь чакаюць больш важныя справы на Бацькаўшчыне. У гэтых юнакоў і дзяўчат былі самыя светлыя памкненні, патрыятычныя. Яны дбалі пра незалежнасць Беларусі і шчыра верылі, што такое магчыма ва ўмовах нямецкай акупацыі. А як жа не верыць, калі гэтаму спрыяў сам Вільгельм Кубэ, генеральны камісар акругі «Беларусь». Гэтым самым былі выратаваны дзесяткі тысяч маладых беларусаў ад адпраўкі на працу ў Нямеччыну. Праўда, частка моладзі СБМ ад'ехала туды па вярбоўцы – гэта, па розных крыніцах, ад адной да 5 тысяч чалавек. Для іх былі арганізаваны курсы па авалоданню новай, а можа

і першай у жыцці, прафесіяй. Пасля курсаў усіх размеркавалі на працу – юнакоў у канцэрн «Юнкерс», а дзяўчат у войскі супрацьпаветранай абароны. Юнакі замянілі на заводах немцаў, якіх мабілізавалі на фронт. Трэба адзначыць, што над гэтымі нашымі суайчыннікамі не стаялі наглядчыкі з палкамі і пражывалі яны не ў бараках за калючым дротам. Пасля працоўнага дня ў іх быў вольны час, яны маглі збірацца разам. Тут таксама дзейнічалі структурныя СБМ, нават выпускаўся часопіс «Малады змагар».

Дарэчы, я яшчэ нічога не сказаў пра кіраўніцтва СБМ. Кіраўнікоў не проста прызначалі, а спачатку іх рыхтавалі ў вучэбных цэнтрах. Вышэйшае кіраўніцтва і кіраўнікі СБМ акруг праходзілі падрыхтоўку ў Берліне. На кіруючыя пасады маглі прызначацца асобы, старэйшыя за 20 гадоў.

Такім быў Міхась Ганько. Ён нарадзіўся 28 лютага 1918 года ў Маладзечанскім павеце. Скончыў Маладзечанскую гімназію. У 1938 годзе паступіў у Віленскі ўніверсітэт на медыцынскі факультэт. Вучобу хутчэй за ўсё ён не закочыў, магчыма, перашкодзіла вайна. У 1939–1941 гадах працуе настаўнікам у Маладзечанскім раёне. У траўні 1941 года яго прызвалі ў Чырвоную Армію. Калі пачалася вайна, ён з першых дзён на фронце. У ліпені 1941 года пад Псковам трапіў у нямецкі палон. Беларускія дзеячы, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі, у Нямеччыне і ў іншых акупаваных краінах Еўропы, наведвалі лагеры ваеннапалонных і, дзякуючы свайму аўтарытэту і сувязям, вызвалялі беларусаў з палону. Быў вызвалены з палону і Міхась Ганько, пастараўся ў гэтым актыўны дзеяч беларускай эміграцыі журналіст Акінчыц. Міхася Ганько накіравалі на вучобу ў школу прапагандыстаў. Пасля вучобы на пачатку 1942 года яго накіравалі ў Мінск на пасаду супрацоўніка аддзела прапаганды Генеральнага камісарыята. 22 чэрвеня 1943 года Міхась Ганько быў прызначаны кіраўніком СБМ. Ён быў вопытным прапагандыстам, умелым кіраўніком. У кароткі тэрмін ён арганізаваў кіруючы штаб СБМ і стварыў адпаведныя структуры ў акругах. Ім былі арганізаваны курсы падрыхтоўкі кадраў СБМ, ён сам кантраляваў вучэбны працэс, выступаў з лекцыямі. Міхась Ганько быў выдаўцом і рэдактарам часопіса «Жыве Беларусь!». У верасні 1944 года быў уключаны ў склад Беларускай Цэнтральнай Рады. Міхась Ганько загінуў у маі 1945 года ў Празе, пры якіх абставінах ён загінуў, звестак знайсці не ўдалося.

Другі кіраўнік СБМ Надзея Абрамава, яна займалася жаночай часткай арганізацыі. Нарадзілася ў 1907 годзе на Міншчыне. Закончыла Мінскі медыцынскі інстытут, навучалася на педагагічных курсах.

У часы нямецкай акупацыі працягвала працаваць лекарам. З сярэдзіны 1942 года працавала ў Беларускай народнай самадапамозе, узначальвала сектар дапамогі дзецям. 22 чэрвеня 1942 года прызначана галоўным кіраўніком жаночай часткі СБМ. Арганізавала курсы для кандыдатак на кіруючыя пасады, чытала лекцыі на тэмы маралі, здароўя, сям'і. Надзея Абрамава была супрацоўнікам часопіса «Жыве Беларусь!». З сярэдзіны 1943 года ўведзена ў склад Рады даверу. Удзельнічала ў працы Другога Усебеларускага кангрэсу, які адбыўся 27 чэрвеня 1944 года. Дарэчы, Міхась Ганько выступаў з прамовай на гэтым кангрэсе.

Летам 1944 года Надзея Абрамава эвакуіравалася ў Нямеччыну. Працягвала займацца грамадскай працай, аднавіла кіруючы штаб СБМ. Выпускала часопіс «Вучэбны лісток». У верасні 1944 года ўвайшла ў склад БЦР.

Памерла 18 лютага 1979 года ў горадзе Мюнхене, Нямеччына.

Пасля вызвалення Беларусі Чырвонай Арміяй ад нямецкіх захопнікаў лёс сябраў СБМ склаўся па-рознаму. Шмат хто з іх пакінуў Беларусь разам з немцамі, а потым эміграваў у ЗША, Канаду, Аўстралію ды іншыя краіны і сталі там вартымі грамадзянамі тых краін. Многія засталіся ў Беларусі, змагаліся ў шэрагах Чырвонай Арміі. Але гэта іх не выратавала. Па іх следзе ішоў СМЕРШ, іх сустракаў ГУЛАГ. Частка СБМаўцаў пайшла ў лес, у падполле, працягвала змагацца з бальшавікамі за незалежнасць Беларусі.

СБМ, які на тэрыторыі Беларусі праіснаваў крыху больш года зрабіў вялікі ўплыў на беларускую моладзь. Моладзь зразумела што ў беларусаў была свая краіна, свая дзяржава, каб яе аднавіць, к гэтаму трэба рыхтавацца. Зноў прыпомнілася мая стрыечная сястра Ніна Саракалетава. Яна ўвесь час акупацыі жыла і працавала ў Мінску. Яна мне паведала, што да вайны ў Мінску немагчыма было пачуць беларускую мову. А калі хто і размаўляў, то ад такіх людзі кідаліся ўбок. А за часы акупацыі амаль усе загаварылі па-беларуску. Гэта заслуга СБМ і тых беларускіх дзеячаў, якія вярнуліся на Радзіму з прыходам акупацыі.

Калі 3 ліпеня 1944 года ў Мінску была адноўлена савецкая ўлада, то кіраўнікоў рэспублікі, партыйных функцыянераў, магчыма, ахапіў жах – 25-гадовая праца ВКП(б)–НКВД была да-

рэмнай. Усяго за тры гады акупацыі Беларусь зноў стала беларускай. Трэба было штосьці рабіць. Але савецкая ўлада здольная толькі на правядзенне рэпрэсій. І рэпрэсіі ўзмацніліся. На сайце Радыё Свабода 31.07.2013 г. быў змешчаны матэрыял: «У 1944 годзе ў Беларусі пачалася маштабная аперацыя НКВД з мэтай ліквідацыі ў заходніх раёнах узброенага падполля. Усяго за год было арыштавана амаль 100 тысяч чалавек. Забіта пры супраціве 3200 змагароў з савецкай уладай». Тут жа змешчаны дакументальны фільм «Беларускі рэзыстанс». Я паглядзеў гэты фільм пра мужных людзей, сапраўдных патрыётаў Беларусі і быў вельмі ўзрушаны. І вайсковыя аперацыі супраць змагароў і змаганне супраць бальшавіцкай улады ў Беларусі працягваліся да пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Колькі ўсяго рэпрасавана пасля вайны «нямецкіх прыслужнікаў», колькі людзей забіта – такой лічбы знайсці не ўдалося.

У інтэрнэце знайшоў звесткі, што наклад кнігі Юрыя Туронка «Людзі СБМ» быў канфіскаваны ў офісе адной грамадскай арганізацыі. Прайшло 68 год, як закончылася вайна, а ўлада да гэтага часу працягвае змагацца з 10–20-гадовымі дзяўчынкамі і юнакамі, палохаецца нават упамінання пра іх. Улада незалежнай Беларусі змагаецца з южнымі патрыётамі, якія ў гады акупацыі змагаліся за незалежнасць сваёй Бацькаўшчыны.

Асабіста я нават думкі не дапускаю, каб сяброў СБМ залічыць у здраднікі. Яны былі адданымі патрыётамі сваёй краіны – Беларусі. Мы імі павінны ганарыцца. Наша сённяшняя свядомая моладзь працягвае іх справу.

## *Беларуская цэнтральная Рада – БЦР*

Спачатку была створана Беларуская рада даверу. Гэта адбылося 27 чэрвеня 1943 года. Старшынёй Рады быў прызначаны бургамістр Мінска Вацлаў Іваноўскі. У яе склад уваходзілі прадстаўнікі БНС А. Калубовіч і Ю. Сабалеўскі, прафсаюзны дзеяч К. Рабушка, ад СБМ М. Ганько і Н. Абрамава, а таксама па аднаму прадстаўніку ад кожнай акругі.

Дзейнасць Рады даверу заключалася ў актыўным удзеле яе членаў у нарадах і паседжаннях кіраўніцтва Генеральнага камісарыята Беларусі. Галоўнай мэтай Рады даверу было стварэнне больш-менш бяспечных умоў існавання насельніцтва ў часы акупацыі. Часам яны ўдзельнічалі ў распрацоўцы планаў

і метадаў правядзення аперацый супраць прамаскоўскіх партызан і падпольшчыкаў, якія значна ўскладнялі жыццё людзей ва ўмовах акупацыі. Не выключаецца, што Рада даверу вяла антыбальшавіцкую прапаганду. Быў створаны шэраг газет і часопісаў як «Менская газета», «Беларуская газета», «Жыве Беларусь!» ды іншыя. Галоўнай мэтай Рады даверу было ўтварэнне беларускай дзяржавы, няхай гэта пакуль што пад пратэктаратам Германіі. Гэта быў бы значны падмурак на будучыню. Пры Радзе даверу было створана Навуковае таварыства на чале з Вацлавам Іваноўскім, мэтай якога было згуртаванне навукоўцаў дзеля адбудовы Бацькаўшчыны.

БЦР – Беларуская цэнтральная рада створана на базе Рады даверу ў снежні 1943 года. Прэзідэнтам БЦР быў Радаслаў Астроўскі. 1-м віцэ-прэзідэнтам быў Мікалай Шкялёнак, 2-м віцэ-прэзідэнтам – Юры Сабалеўскі. У падпарадкаванне БЦР былі перададзены: школьныя справы, Беларускае навуковае таварыства, культура, сацыяльная апека, моладзевыя справы, ваенныя справы. Кіраўнікамі былі прызначаны: Францішак Кушаль – ваенныя справы, С. Кандыбовіч – фінансы, Аўген Калубовіч – культура, А. Сакрат – школа, Міхась Ганько і Надзея Абрамава – моладзевыя справы, Павел Свірыд – юрыдычныя і рэлігійныя справы.

Беларускія дзеячы і Рады даверу і БЦР у часы акупацыі адыгралі станоўчую роль. Яны спадзяваліся, што БЦР стане паўнавартасным урадам незалежнай Беларусі.

## *БКА – Беларуская краёвая абарона*

Была створана ў лютым–сакавіку 1944 года па загаду прэзідэнта БЦР Радаслава Астроўскага і выконваючага абавязкі генеральнага камісара Беларусі фон Готберга. Узначальвала БКА Галоўнае камандаванне. Камандзірам прызначаны Францішак Кушаль. Фарміраванне ішло за кошт добраахвотнікаў і мабілізацыі. Колькасць жаўнераў дасягнула 25 тысяч чалавек. Было сфарміравана 45 батальёнаў па 450–500 чалавек у кожным. Афіцэры рыхтаваліся на курсах у Мінску, жаўнеры – па месцы службы. Службовай мовай была беларуская. Астроўскі і Кушаль выставілі немцам умову, што батальёны БКА будуць змагацца толькі на тэрыторыі Беларусі і толькі з ворагамі беларускага народа. Таму галоўнай мэтай БКА было змаганне супраць прамаскоўскіх партызан. Пад уплывам наступлення Чырвонай

Арміі частка жаўнераў БКА перайшла на бок партызан. Але на іх месца прыбывалі добраахвотнікі з так званых партызанскіх зон, папаўнялі шэрагі БКА. Яны адчулі на сабе, што такое савецкія партызаны, што часам яны горш за немцаў. Пасля 27 чэрвеня 1944 года немцы сталі пакідаць Мінск. Перад камандзірамі батальёнаў БКА стаяў выбар, ці адступаць разам з немцамі ці заставацца на радзіме. Кожны жаўнер прымаў рашэнне сам за сябе. Такі падзел адбыўся. Частка людзей засталася дома. Разам з немцамі на захад пайшло каля 10 тысяч жаўнераў. На пачатку 1945 года з застаўшыхся батальёнаў БКА была створана 1-я Беларуская грэнадзёрская брыгада «Беларусь». Пазней брыгада была перафарміравана ў 30-ю грэнадзёрскую дывізію СС «Беларусь». Яе камандзірам па-ранейшаму заставаўся Францішак Кушаль. У красавіку 1945 года камандаванне дывізіі прыняла рашэнне перайсці на бок амерыканцаў. Былі праведзены перамовы, вызначана месца пераходу. Для гэтага трэба было захапіць мост праз раку і прарваць нямецкую абарону. Дывізія задачу паспяхова выканала і строем пад бела-чырвона-белым сцягам прыбыла к амерыканцам. Гэта адбылося 30 красавіка 1945 года.

## 5. Страты Беларусі ў Другой сусветнай вайне

Пытанне даволі складанае, недаследаванае, таму што праўда хаваецца наўмысна, камусьці гэта выгадна. Доўгі час гаварылася, што ў Беларусі загінуў кожны чацвёрты чалавек. Гэта лічба ўспрымалася на веру. Як яна атрымалася, ніякіх тлумачэнняў ніхто не даваў.

У мяне з’явілася жаданне даведацца, у выніку якіх абставін загінула столькі людзей – на фронце, ва ўмовах акупацыі ці неяк інакш. З маёй сям’і вайна забрала 4 чалавек з 7, і ўсе яны загінулі пры розных абставінах. Бабулю Насту забілі паліцаі ў траўні 1943 года, бацька загадкава загінуў у вайне з Японіяй 19 жніўня 1945 года, старэйшы брат Мікалай загінуў у партызанах выпадкова па неасцярожнасці, сярэдні брат Сяргей памёр з голаду ў блакадным Ленінградзе. Маё жаданне даведацца больш дакладна, больш падрабязна пра агульныя ахвяры вайны было марным, бо мае магчымасці абмежаваныя.

У апошні час на самым высокім узроўні была агучана ўжо іншая лічба ахвяр, што за гады вайны загінуў кожны трэці беларус. А колькі загінула ўсяго? Зноў ніякага тлумачэння. Можа, да 70-годдзя Перамогі больш дакладна пералічаць ваенныя ахвяры?

Я пачаў шукаць крыніцы, каб атрымаць хоць нейкія звесткі па гэтым пытанні. Я наведваўся ў бібліятэкі, гартаў старыя падшыўкі газет і часопісаў. Нарэшце ў згаданай кнізе «Саўдзельнікі ў злачынствах» удалося штосьці знайсці. Аўтар запэўнівае, што ў сваёй працы ён карыстаўся архіўнымі дакументамі і матэрыяламі. З кнігі я даведаўся (старонкі 180–181), што гітлераўцы за тры гады акупацыі Беларусі знішчылі 2 219 316 чалавек, што падцвярджаецца табліцай:

| **Вобласці** | **Знішчана мірнага насельніцтва** | **Забіта, закатавана ваеннапалонных** | **Вывезена ў нямецкае рабства** |
|---|---|---|---|
| Мінская | 317515 | 101590 | 20815 |
| Магілёўская | 71502 | 59134 | 21436 |
| Віцебская | 151421 | 92891 | 68434 |
| Гомельская | 53630 | 114476 | 18745 |
| Бабруйская | 82194 | 54013 | 15275 |
| Полацкая | 105211 | 157007 | 52599 |
| Палеская | 37981 | 3120 | 23047 |
| Гродзенская | 111208 | 41330 | 53955 |
| Брэсцкая | 159526 | 38858 | 30008 |
| Баранавіцкая | 181179 | 88407 | 33773 |
| Пінская | 95385 | 24613 | 30861 |
| Маладзечанская | 42373 | 34652 | 8828 |
| Усяго | 1409225 | 810091 | 377776 |

Табліца ўражвае сваёй «дакладнасцю»: падлік зроблены да адзінага чалавека. Давайце больш уважліва зірнём на гэтыя лічбы. Мы заўважым, што на тэрыторыі Беларусі забіта, закатавана 810.091 ваеннапалонных. Хто яны, гэтыя ваеннапалонныя? Відавочна, што гэта былі чырвонаармейцы вайсковых часцей Заходняй асобай ваеннай акругі, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі. Яны трапілі ў палон на пачатку вайны.

Савецкая сістэма воінскай службы была пастаўлена такім чынам, што прызыўнікі ніколі не служылі на сваёй Радзіме побач з месцамі свайго пражывання. Беларусы служылі на Каўказе, у Ся-

рэдняй Азіі, на Урале, Далёкім Усходзе, толькі не на тэрыторыі Беларусі. На Беларусі неслі службу ўраджэнцы Каўказа, Сярэдняй Азіі, хлопцы з расійскай глыбінкі. Вось тыя 810091 загінуўшых палонных і былі імі. Сярод абаронцаў Брэсцкай крэпасці было больш за 300 чэчэнцаў. Залічваць усіх на баланс Беларусі не выпадае. Іх падлічыў Генеральны штаб Чырвонай Арміі і звесткі разаслаў у ваенкаматы па месцы жыхарства, так кожная рэспубліка СССР, кожная вобласць вяла падлік сваіх ахвяр. Магчыма, ў гэтай колькасці былі часткова і беларусы. Тады давайце разбярэмся, колькі іх было, і прыплюсуем нашых ахвяр. Я лічу, што 810091 загінуўшых палонных трэба мінусаваць ад агульнай колькасці загінуўшых нашых грамадзян. Гэта значыць, трэба ўжо прытрымлівацца лічбы загінуўшых у 1 409 225 чалавек. Калі гэта не так, то трэба лічыць румынамі чырвонаармейцаў, загінуўшых пры вызваленні Венгрыі, і нават лічыць немцамі чырвонаармейцаў, загінуўшых у баях на тэрыторыі Германіі. Гэтыя абсурдныя прыклады можна працягваць далей.

Але мне здаецца, што і 1,4 млн чалавек – лічба завышаная. Сюды залічаны яўрэі, якіх эшалонамі везлі з акупаваных немцамі краін Еўропы ў Беларусь і тут знішчалі. Па дадзеных даследчыка Халакосту доктара гістарычных навук Эмануіла Іофэ такіх яўрэяў было 90 тысяч. Не трэба іх залічваць у ахвяры Беларусі. Яны падлічаны ў тых краінах, адкуль іх вывезлі. Дык дзеля чаго нам двайная бухгалтэрыя? Можа, дзеля таго, каб выдаваць сябе яшчэ большымі пакутнікамі? Калі мінусаваць гэтыя 90 тысяч замежных яўрэяў, то застаецца 1 319 225 загінуўшых беларусаў. Доля знішчаных беларускіх яўрэяў ад гэтай колькасці, па падліках прафесара Эмануіла Іофэ, складае 715 тысяч чалавек. Узнікае пытанне: колькі беларускіх яўрэяў знішчылі савецкія партызаны? А тое, што партызаны, як і немцы, знішчалі яўрэяў – гэта факт. Прывяду для прыкладу вытрымку з працы расійскага гісторыка Барыса Сакалова:

«*Как решали “еврейский вопрос” советские партизаны.*

«Не лучше относились к несчастным и партизаны. Герой Советского Союза подполковник госбезопасности Кирилл Орловский, командовавший партизанским отрядом имени Берия в Беларуси в сентябре 1943 года, рассказывал сотрудникам Института истории Белорусской компартии:

"Организовал я отряд имени Кирова исключительно из евреев, убежавших от гитлеровского расстрела. Я знал, что передо мной стоят невероятные трудности, но я не боялся этих трудностей, пошёл на это лишь только потому, что все окружающие нас партизанские отряды и партизанские соединения Барановичской и Пинской областей отказывались от этих людей. Были случаи убийства их. Например, «партизаны»-антисемиты отряда Циганкова убили 11 человек евреев, крестьяне деревни Раджалавичи Пинской области убили 17 человек евреев, партизаны отряда имени Щорса убили 7 человек евреев".

Сярод забітых яўрэяў ёсць сваякі Прэзідэнта Ізраіля Шымона Перэса. Вось што паведамляе сайт izrus:

"В начале июня Президент Израиля Шимон Перес получил в подарок архивный документ времён нацистской оккупации Беларуси: расстрельный список, в котором фигурируют имена его родственников и друзей. Это страшное свидетельство Холокоста вручил ему премьер-министр Беларуси Михаил Мясникович, побывавший в Израиле с рабочим визитом. Данный документ, составленный нацистами, содержит список уничтоженных евреев, живших в Воложинском районе. Среди них 22 родственника родителей Переса. Президент Израиля – уроженец беларускай деревни Вишнёво"».

Яшчэ раз хачу падкрэсліць, што яўрэяў знішчалі не толькі немцы і паліцаі, але і савецкія партызаны і нават мірныя «талерантныя» беларусы. Можа, таму і маўчала савецкая прапаганда? Можа, мэты адносна яўрэяў у фашысцкай Германіі і ў СССР часткова супадалі? Вось што аб гэтым піша доктар юрыдычных навук прафесар Аркадзій Лейзераў у сваёй працы: «Некаторыя аспекты адносін савецкага кіраўніцтва к Халакосту на Беларусі...»:

«Як вядома, у часы Вялікай Айчыннай вайны савецкая афіцыйная прапаганда амаль поўнасцю замоўчвала генацыд яўрэяў на акупаваных немцамі тэрыторыях. Паведамленні савецкага Інфармбюро не ўтрымлівалі інфармацыі аб ставарэнні немцамі гета, аб масавых расстрэлах яўрэяў як у гета, так і ў іншых месцах. Калі штосьці і паведамлялася, то вельмі рэдка... У зводках 1942–43 гг. увогуле не было ніводнага паведамлення аб масавых расстрэлах яўрэяў. Менавіта ў гэтыя гады праводзілася татальнае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва...»

А колькі загінула беларусаў без уліку яўрэяў? Атрымліваецца 604 225 чалавек. Яўрэяў нацысты знішчалі толькі за тое, што яны яўрэі, нежалежна ад краіны пражывання. Знішчаць беларусаў? Мне здаецца, такой мэты немцы перад сабой не ставілі. Напрыклад, у маёй вёсцы Нябышына непасрэдна ад рук немцаў ніхто не загінуў. Калі б у іх была мэта нас знішчыць, то яны б гэта зрабілі без усялякіх цяжкасцей. Большасць ахвяр маёй вёскі – ад рук паліцаяў і часткова ад рук партызан. Прашу прабачэння за паўтор, але я яшчэ раз нагадаю лічбы. Ад агульнай колькасці знішчанага мірнага насельніцтва Беларусі на долю яўрэяў прыходзіцца 715 000 ці прыкладна 55 % (выжыла 300–400 тысяч); на долю беларусаў прыходзіцца 604 225 чалавек, ці каля 45 % ад колькасці загінуўшых. Вось тут узнікае шэраг пытанняў к даследчыкам гісторыі акупацыі Беларусі, к прапагандыстам і ідэолагам, к высокім чыноўнікам, якія ўжо больш за 70 гадоў спекулююць лічбамі ахвяр вайны:

***Пытанне першае:*** Якая колькасць насельніцтва загінула ў выніку баявых дзеянняў у прыфрантавой паласе?

А людзі гінулі. Яны аднолькава гінулі ад артылерыйскіх абстрэлаў, бамбёжак як нямецкіх, так і савецкіх. Прычым савецкае камандаванне знішчала мірнае насельніцтва, якое засталося ў нямецкім тыле, мэтанакіравана. Магчыма, я ўжо прыпамінаў Загад Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання № 0428 ад 17.11.1941 года, у якім загадвалася: «Разбураць і паліць да шчэнту ўсе населеныя пункты ў тыле нямецкіх войск... Для знішчэння населеных пунктаў... кінуць неадкладна авіяцыю, шырока выкарыстаць артылерыйскі і мінамётны агонь, каманды разведчыкаў, лыжнікаў і партызанскія дыверсіённыя групы...» У такіх умовах мірнаму насельніцтву выжыць было проста немагчыма. На каго спісаны гэтыя ахвяры вайны? Безумоўна, на немцаў.

***Пытанне другое:*** Якая колькасць насельніцтва забіта партызанамі? Партызаны не мелі права не забіваць, наадварот, ім ставілася задача забіваць мірных людзей. Аб гэтым прама сказана ў Загадзе Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Сталіна «Аб задачах партызанскага руху» ад 5.09.1942 года. Адной з галоўных задач было: знішчэнне ідэйных ворагаў, якімі былі нацыянальныя дзеячы, асобы, якія працавалі ў акупацыйных адміністрацыях, паліцаі, старасты. Ад партызан патрабавалася нават знішчаць сялян, якія здаюць падаткі акупантам.

І партызаны стараліся дагадзіць сваім крамлёўскім гаспадарам, праяўлялі ініцыятыву. Усіх, хто ўладкаваўся к немцам на працу, каб пракарміцца, абʼявілі «пасобнікамі» акупантаў. Часам забівалі не толькі «пасобніка», а і ўсю яго сямʼю, уключаючы дзяцей. Шмат хто ведае, як партызаны ў вёсцы Дражна 14 красавіка 1943 года спалілі 37 дамоў і забілі 25 чалавек мірных жыхароў. Аб гэтым паведаў журналіст Віктар Хурсік у кнізе «Кроў і попел Дражна». На каго павешаны гэтыя ахвяры? Трэба меркаваць, што зноў жа на нямецкіх захопнікаў. І ці падлічаны гэтыя ахвяры?

***Пытанне трэцяе:*** Колькі знішчана насельніцтва ў выніку карных нямецкіх аперацый, справакаваных партызанамі? Пры жаданні гэту колькасць можна падлічыць. Вёскі, спаленыя разам з людзьмі – вядомы. Спадзяюся, што вядомы. Хаця... я прагартаў шмат матэрыялаў пра мемарыял «Хатынь», шукаў спіс спаленых вёсак. Мяне цікавіла колькасць людзей, знішчаных у кожнай вёсцы і дата знішчэння. Але ўсе крыніцы, з якімі я азнаёміўся, распавядаюць аб чым хочаш, асабліва пра зверствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і нічога канкрэтнага.

Аднойчы я прысутнічаў на мерапрыемстве, дзе паказалі фільм расійскага тэлежурналіста пра Хатынь. Фільм як фільм, нічога новага, спроба выклікаць у гледачоў спачуванне к гаротным беларусам, спроба разварушыць затухаючую нянавісць к нямецка-... Стоп! Пра немцаў у фільме нічога не сказана. Гледачам назойліва навязвалася думка, што Хатынь разам з жыхарамі спалена 118-м паліцэйскім украінскім батальёнам, што вінаватыя ў гэтым украінцы, праклятыя хахлы. У год паказу фільма прэзідэнтам Украіны быў Юшчанка, нелюбімы Масквой. К таму ж Віктар Юшчанка сябраваў з другім заклятым ворагам Масквы – прэзідэнтам Грузіі Міхаілам Саакашвілі. У сваім змаганні з Кіевам маскоўскі Крэмль не грэбаваў нічым. Вось там і ўспомнілі пра Хатынь, каб з гэтага боку куснуць Украіну. У фільме нічога не сказана, што склад батальёна – гэта былыя салдаты і афіцэры Чырвонай Арміі, і гэта галоўнае. Але стваральнікі фільма падкрэслівалі тое, што камандзір батальёа і камандзір аднаго са ўзводаў – украінцы і што 118-ы паліцэйскі батальён сфарміраваны на Украіне. На гэта мерапрыемства сабраліся адукаваныя людзі і шмат хто стаў абурацца зместам фільма, назвалі яго брудная расійскай правакацыяй, каб пасварыць паміж сабой беларусаў і ўкраінцаў.

На паказ фільма быў запрошаны нейкі чыноўнік, які мае дачыненне да мемарыяла «Хатынь». Я запытаўся ў яго, ці ёсць

у музеі мемарыяла спіс спаленых вёсак з указаннем даты спалення і колькасці знічшаных людзей. У адказ я пачуў, што ў іх ёсць задумка скласці такі спіс, але гэта вельмі складаная праца, мала звестак, усё амаль забыта. Прыехалі... Падумаеш, сцёрлі з твару зямлі нейкіх 628 вёсак разам з людзьмі. Ці варта гэта памятаць? Для вас пабудавалі цацку – мемарыял «Хатынь», і будзьце задаволены.

Тады я задаў чыноўніку наступнае пытанне, ці ёсць на макетах спаленых вёсак, што ўсталёваны на мемарыяле, даты іх знішчэння і колькасць знішчаных людзей. Ён паглядзеў на мяне здзіўлена і прамовіў, што там няма ні дат ні колькасці забітых людзей, што гэты мемарыял чыста сімвалічны. Складаецца такое ўражанне, што савецкая ўлада рабіла ўсё магчымае, каб трагедыя Беларусі часоў акупацыі была як мага хутчэй забыта, а сучасная ўлада гэту справу працягвае. Пасля партызанскага бязмежжа, 3 ліпеня 1944 года ўсе кіруючыя пасады ў БССР ад верху да самага нізу пазаймалі партызанскія кіраўнікі. А яны добра ведалі, што віна за спаленыя вёскі ляжыць як на немцах, так і на іх сумленні. Вось і патрабаваўся мемарыял, каб людзі ведалі толькі пра Хатынь, а ўсё астатняе забылі.

Цікава атрымліваецца, мы ведаем дату нараджэння і дату смерці Аляксандра Македонскага, які жыў 2360 гадоў таму назад, ведаем імёны яго жонак і дзяцей, а вось што адбывалася ўсяго 70 год таму назад ва ўласнай краіне, не памятаем. Памяць адбіла.

Мной заўважана яшчэ адна заканамернасць, якая сведчыць не на карысць партызан – гэта размеркаванне знішчэння беларускіх вёсак па гадах. Штогод, калі надыходзіць 9 мая, дзень Перамогі, чыноўнікі з высокіх трыбун у сваіх «дзяжурных» прамовах лямантуюць, што нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 9200 беларускіх вёсак. У 4667 вёсках ад гэтай колькасці часткова знішчана насельніцтва. 628 вёсак знішчаны цалкам з насельніцтвам. А зараз паглядзім, як знішчаныя вёскі размеркаваны па гадам акупацыі:

– 1941 год – знішчана 3 %
– 1942 год – знішчана 16 %
– 1943 год – знішчана 63 %
– 1944 год – знішчана 18 %.

Усё гэта ад агульнай колькасці спаленых вёсак.

А зараз зірнём на гэтыя лібчы больш удумліва. 1941 год нам паказвае, што немцы не планавалі знішчаць беларускія вёскі і беларусаў. 3 % – гэта тыя вёскі, якія апынуліся ў зоне баёў. Арганізаваных партызанскіх атрадаў яшчэ не было. Нешматлікія групоўкі, накшталт Міная Шмырова, хоць і наносілі шкоду насельніцтву, але яе было яшчэ нешмат. Загад Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання № 0428: разбураць і паліць усё дашчэнту ў тыле нямецкіх войск, выйшаў толькі 17.11.1941 года.

1942 год стаў ужо больш трывожным. Менавіта ў гэтым годзе на тэрыторыю акупаванай Беларусі былі перакінуты дзесяткі тэрарыстычных груп НКВД, такіх, як група Ваўпшасава. Яны былі надзелены шырокімі паўнамоцтвамі – выносіць пакаранні па свайму вырашэнню. Дзякуючы ім, банды чырвонаармейцаў і партработнікаў, якія блыталіся па лясах, больш-менш былі арганізаваны ў атрады і падлічаны. К канцу 1942 года партызан налічвалася 12 тысяч. Гэта дало свой плён – за год ужо было знішчана 16% ад агульнай колькасці знішчаных вёсак.

1943 год для Беларусі і беларусаў стаў найбольш трагічным. З восені 1942 года ў акупаваную Беларусь з савецкай тэрыторыі праз лінію фронта пачалі масава перапраўляць рэгулярныя вайсковыя часткі, падрыхтаваныя для правядзення дыверсій і вядзення партызанскай вайны. К канцу 1943 года колькасць такіх «партызан» дасягнула свайго піка – 153 тысячы чалавек. Якраз на гэты перыяд прыпадаюць самыя вялікія страты, якія панесла Беларусь. За 1943 год знішчана 63 % вёсак ад колькасці знішчаных. Савецкая прапаганда заяўляла, а сучасная прапаганда працягвае заяўляць, што на тэрыторыі акупаванай немцамі Беларусі былі створаны партызанскія зоны, дзе была адноўлена савецкая ўлада. Але якую карысць атрымала ад гэтага Беларусь? Падумалася, а што засталося б ад Беларусі, калі б тут было не 153 тысячы партызан, а тысяч 600? У Беларусі, магчыма, не засталося б ніводнай жывой душы.

1944 год – год вызвалення. За апошнія 7 месяцаў акупацыі было знішчана 18 % ад агульнай колькасці знішчаных вёсак. У 1944 годзе колькасць партызан рэзка ўзрасла – да 374 тысяч чалавек. І справа тут не ва ўсенародным уздыме. К гэтаму часу ў беларускіх вёсках засталіся толькі бабы і дзеці. Проста для так званай «рэльсавай вайны» пры правядзенні вайсковай аперацыі «Баграціён» на тэрыторыю Беларусі ў нямецкі тыл дадаткова было перакінута 220 тысяч чырвонаармейцаў (!). Проста ў каман-

давання фронтам не было спадзявання на тых партызан, якія тут адчувалі сябе ўтульна з 1942 года, хаваючыся ад вайны.

***Пытанне чацвёртае:*** Якая колькасць беларускага насельніцтва знішчана ўласна немцамі і паліцаямі? На іх совесці ляжыць забойства 715 тысяч беларускіх яўрэяў, гэта бясспрэчна. А вось забойства 604 тысяч беларусаў, якое прыпісалі немцам, я б на іх вешаць поўнасцю не стаў. Гэта агульная партызанска-нямецкая віна.

Пытанні, пытанні, пытанні... Але адказаў на іх няма.

Вышэй я расказаў пра тыя ахвяры, якія панесла мірнае насельніцтва на акупаванай тэрыторыі. Але ж нашы землякі гінулі не толькі там. Хачу нагадаць яшчэ раз, што Другая сусветная вайна для Беларусі, для беларусаў пачалася не 22 чэрвеня 1941 года, а 1 верасня 1939 года. Таму зноў узнікае шмат пытанняў, на якія хацелася б атрымаць адказы і тлумачэнні. Напрыклад, колькі беларусаў, якія былі ў складзе польскай арміі, загінула ў барацьбе супраць нямецка-савецкіх захопнікаў з 1 па 22 верасня 1939 года? Як мы ведаем, у гэты дзень адбыўся ганебны сумесны парад дзвюх «брацкіх» армій – нямецкай і савецкай.

Сярод жаўнераў, якія трапілі ў нямецкі палон, было 70 тысяч беларусаў. Яны былі інтэрніраваны ў СССР у абмен на палякаў, трапіўшых у савецкі палон. Каму з іх ад гэтага абмену пашанцавала больш? Пытанне цынічнае. Дарэчы, савецкае кіраўніцтва ашукала немцаў, яно перадала ім толькі невялікую частку палонных палякаў, астатніх чакалі турмы, расстрэлы, ГУЛАГ. 46 тысяч палонных беларусаў выселілі ў Казахстан. Колькі ўсяго палякаў і беларусаў было ў савецкім палоне, дакладнай лічбы я не знайшоў. Пасля параду 22 верасня 1939 года савецкіх і нямецкіх войск у г. Брэсце, прысвечанага захопу і падзелу Польшчы, вайна супраць заходніх беларусаў не спынілася і працягвалася да 22 чэрвеня 1941 года. На тэрыторыі Беларусі праводзіліся жорсткія карныя аперацыі. У выніку гэтых аперацый з Заходняй Беларусі ў Сібір, на Поўнач, у Казахстан было дэпартавана, як напісала газета «Народная Воля» (за 4.08.1998 г.), 250 тысяч асуджаных і 990 тысяч чалавек, проста папаўшых пад падазрэнне ўлады. Часам людзей высылалі цэлымі сем’ямі.

За той жа перыяд, як сцвярджае Сымон Струменскі ў сваім зборніку «Страты Беларусі», было расстраляна 135 тысяч грамадзян Беларусі. У гэтай колькасці не ўлічаны палонныя беларусы, якія расстраляны разам з палякамі ў адпаведнасці з Пастановай Палітбюро ЦК ВКП(б) «Аб расстрэле ваеннапалонных польскіх

афіцэраў, чыноўнікаў, памешчыкаў, асаднікаў» ад 05.03.1940 года. Расстрэлы адбыліся ў красавіку 1940 года ў Катынскім лесе пад Смаленскам, у Старабельскім лагеры пад Харкавам, у Асташкаўскім лагеры Калінінскай вобласці, у ваколіцах Мінска – Курапаты, Дражня, Лошыца, парк Чалюскінцаў і ў іншых месцах. Колькі ўсяго беларусаў расстраляна ў адпаведнасці з гэтай жахлівай пастановай, невядома.

Чаму мы адракаемся ад нашых суайчыннікаў, загінуўшых ад рук нкусаўцаў, спрабуем выкінуць із з народнай памяці? Няўжо да нашага часу баімся называць савецкую ўладу злачыннай, бандыцкай, антычалавечай? Пытанняў шмат, а адказаў няма.

Вядома, што на працу ў Нямеччыну было вывезена 377 776 грамадзян Беларусі. Але эта самае можна выказаць крыху інакш: усяго толькі 377 776 грамадзян Беларусі было вывезена на працу ў Нямеччыну. Такое магло адбыцца дзякуючы таму, што ва ўмовах акупацыі такія ўнікальныя аўтарытэтныя структуры, як Беларуская народная самадапамога (БНС), як Саюз беларускай моладзі (СБМ), як Беларуская цэнтральная рада (БЦР) ды іншыя, якія рабілі ўсё магчымае, каб аблегчыць долю насельніцтву ва ўмовах акупацыі. З гэтымі структурамі лічылася акупацыйная грамадзянская адміністрацыя. Генеральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ спрыяў беларусам і часам пярэчыў органам СС і СД у пытаннях вярбоўкі беларускай моладзі на працу ў Нямеччыну. Ён лічыў, што беларускую моладзь наперадзе чакае шмат важных спраў у будучай незалежнай Беларусі.

Колькі беларусаў загінула на працы ў Нямеччыне – невядома. Яны гінулі ад амерыканскіх і англійскіх налётаў авіяцыі. Справа ў тым, што шмат беларусаў працавала на заводах канцэрна «Юнкерс». А менавіта гэтыя заводы падвяргаліся самаму жорсткаму бамбаванню.

Колькі беларусаў пасля нямецкай капітуляцыі адмовіліся вяртацца на радзіму і з'ехалі ў Англію, Канаду, ЗША, Аўстралію і іншыя краіны? Ёсць звесткі, што такіх 260 тысяч, гэта 68,8 % ад колькасці ад'ехаўшых на працу ў Нямеччыну. А гэта ж таксама нашы страты ў вайну. Хаця з якога боку на гэту справу паглядзець. Магчыма, наадварот, гэта нашы набыткі. З'ехаўшы ў іншыя краіны, нашы землякі сталі вартымі грамадзянамі тых краін, сталі знакамітымі асобамі. Асабіста для мяне не мае значэння, якім чынам яны апынуліся за мяжой, на чым баку яны былі ў часы Другой сусветнай вайны. Так ці інакш яны – прадстаўнікі нашага

народа за мяжой, дзякуючы ім пра нас там ведаюць. Мы павінны ганарыцца імі. Калі б яны вярнуліся на Радзіму пасля 9 мая 1945 года ці засталіся б на Радзіме пасля вызвалення Беларусі, то яны на доўгія гады сталі б вязнямі савецкага ГУЛАГу і зніклі б у ім. Добра, што ў іх хапіла розуму своечасова ад'ехаць у замежжа.

Пасля 22 чэрвеня 1941 года ў першыя дні вайны нкусаўцы праявілі масавыя расстрэлы вязняў, якія знаходзіліся ў савецкіх турмах на тэрыторыі Беларусі. Такія факты прывёў Сымон Струменскі ў зборніку матэрыялаў «Страты Беларусі...»:

– 25 чэрвеня 1941 г. Расстрэл калоны зняволеных Менскай турмы ва ўрочышчы Благоўшчына каля вёскі Трасцянец. Забіта каля 2 тысяч чалавек.

– 26–28 чэрвеня 1941 г. Службоўцы ворганаў НКУС расстралялі каля 2 тысяч палітычных зняволеных, прыгнаных з Менскай ды іншых суседніх турмаў, каля г.п. Чэрвень, ва ўрочышчы Цагельня.

– 6 ліпеня 1941 г. Перад надыходам немцаў ахоўнікі Бярэзінскай турмы НКУС расстралялі яе вязняў (большасць з іх былі сяляне, асуджаныя за крадзеж у калгасе).

– Ліпень 1941 г. Адступаючы з Віцебска пад націскам нямецкіх войскаў ахоўнікі тамтэйшай турмы, дзе былі палітвязні, аблілі яе бензінам і спалілі разам са зняволеннымі. (Канец цытавання).

Гэта ўсё нашы страты. Колькі людзей было знішчана вось такім метадам, невядома. Як падлічаны гэтыя ахвяры, на каго ўскладзены? Няўжо ўсё на тых жа немцаў?

Беларусы змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у складзе армій іншых краін – у англійскай, амерыканскай, канадскай, французскай і іншых. Колькі іх там усяго было, колькі загінула, дзе іх пахаванні, ці ўскладаюць кветкі на іх магілы супрацоўнікі нашых амбасад у тых краінах хаця б раз на год? Вядома, што ў складзе арміі польскага генерала Андэрса змагалася больш за 50 тысяч беларусаў. Армія вызваляла ад немцаў Італію, пры гэтым загінула 1270 нашых землякоў. Якім чынам яны ўлічаны ў агульнанацыянальных стратах Беларусі? Невядома, якія людскія страты панесла Беларусь ад выканання загада Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання № 270, які ваеннапалон-

ных чырвонаармейцаў аб'яўляў здраднікамі і дазваляў арышты іх сем'яў.

З 1,5 мільёна беларусаў, якія ваявалі ў складзе Чырвонай Арміі, загінуў 1 мільён, у іх ліку і мой бацька. Гэта вельмі шмат – 66,3%. Масавая гібель чырвонаармейцаў-беларусаў прыпадае на 1944 год. Прычына гэтага вядома.

Цёмнай ці белай плямай з'яўляецца савецка-фінская вайна. Гэта кавалак Другой сусветнай вайны. Колькі беларусаў удзельнічала ў гэтай вайне, колькі загінула, колькі замёрзла ў карэла-фінскіх лясах і балотах? Ніякіх звестак пра гэта я не знайшоў.

Калі падлічыць, падсумаваць усе ахвяры Другой сусветнай вайны, то, магчыма, высвятліцца, што загінуў не кожны чацвёрты, не кожны трэці, а кожны другі беларус. А можа, наадварот, усяго толькі шосты ці дзесяты.

Беларусь панесла і вялізарныя матэрыяльныя страты. Пра спаленыя вёскі я ўжо прыпамінаў. Разбурана 209 гарадоў і пасёлкаў гарадского тыпу, знішчана 1,2 мільёна будынкаў. Акупанты разрабавалі больш за 10 тысяч фабрык і заводаў, усе калгасы, саўгасы і МТС. Такія звесткі можна адшукаць у афіцыйных паведамленнях. Там можна прачытаць, што Мінск, Віцебск, Магілёў і іншыя буйныя гарады былі разбураны акупантамі на 80%. Падлічаныя страты склалі 75 млрд рублёў у коштах 1941 г. Але афіцыйныя крыніцы не дагаварваюць да канца, замоўчваюць той факт, што разбурэнні здзяйснялі не толькі немцы, а і савецкія сілавыя структуры. Дзеянні апошніх былі больш эфектыўнымі. І рабілася гэта не стыхійна, а па загаду зверху. Яшчэ раз напомню некаторыя тыя загады:

– Дырэктыва Саўнаркама ад 20 ліпеня 1941 года: «Не оставлять противнику ни килограмма хлеба, ни капли горючего»;

– Загад Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання ад 17 лістапада 1941 года, які загадаў «разрушать и сжигать дотла все населённые пункты в тылу немецких войск...»

Вось чаму партызаны і «клапаціліся» (правакавалі немцаў), каб тыя 9200 вёсак згарэлі. А савецкая авіяцыя метадычна бамбавала Мінск і іншыя гарады. Асабліва жорсткімі былі бамбаванні, прысвечаныя святочным датам: 8-е сакавіка, 1-е мая, 7-е лістапада. Самыя маштабныя з іх адбыліся 8.03.1942 г. і 1–2.05.1943 г., у выніку якіх былі вялікія разбурэнні, загінулі сотні людзей. Асабліва ўчасціліся бамбаванні ў 1944 годзе. Трэба ўлічваць і тое, што са-

вецкая авіяцыя бамбавала не адміністрацыйныя будынкі, а жылыя кварталы.

У пацверджанне вышэйсказанага хачу прывесці словы доктара гістарычных навук Захара Шыбекі:

«Перад адступленнем Чырвонай Арміі органы ўнутранай бяспекі і вынішчальныя атрады падпальвалі будынкі, каб нічога не пакінуць немцам. Таму пажары пачаліся не толькі ад нямецкіх налётаў, але і ў выніку дзейнасці бальшавікоў. Падчас акупацыі Мінск цярпеў ад бамбардзіровак з савецкай тэрыторыі. Потым гэтыя разбурэнні былі залічаны на рахунак нацыстаў»

*(tut.by, Кастусь Лашкевіч, 10.09.2010).*

Афіцыйныя крыніцы прыводзяць такія факты, што за часы акупацыі насельніцтва не далічылася 61 % коней, 69 % кароў, 89 % свіней, 78 % авечак. Куды ж яны падзяваліся? У маёй вёсцы Нябышына немцы не забралі ніводнага каня, ніводнай каровы. Так, частка пагалоўя свіней, авечак ішла на падаткі немцам. Але памер падатку быў ад 20 % да 30 % у залежнасці ад колькасці жывёлін у гаспадарцы. Усё, што засталося ад немцаў, з'елі партызаны, яны не цырымоніліся.

Пад «шумок» вайны і СССР абрабаваў Беларусь – на тэрыторыю Расіі былі вывезены амаль усе культурныя і мастацкія каштоўнасці. Пасля вайны назад нічога не вярнулася. Тое, што не паспелі вывезці ў Расію, немцы вывезлі ў Германію. Доктар філалагічных навук прафесар Адам Мальдзіс у газеце «Известия» ад 29.09.2000 года з болем у сэрцы расказаў, што ўсяго ад 1 % да 5 % нашых (беларускіх) культурных, мастацкіх і духоўных каштоўнасцяў знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. У першыя дні вайны ў Расію вывезена калекцыя слуцкіх паясоў, крыж Еўфрасінні Полацкай, выданні Францішка Скарыны, царкоўныя рэліквіі.

***Дадатак.*** Ужо паставіў апошнюю кропку пад сваімі разважаннямі, але на вочы папалася прозвішча яшчэ аднаго з тысяч партызанскага камандзіра, Луніна. Ён мяне зацікавіў і я стаў шукаць пра яго звесткі.

Барыс Мікалаевіч Лунін – ураджэнец Саратаўскай вобласці. На фронце з ліпеня 1941 года. У жніўні 1941 года папаў у нямецкі палон. Утрымліваўся ў канцлагеры ў Драздах недалёка ад Мінску. У сакавіку 1942 года яму ўдалося здзейсніць уцёкі. З такіх жа, як і сам, Лунін арганізаваў невялікі партызанскі атрад. З цягам часу

на базе атрада была створана партызанская брыгада «Штурмавая». Яе камандзірам быў прызначаны Барыс Лунін. Брыгада дзейнічала на тэрыторыі Мінскай і Вілейскай абласцей. Я не стаўлю перад сабой мэту распавядаць тут пра «подзвігі» брыгады, толькі скажу, што 1 студзеня 1944 года Барысу Луніну было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны стане вядома, што з сябе ўяўляе гэты партызанскі камбрыг, якія подзвігі ён здзейсніў. Ён не вярнуўся на сваю радзіму ў Саратаўскую вобласць. Гэта быў цэнны кадр на кіруючую пасаду ў пасляваеннай Беларусі. Ён быў прызначаны памочнікам міністра аўтамабільнага транспарту БССР. Праз нейкі час ён пераехаў на сталае месцажыхарства ў Краснадарскі край.

22 ліпеня 1957 года Лунін быў асуджаны ваенным трыбуналам Беларускай ваеннай акругі па арт. 180 і арт. 214 ч. 2 УК БССР к 7 гадам пазбаўлення волі. У тэксце прыгавора сказана, што «Лунін як камандзір партызанскай брыгады і яго падначалены Белік як начальнік асобага аддзела гэтай брыгады пры асабліва ацягчаючых абставінах... злоўжывалі сваім службовым становішчам і з-за асабістай зацікаўленасці незаконна расстрэльвалі і забівалі многіх савецкіх людзей, а Белік, у тым ліку, і няпоўнагадовых дзяцей. Дзеянні Луніна і Беліка выклікалі абурэнне партызан і мясцовага насельніцтва».

Цікава, што следства было распачата адразу пасля вызвалення Мінска па заяве падпольшчыкаў у КДБ. Калі аб гэтым даведаўся Сталін, то ён сказаў: «Подумаешь, кого-то партизаны расстреляли. На то они и партизаны». Справу прыпынілі. Пасля смерці Сталіна справу аднавілі і давялі яе да канца. Акрамя гэтага суд звярнуўся з хадайніцтвам у Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР аб пазбаўленні Луніна Б.М. звання Героя Савецкага Саюза і ўсіх узнагарод. Лунін Барыс Мікалаевіч Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета ад 26 лістапада 1957 года пазбаўлены звання Героя Савецкага Саюза і ўсіх дзяржаўных узнагарод у сувязі з асуджэннем за воінскія злачынствы.

Што тут сказаць? На маю думку, не толькі Луніна, але амаль кожнага партызанскага камандзіра можна прыцягнуць да адказнасці за злачынствы, здзейсненыя супраць мірнага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі. І нават не варта ўдакладняць, кім тэрыторыя акупавана. Часам у так званых партызанскіх зонах насельніцтва адчувала сябе значна небяспечней, чым пад немцамі. Такія прыклады я ўжо прыводзіў. Менавіта таму, калі БНС, а потым БЦР

фарміравалі БСА і БКА, самае значнае папаўненне паступіла за кошт насельніцтва з партызанскіх зон. Так людзі ратаваліся ад партызанскага «вызвалення», ад партызанскага бязмежжа.

Яшчэ адзін «беларускі» партызан, Радзіён Ахоцін, ураджэнец рэспублікі Марый Эл. Хто тут толькі не партызаніў. Перад вайной старшы лейтэнант Ахоцін служыў у Беларусі недалёка ад Полацка. Калі пачалася вайна, ён пападае ў акружэнне. З акружэнцаў Ахоцін арганізаваў партызанскі атрад. Можна адшукаць крыніцы, у якіх сказана, што атрад нанёс ворагу вялікія страты. Якія гэта страты? Чытаем: знішчана 672 шпіёны і здраднікі. Што гэта за здраднікі? Няцяжка здагадацца, што гэта сем'і паліцэйскіх, у тым ліку і дзеці, сем'і стараст і ўсе тыя, хто ўладкаваўся к немцам на працу, ды іншыя. Гэта яшчэ адзін доказ, што галоўнай мішэнню для партызан было мірнае насельніцтва.

На сайце westki.info нарэшце ўбачыў матэрыял пра партызанскага камандзіра, выхадца з Беларусі. Падумалася, вось яна – светлая пляма сярод партызанскага бязмежжа. Ну як жа пра яго не расказаць.

Фёдар Маркаў, а менавіта пра яго ідзе гаворка, нарадзіўся ў 1914 годзе ў вёсцы Качанішкі Пастаўскага раёна. Навучаўся ў настаўніцкай гімназіі ў Свянцянах. У 1934 годзе ўступіў у КПЗБ. У 1936 годзе арыштаваны польскай паліцыяй за антыдзяржаўную дзейнасць. Турэмны тэрмін адбываў у лагеры «Бяроза Картузская». У верасні 1939 года вызвалены Чырвонай Арміяй. Савецкая ўлада, якая прыйшла ў Заходнюю Беларусь, прызначыла Фёдара Маркава на пасаду старшыні Свянцянскага райвыканкама. Пасля 22 чэрвеня 1941 года ўцякаў на ўсход разам з Чырвонай Арміяй. У раёне Бранска яго спынілі і накіравалі ў школу НКВД на курсы дыверсантаў. Пасля заканчэння курсаў яго ў складзе групы перапраўлілі праз лінію фронта на тэрыторыю Пастаўскага раёна. Чытачы, мяркую, ужо зразумелі, што гэта такі ж самы, як і ўсе, прамаскоўскі партызан.

Група пад кіраўніцтвам Фёдара Маркава здзейсніла шэраг дыверсій. Самай гучнай была дыверсія, ад якой уздрыгнуўся ўвесь Пастаўскі раён, якая адбылася 20 мая 1942 года каля вёскі Лынтупы. Дыверсанты з засады абстралялі нямецкую легкавую машыну. У выніку загінулі два высокапастаўленыя нямецкія афіцэры. Акупанты ўзялі ў закладнікі ні ў чым не вінаватых 200 жыхароў вёсак Шудоўцы і Лынтупы, якія былі бліжэй к месту засады. Немцы паабяцалі адпусціць закладнікаў, калі будуць

выдадзены злачынцы, якія забілі нямецкіх афіцэраў. Але ж Фёдар Маркаў і зладзіў засаду для таго, каб справакаваць немцаў на рэпрэсіі супраць насельніцтва. Немцы чакалі выдачы злачынцаў, а злачынцы ў гэты самы час распівалі самагонку, абмывалі поспех. Былы курсант школы НКВД Раманаў у сваіх успамінах напісаў: «Нас обучали провоцировать немцев, чтобы они совершали более жестокие репрессии и таким образом увеличивали количество партизан». У выніку немцы расстралялі 200 чалавек мясцовага насельніцтва.

За забойства двух нямецкіх афіцэраў і знішчэнне 200 чалавек мірнага насельніцтва Ф. Маркаў атрымаў узнагароду. Яго група была пераўтворана ў партызанскі атрад імя Суворава, камандзірам якога ён стаў. З цягам часу на базе атрада была створана партызанская брыгада імя Варашылава. Яе камандзірам быў прызначаны Фёдар Маркаў.

У 1943 годзе Цэнтральны штаб партызанскага руху аддаў загад сваім партызанам прыступіць к раззбраенню польскіх партызан АК. У гэты працэс уключылася і партызанская брыгада імя Варашылава. Колькі ўсяго польскіх атрадаў АК абяззброіў камбрыг Маркаў, такой лічбы не знайшоў. Але ёсць звесткі, як ён абышоўся з першым такім атрадам. Гэта адбылося 26.08.1943 года. Пасля здачы зброі камбрыг Ф. Маркаў звярнуўся к палякам (магчыма, гэта былі заходнія беларусы) са словамі: «Никому из вас ничего не будет. Я вам даю слово чести советского офицера». Чаго варта тое «слово чести...» стане вядома вельмі хутка. Ужо на наступны дзень 50 чалавек польскіх партызан – салдат і афіцэраў былі расстраляны. Потым было расстраляна яшчэ 30 чалавек. Астатнія не сталі чакаць трагічнага канца, уцяклі.

Брыгада Ф. Маркава бязлітасна тэрарызавала насельніцтва Пастаўскага і Мядзельскага раёнаў. Вось што сведчыць жыхарка Пастаўскага раёна Адэля К. (блогер Gienek): уначы да нас у дом уварваліся партызаны і ў грубай форме, карыстаючыся нецэнзурнымі выразамі, патрабавалі выдаць веласіпед. Калі я сказала, што веласіпеда ў нас няма, то камандзір стукнуў мяне рукаяткай пісталета па галаве. Кроўю заліло мне ўвесь твар. Другі партызан вынуў з вінтоўкі шомпал і пачаў біць мяне па спіне. Пасля збіцця зрабіліператрус. Забралі прадукты, каштоўнасці, жаночую споднюю бялізну, адзенне, адрэзы тканіны.

Вось яшчэ адно сведчанне жыхара вёскі Руда Пастаўскага раёна Францішака Драгуна:

☙ «Бальшавіцкія партызаны вельмі народ прыгняталі. Прыходзілі п'яныя, усіх выганялі на двор, ставілі да сцяны, а самі што хацелі, тое і забіралі – нават апошнюю свінню ці курыцу, не кажучы ўжо пра карову ці каня. Пагражалі нам, білі і здзекаваліся. Потым, калі яны ўхадзілі, забіралі бацьку і нас і загадвалі перайсці чыгунку на другі бок. Пасля нас яны пераходзілі самі. Партызаны баяліся падарвацца на міне ці натыкнуцца на нямецкую засаду».

Партызанам было не да немцаў. Пакуль насельніцтва ламала галаву, як выжыць, партызаны п'янствавалі, вялі разгульнае жыццё. Мала таго, што яны пры налётах на вёскі гвалцілі жанчын, дык яны яшчэ праводзілі «мабілізацыю» дзяўчат у свае шэрагі ці проста іх сілком уводзілі ў лес. Так у атрадзе Ф. Маркава было 116 маладых жанчын, прычым толькі 9 з іх мелі нейкія пасады. Астатнія вымушаны былі служыць уцехай для партызанскай вярхушкі. На сучаснай мове гэта азначае, што дзяўчаты, маладыя жанчыны павінны былі даваць сексуальныя паслугі. Штосьці перападала і шэраговым партызанам. Сам Фёдар Маркаў сумесна пражываў з няпоўнагадовай дзяўчынай. Ёй, можна сказаць, пашанцавала, таму што Ф. Маркаў меў прыемны выгляд. А што адчувалі жанчыны, якія былі вымушаны быць сужыцелькамі камісара 1-га атрада брыгады «Жалязняк» Спірыдона Барздыкі. У яго была на рэдкасць брыдкая морда, жахлівей не прыдумаць. Я асабіста сам яго бачыў.

Партызанскае бязмежжа настолькі стала распаўсюджаным, што нават «галоўны партызан» Панцеляймон Панамарэнка ў сваёй чарговай справаздачы Сталіну паведаміў пра «марадзёрства, неабгрунтаваныя расстрэлы і рэпрэсіі ў адносінах да насельніцтва, непрыстойныя адносіны да жанчын ў вёсках, працяглае адседжванне, імкненне пазбегнуць сустрэч з праціўнікам».

Нягледзячы на гэта партызаны атрымлівалі званні Герояў Савецкага Саюза, за два-тры гады вырасталі ад лейтэнанта да палкоўніка ці нават генерала.

## 6. Ці дачакаемся мы праўды?

Гісторыя Другой сусветнай вайны ў савецкай інтэрпрэтацыі – суцэльная хлусня. Патрабуецца дэталёвая інвентарызацыя. Гісторыкі савецкага накірунку лямантуюць: не дазволім перапісваць гісторыю вайны! Але ж яе спачатку трэба праўдзіва

напісаць, вярнуць яе нам. Трэба аддзяліць усялякае мемуарнае шалупінне і пакінуць праўду, якой бы горкай яна ні была.

На першым з'ездзе беларусаў свету акадэмік Радзім Гарэцкі сказаў у сваім дакладзе:

> «...Больш усебаковай і аб'ектыўнай ацэнкі патрабуе партызанскі рух Беларусі ў час Другой сусветнай вайны. Ён заключыў у сабе не толькі гераічнае, што ўсяляк высвечваецца, а і трагічнае, што ўсё яшчэ зацямняецца, проста замоўчваецца. Так, ён мала выконваў адзін з важнейшых абавязкаў, а менавіта – бараніць насельніцтва Беларусі ад вынішчэння featureзнага роду карнікамі, а ў шэрагу выпадкаў нават садзейнічаў гэтаму».

Гэта было сказана ў 1993 годзе. Я ўдзячны акадэміку. З яго вуснаў я пачуў тое, што доўгія гады выношваў у сабе. Мне тады падумалася, што лёд крануўся, што высновы акадэміка Гарэцкага падхопяць і працягнуць іншыя. Але заварушыліся, паднялі галовы былыя партызанскія функцыянеры, рынуліся бараніць свой міт аб заступніцтве за простых, мірных беларусаў.

Знішчаны школьныя падручнікі па гісторыі, выдадзеныя ў першай палове 90-х гадоў мінулага стагоддзя. У апошні час распачата беспардонная спекуляцыя тэмай вайны і перамогі. Слухаеш некаторыя афіцыйныя прамовы і складаецца ўражанне, што прамоўца кіраваў дывізіямі, арміямі, франтамі, распрацоўваў вайсковыя аперацыі, натхняў войскі на подзвігі, браў Берлін. Узнікае жаданне зняць ордэн Перамогі з помніка Перамогі і пачапіць яго на грудзі прамоўцы.

Пачалася новая хваля прыватызацыі перамогі. Так, мы пранеслі на сваіх плячах цяжар вайны, перацярпелі шмат пакут, панеслі вялікія страты. Але не трэба перабольшваць унёсак Беларусі ў справу разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Чырвоная Армія больш чым напалову складалася з цёмнаскурых і вузкавокіх салдат. Тыя беларусы, якіх мабілізавалі ў 1944 годзе, загінулі на працягу 1–2 месяцаў. Іх ледзь хапіла на некалькі разведак боем. Перамога над Германіяй дасягнута агульнымі намаганнямі ўсіх краін свету. Брэсцкую цытадэль, якой мы так ганарымся, абаранялі воіны розных нацыянальнасцяў, там загінула 300–350 чэчэнцаў, пра якіх сёння не ўспамінаюць.

Чырвоная Армія вызваліла краіны Усходняй Еўропы ад фашызму, для народаў вызваленых краін гэта была вялікая радасць, але яна была нядоўгай. На змену карычневай чуме прыйшла чыр-

вона-карычневая. Васіль Быкаў у артыкуле «Горкі смак Перамогі» («Народная газета» ад 07.03.1995) пісаў:

> «Мы меркавалі, што вызваляем еўрапейскія народы ад фашызму, не падумаўшы, што нясём ім новае зняволенне...»

Савецкая акупацыя праіснавала 45 гадоў. Толькі гарбачоўская перабудова і галоснасць паспрыялі вызваленню. Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў варты таго, каб яму пры жыцці ў гэтых краінах былі ўсталяваны помнікі, як цару-вызваліцелю.

Чым больш аддаляе нас час ад Другой сусветнай вайны, ад дня Перамогі, тым больш падымаюцца новыя хвалі хлусні. У дзяржаўных СМІ толькі і чуеш напышлівую балбатню пра ўсенародны ўздым на барацьбу супраць ворага, пра самаахвярнасць, пра суцэльны гераізм на фронце і ў тыле. Але давайце зірнём праўдзе ў вочы. Які ж гэта гераізм, калі за першы год і асабліва за першыя месяцы вайны ў нямецкі палон трапіла 3,7 мільёна савецкіх салдат і афіцэраў? Чаму такая процьма не засланіла сабой краіну? Калі быў у гады вайны суцэльны ўздым, гераізм, патрыятызм, дык як тады мог з'явіцца загад стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандвання № 270, які аб'яўляў здраднікамі не толькі салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі, якія трапілі ў нямецкі палон, але і чальцоў іх сем'яў? Калі лічыць, што кожная сям'я складалася з 4–5 чалавек, дык атрымліваецца, што ў СССР аказалася ў час вайны ад 25 млн да 30 млн здраднікаў! Што ж гэта была за дзяржава, у якой мы жылі?

Калі быў у гады вайны ўсенародны ўздым, патрыятызм, гераізм, то як мог з'явіцца на свет загад наркама абароны СССР І. Сталіна № 227 ад 28 ліпеня 1942 года, які атрымаў назву «Ні кроку назад!». Гэты загад прадпісваў стварыць заградатрады НКВД, узброеныя кулямётамі, аўтаматамі і іншай зброяй. Атрады размяшчаліся ў тыле часцей, прызначаных для атакі. Пры спробе адступіць заградатрады адкрывалі агонь па сваіх. Акрамя таго, загад даваў санкцыі на стварэнне штрафных рот і батальёнаў. Загад прадпісваў расстрэльваць перад строем трусаў і панікёраў. У адпаведнасці з загадам № 227 такіх было расстраляна (слабанервовых прашу не чытаць, перагарніце старонку) 954 тысячы савецкіх салдат і афіцэраў!

Такі «патрыятызм» у страшным сне не мог прысніцца. Што ж гэта за дзяржава такая? Што ж гэта за кіраўнікі дзяржавы, што аддавалі такія бесчалавечныя загады? Гэта нелюдзі. Любога сал-

дата, які замарудзіўся і апошнім падняўся ў атаку, расстрэльвалі, каб запалохаць іншых. Загад з'явіўся ў канцы ліпеня 1942 года. Вайна працягвалася ўжо больш за год, быў назапашаны вялікі вопыт яе вядзення. Але патрыятызму, запалу ў арміі не было. Што ж гэта за армія, якую ў атаку, у наступленне трэба падымаць і гнаць наперад пры дапамозе заградатрадаў?

Кожнаму военачальніку і шараговаму салдату вядома, што армія, якая наступае, нясе значна большыя страты, чым тая, якая трымае абарону. А што адбывалася на самай справе? Чырвоная Армія, якая трымала абарону, у баях за кожны горад несла незлічоныя страты. Звычайна армія пакідае горад ці тэрыторыю, каб зберагчы сваю жывую сілу і тэхніку, перагрупавацца і чакаць праціўніка на новых рубяжах абароны. Але тут нават гаворка не ішла, каб берагчы жыццё сваіх салдат і афіцэраў для будучых баёў. Абараняючы Смаленск, Чырвоная Армія згубіла 1,5 мільёна чалавек. Пад Ржэвам і Вязьмай яшчэ 1,5 мільёна. У баях за Маскву загінула каля мільёна чалавек. К восені 1941 года ад той часці Чырвонай Арміі, якая была выстаўлена супраць немцаў, засталося 7 % асабовага складу. Аднак і немцам патрэбна была перадышка. Становішча Чырвонай Арміі пад Масквой палепшылася, калі з Далёкага Усходу сюды прыбылі свежыя арміі, якія трымалі там на выпадак агрэсіі з боку Японіі.

Не трэба скідваць з шаляў вялікую бескарыслівую дапамогу, якую аказалі СССР Злучаныя Штаты Амерыкі. Чырвоная Армія мела шматкратную перавагу ў жывой сіле і тэхніцы над нямецкай арміяй. Па віне бяздарнага кіраўніцтва гэта перавага была згублена ў першыя месяцы вайны. Калі мы вядзём размову пра дапамогу, то прыпамінаем толькі амерыканскія аўтамабілі «Студабекеры». Але ж ЗША бесперабойна пастаўляла для СССР танкі, самалёты, іншае ўзбраенне, выбуховыя рэчывы. Я не буду называць канкрэтныя лічбы дапамогі, скажу толькі, што яны астранамічныя.

Акрамя таго, ЗША пастаўлялі ў СССР прадукты харчавання. Чырвоная Армія галадала. Мой стрыечны брат Аляксандр Капылоў пачаў вайну сувязістам. Ён мне расказваў, што кармілі іх вельмі кепска – раз у двое сутак. Усе думкі былі накіраваны на тое, дзе і як знайсці ежу, хадзілі з працягнутай рукой, а бывала, і рабавалі мясцовае насельніцтва. Прэзідэнт Рузвельт, сенат і ўрад ЗША прынялі ў той час пастанову абмежаваць у забеспячэнні прадуктамі ўласны народ, каб за кошт гэтага арганізаваць пастаўкі для СССР. Я не магу назваць лічбу, колькі мільёнаў тон прадуктаў харчавання было пастаўлена, але ў СМІ прагучала інфармацыя,

што гэтага хапіла б, каб паўнавартасна карміць 3-мільённую армію на працягу трох гадоў. На жаль, факт амерыканскай дапамогі замоўчваецца.

На абарону Масквы былі перакінуты вайсковыя фарміраванні з Сярэдняй Азіі. Там былі размешчаны вялікія сілы, бо Сталін баяўся, каб Сярэдне-Азіяцкія рэспублікі не паспрабавалі аддзяліцца, выкарыстаўшы цяжкае становішча СССР. Унутраныя ворагі для Крамля былі небяспечней вонкавых. Толькі з 1929 года супраць савецкай улады адбылося 730 паўстанняў, у тым ліку і ў арміі. Салдаты-сяляне адкрыта заяўлялі, што ў выпадку вайны яны не будуць абараняць СССР. Пра гэта гаварылася ў перадачы «Особая папка» на канале ТВЦ 22.03.2004 года.

Каб прадухіліць крах СССР, Сталін, ратуючы сваю скуру, вёў перамовы з Гітлерам аб спыненні вайны. Пасярэднікам перамоў была хаўрусніца Гітлера – Балгарыя. За спыненне вайны Сталін даў згоду добраахвотна аддаць Германіі Украіну, Беларусь, Прыбалтыку, Бесарабію, Букавіну, Карэльскі перашыек (гл. кнігу ваеннага гісторыка Д. Валкагонава «Ленін»). Дарэчы, сатрап Ленін, ратуючы сваю ўладу, у 1918 годзе ўжо здаваў нас немцам па Брэсцкім міры. І вось зноў усё магло паўтарыцца.

Але Гітлер адхіліў прапанову Сталіна. Гэтыя тэрыторыі і так ужо былі пад нямецкай акупацыяй. А калі б Гітлер пагадзіўся? Як бы склалася гісторыя Беларусі, у якім бы накірунку яна развівалася? І што казалі б нам сёння ветэраны? І ці ведалі б мы тады – па волі Сталіна, якога яны ўхваляюць, саміх ветэранаў?

У апошні час беларускія ветэраны Вялікай Айчыннай вайны паднялі лямант вакол помніка маршалу Жукаву. Ім не церпіцца ўсталяваць яго ў цэнтры Мінска. Але якія адносіны мае Жукаў да Беларусі? Так, ён служыў на нашай тэрыторыі ў якасці камандзіра палка. Ну і што? Такіх камандзіраў праз Беларускую ваенную акругу прайшлі тысячы, можна натыкаць помнікаў на кожным квадратным метры. Жукаў нарадзіўся ў Калужскай вобласці. Калі яго землякам патрэбны такі помнік, няхай яны і ставяць. А мы павінны шанаваць сваіх знатных землякоў, у тым ліку военачальнікаў.

Ні ў Мінску, ні ўвогуле на тэрыторыі Беларусі ўсталёўваць помнік Жукаву не варта. Беларусь была здана немцам за месяц, а сталіца рэспублікі горад Мінск – на шосты дзень вайны. Вызвалялі Беларусь доўгіх 3 гады 1 месяц і 5 дзён. Маршал Жукаў ваяваў не розумам, а колькасцю. Ён заваліў нямецкія траншэі трупамі савецкіх салдат. На аднаго забітага нямецкага салдата прыпадае (па афіцыйных дадзеных) 10 савецкіх. Але гэта

не дакладная, а значна заніжаная лічба. Перад 60-годдзем Дня Перамогі, якое пампезна адсвяткавалі ў Расіі і Беларусі, у адной з тэлеперадач было сказана, што да нашага часу лічацца без вестак зніклымі больш 6 (шасці) мільёнаў салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі! Куды ж яны дзеліся? Яны загінулі, іх проста ніхто не лічыў. Магчыма, гэта быў злосны намер. Сем'ям без вестак зніклых салдат і афіцэраў не плацілі пенсій, пазбаўлялі іх ільгот. Гэта ж астранамічная эканомія для бюджэту краіны...

У мяне няма намеру пакрыўдзіць ветэранаў ВАВ, абразіць іх пачуцці, адносіны да мінулага, для іх гераічнага. Яны мужныя людзі, ім пашчасціла выжыць у той мясарубцы. Здароўя ім, няхай жывуць доўга! Я ўсяго толькі іх заклікаю зірнуць праўдзе ў вочы. Новыя пакаленні нашых людзей маюць права і павінны ведаць усю праўду пра Другую сусветную вайну, якой бы тая праўда горкай ні была. Калі мы нашу моладзь будзем выхоўваць на хлусні, то яна, моладзь, будзе наступаць на тыя ж самыя граблі.

Памятаю, як па расійскім тэлеканале ТБ 23.06.2000 года паказалі дакументальную кінастужку «Перамога. Адна на ўсіх». Сталін арганізаваў паміж Жукавым і Коневым спаборніцтва, хто першым увойдзе ў Берлін. Савецкіх маршалаў у пагоні за славай нішто не магло спыніць. Кожная пядзя зямлі на подступах да Берліна прапітана крывёю савецкіх салдат. На шляху адной з дывізій да Берліна сустрэўся дот, у якім знаходзіўся кулямётны разлік з двух нямецкіх салдат. Гэтую перашкоду можна было абысці з флангаў, каб не трапіць пад кулямётны агонь, і наступаць далей. Разумны камандзір так бы і зрабіў. Але паступіў безагаворачны загад – захапіць дот. Батальёны, палкі па некалькі разоў падымалі ў атаку і кідалі на дот, але нямецкі кулямёт працаваў безадказна. Мясцовасць перад амбразурай была завалена трупамі салдат. Ад гэтага жудаснага відовішча нямецкі кулямётчык звар'яцеў, кулямёт замоўк. Але і ў атаку падымаць ужо не было каго, падраздзяленне амаль усё загінула. Вось такія «таленавітыя» камандзіры былі ў Чырвонай Арміі.

Абвінавачваць у неапраўданых стратах камандзіраў сярэдняга і ніжэйшага звяна несправядліва. Яны не мелі права ўносіць змены ў загады камандзіраў больш высокага рангу. Для прыкладу. Перад фронтам дывізіі была добраўмацаваная вышыня з шматлікімі агнявымі пунктамі. За вышынёй – вёска, у якой размяшчаліся немцы. Немцы не збіраліся здаваць ні вышыню, ні вёску. Батальёны і палкі дывізіі некалькі разоў кідаліся на штурм, хадзілі ў атаку, але безвынікова. Гінулі і салдаты, і камандзіры. І вось на

7 гадзін раніцы наступнага дня быў прызначаны чарговы штурм. Камандзір палка паставіў задачу захапіць вышыню нядаўна прызначанаму на пасаду камандзіру батальёна. Атака – пасля 15-хвіліннай артылерыйскай падрыхтоўкі.

Але камандзір батальёна ўсё вырашыў па-свойму. Пад покрывам ночы батальён непрыкметна падкраўся да вёскі. Часавых ліквідавалі ціха. Потым па сігналу байцы адначасова ўварваліся ў хаты. Сонныя немцы былі знішчаны без адзінага выстралу. Савецкіх байцоў уразіла тое, што немцы, знаходзячыся на перадавой, спалі на чыстай бялізне. Пакончыўшы з немцамі ў вёсцы, батальён з тылу атакаваў вышыню і без асаблівага шуму захапіў яе. Усе агнявыя пункты немцаў былі падаўлены. У 6 гадзін раніцы, за гадзіну да атакі, камандзір батальёна далажыў камандзіру палка аб захопе вышыні і вёскі. Вы думаеце, што камандзір батальёна за праяўленую ініцыятыву атрымаў узнагароду? Як бы не так. Батальёну было загадана пакінуць вышыню і вёску, вярнуцца на зыходныя пазіцыі і чакаць, як было запланавана, сігналу для атакі. Камандзіра батальёна адхілілі ад пасады, пазбавілі афіцэрскага звання і накіравалі ў штрафную роту. Гэта шараговы выпадак, якіх было вельмі многа...

Пасля таго як Германія капітулявала, адбылася сустрэча паміж маршалам Жукавым, фельдмаршалам Мантгомеры (Англія) і генералам арміі Эйзенхаўэрам (ЗША). У размове Эйзенхаўэр запытаўся ў Жукава, як яму так хутка ўдалося захапіць Берлін. Вакол Берліна, на далёкіх і блізкіх подступах да яго суцэльныя мінныя палі, на якіх падарвалася некалькі амерыканскіх салдат. Саюзнікі спынілі наступленне. Вельмі крыўдна гінуць, калі вось-вось закончыцца вайна. Так думалі і шараговыя амерыканскія салдаты, і генералы, і галоўнакамандуючы генерал арміі Эйзенхаўэр, і прэзідэнт ЗША. Але ў нас было ўсё па-іншаму.

Маршал Жукаў адказаў Эйзенхаўэру, што які сэнс жалець салдат, калі ведаеш, што гэта апошні штурм. Жукаў на міннае поле, на верную смерць кінуў мотастралковую дывізію. У жывых ад дывізіі засталіся адзінкі... Так быў пракладзены праход праз міннае поле. Там, дзе прайшла дывізія, на зямлі засталіся ляжаць тысячы забітых і сцякаючых крывёю, параненых салдат і афіцэраў. Параненым, пакалечаным, кантужаным медыцынскай дапамогі ніхто не аказваў, не было часу. У пракладзены мінны праход адразу пайшлі танкі. Яны давялі справу да канца, гусеніцамі перамалолі косці і мёртвых і жывых і змяшалі іх з зямлёй. Магчыма, усе яны

папалі ў спіс без вестак прапаўшых. Для маршала Жукава жыццё салдата, афіцэра, генерала было нішто.

За ўсю Другую сусветную вайну загінула 307 тысяч англійскіх салдат і афіцэраў. Гэта ў тры разы меней, чым іх страты ў Першую сусветную вайну. Страты амерыканскай арміі ў Другой сусветнай вайне склалі 250 тысяч салдат і афіцэраў. Страты савецкай арміі незлічоныя. Па афіцыйных дадзеных спачатку яны склалі 7 мільёнаў чалавек, потым – 8 мільёнаў, зараз абвяшчаецца, што ваенныя страты Чырвонай Арміі склалі каля 10 мільёнаў чалавек. Але і гэта лічба значна заніжана. Толькі ў баях за Берлін загінула каля мільёна савецкіх салдат і афіцэраў. Такі ж самы малюнак назіраўся ў баях за іншыя гарады.

Гледзячы на тыя падзеі з пазіцыі сённяшняга дня, мне не зразумела, для чаго Сталін, Жукаў, Конеў так напіналіся, каб першымі захапіць Берлін. Па-першае, амерыканцы не збіраліся яго браць штурмам, бо яны пазбягалі вялікіх неапраўданых страт. Па-другое, захапіўшы Берлін, савецкае кіраўніцтва ўсё роўна вымушана падзяліла горад на 4 часткі акупацыі паміж саюзнікамі, паднесла ім яго на сподачку.

Некалькі слоў аб тым, як падпісваўся акт аб капітуляцыі Германіі. Ён быў падпісаны 7 мая 1945 года. З амерыканскага боку акт падпісаў генерал Сміт, з боку СССР – генерал Суслапараў, з боку паверженай Германіі – генерал Йодль. Акт уступіў у сілу ў ноч з 7 на 8 мая. 8 мая радаваўся ўвесь свет. Звесткі дайшлі да Крамля. Там абурыліся. Хто пасмеў свавольнічаць?! Амерыканцы, каб уцешыць Жукава, каб не дражніць звера, не сталі пярэчыць супраць яшчэ аднаго падпісання акта аб капітуляцыі Германіі. З боку СССР падпісаў надменны маршал Жукаў, з боку Германіі – фельдмаршал Кейтэль. Але гэта падзея ўжо не іграла ніякай ролі, ніхто ў свеце, акрамя СССР, яе не заўважыў.

Трэба адзначыць, што Сталін не выказаў асаблівай радасці, што ў вайне з Германіяй пастаўлена апошняя кропка. Ён быў не супраць паваяваць яшчэ, бо вайна з самага пачатку ішла не па яго сцэнарыі. Ён збіраўся першым знянацку, без аб'яўлення вайны напасці на Германію і за кароткі тэрмін дайсці да Берліна. Жукаў і Цімашэнка падрыхтавалі план вядзення вайны. СССР меў шматкратную перавагу над Германіяй у жывой сіле і ва ўзбраенні. Але атрымалася ўсё наадварот. «Лепшы сябра» Сталіна папярэдзіў падзеі, напаў першым і вельмі хутка дайшоў да Масквы.

Пасля параду перамогі, які адбыўся ў Маскве ў дажджлівы дзень 24 чэрвеня 1945 года, пра Дзень Перамогі не ўспаміналі

20 гадоў – да 9 мая 1965 года. З гэтага моманту галоўнай дзеючай асобай у Вялікай Айчыннай вайне стаў чарговы генсек ЦК КПСС Леанід Брэжнеў. На яго грудзях з маўклівай згоды сённяшніх ветэранаў пачапілі ордэн Перамогі. Цяпер ужо самай галоўнай вайсковай аперацыяй стаў не штурм Берліна, а высадка дэсанта на бераг Цэмескай бухты каля Новарасійска і захоп там невялікага плацдарма плошчай у 30 кв. км. Плацдарм некалькі разоў наведаў начальнік палітаддзела 18-й арміі палкоўнік Брэжнеў. Як пачалі пісаць гісторыкі, менавіта тая аперацыя была лёсавызначальнай для далейшага ходу вайны!

Як з цягам часу ўсё мяняецца! Бо зараз нам даводзяць, што паваротным пунктам у ходзе вайны была бітва на «Лініі Сталіна» пад горадам Заслаўем на подступах да Мінска, бітва – якой не было.

Які эпізод вайны ні возьмеш – усюды хлусня. Возьмем, прыкладам, блакаду Ленінграда. Не для людской памяці, а па ідэалагічных меркаваннях, для турыстаў, як нейкую выставу, пабудавалі Піскароўскія могілкі. А на тым месцы, дзе праводзіліся самыя масавыя пахаванні, пасля вайны заклалі парк Перамогі. Кроны дрэў у ім разрасліся, трава на газонах сакавітая, квітнеюць клумбы – зямля ўгноена... Нашчадкі памерлых і выжыўшых прагульваюцца па алеях парка і, магчыма, не падазраюць, што пад іх нагамі сотні тысяч людскіх парэшткаў. Улада рабіла і працягвае рабіць усё, каб сцерці вялікія страты з памяці. У Ленінградзе ёсць яшчэ адно змрочнапамятнае месца – цагельны завод. У часы блакады ён працаваў як крэматорый. Спачатку ў пячах завода штодзённа спальвалі па 800 цел. Потым, па загадзе першага сакратара Ленінградскага абкама КПСС Жданава, норму спальвання давялі да 1500 трупаў за суткі. Попел з печаў вывозілі ваганеткамі і выгружалі ў катлаван, з якога да блакады здабывалі гліну. Катлаван, ці кар'ер, меў вельмі ўнушальныя памеры. Пасля вайны яго запоўнілі вадой, уладкавалі бераг, пабудавалі пляжы, зоны адпачынку – атрымалася прыгожае возера. Зараз там адпачываюць, купаюцца, загараюць, п'юць піва пецярбуржцы. Няўжо ім невядома, што дно гэтага возера пакрыта тоўстым слоем святога попелу? На тым месцы, дзе стаяў цагельны завод, пабудавана станцыя метро «Парк Перамогі». Уваход у метро знаходзіцца якраз там, дзе стаялі печы.

Якая колькасць людзей загінула ў блакадным Ленінградзе, дакладна невядома. Да вайны ў горадзе прыжывала 3 мільёны чалавек. На момант ліквідацыі блакады засталося ўсяго 500 тысяч.

Эвакуіравана людзей з Ленінграда было не надта многа. Гэта быў у асноўным персанал навукова-даследчых устаноў. У Ленінград рынулі бежанцы. Па розных ацэнках, іх колькасць складала ад 2 да 3 мільёнаў чалавек. Яны і сталі паміраць першымі. Бо былі без дакументаў, без месца працы, ім не выдаваліся картачкі на атрыманне пайкоў. Блакаду можна было зняць на год раней.

Чаму я так падрабязна пішу пра блакадны Ленінград? Таму што ў гэтым пекле памёр мой родны брат Сяргей. Дзе яго магіла – невядома. Крэмль не спяшаўся з дапамогай блакаднаму Ленінграду.

Разам з «рукой дапамогі» СССР вырашаў свае далёка ідучыя планы. А калі здаралася, што насамрэч акупаваным народам была патрэбна хуткая дапамога і яны яе прасілі, СССР не спяшаўся яе аказаць. Так здарылася з Варшаўскім паўстаннем. Камандаванне Чырвонай Арміі, якая была ўжо побач з Варшавай, раўнадушна назірала ў бінoклі, як немцы распраўляліся з паўстанцамі.

Як вызвалялася сталіца Чэхаславакіі Прага – гэта цэлая захапляльная гісторыя, у якой замешана Руская вызваленчая армія (РВА) генерала Уласава.

13 сакавіка 1945 года 1-ю рускую дывізію гэтай арміі пад камандаваннем генерал-маёра Сяргея Бунячэнкі нямецкае камандаванне перакінула да Берліна, дзе ішлі крывапралітныя баі. Але генерал Бунячэнка адмовіўся выконваць загады нямецкага камандавання, аб чым 13 красавіка аб'явіў усяму асабоваму складу сваёй дывізіі. Прывітанне «Хайль Гітлер» было заменена на звычайнае прыкладанне рукі да галаўнога ўбору. Дывізію, а разам з Уласавым і ўсю армію, генерал Бунячэнка павёў на поўдзень. 2 мая дывізія спынілася на прывал у 50 км ад Прагі. У той жа дзень у штаб дывізіі прыбыла чэшская дэлегацыя і праінфармавала Уласава і Бунячэнку, што ў Празе рыхтуецца паўстанне супраць нямецкіх акупантаў, прасілі дапамогі. Паміж Уласавым і Бунячэнкам па гэтым пытанні спачатку паразумення не было. 3 мая 1945 года дывізія займалася раззбраеннем нямецкіх гарнізонаў. Немцы ўласаўцам супраціву не аказвалі. Нямецкія салдаты і унтэрафіцэры адразу былі адпушчаны, а афіцэраў адпусцілі на наступны дзень. 4 мая амерыканская армія па прыказу генерала Эйзенхаўэра пачала наступленне ў Чэхаславакіі. Да Прагі было не надта далёка.

Спадзеючыся на амерыканцаў, у 11 гадзін 5 мая пачалося Пражскае паўстанне. Немцы пачалі жорстка яго падаўляць. Да Прагі пачалі рухацца эсэсаўскія часці. Паўстанне сцякала кры-

вёй. ЧНС – Чэшскі нацыянальны савет зноў звярнуўся за дапамогай да Уласава. Амерыканцы гатовы былі аказаць дапамогу, але савецкае камандаванне забараніла ім гэта рабіць. Ялцінскімі пагадненнямі была вызначана мяжа, на якой саюзнікі павінны былі спыніцца. Чырвоная Армія была далёка і дапамагаць паўстанцам яна, як звычайна, не збіралася. На гэты раз генералы Уласаў і Бунячэнка прыйшлі да высновы, што паўстанцам трэба тэрмінова аказаць дапамогу. Армія рушыла на Прагу. 5 мая рыдыё паўстанцаў перадала: «Абаронцы Прагі! Мужна трымайцеся, напружце апошнія сілы! Нам на дапамогу рухаецца армія генерала Уласава!» Напрыканцы дня армія ўвайшла ў Прагу. За 6 і 7 мая армія ачысціла Прагу ад немцаў, спыніла моцныя часці эсэсаўцаў, якія наступалі на Прагу. Прага была вызвалена. Уласаўцаў радасна сустракала насельніцтва. На танках уласаўцаў было напісана: «Смерць Сталіну, смерць Гітлеру».

Але большасць у ЧНС складалі прамаскоўскія камуністы. Яны былі напалоханы тым, што супрацоўніцтва з уласаўцамі скампраметуе іх перад СССР. 7 мая яны прынялі рэзалюцыю, каб уласаўцы пакінулі горад. Вось так функцыянеры ЧНС аддзякавалі ўласаўцам за вызваленне сталіцы ад немцаў. Раніцай 8 мая дывізія ў апошні раз прайшла па вуліцах Прагі, пакідаючы яе. Людзі плакалі, прасілі ўласаўцаў не пакідаць горад. Прагу зноў адразу занялі фашысты. ЧНС ім не перашкаджаў, хаця насельніцтва, дзякуючы Уласаву, было ўжо добра ўзброена. Чэхі вызвалілі палонных немцаў, якіх у палон захапілі ўласаўцы. Па дамоўленасці з ЧНС, немцы папоўнілі свае запасы зброі, харчавання і ў гэты дзень, 8 мая, пакінулі горад. 9 мая 1945 года ў свабодную Прагу ўвайшла Чырвоная Армія. Савецкае камандаванне было абурана тым, што чэхі далі магчымасць пакінуць горад спачатку ўласаўцам, а потым немцам. Савецкія военачальнікі прывыклі браць гарады, заваліўшы іх трупамі сваіх салдат і мірнага насельніцтва, пакінуўшы пасля сябе руіны. Вінаватых знайшлі хутка. Былі арыштаваны кіраўнікі паўстання і ЧНС. У поўным складзе – каго расстралялі, каго адправілі ў ГУЛАГ. А многія нашы ветэраны і зараз носяць медаль «За взятие Праги».

Уласаўцы шукалі паратунку ў амерыканцаў, але тыя не прапусцілі іх у сваю зону. Дзень 17 мая стаў апошнім днём арміі Уласава. Амерыканцы далі магчымасць савецкім часцям акружыць яе. Пачалася крывавая расправа. Чэхі-сведкі расказвалі і пісалі ў сваіх успамінах, што расправа над уласаўцамі – самае жахлівае, самае жудаснае, што ім давялося бачыць за гады Другой

сусветнай вайны. Генерала Уласава і Бунячэнку адвезлі ў Маскву, дзе вынеслі смяротны прысуд.

У савецкай зоне акупацыі Германіі фашысцкія канцлагеры працягвалі дзейнічаць. Ва ўласнасць НКУС ад гестапа перайшло 11 канцлагераў. Аднак гэтага было недастаткова, адчыніліся новыя. Нават працягвалі дзейнічаць канцлеры з такімі злавеснымі назвамі, як Бухенвальд і Заксенхаўзен, іх зачынілі самымі апошнімі ў 1950 годзе. Вязні заставаліся там тыя ж самыя, што і пры Гітлеры – антыфашысты.

Да 1945 года яны сядзелі ў нацысцкім Бухенвальдзе, а пасля 1945 года – у савецкім Бухенвальдзе. Вонкавую ахову неслі савецкія салдаты, унутраная ахова складалася з шараговых эсэсаўцаў, начальнікамі аховы былі афіцэры СС. Савецкі рэжым ведаў, на каго цалкам можна абаперціся. Савецкім вязнем канцлагера Фюнфайхен быў Эвальд Пік, родны брат будучага прэзідэнта ГДР Вільгельма Піка. Пасля перамогі па ўсёй Германіі ішлі арышты. Асаблівае паляванне пачалося на падлеткаў. Тысячы нямецкіх падлеткаў ад 12 да 18 гадоў былі кінуты ў канцлагеры. Арыштоўвалі цалкам школьныя класы. Допыт арыштанта працягваўся 1–2 хвіліны. Для прыкладу, следчы задае арыштанту пытанне: «Газеты чытаеш, радыё слухаеш?» «Ja, ja», – адказвае напалоханы арыштант. Следчы запісвае ў пратакол: «Арыштаваны сцвярджае, што займаўся нацысцкай прапагандай».

Яшчэ прыклад. Следчы пытаецца ў чарговай ахвяры, на якой пасадзе той працуе. «Эсбанфюрэр», – чуецца адказ. А пра «фюрэр» – дарога ў канцлагер. Следчы не стаў удакладняць, што эсбанфюрэр – гэта ўсяго толькі кіроўца трамвая.

Больш падрабязна пра гэта можна прачытаць у «Московских новостях» за 06.06.1993 года.

У нямецкае рабства было прымусова вывезена каля 380 тысяч беларусаў. Нямецкі бок ужо ў наш час прызнаў сваю віну і нават усім пацярпелым выплаціў кампенсацыю. Хацелася б даведацца, колькі тысяч ці мільёнаў немцаў было вывезена на працу ў СССР пасля акупацыі Германіі? Можа, хтосьці скажа, што такога не было і быць не магло? Было. За 1945–1946 гады на працу ў СССР было прымусова вывезена каля мільёна нямецкіх жанчын. Колькі іх выжыла ў савецкіх умовах і вярнулася ў Германію? Колькі было вывезена мужчынскага насельніцтва? Гэта і сёння таямніца.

Хачу закрануць яшчэ адно пытанне. За ўсю вайну ў маёй і ў навакольных вёсках немцы не згвалцілі ніводнай жанчыны. Пасля капітуляцыі Германіі маршал Жукаў дазволіў войску на некалькі

дзён разгул. Для немцаў гэта былі самыя жахлівыя, самыя цяжкія дні за ўсю вайну. Савецкія салдаты і афіцэры азвярэлі, забівалі мужчын і падлеткаў, гвалцілі жанчын і непаўналетніх дзяўчынак. Бязмежжа савецкіх салдат і афіцэраў набыло велізарны размах. Колькі адбылося згвалтаванняў, невядома, можна толькі здагадвацца. У другой палове 1945 года нямецкія жанчыны з Усходняй Германіі зрабілі больш за 800 тысяч абортаў. Яны не жадалі нараджаць дзяцей, зачатых гвалтоўна.

Паверце, я не імкнуся ў сваіх нататках паказаць савецкую армію ў цёмных фарбах. Я толькі хачу параўнаць паміж сабой тых і другіх. Калі ты асуджаеш злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў, то, ступіўшы на іх зямлю, пакажы сябе з лепшага боку, пакажы свій хвалёны гуманізм, з павагай стаўся да жанчын. Яны ж ні ў чым не вінаватыя, з павагай стаўся да культуры краіны, якую вызваліў ад фашызму. Інакш які ж ты вызваліцель? Ты такі ж самы вандал, цемрашал, захопнік, садыст, кат. Папытайце нашых ветэранаў, хто з іх гвалціў? Ніводны не прызнаецца, сорамна перад дзецьмі і ўнукамі.

Між тым, тыя 800 тысяч абортаў можна лічыць як афіцыйна зафіксаваную колькасць нямецкіх жанчын, згвалтаваных савецкімі ваякамі. Але гэта лічба недакладная. Тысячы немак не вытрымалі здзекаў, сораму, абразы, гвалту і скончылі жыццё самагубствам. Іншыя былі забітыя. Некаторыя, зразумела, не зацяжарылі. Можна меркаваць, што было згвалтавана больш за мільён нямецкіх жанчын. Былі выпадкі калектыўнага гвалтавання нямецкіх жанчын узводам, ротай. Каб спыніць урэшце гэта дзікунства, маршал Ракасоўскі аддаў загад гвалтаўнікоў, рабаўнікоў расстрэльваць перад строем вайсковых часцей. Пра ўсё гэта падрабязна і не аднойчы было расказана ў тэлеперадачах «Вайна стагоддзя», «Другая сусветная ў колеры», «Асвенцым», «Сталінград» і іншых на тэлеканале «History».

У нямецкім палоне былі англійскія, амерыканскія, французскія, канадскія, аўстралійскія і іншых краін ваеннаслужачыя. Кіраўніцтва гэтых краін дбала пра сваіх людзей, якія апынуліся ў бядзе. Усе дзяржавы, акрамя СССР, выконвалі Жэнеўскае пагадненне аб утрыманні ваеннапалонных. Ваеннапалонныя гэтых краін па лініі Чырвонага Крыжа рэгулярна атрымлівалі пасылкі, у якіх быў набор: сыр, каўбаса, тушонка мясная і ласасёвая, згушчанка, шакалад, кава, канцэнтрат сокаў і іншая дробязь. Што цікава, немцы не перашкаджалі супрацоўнікам Міжнароднага

Чырвонага крыжа пастаўляць пасылкі ваеннапалонным. Палонным афіцэрам дазвалялася насіць воінскія знакі адрознення.

А як адчувалі сябе нямецкія салдаты і афіцэры ў савецкім палоне? Цэласнага матэрыялу я не знайшоў. Трапляліся нейкія абрывачныя звесткі. Я не змог даведацца, колькі нямецкіх салдат і афіцэраў было агулам у савецкім палоне. Пад Сталінградам трапіла ў савецкі палон, па звестках розных крыніц, ад 90 тысяч да 115 тысяч. З гэтай колькасці выжыла і вярнулася ў Германію ўсяго толькі 5 тысяч, ці ўсяго толькі ад 4,3% да 5,5%. У нямецкім жа палоне выжыла 63% савецкіх салдат. Няцяжка падлічыць, што смяротнасць у савецкіх канцлагерах была ў 12 разоў вышэй, чым у нямецкіх.

Па вуліцах Масквы правялі калону ваеннапалонных немцаў. «Заваёўнікі» прайшлі па Маскве спакойна, падтрымліваючы строй. Не ведаю, чаго гэтым улада хацела дабіцца. Магчыма, разлічвала, што людзі будуць услых выказваць праклянцці, абразы ў бок палонных немцаў, пляваць, кідаць камяні. Людзі глядзелі на гэтую шэрую масу палонных моўчкі і нават са спачуваннем. Некаторыя падбягалі да калоны, перадавалі клункі з ежай. І такіх людзей было шмат. Немцы бралі тыя перадачы з рук масквічоў спакойна.

Я адмоўна стаўлюся да гэтай акцыі савецкага кіраўніцтва – прагнаць палонных немцаў па вуліцах Масквы. Каб учыніць здзек з бездапаможных палонных, шмат розуму не трэба. Са сваіх грамадзян савецкая ўлада здзекавалася яшчэ больш бязлітасна. Гэта лішні раз даказвае, што савецкі і фашысцкі рэжымы падобныя адзін да аднаго, як блізняты-браты.

⁂

Я абяцаў яшчэ раз вярнуцца да падзей савецка-фінскай вайны. Тэму пра савецка-фінскую вайну савецкая ўлада трымала за сямю пячацямі. Толькі ў часы гарбачоўскай перабудовы, і асабліва пасля распаду СССР, усё выйшла наверх.

Вайна пачалася 30 лістапада 1939 года, скончылася 12 сакавіка 1940 года. Падрабязна пра савецка-фінскую вайну расказала газета «Комсомольская правда» за 12 і 14.11.1989 год. Падчас гэтай вайны, з даклада Молатава, загінула 49 тысяч савецкіх салдат, ранена 159 тысяч («Известия»за 02.06.1992 года). З «Народнай газеты» за 11–13.03.1995 года можна даведацца, што за 105 дней фінскай кампаніі Чырвоная Армія страціла 74 тысячы забітымі, 17 тысяч зніклымі без вестак, 198 510 чалавек параненымі

і абмарожанымі. Па ацэнках заходніх гісторыкаў, страты СССР у той вайне – 217 тысяч забітымі, 17 тысяч зніклымі без вестак. «Комсомольская правда» за 14.11.1989 года прывяла такія даныя: страты Чырвонай Арміі забітымі складаюць 272 тысячы чалавек. Сталін на нарадзе каманднага складу сказаў: «Наша няўменне ваяваць абышлося нам у гэтай вайне ў 500 тысяч чалавек». Калі Сталін назваў такую лічбу, то трэба меркаваць, што сапраўдныя страты Чырвонай Армі ў 105-дзённай савецка-фінскай вайне былі значна большыя.

Памятаю, 3 ліпеня 1984 года я са сваёй жонкай Нінай гуляў у парку імя Горкага. Горад Мінск быў у святочным убранні. Мы сядзелі на лаве, слухалі музыку, елі марожанае. Да нас, на свабоднае месца, падсеў мужчына. Было бачна, што ў яго ёсць жаданне паразмаўляць, выказацца. Ён сказаў, што 3 ліпеня 1944 года ніякага вызвалення горада не адбывалася. З 30 чэрвеня на 1 ліпеня немцы скрытна, без адзінага выстрала пакінулі горад. Толькі раніцай, калі людзі ішлі на працу, высветлілася, што на вуліцах няма нямецкай тэхнікі, няма немцаў, іх установы апусцелі. 1 і 2 ліпеня горад жыў свабодна, не было ні нямецкай, ні савецкай улады.

«А дзе ж былі падпольшчыкі? Яны ж у склаўшыхся абставінах павінны былі выйсці з падполля, адкрыцца перад людзьмі і распачаць арганізацыю жыццядзейнасці ў горадзе?» – падумаў я, але прамаўчаў. «Ніякага падполля ў Мінску не было», – сказаў ён, быццам бы прачытаўшы маё маўклівае пытанне. Далей з яго слоў мы даведаліся, што мінчане радаваліся вызваленню заўчасна. 3 ліпеня на горад наляцела савецкая авіяцыя і ўшчэнт разбамбіла яго. Бамбілі жылыя кварталы, загінула шмат людзей. Усё гэта ён бачыў на свае вочы, перажыў сам. Мы слухалі, але ў размову з ім не ўступалі – раптам гэта нейкая правакацыя? У той час я быў савецкім чалавекм і праз нейкі час пра гутарку забыўся. У галаве былі іншыя турботы. Пасля працы трэба было матацца па горадзе, каб атаварыць харчовыя і прамтаварныя талоны. Такой была савецкая рэчаіснасць.

Наступіў 1994 год – чарговая круглая дата з дня вызвалення Мінска. Мінск святкаваў. А на расійскіх тэлеканалах у гэты самы час успаміналі пра вайсковую аперацыю «Баграціён». У адной з тэлеперадач выказаў свае ўспаміны расійскі ветэран-лётчык. Ён расказаў, што да вайны служыў пад Мінскам, а жыў з сям'ёй у самім горадзе. Калі пачалася вайна, сям'я не змагла эвакуіравацца і засталася ў Мінску.

Калі пачалося вызваленне горада ў 1944 годзе, авіяполк, у якім ён служыў, быў нацэлены на Мінск. Пра лёс сваёй сям'і ён нічога не ведаў. 1 ліпеня авіяразведка данесла, што ў Мінску праціўнік не заўважаны, немцы змаглі пакінуць горад непрыкметна. Высокае начальства абуралася, што немцы змаглі ўлізнуць з-пад самага носа. Шараговыя лётчыкі радаваліся, што горад не трэба будзе бамбіць, будзе менш разбурэнняў. Штаб пачаў распрацоўку плана бамбёжкі другіх беларускіх гарадоў, якія знаходзяцца далей на захадзе, – Баранавіч, Гродна, Брэста і іншых. І тут нечакана раніцай 3 ліпеня полк атрымаў загад бамбіць Мінск, прычым бамбіць жылыя кварталы, адміністрацыйныя будынкі – не чапаць. Шараговыя лётчыкі не разумелі, для чаго бамбіць горад, які немцы пакінулі двое сутак таму. Сухапутныя арміі нават не сталі заходзіць у сталіцу Беларусі, а хутчэй кінуліся на захад даганяць праціўніка. Абмяркоўваць загад, пярэчыць начальству было небяспечна. Гэты лётчык бачыў са свайго самалёта дом, у якім засталася яго сям'я. І на гэты дом ён скідваў бомбы.

Што было далей – не вядаю. На жаль, тэлевядучы аддаў мікрафон другому ветэрану. І тут я ўспомніў таго незнаёмага з парку Горкага, з якім давялося сустрэцца ў 1984 годзе. Два ўдзельнікі вайны расказалі адно і тое ж у розны час. Прычым яны грамадзяне розных краін, не ведаюць адзін аднаго.

Мая стрыечная сястра Ніна Капылова ўвесь час акупацыі пражыла ў Мінску. Пры сустрэчах я пакрыху выцягваў з яе звесткі пра тое, як яна перажыла акупацыю. Мая цікаўнасць да 3 ліпеня 1944 года ў Мінску распалілася.

Калі пачалася вайна, Ніне споўнілася 23 гады. Яна была прывабная прыгожая дзяўчына. Таму я запытаўся, як паводзілі сябе немцы, як ставіліся да маладых жанчын. Яна адказала, што не чула, каб немцы прыставалі да жанчын ці кагосьці згвалцілі. Мінск быў не надта вялікім горадам, і калі нешта здаралася, на наступны дзень усе пра тое ведалі. На паштовае аддзяленне, дзе яна працавала, штодзённа наведваліся дзесяткі немцаў. Яны адсылалі паштоўкі, пісьмы, бандэролі, пасылкі. Ніна сказала, што наслухалася іх «Darf ich herein», «Guten Tag», «Bitte», «Danke schön», «Auf wiedersehen». Але мяне больш за ўсё цікавіў дзень 3 ліпеня 1944 года. Я сказаў, што гэты дзень, напэўна, быў самы радасны. Яна адказала, што, наадварот, гэта быў самы жахлівы дзень. Савецкая авіяцыя разбамбіла горад.

Удалося знайсці яшчэ адно падцверджанне, што савецкая авіяцыя бамбіла Мінск пасля таго, як немцы яго ўжо пакінулі. Аб гэтым можна прачытаць у кнізе Васіля Якавенкі «Прывіды Шанхая над Свіслаччу». Гэта кніга не мастацкі твор, яна складаецца з эсэ, з гутарак аўтара з канкрэтнымі людзьмі. Вось што сказаў Уладзімір Папруга, былы Галоўны дзяржаўны інспектар Мінгарвыканкама па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, архітэктар (старонка 59):

> «...Афіцыйная версія сарамліва даводзіць, што падчас Другой сусветнай вайны гістарычны цэнтр быў цалкам знішчаны. Спецыялісты ведаюць, што гэта няпраўда. У Мінску за ўсю вайну не адбылося ніводнага вулічнага бою. Разбурэнні тут былі не большыя за разбурэнні іншых еўрапейскіх гарадоў... Дадам адно, што Мінск бамбавала наша авіяцыя пасля таго, як немцы ўжо пакінулі горад. Такая недарэчнасць».

Як бачыце, той факт, што Мінск бамбавала савецкая авіяцыя, калі немцы ўжо пакінулі горад, агучыў чыноўнік. Чыноўніку можна верыць. Гэта ж не выпадковы суразмоўца, а супрацоўнік Мінгарвыканкама, хоць і былы. У яго быў доступ к архіўным дакументам.

Ці дачакаемся мы праўды? Яшчэ ў 1967 годзе рэдактар «Военно-исторического журнала», доктар гістарычных навук Мікалай Паўленка ў размове з начальнікам Галоўнага палітупраўлення СА і ВМФ Епішавым падняў пытанне аб праўдзе ў гістарычнай навуцы. На што Епішаў адказаў: «Кому нужна ваша правда, если она мешает нам жить» *(часопіс «Огонёк», 1989, № 25).*

Як бачыце, усё вельмі проста: праўда... праўда аб вайне, праўда аб партызанскім руху замінае жыць тым, хто трымае ў сваіх руках уладу і манапольна карыстаецца дабротамі жыцця.

Так, Германія вінавата. Але чаму працягваецца маўчанне пра вінаватасць СССР? Мы адзіная рэспубліка, зараз незалежная краіна, якая ў выніку Другой сусветнай вайны страціла значную частку сваёй тэрыторыі. Як мы ведаем, вайна пачалася 1 верасня 1939 года. Германія ў саюзе з СССР напала на Польшчу. Ускосна гэта быў напад і на Беларусь, паколькі значная частка беларускіх земляў знаходзілася па віне бальшавіцкай Расіі ў складзе Польшчы. Шмат беларусаў служыла ў польскім войску. 10 кастрычніка 1939 года СССР нанёс новы удар па Беларусі. Па распараджэнні Сталіна Літве былі перададзены старажытная сталіца Беларусі

Вільня і Віленскі край. У адпаведнасці з тым жа распараджэннем да Літвы адышлі Свянцянскі раён і часткі тэрыторый Відзаўскага, Астравецкага, Ашмянскага, Пастаўскага, Свірскага і Радунскага раёнаў. Беларусь у адначассе згубіла 2750 кв. км сваёй тэрыторыі з насельніцтвам 457 500 чалавек.

З прамоў на высокім узроўні часта можна пачуць, што Беларусь атрымала сваю дзяржаўнасць з утварэннем БССР. Але якая ж гэта дзяржаўнасць, калі, не пытаючыся ў гэтай дзяржавы, не пытаючыся ў яе вышэйшага органа ўлады – Вярхоўнага Савета БССР, яе тэрыторыі звычайным распараджэннем дыктатара былі перарадзены іншай краіне? Гэта была самая звычайная вайна СССР супраць Беларусі. Пасля таго як і сама Літва апынулася пад савецкай акупацыяй, 25 жніўня 1940 года па распараджэнні з Крамля Вільня стала сталіцай Літоўскай ССР. Крэмль даў нам зразумець, што з Вільняй і Віленскім краем мы развіталіся назаўсёды. Бязлітасная вайна СССР супраць Беларусі на гэтым не спынілася. Настаў 1944 год. Да канца ліпеня Беларусь поўнасцю была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Трэба было б радавацца. Але 20 верасня 1944 года Сталін нанёс яшчэ адзін удар па Беларусі. Ён перадаў у склад Польшчы Беластоцкую вобласць і 3 раёны Брэсцкай вобласці. Дык якія ж мы пераможцы? Ці ёсць тут чым ганарыцца? СССР разграміў Беларусь больш адчувальна, чым Германію.

## 7. Рэха вайны (30 год пасля...)

### *Знарок не прыдумаеш*

У савецкія часы дзень 22 чэрвеня 1941 года стараліся не ўзгадваць, надта непрыемныя ўспаміны савецкаму рэжыму навявала гэтая дата. 22 чэрвеня 1971 года ніхто ні па радыё, ні па тэлебачанні, ні ў газетах не напомніў, што гэта за дзень.

Я ў той час служыў у ракетных войсках стратэгічнага прызначэння (РВСП), меў званне капітана. Раніцай звычайна ракетны полк строілі для разводу на заняткі. Але ў гэты дзень было па-іншаму. Адрозненне было ў тым, што на пляц вывелі аркестр. Такое адбывалася толькі ў дні дзяржаўных свят. А гэта ж быў звычайны дзень, сярэдзіна тыдня. Пастраеннем палка займаўся начальнік штаба, прозвішча яго ўжо не памятаю. Бачым: да пляцу набліжаецца камандзір палка палкоўнік Палуэктаў. У двух кроках

за ім, крыху лявей, ідзе нампаліт маёр Ігін. Начальнік штаба падаў адпаведныя каманды і пад аркестр пайшоў насустрач. Камандзір выслухаў даклад, выйшаў на сярэдзіну перад строем і гучна прамовіў: «Здравствуйте, товарищи!» Мы, як гэтага патрабаваў статут, дружна адказалі на прывітанне. Далей камандзір палка прамовіў: «Віншую вас са святам – 30-й гадавінай нападу гітлераўцаў Германіі на Савецкі Саюз!» Мы спачатку разгубіліся ад нечаканага віншавання, але потым дружна адказалі трохкратным «Ура!».

Сэнс віншавання, нарэшце, дайшоў да нампаліта. Ён ухапіўся за рукаў кіцеля камандзіра і ўзрушана кажа: «Таварыш палкоўнік, апамятайцеся. З чым гэта вы віншуеце?» Нам усё гэта чуваць. Камандзір абурана адкінуў руку маёра Ігіна і ўзвышана дадаў: «Так, так, я не абмовіўся. Калі б Германія не напала на Савецкі Саюз, мы б яе не перамаглі і ў нас не было б свята – Дня Перамогі». Потым мы ў гонар дня нападу Германіі на Савецкі Саюз пад аркестр прайшлі ўрачыстым маршам. Гэты анекдатычны выпадак, відавочцам і ўдзельнікам якога я быў, з вуснаў у вусны распаўсюдзіўся па ўсёй дывізіі і выйшаў за яе межы. Калі мы збіраліся ў курыльні або за сталом, хто-небудзь успамінаў: «А памятаеце, як палкоўнік Палуэктаў?..» – і пачынаўся рогат.

З маёрам Ігіным я жыў па суседстве на адной лесвічнай пляцоўцы. Аднойчы я запытаўся ў яго, ці быў працяг таго віншавання? Ён адказаў, што непрыемнасці былі, справай займаліся і палітаддзел, і асобы аддзел. Хутка маёр Ігін атрымаў чын падпалкоўніка. Палкоўніка Палуэктава перавялі ў Маскву, ён стаў генералам.

### *30-годдзе з Дня Перамогі*

Мае прыгоды, звязаныя з вайной, працягваліся. Напярэдадні 30-годдзя Дня Перамогі палітработнікі прыдумлялі шэраг мерапрыемстваў на ваенна-патрыятычную тэматыку. Нампаліт вайсковай часці, у якой я нёс службу, даведаўся, што ў часы вайны я жыў у акупацыі. Ён запытаўся ў мяне, ці сустракаўся я з немцамі, што я ведаю пра партызанскі рух. Я адказаў, што шмат ведаю і пра тых, і пра тых. Нампаліт запланаваў маё выступленне на гэтую тэму перад салдатамі. У межах адведзенага мне часу я расказаў сваю праўду пра вайну, пра немцаў, пра жыццё ва ўмовах акупацыі. Змест майго выступлення хтосьці данёс нампаліту, і ён запрасіў

мяне ў свой кабінет. Трэба сказаць, што нампаліт быў прыстойны чалавек, і ён тактычна, нават па-бацькоўску, параіў мне быць больш асцярожным у сваіх выказваннях, праўда ў некаторых выпадках можа нанесці шкоду. Гэта быў 1975 год.

Да 30-годдзя з Дня Перамогі высокім камандаваннем было загадана ў кожнай казарме зрабіць стэнд, на якім адлюстраваць удзел у Вялікай Айчыннай вайне бацькоў тых салдат, якія праходзяць службу ў гэтай казарме. З гэтай прапановай я звярнуўся да салдат, і шмат хто з іх адклікнуўся на маю просьбу. Малодшы сяржант Жальскіх сказаў, што яго бацька змагаўся супраць немцаў у шэрагах французскага Супраціўлення і ў яго ёсць фатаграфіі. Каб сэканоміць час, я здолеў арганізаваць яму тэлефонную размову з бацькам. Хутка малодшы сяржант Жальскіх атрымаў з дому пакет. Фатаграфіі былі не любіцельскія, а прафесійныя, і, што самае галоўнае, яны былі каляровыя. На здымку быў вельмі статны мужчына, апрануты ў французскую ваенную форму, на грудзях красаваліся французскія ўзнагароды – ордэны і медалі. Мой стэнд атрымаўся на славу. На стэндзе былі планшэты з фотаздымкамі сваякоў іншых салдат. Перад святам Перамогі камандаванне правяло агляд казарм.

Мой стэнд быў прызнаны лепшым, і я нават атрымаў падзяку. Пасля свята да мяне ў казарму наведаўся прадстаўнік асобага аддзела маёр Фёдараў. Да мяне ён прыехаў упершыню, што мяне здзівіла і насцярожыла. Ад штаба нашай вайсковай часці ды майго падраздзялення было 43 кіламетры. Мы прывіталіся. Фёдараў прайшоўся па казарме і прыпыніўся каля стэнда, прысвечанага Дню Перамогі, паглядзеў фотаздымкі, прачытаў тэкст, сказаў, што зроблена добра, і развітаўся са мной. Праз 3–4 дні ў маё падраздзяленне нечакана заявілася камісія ў складзе двух падпалкоўнікаў, якіх суправаджалі сакратар парткама маёр Дзмітрый Пахучы і той жа «асабняк» маёр Фёдараў. Як потым высветлілася, маёр Фёдараў зрабіў запыт у архівы КДБ, каб адшукаць «справу» на грамадзяніна Жальскіх. Звесткі з архіва паступілі ў асобы аддзел дывізіі. А звесткі былі наступныя: чырвонаармеец Жальскіх трапіў у нямецкі палон. Калі з'явілася магчымасць, ён уступіў у Рускую вызваленчую армію, якую фарміраваў генерал Уласаў. Асабіста я «справу» Жальскіх не чытаў, таму ўсіх падрабязнасцяў не ведаю. Пра ўсё гэта я кажу са слоў маёра Пахучага.

Праз нейкі час Жальскіх уцёк з арміі Уласава і ўступіў у французскае Супраціўленне. Французы яго прынялі прыязна. У шэ-

рагах французскага Супраціўлення ён праявіў сябе як мужны, храбры, знаходлівы воін, што бачна па яго шматлікіх узнагародах, якія ён атрымаў ад Францыі. У 1946 годзе ён добраахвотна вярнуўся на радзіму ў СССР. Радзіма з ім абышлася крута, прамым ходам накіравала ў ГУЛАГ, дзе ён правёў доўгіх 8 гадоў. Яго вызвалілі ў 1954 годзе. Вось такі лёс напаткаў бацьку малодшага сяржанта Жальскіх.

Таму камісія і прыбыла ў маё падраздзяленне. Асабліва актыўнічалі падпалкоўнікі. Я так і не зразумеў, ці яны былі з КДБ, ці проста палітработнікі. Яны не назваліся, а я не мог патрабаваць ад іх паказаць пасведчанні, бо яны прыбылі ў суправаджэнні прадстаўніка нашай вайсковай часці. Пачалася разборка. Адзін з іх сказаў у мой бок, якую сувязь я ўбачыў паміж французскім Супраціўленнем і Днём Перамогі, якое дачыненне ўвогуле мае Францыя да гэтага нашага святога дня? Я адказаў, што Францыя і шмат іншых краін былі нашымі саюзнікамі. Нават у складзе Чырвонай Арміі існавала французскае авіяпадраздзяленне «Нармандыя–Нёман». Маёр Пахучы прыклаў палец да сваіх вуснаў, падаў мне знак, каб я як можна менш размаўляў, а больш ківаў галавой у знак згоды з камісіяй. На мяне пасыпаліся абвінавачванні: як я мог такое дапусціць – уласаўца выдаваць за героя, што я згубіў рэвалюцыйную пільнасць, дапусціў палітычную блізарукасць, апалітычнасць – стандартны набор абвінавачванняў для таго часу.

Было сумна і смешна. Але трэбы было рабіць сур'ёзны выгляд і слухаць гэтую бязглуздзіцу, паказваючы ім кукіш у кішэні. Потым у мяне запатрабавалі «Кнігу ўліку асабовага складу падраздзялення». Сталі яе правяраць. Мы тую кнігу называлі «Кніга штатнага раскладу». У ёй былі пералічаны ўсе пасады і асобы, якія іх займалі, з кароткімі біяграфічнымі данымі. І вось падпалкоўнік натыкнуўся на салдата, нацыянальнасць якога была – немец.

«Якім гэта чынам у асобарэжымным падраздзяленні апынуўся немец?» – уставіўся на мяне правяральшчык. «Яго да нас не з ФРГ заслалі, гэта наш савецкі немец з Казахстана», – адказаў я. «Вы тут мне не жартуйце, ён, магчыма, з паволжскіх немцаў, высланых у Казахстан. Ніхто не ведае, што там у яго галаве», – абурана сказаў падпалкоўнік.

«Прэтэнзіі не да мяне. Не я вырашаю, дзе каму служыць. Мне прыслалі салдата, мая задача навучыць яго воінскай прафесіі, якой бы нацыянальнасці ён ні быў. Дарэчы, гэта лепшы салдат

падраздзялення», – не здаваўся я. Падпалкоўнік па «Кнізе ўліку...» працягваў знаёміцца з маімі падначаленымі. Раптам ён падскочыў са стула, быццам яму ў задніцу пырнулі шылам. «Да тут асінае гняздо!» – закрычаў ён, натыкнуўшыся на запіс: «Камандзір аддзялення малодшы сяржант Кох». Я не магу ведаць, якія асацыяцыі і фантазіі ўзніклі ў галовах гэтых правяральшчыкаў. Магчыма, ім прыпомніўся Эрых Кох, стаўленік Гітлера, гаўляйтар Украіны, кат украінскага народа. Раптам гэты малодшы сяржант Кох сваяк таго Коха? Магчыма, ён у гэтай казарме стварыў таемную камеру катаванняў і па начах катуе салдат. Якраз тады ў арміі квітнела дзедаўшчына.

Падпалкоўнікі, перабіваючы адзін аднаго, няслі ўсялякую бязглуздзіцу. Я іх не слухаў, а чакаў, калі гэты цырк скончыцца. Калі іх слоўны запас быў вычарпаны і яны нарэшце спыніліся, я ім патлумачыў, што малодшы сяржант Кох – украінец. Чалавек не вінаваты, што яму дасталася такое прозвішча. Камісія забрала планшэт са стэнда з фотаздымкамі «ўласаўцаў» і ад’ехала.

На наступны дзень паступіў загад: малодшага сяржанта Жальскіх і шараговага салдата (немца, прозвішча не памятаю) адправіць для праходжання службы ў іншую вайсковую часць. Я пазбавіўся самага лепшага свайго салдата. Малодшы сяржант Кох застаўся на месцы. Вось такім чынам для мяне абярнулася святкаванне 30-й гадавіны Перамогі. Трэба адзначыць, што з боку камандавання часці па гэтым выпадку ў мой адрас папрокаў не прагучала.

## Частка 3.
# РЭЗАНАНС

## Кніга выйшла з друку

Трымаю ў руках асобнік кнігі «Нябышына. Вайна», аўтарам якой з'яўляюся я сам. Гэта неверагодна, такое немагчыма сабе ўявіць. Выдавец Віктар Хурсік, журналіст і краязнаўца, паціснуў маю далонь і павіншаваў з выхадам першай кнігі, пажадаў творчых поспехаў. Я падарыў яму кнігу са сваім аўтографам. Гэта мой першы аўтограф. Віктар Хурсік запытаўся, ці чытаў я яго кнігу «Кроў і попел Дражна». Было сорамна прызнавацца, але на той момант я гэтую кнігу яшчэ не чытаў, яе немагчыма было знайсці.

З вокладкі на мяне глядзіць мой бацька. Фотаздымак вельмі ўдалы. Такое ўражанне, што ён у тым далёкім 1944 годзе сфатаграфаваўся спецыяльна для гэтай кнігі. Вочы адкрытыя, добрыя. Позірк упэўнены, накіраваны на мяне, быццам хваліць, што я ўвекавечыў яго гэтай кнігай, гэтай вокладкай. Падумалася, ці адчуваў мой бацька, што знаходзіцца пад пільным наглядам СМЕРШа, што яго чакае смерць?

Як ствралася кніга? Як узнікла ідэя яе напісаць? Такія пытанні не аднойчы мне задавалі чытачы.

* * *

На сайце Рыдыё Свабода ўбачыў матэрыял Галіны Абакунчык за 14 красавіка 2010 года «Ці трэба адмаўляцца ад штампу "Усенародная вайна"?» Яна распавядала, што

> «...напярэдадні 65-годдзя перамогі над фашызмам у Другой сусветнай вайне навукоўцы заяўляюць пра неабходнасць пераацэнкі і праўдзівага асвятлення падзеяў таго часу. Адначасова яны перасцерагаюць ад новых спробаў, нібыта, перапісвання і скажэння гістарычных звестак.

Пра публікацю Іллі Копыла «Нябышына. Вайна» дырэктар інстытута гісторыі НАН Аляксандр Каваленя сказаў наступнае:

«Я знаёмы з гэтай публікацыяй. Каб не абражаць аўтара, скажу, што яна вельмі і вельмі слабая. Гэта камерцыйная літаратура – яна і ёсць камерцыйная. Трэба паглядзець архіўныя крыніцы, трэба на іх таксама крытычна глядзець. Трэба працы, якія б не раздзялялі нашае грамадства, а працавалі на кансалідацыю. Трэба нават самыя складаныя пытанні падаваць так, каб яны працавалі на аб'яднанне. А мы іншы раз вось так – абазначыць сябе».

Можа, я не так зразумеў паважанага прафесара? Кніга выдадзена за мае ўласныя грошы накладам ўсяго 100 асобнікаў, якія я бясплатна раздаў на прэзентацыі. Вось і ўся камерцыя.

Як узнікла ідэя напісаць кнігу? Ды не ўзнікала ў мяне ні ідэі, ні мэты напісаць кнігу. Усё адбылося само сабой. Пытанні Другой сусветнай вайны, і асабліва акупацыі, як чалавека, яе пераэжыўшага, мяне заўсёды хвалявалі і цікавілі. Мне прасцей разабрацца, дзе – праўда, а дзе – міты, чым чалавеку, які гэтага не пераэжыў.

Часам я дасылаў свае лісты ў газеты і на Радыё Свабода, у якіх расказваў пра перажытае ў часы ваеннага ліхалецця. Але адкрыта і гучна ўпершыню я выказаўся ў 2003 годзе. Перад 62-й гадавінай нападу Германіі на СССР газета «Народная Воля» надрукавала мой артыкул: «Война глазами подростка» («Народная Воля» ад 20 чэрвеня 2003 г.). Няма сэнсу спыняцца на артыкуле, ён цалкам увайшоў у маю кнігу, у раздзел успамінаў. Для мяне было важна, як адгукнуцца на маю публікацыю чытачы. Але «Народная Воля» маўчала.

І толькі 1-га лістапада 2003 года, больш як праз 4 месяцы пасля выхаду майго артыкула, газета ў рубрыцы «альтэрнатыўная думка» надрукавала артыкул Ларысы Кароткай: «Война глазами подростка?». Артыкул вельмі жорсткі. Яго аўтарка абрынулася на майго бацьку, абвінаваціла яго ва ўсіх грахах.

У чытачоў ёсць магчымасць самім азнаёміцца са зместам артыкула і зрабіць свае высновы.

## *Война глазами подростка?*

Бывают случаи, когда долго думаешь, сказать свое слово или нет. И чем больше проходит времени, тем больше утверждаешься в том, что нужно все-таки публично выразить свое мнение.

В данном случае оно связано с публикацией на страницах «Народной Воли» статьи Ильи Копыла «Война глазами подростка».

Это воспоминание автора, которому в начале войны было 7, и 10 – после освобождения Беларуси.

У детей действительно цепкая память, и факты, свидетелем которых был мальчик, сомнений не вызывают. Все, что запомнилось ему, происходило действительно так. Можно понять и отношение ребенка к этим фактам: немцы, которые при встрече одарили ребятишек шоколадками, представляются ему хорошими. А вот партизаны, которые забрали у его семьи продукты, и еще, кроме пожалованных им его отцом сапог и ватовки, реквизировали кожух и валенки, конечно, были плохие. Да к тому же в другой раз партизан, ругаясь и тыча пистолетом в лицо его отца, допытывался, почему немцы его не расстреляли как предколхоза и почему он не идет в партизаны. Можно представить ужас мальчика, хотя вопрос, заданный его отцу, правомерен. Словом, очень нехорошие, злые эти партизаны. Зато родионовцы, которых Гитлер благословил на предательскую войну против своих и экипировал в новенькую немецкую форму, хорошо вооруженные, сытые, вежливые – эти лучше всех: при них и партизаны не совались в село, и немцы им доверяли.

Все бы ничего, если бы Илья Копыл только сообщил запомнившиеся ему факты. Дело в том, что он пытается их истолковать, не имея для этого, на мой взгляд, необходимых знаний и не представляя, что из сказанного им вытекает. И тут уже не подросток выглядывает. Да и каким он подростом был в 7–10 лет? Это еще ребенок, несмышленыш, на многое смотревший глазами родителей. Но теперь-то не назовешь его несмышленышем, автором публикации является человек, доживший, как говорится, до седин. Но поговорим не о нем, а об его отце более конкретно.

## *Роспуск колхоза*

В деревне Небышино на Бегомльщине до войны отец Ильи был председателем колхоза «Красный рассвет». В первых числах июля приехали представители оккупационных властей. Они вызвали его и велели созвать людей на сход. Народу собралось много: деревня большая, 20 дворов. Немец, сообщив им, что взят Минск, что бои идут под Смоленском, велел отцу распустить колхоз. Все колхозное имущество раздать крестьянам. Устанавливается твердый налог зерном, скотом, фуражом. Колхоз разделили, при этом руководитель сказал, что отец Ильи уже принял новую власть и примерялся к ней. Ничего, жить можно.

И это председатель большого колхоза, человек, который и до войны жил очень даже неплохо, сумел в 1940 году отгрохать себе новый, хороший домище.

## *Хорошие немцы*

Первая встреча с немцами описывается просто идиллически. Немецкая автоколонна остановилась у моста через реку Поню. Купавшиеся ребятишки выскочили к машинам. Немецкие солдаты дружелюбно их встретили, не прогоняли от машин и стали наделять шоколадками. Один из них даже подарил сыну председателя губную гармошку. Какая радость для малыша! Как он любил эти гармошки! Плакал, потеряв ее. А вот когда односельчанин предательски застрелил партизана (мужа его двоюродной сестры), который попросил показать ему выход из болота, – не плакал. Что скажешь? Ребенок!

## *Плохие партизаны*

Во-первых, в конце осени 1941 года они закрыли школу. Согласна с автором: закрыли грубо, нетактично. Эти люди «были в красноармейской форме, грязные, оборванные, очень неприятные»... Это глазами мальчика. А мне представляются измученные, изголодавшиеся окруженцы, не отказывавшиеся от красноармейской формы и уже в начале войны ставшие на путь борьбы с оккупантами.

«Повторно в первый класс пошел 1 сентября 1944 года, а мог бы пойти в четвертый, если бы не партизаны». Это пишет уже не ребенок. Это вывод умудренного жизнью человека. Неужели он не понял, что при немецкой власти школа долго бесконтрольно функционировать не могла, и не узнал, что оккупантами было предусмотрено только начальное образование. В условиях репрессий против мирного населения, когда запылали села с живыми людьми, – какая уж тут школа! Мне известно, что в деревне Карпиловка Логойского района партизаны, наборот, открыли школу, но начались блокады. Тут не до учебы. А вот то, что после освобождения Илья нагнал упущенное, получил образование выше четырех классов, – это, выходит, вне сферы его понимания.

Во-вторых, партизаны забирали продукты. Немец в свое время попросил только пять «яек». А партизаны, которых его мать хотела угостить яичницей, не удовлетворились этим. И одежду взяли. Так виделось ребенку. Но пишет-то уже не ребенок.

Да он что, Илья Копыл, с неба свалился? Подумать только: партизаны не оценили гостеприимство. Им что же, каждый день на

обед приходить? Неужели автор до сих пор не понял, что Москва не снабжала партизан ни одеждой, ни питанием? Что это бремя должно было лечь на плечи населения. Что его отец, военнообязанный, сам не воевал, жизнью не рисковал, сидел в тепле, и его прямым долгом было всячески помогать тем, кто боролся с врагами. Помогать изо всех сил, как это делали люди в далеком тылу, где подростки у станков, голодные и озябшие, стояли на подмостках, чтобы дотянуться до станков, где женщины в колхозах работали за себя, за отца, за мужа и брата, изгонявших оккупантов с родной земли.

В-третьих, действия партизан никакого ущерба врагам не причинили, наоборот, они провоцировали репрессии врагов протрив крестьян.

Так, в 1942 году партизаны сожгли деревянный мост через реку Поню, через которую проходила дорога с Докшиц на Бегомль, которым «немцы почти не пользовались». Как же «не пользовались»? Сам же ведь описывал встречу у моста с большой автоколонной. «А в центр партизаны послали донесение, что… уничтожен стратегический мост». Откуда парнишка знает, что писали в донесениях партизаны? О многом он наверняка судит со слов своего отца.

В 1943 году запылали деревни с живыми людьми. Допустим, что вблизи деревни Шуневка и не нужно было обстреливать вражескую машину. Но за это сжигать всю деревню? В Логойском районе оккупанты сожгли с живыми людьми дорогую мне деревню Тхорница за то, что в ней жили дальние родственники известного журналиста Алеся Матусевича, застрелившего по приговору партизан в центре Минска редактора профашистской «Минской газеты» Акинчица. Но никто и представить себе не мог, что каратели пойдут на такую акцию. Так это партизаны спровоцировали? И что, не нужно было бороться с теми, кто полонил родную землю, ее трудолюбивый народ хотел превратить в послушных рабов?

Каждая строчка воспоминаний Копыла сводится к утверждению этой мысли: сидели бы тихо – и немцы не карали бы. А вот великий полководец и патриот маршал Жуков высоко ценил сопротивление партизан врагу и весьма надеялся на их помощь в успешном проведении операции Багратион, о чем и говорил со Сталиным. И партизаны оправдали его надежды. Мальчик Илья, конечно, ничего этого знать не мог, но пишет-то уже не мальчик.

Мир не видел таких зверств. Немцы в современной Германии покаялись и осудили тех соотечественников, которые пошли войной на другие народы. А Копыл их, выходит, оправдывает. Дескать, это партизаны специально разрабатывали «такие сценарии». «Позднее

по такому же сценарию партизаны пытались уничтожить Витуничи... Точно по такому же сценарию была уничтожена Хатынь». Это же надо: партизаны вырабатывали сценарии уничтожения деревень. Ну как тут не возмутиться!

Мне известно много примеров, когда партизаны защищали деревни от карателей. Так, ожесточенным огнем они отогнали врагов ото деревень Мерковичи, Лысая Гора, Гаяны. В этом бою погибли командиры Леша Голощекин и Гена Домричев и несколько рядовых бойцов.

И наконец, последнее. Партизаны, пишет Копыл, во время блокад «испарялись», оставляя население на произвол судьбы.

Партизаны не могли противостоять танкам, самолетам, артиллерии. Окруженные врагами, они шли на прорыв и молили бога об одном: лучше смерть, чем ранение. Копыл не видел партизан в бою, когда был ребенком. Он, скорее всего, не увидел и сотен братских партизанских могил после войны. А судит.

В партизанских отрядах воевали известные белорусские писатели Янка Брыль, Алесь Адамович, Алексей Карпюк, Владимир Колесник и многие другие. Они поведали правду о партизанах, сказали и о хорошем, и о плохом.

Но и воспоминания Копыла по-своему интересны. Не фактами (такие факты широко известны и без него), а психологией ребенка, который на события смотрел глазами своего отца, который, видимо, и в зрелые годы не избавился от многих ошиблочных представлений.

Сегодня на войну нужно смотреть не глазами подростка, а глазами серьезного взрослого человека.

*Лариса Короткая,*
*жительница Минска.*

Ну што, шаноўныя чытачы, дачыталі да канца ліст Ларысы Кароткай? Я ўпэўнены, што вашы думкі падзяліліся. Зразумела, што і я павінен адрэагаваць на гэты ліст, нягледзячы на тое, што некаторыя фрагменты майго адказу ўвайшлі ў кнігу. Калі б я не адгукнуўся на ліст Ларысы Кароткай, чытачы маглі падумаць, што мне няма чаго сказаць. Вось мой адказ:

## *Ды яна што, Ларыса Кароткая, з неба ўпала?*

Добры дзень, «Народная Воля». Я нават пачаў хваляваца, прайшло шмат часу з моманту, калі быў надрукаваны мой артыкул

«Война глазами подростка» (НВ за 20.06.2003 г.), і дагэтуль ніводнага водгуку. Няўжо мой артыкул нікога не зацікавіў? І вось першая ластаўка – ліст Ларысы Кароткай, жыхаркі Мінска. Калі я прачытаў яе артыкул, то ўжо мне захацелася крыкнуць яе словамі: «Ды яна што, Ларыса Кароткая, з неба ўпала?» Відавочна, што яна вывучала гісторыю краіны, гісторыю Другой сусветнай вайны па савецкіх школьных падручніках, па творах савецкіх пісьменнікаў, якія пісалі па заказу КПСС, па мемуарах савецкіх генералаў. А там суцэльны гераізм, патрыятызм савецкага народа. Але ж існуе і другі бок медаля.



*Аляксандар Капылоў, стрыечны брат Іллі, з жонкай Стасяй*

Свой артыкул «Война глазами подростка» я выклаў тэзісна, апусціўшы шмат цікавых падрабязнасцяў. Я расказаў пра некаторыя падзеі, якія адбываліся ў нашай вёсцы ў часы вайны. Калі ідзе вайна, дзеці ўзраслеюць у два-тры разы хутчэй.

Паспрабую паспрачацца з Ларысай Кароткай, тым больш, што яна ў сваім лісце (НВ за 1.11.2003 г.) сказіла змест майго артыкула і зрабіла спробу абразіць маіх бацькоў. Не ведаю, адкуль Кароткая ўзяла, што нямецкі афіцэр загадаў майму бацьку распусціць калгас? У мяне напісана, што немец сам абвясціў аб роспуску калгаса. А гэта не адно і тое. Майму бацьку было загадана падзяліць калгасную маёмасць і зямлю паміж калгаснікамі, што ён і зрабіў.

Можа Кароткая мяркуе, што ў майго бацькі была магчымасць адмовіцца ад гэтай справы? Кароткая са скуры лезе, каб абвінаваціць маіх бацькоў у непатрыятызме. Так яна заяўляе, што мой бацька ўжо прыняў новую ўладу. Адкуль такія ўпэўненыя высновы? Мой бацька проста параўноўваў савецкую ўладу з нямецкай. І тое параўнанне было не на карысць першай. Можа, Ларыса Кароткая будзе адмаўляць той факт, што пры савецкай уладзе калгаснікі

атрымлівалі за сваю працу пустыя працадні, якія ў народзе называлі «палачкамі»? Працавалі за палачкі. А вось немцы вярнулі сялянам зямлю, коней, інвентар ва ўласнае карыстанне. У 1941–1942 гадах немцы імкнуліся паказаць сябе больш лаяльнымі да мясцовага насельніцтва.

Мой бацька быў адукаваным чалавекам. Не выключаю, што ён добра ведаў пра былую нашу краіну ВКЛ, пра тры падзелы Польшчы, пра антырасійскія паўстанні на нашай тэрыторыі. Ён нарадзіўся і жыў у Паўночна-Заходнім краю Расійскай імперыі. Потым гэта стала Савецкай Расіяй. Ён жыў у СССР да калгасаў і пры калгасах. І вось нямецкая акупацыя. У майго бацькі было шмат з чым параўноўваць. Не магу сцвярджаць, магу толькі здагадвацца, што ён лічыў акупацыйным не толькі нямецкі, але і савецкі рэжым. Які з іх быў больш жахлівым, вырашайце самі. Можна ўявіць, як абураецца Ларыса Кароткая, калі чытае гэтыя радкі. Але ж справа тут не ў вёсцы Нябышына і не ў маіх бацьках. Прыкладна ў такім жа становішчы знаходзілася ўся акупаваная Беларусь. Ларыса Кароткая зласліва распавядае ў сваім лісце, што мой бацька не проста прыняў нямецкую ўладу, але і прымяраўся да яе. Можа і так, прымяраўся. І казаў, што жыць можна. Але ён ніколі не быў «здраднікам» у тым сэнсе, як гэта разумее Ларыса Кароткая. Хутчэй за ўсё гэта была кемлівасць, уласцівая для ўсяго «тутэйшага» насельніцтва. Трэба было ўсё ўзважыць, каб выжыць у тых складаных умовах.

Прашу прабачэння ў чытачоў за паўтор і за дакучлівасць, але яшчэ раз хачу падкрэсліць, што мой бацька не здраднік. Ніякіх пасад у мясцовай нямецкай адміністрацыі ён не займаў. Інакш бы партызаны яго расстралялі, у такіх выпадках яны не цырымоніліся. А калі б партызаны не змаглі гэтага зрабіць, то яго арыштавалі б НКУСаўцы ў першы ж дзень пасля вызвалення ў 1944 годзе. Але гэтага не адбылося. Уяўляю, якое расчараванне адчула Ларыса Кароткая, яна прагне крыві. А я імкнуся абараніць чэснае імя свайго бацькі, абараніць ад нападак такіх вось рэаніматараў сканаўшага савецкага рэжыму, як Ларыса Кароткая.

Ларысу Кароткую асабліва абурае тое, што я пасмеў сказаць непрыемную праўду пра партызан. У яе ўяўленні партазаны – суцэльныя героі, партызаны – патрыёты, гатовыя загінуць за свой народ, за сваю Радзіму. Усё тое, у чым я асуджаю партызан, яна іх апраўдвае. Ларыса Кароткая, адукаваная жанчына, апраўдвае партызанскае рабаўніцтва мясцовага насельніцтва і разбой. Гэта неверагодна. Мы ж ужо ўвайшлі ў 21-е стагоддзе. Але яна, як замбіраваная камсамолка, завязла ў 1943-м годзе ў партызанскіх балотах.

«Няўжо аўтар да гэтага часу не зразумеў, – кажа Ларыса Кароткая ў мой бок, – што Масква не забяспечвала партызан ні адзеннем, ні харчаваннем». Так, я гэтага не ў стане зразумець. Мы маскоўскіх партызан да сябе не запрашалі. Без іх мы б значна лягчэй перажылі б гады акупацыі і ў разы менш бы загінула беларусаў. Гэта маё асабістае меркаванне. Што тычыцца забеспячэння, то Масква магла забяспечыць сваіх партызан грашыма, савецкія грошы былі ў хаду, прызнаваліся нямецкай акупацыйнай адміністрацыяй на тэрыторыі акупаванай Беларусі.

Як жыла Беларусь ва ўмовах нямецкай акупацыі, я б параіў чытачам і асабліва Ларысе Кароткай прачытаць артыкул Галіны Кнацько, кандыдата гістарычных навук: «Минск в годы оккупации» («Народная газета» за 1.07.1993 г.). Матэрыял даследчы, пабудаваны на архіўных дакументах, цікавы, праўдзівы, займае тры старонкі газеты (11–13).

І зноў Ларыса Кароткая гнеўна абрынаецца на майго бацьку: «Яго бацька ваеннаабавязаны, сам не ваяваў, жыццём не рызыкаваў, сядзеў у цяпле, і яго прамым абавязкам было ўсяляк дапамагаць тым, хто змагаўся з ворагамі». Яшчэ раз хачу патлумачыць сучаснаму змагару ідэалагічнага фронту Ларысе Кароткай, што галоўным ворагам прамаскоўскіх партызан было мірнае беларускае насельніцтва. Партазаны змагаліся не з немцамі, а з бяззбройнымі сялянамі, з дзецьмі, з настаўнікамі, з усімі, хто працаўладкаваўся к немцам, каб зарабіць на ежу. Я гэта бачыў на свае вочы. Што тычыцца майго бацькі, то ён не ваеннаабавязаны па стане здароўя. Нягледзячы на гэта, у ліпені 1944 года яго забралі на фронт. Ён загінуў 19 жніўня 1945 года ў далёкай Манчжурыі.

Ларыса Кароткая напомніла пра сотні партызанскіх магіл. Я бачыў адзінкі такіх пахаванняў, сярод іх і магіла майго брата Мікалая. Але ён, партызан, загінуў не ў баю з немцамі. Ён загінуў ад кулі іншага партызана. Магчыма, яго забілі таму, што ён, беларус, не ўпісаўся ў склад прамаскоўскага партызанскага атрада? Магчыма, ён стаў сведкай партызанскага злачынства? А злачынцы жывых сведак не астаўляюць.

*Ілля Копыл. 10.11.2003.*

Гэты мой артыкул «Народная Воля» не надрукавала. Рэдакцыя дыскусію спыніла – тэма вельмі непрыемная і небяспечная. Ды і дыскусіяй гэта назваць нельга. Артыкул Ларысы Кароткай газета надрукавала праз 4 месяцы пасля майго. Мой артыкул к гэтаму часу ўжо мала хто змог прыпомніць.

❦ ❦ ❦

Доўгі час за тэму вайны, тэму акупацыі я не браўся. Але на пачатку 2005 года Радыё Свабода звярнулася да слухачоў з прапановай дасылаць свае ваенныя ўспаміны, якія потым прагучаць у перадачах на хвалях Радыё. Справа ў тым, што 2005 год – год юбілейны, 60 год з Дня Перамогі. І я ўзяўся за працу. Праз тры месяцы ўсё было гатова. Я аднёс свой рукапіс з успамінамі «Вайна вачыма падлетка» ў рэдакцыю Радыё Свабода. Праз тыдзень мне паведамілі, што мой сшытак ужо атрымалі ў сядзібе Радыё Свабода ў Празе. Але на гэтым усё і закончылася. Ніводнага фрагмента з маіх успамінаў у перадачах Свабоды не прагучала. Крыўды не было. На хвалях Свабоды мяне і так было шмат: штотыдзень гучалі мае лісты, амаль штодзень – тэлефанаванні. Але мне хацелася ведаць, чаго варты мае ўспаміны.

Свой рукапіс я даваў чытаць знаёмым пісьменнікам, палітыкам, журналістам, гісторыкам. Некаторыя з іх вярталі мне рукапіс назад моўчкі, некаторыя стрымана казалі: «Спадар Ілля, магчыма, усё яно было так, як ты пішаш. Такая думка існуе і ў навуковых колах. Але заяўляць аб гэтым у СМІ ці выдаваць кнігу – несвоечасова. Цябе людзі не зразумеюць». Я спрачаўся, што, наадварот, мы ўжо спазніліся. Хутка зусім не застанецца сведак Другой сусветнай вайны.

На вечарыне, якая была наладжана з нагоды 80-годдзя гісторыка Леаніда Лыча, на якой прысутнічаў і я, Леанід Міхайлавіч прамовіў, што ён жадаў бы напісаць кнігу пра часы нямецкай акупацыі, але каб героямі кнігі былі тагачасныя падлеткі. Мяне зачапіла яго ідэя, героем такой кнігі магу быць і я. Калі пачалася акупацыя, мне споўнілася 7 гадоў, а калі прыйшло вызваленне – 10. Паразмаўляць з ім аб гэтым у той вечар я не змог. Праз паэта Яўгена Гучка я перадаў Леаніду Лычу прапанову ўключыць у яго будучую кнігу асобнай главой мае ўспаміны. Я бачыў пабудову яго кнігі па схеме кніг Святланы Алексіевіч: пытанне – адказ. Мае адказы ўжо напісаны, а Леаніду Лычу застаецца паставіць пытанні да іх. Але ён адхіліў маю прапанову, сказаўшы, што калі Ілля Копыл штосьці напісаў, хай сам і выдае.

Пасля гэтага Яўген Гучок арганізаваў мне сустрэчу з выдаўцом Віктарам Хурсікам. Віктар Уладзіміравіч пагартаў мой сшытак і прызначыў наступную сустрэчу праз тыдзень. Столькі часу ён адвёў для сябе на чытанку майго рукапісу. Але ўжо праз два дні

Віктар патэлефанаваў мне і прызначыў сустрэчу. Пры сустрэчы ён сказаў, што гэта будзе не проста кніга, а бомба. Асабіста я сам пакуль што нічога такога незвычайнага не адчуваў. Дарэчы, загаловак для кнігі «Нябышына. Вайна», прыдумаў Віктар Хурсік. Мой загаловак быў – «Акупацыя вачыма падлетка».

На пачатку лістапада 2009 года кніга выйшла з друку. Я толкам не ведаў, што мне з накладам кнігі рабіць далей, як яго выкарыстаць, таму я проста дарыў кнігу сваім знаёмым. Выбіраў тых, хто падзяляе маю думку.

## Прэзентацыя

На адным з мерапрыемстваў у Чырвоным касцёле ў снежні 2009 года я выпадкова сустрэўся з Вячаславам Сіўчыкам. Ён ужо ведаў, што вайшла мая кніга, і прапанаваў мне правесці прэзентацыю. Усю арганізацыю ён браў на сябе. Я адразу пагадзіўся, таму што ў мяне не было ні вопыту, ні магчымасцяў, каб правесці такое мерапрыемства. А прэзентацыя была неабходна, каб пашырыць інфармацыю пра кнігу.

З Вячаславам Сіўчыкам я знаёмы са студзеня 1990 года. Я ўжо быў пенсіянерам, але працаваў у ваенным прадстаўніцтве (ВП) на МЭМЗе (32-гі завод). Працоўны калектыў аднаго з цэхаў завода ў студзені 1990 года высунуў мяне кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога савета. К таму часу кіраўніцтва ВП і завода завочна называлі мяне «нефармалам», таму што я быў пастаўшчыком на завод вулічнай інфармацыі. А калі памятаеце, канец 80-х і пачатак 90-х гадоў мінулага стагоддзя – гэта быў час сапраўднай дэмакратыі. Кіраўніцтва завода вусным загадам забараніла мне ствараць ініцыятыўную групу з прадстаўнікоў завода. Не падпарадкаваліся загаду толькі двое: Генадзь Мужаў з 8-га цэха і Леанід Славашэвіч з 20-га цэха. Вось яны і былі і маёй групай падтрымкі і даверанымі асобамі.

Але гэтага не хапала, і я звярнуўся за падтрымкай у Цнянскую суполку БНФ. Там я і пазнаёміўся з Вячаславам Сіўчыкам. Ён 1962 года нараджэння. Па адукацыі геолаг. З 1995 года працаваў адказным сакратаром управы БНФ і старшынёй камісіі Сойму БНФ па сувязях з рабочым рухам. 30 кастрычніка 1999 года быў абраны намеснікам старшыні БНФ «Адраджэнне» і Партыі БНФ. Але 11 студзеня 2003 года рашэннем Сойму БНФ выклю-

чаны з Партыі БНФ з фармуліроўкай «За дэструкцыйную дзейнасць і непадпарадкаванне рашэнням Сойму». Што канкрэтна ён нарушыў, не ведаю.

Вячаслаў Сіўчык шмат разоў падвяргаўся арышту. Асабліва памятаю, як яго разам з Юрыем Хадыкам арыштавалі ў 1996 годзе як арганізатараў Чарнобыльскага шляху. Яны абвясцілі галадоўку, якая працягвалася 23 дні, і дамагліся вызвалення.

Вячаслаў Сіўчык – актыўны грамадскі дзеяч. Ён адзін з арганізатараў і ўдзельнікаў намётавага гарадка пасля выбараў 2006 года.

Зараз пражывае ва Украіне, з'ехаў туды, ратуючыся ад пераследу ў Беларусі.

Але я адхіліўся ад тэмы. Прэзентацыя адбылася 20 студзеня 2010 года ў сядзібе БНФ на Варвашэні, 8. Я хваляваўся, ці прыйдуць людзі, у СМІ пра прэзентацыю ніякіх абвестак не было. Але к прызначанаму часу памяшканне было запоўнена. Абрадавала яшчэ і тое, што да мяне завіталі і вядомыя людзі: кандыдат гістарычных навук, даследчык сталінскіх рэпрэсій Ігар Кузняцоў; журналіст і выдавец Віктар Хурсік; паэт Яўген Гучок; палітык і грамадскі дзеяч Вінцук Вячорка; літаратар і краязнаўца Уладзімір Содаль; навуковец, даследчык гісторыі, аўтар кнігі «Утроп Літвы» Здзіслаў Сіцька ды іншыя. Прысутнічалі і прадстаўнікі прэсы. Мерапрыемства прайшло цікава, былі выступоўцы, я адказваў на пытанні. Кожны з прысутных атрымаў маю кнігу – я раздаў больш за 30 асобнікаў. У наступны дзень пра гэтую падзею з'явіліся звесткі ў некаторых СМІ.

Вось фрагмент з рэпартажу на сайце Радыё Свабода ад 21.01.2010 г.:

На Управе БНФ адбылася прэзентацыя кнігі Іллі Копыла «Нябышына. Вайна». У пачатку вайны аўтару было 7 гадоў.

Гаворыць выдавец кнігі Віктар Хурсік: «Я хачу сказаць, што дзеці, якія нарадзіліся ў 1934 годзе, якім у 41-м годзе было 7 гадоў, яны б маглі шмат чаго распавесці пра вайну. Аднак такіх успамінаў не з'яўляецца, няма. Не прапануюць. А кніга Іллі Копыла – гэта ўчынак грамадзянскі. Ён проста адкрыў яшчэ адзін абразок праўды пра Вялікую Айчынную вайну. І я, калі атрымаў гэты рукапіс, быў вельмі ўзрушаны. Таму што мая родная вёска тут пад Мінскам, я шмат чуў расповедаў ад дарослых і чуў пры-

кладна тое самае. Але засведчанага ў пісьмовых крыніцах – няма. Таму мяне проста прага праняла выдаць гэтую кнігу».

Каментары к матэрыялу наведвальнікаў сайта:

**Сымон, горад Мінск:**

«Ну, цяпер пасадзяць Копыла. Разам з Хурсікам».

**Ганна:**

«Вельмі цікавая кніга. Дзякуй, спадар Копыл за Вашу мужнасць. Столькі лапшы гэтыя камуністы нам на вушы павесілі, што невядома, калі здымем. Асабліва гэта тычыца Другой сусветнай вайны на Беларусі. Адны спекуляцыі і ні кроплі праўды».

На сайце «Livejournal» 24 студзеня 2010 адбылося абмеркаванне часткі кнігі «Нябышына. Вайна»: «Міты пра партызанскі рух у Беларусі».

**Japgor:**

«Всё в книжке – правда. Партизаны именно в том районе заебали всех по страшной силе – забирали всю еду, грабили, убивали. Я со многими стариками базарил, у каждого есть своя история.»

Інтэрнет-газета «Салідарнасць» ад 24.01.2010 года таксама адгукнулася на маю кнігу рэпартажам журналісткі Анастассі Зелянковай:

«Пабачыла свет кніга Іллі Копыла «Нябышына. Вайна». Гэта аповед пра акупацыю асобна ўзятай вёскі ў перыяд другой сусветнай вайны. Аўтар, які ў час вайны быў падлеткам, дзеліцца сваімі ўспамінамі пра тое, што чынілі партызаны з мірным насельніцтвам, як паводзілі сябе немцы і якія міфы пра вайну і партызанскі рух былі створаны савецкай прапагандай».

«Ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія ведаюць праўду, з кожным годам застаецца менш. Тыя, хто яшчэ з намі, не жадаюць адкрыць акопную праўду. Міфы аб вайне: пра ўсенародны ўздым, пра масавы патрыятызм, пра «За Радзіму, за Сталіна» – ім больш даспадобы, – адзначае Ілля Копыл. – У адрозненне ад ветэранаў я жадаю, каб аб Другой сусветнай вайне была напісана праўда, якой бы горкай яна ні была».

«На пачатку вайны Іллі Копылу было 7 год. Ягоная вёска Нябышына... усю вайну знаходзілася пад акупацыяй. Таму тое, што адбывалася ў тыя часы, аўтар пабачыў на ўласныя вочы. І гэтыя яго ўспаміны вельмі разняцца ад таго, што можна прачытаць у сённяшніх школьных падручніках або пачуць па радыё і тэлебачанні.

У кнізе аўтар падае факты, якія часам могуць здзівіць і нават выклікаць абурэнне. Тут і пра тое, як партызаны правакавалі немцаў да расправы над мірным насельніцтвам, як самі паступалі з вяскоўцамі (як напрыклад, з дзяўчынай Фаняй, якую застрэліў партызан толькі за тое, што яна адмовілася з ім танцаваць).

Газета прапануе чытачам некаторыя ўрыўкі з кнігі».

Менавіта гэтыя ўрыўкі абмяркоўваліся на «Форуме рэканструктараў Беларусі».

**Курт:**

«Трохі рэзкавата і ў вывадах, я лічу, аўтар часам перагібае ў другі антыпартызанскі бок. Гэта, магчыма, вынік таго, што ў газету патрапілі самыя сенсацыйныя (для чалавека, які вучыў гісторыю толькі па школьных падручніках) цытаты».

**WW2:**

«Очередная «антисоветская агитация». Немцы хорошие – наши плохие. Всякое было – гавнюков везде хватало».

**Алекс:**

«Не думаю, что это лишь агитация. Вполне возможно, что большинство из описанного – не выдумка, а на самом деле имевшее место. Другое дело, что партизанами могли быть названы и банальные бандиты, а на основе виденного автором делается неправомерное обобщение».

**Политик:**

«Ох, ребятки... Я сам читал документы особых отделов, которые собирали «какашки» про личный состав партизанских отрядов и их деяния. Особые отделы не подчинялись партизанскому командованию и поэтому без прикрас всё описывали... как вам, к примеру, расстрел несовершеннлетних детей? Родителей расстреляли типа «за пособничество», а так как детей никто в деревне не взял, то и их поставили к стенке (12, 13 и 15 лет).

А тома в сотни страниц под названием «Жалобы местного населения на незаконные действия партизан»?

**Курт:**

«Я проста пра тое, што занадта шырокія абагульненні: «усе партызаны – злачынцы, ворагі народу: усе паліцаі – злачынцы, ворагі народу» будуць шкоднымі ў любым выпадку. Гэта толькі падымае непатрэбныя эмоцыі і гуляе на руку тым, хто хоча падмяніць спакойнае вывучэнне гісторыі новай палітычнай істэрыкай».

**Политик:**

«Так какая же истерика? Просто «светлый образ народных мстителей» летит в тартары и по праву. 65 лет на них ни одного пятнышка не было, прямо ангелы во плоти. И естественно, простому обывателю это как серпом...»

**Алекс:**

«Цалкам згодны. Потому и повторюсь: давайте рассматривать конкретные случаи, тогда не будет диаметральных заскоков и «как серпом»».

**Курт:**

«А ты чытаў у СБ артыкул міністра абароны, што «падымаюць галаву ачарніцелі гісторыі»? Дык сколькі яшчэ можна прыкладаў прывесці... Яны граюць на тым, каб перавесці праблему нармальнага вывучэння гісторыі ў эмацыянальна-палітычную сферу. І я лічу, што няправільна ўсіх чорнай фарбай маляваць – што партызанаў, што ўсіх астатніх. Гэта толькі дае нагоду да чарговых эмацыянальных рэакцыяў апанентаў. А пасля гэтага і дыскусія немагчымая».

**Палітык:**

«Этих «конкретных случаев» на серийное издание хватит на годы. Так ведь даже тёмных полутонов добавить не дают – сразу вопли про фальсификации, очернительства и реваншизм».

Вось так адрэагавалі чытачы ўрыўкаў з маёй кнігі «Нябышына. Вайна», якія былі змешчаны на старонках інтэрнэт-газеты «Салідарнасць».

## Публікацыя кнігі ў «Народнай Волі»

Але гэта толькі пачатак, усе падзеі – наперадзе. Кнігу прачытаў галоўны рэдактар газеты «Народная Воля» Іосіф Сярэдзіч і захапіўся ідэяй друкаваць яе ў сваёй газеце. І вось ра-

шэнне прынята. Тэкст кнігі «Нябышына. Вайна» друкаваўся з нумара ў нумар на працягу месяца, з 26-га лютага па 29-е сакавіка 2010 года. У рэдакцыю сталі паступаць лісты ад чытачоў. Адзін журналіст мне сказаў, што ні на адну з публікацый у рэдакцыю не паступала столькі лістоў-водгукаў, як на публікацыю «Нябышына. Вайна».

Вось некаторыя з іх:

**Канстанцін Сердзюк, г. Бабруйск.**

«Здравствуйте, уважаемый Илья Копыл. С нетерпением ждал каждого номера газеты, и не читал, а пил каждую страничку вашего текста. Я много раз ходил по партизанским местам, і меня всегда поражала нестыковка воспоминаний партизанских командиров в официальной прессе с тем, что я слышал от местных жителей, переживших войну. Ваша работа высвечивает то трагическое время и всё расставляет по своим местам».

**Разалія Рубінчык, пенсіянерка, г. Мінск**

«Уважаемая редакция, хочу выразить благодарность за публикацию воспоминаний о войне Ильи Копыла, из которых я узнала для себя много нового. В частности о том, кто такой был Ваўпшасов, чьё имя носит одна из улиц столицы. К сожалению, очень многие наши улицы носят имена тех, по чьей вине было пролито много крови, тех, кто не достоин народной памяти. Но наши власти упорно делают из них героев, скрывая истинную правду о них и их «подвигах».

**Іван Лашко, г. Косава, Івацэвіцкі раён.**

«В редакцию газеты «Народная Воля» Илье Копылу.

Благодарю за смелость, ум, ваш поступок, что вы описали, что видели и слышали о войне. Читая, мне казалось, что пишете не вы, а я».

**Э. Тобін, Ф. Тобіна, п. Смалявічы.**

«Мы з жонкай маладзейшыя за паважанага І. Копыла адпаведна на 2 і 5 гадоў. Усю тую вайну перажылі ў вёсках Верхамень Смалявіцкага раёна і Прыступаўшчына Дзяржынскага раёна. Усё добра помнім. І маглі б апісаць нават больш жудасныя сцэны, чым гэта зрабіў аўтар «Нябышына. Вайна».

Зрэшты, і нашым сем'ям немцы зрабілі менш шкоды, чым бандыты з суайчыннікаў.

Прыдбаўшы нейкім чынам у Смалявічах 3 запалкі, маці не паспела распаліць печ, як назло ў хату ўварваліся бандыты: "Отдавай, сука, спички!" Суседка Ганна выдала. Скарыстаўшы момант, маці кінула запалкі мне на печ. Я іх хуценька схаваў між ног пад жывот і залез у куток. І вось, моцны прамень электрычнага ліхтара ўдарыў мне ў вочы, а востры канец штыка ўпёрся ў мой пуп: "Давай сюда, гадёныш, спички, заколю!" І валасатай лапай выдраў тыя тры запалкі. Наша хата і надалей засталася стыць і без цяпла і без святла».

**Мікалай Куксо.**

✍ «Дзень добры шаноўны спадар Ілля Копыл!

Я – Мікалай Куксо, як і Вы – дзіця вайны (1930 года нараджэння). З вялікай цікавасцю і сумам чытаў Ваш праўдзівы аналітычны аповед аб 2-й сусветнай вайне з выкарыстаннем фактычнага матэрыяла з вёскі Нябышына, а факты – упорная рэч!

Мяне вельмі ўразіў Ваш заключны раздзел, дзе многія ўжо вядомыя факты былі сабраны ў адно месца і былі зроблены адпаведныя правільныя вывады».

**Ямбаеў В.Ю., г. Магілёў.**

✍ «Рэдактару «Народнай Волі».

Хачу Вам паведаміць, што ў вёсцы Дальняе Запольскага с/с Бялыніцкага раёна ў часы вайны адбылася наступная падзея: п'яны партызан пачаў стральбу з вінтоўкі па нямецкаму самалёту. Праз некаторы час прыляцелі самалёты і знішчылі вёску. Людзі ўсю вайну жылі ў зямлянках. Сведка тых падзей і цяпер жыве ў гэтай вёсцы. Гэта Ліпай Зося. Ёй ўжо больш за 100 гадоў. Жыве яна са сваёй нявесткай, засталіся ўдваіх на ўсю вёску. К ёй прыязджаў карэспандэнт раённай газеты «Зара над Друццю», цікавіліся. Але газета пра гэты выпадак не пісала».

**Крыловіч Міхась, г. Мінск.**

✍ «Хачу выразіць праз газету падзяку і нізкі паклон Іллю Копылу за яго праўдзівае апавяданне, надрукаванае ў «Народнай Волі» пад загалоўкам «Нябышына. Вайна». Спадар Копыл Ілля расказаў хоць і горкую, але праўду пра партызан, якія былі горшыя за немцаў, грабілі і рабілі засады на немцаў каля вёсак, тым самым навадзілі кару немцаў на нявінных сялян, дзе ў выніку палілі вёскі немцы. Таксама раскрыў аўтар праўду пра савецкіх генералаў, што яны не цанілі

жыццяў савецкіх салдат і гналі на доты, дзе можна было абыйсці з флангаў і г.д. Асабліва раскрыў аўтар прадажнасць Сталіна, які хацеў дамовіцца з Гітлерам у самы крытычны час для Савецкага Саюза на замірэнне».

**Галіна Гапановіч, дачка ветэрана.**

«...А вот воспоминания моей матери, в начале войны которой исполнилось 14 лет: «От партизан страдали гораздо больше, чем от немцев. По ночам спать боялись. Партизаны приходили постоянно, забирали всё подчистую: одежду, обувь, продукты. Даже нательные крестики детей умыкнули. Вместе с кожухом, валенками, салом партизаны унесли и мами-но платье».

**Анатоль Кавальчук, г. Лоеў.**

В «Народной Воле» о событиях времён ВОВ, мы, послевоенное поколение, узнаём неискажённые эпизоды жизни гражданских людей на оккупированной территории. Хорошо запомнил, как люди плохо отзывались о партизанах. Мне думалось, что это в нашем регионе они бездействовали, а в других регионах республики убивали фашистов на каждом шагу. Оказалось, нет.

Партизаны отряда «За Родину» по ночам делали рейды по сбору продовольствия, избивали за сотрудничество и сочувствие немцам. Мой тесть Лагуто В.Д., участник ВОВ, прочитал «Нябышына. Вайна», воскликнул: «Написали сущую правду про партизан. Я сколько живу после войны, такое прочитал впервые...»

**Шабалтас Васілій, г. Асіповічы.**

«Пачаў выпісваць вашу газету. Прачытаў дакументальную аповесць Іллі Копыла «Нябышына. Вайна». Вельмі добра, што прыйшоў час, калі людзі не баяцца пісаць праўду аб мінулым.

У час вайны, у 1941 годзе мне было 7 гадоў, і ўсё, што адбывалася ў тыя і ў наступныя гады, я помню выразна. Прачытаная аповесць ажывіла ў маёй памяці малюнкі мінулага, яны быццам ажылі і заварушыліся. Жылі мы тады ў вёсцы Курыцічы на Петрыкаўшчыне. Майго бацьку на вайну не ўзялі, яму ў ваенкамаце выдалі «белы білет». Ён моцна кашляў і пляваў крывёю. Слова туберкулёз у нашай хаце не гучала, гаварылі чахотка ці сухоты.

Пачалася вайна. Паявіліся немцы і партызаны. 1942 год, зіма, маразы стаялі моцныя. Неяк ноччу ў вакно нашай хаты пастукалі. «Хто там?» – спытаў бацька, падышоўшы да дзвярэй. «Свае, адчы-

няй». Дзверы раскрыліся, у хату ўваліласся 8 мужчын. «Гаспадар, запальвай лямпу», – загадаў адзін. Я спаў на печы, выглянуў з-за каміна. З другой палавіны хаты ў дзвярах паявілася постаць маці.

«Хазяйка, стаў на стол усё, што ёсць. Хазяін, пакуль баба будзе рыхтаваць закуску, даставай самагонку.»

Мая дзіцячая душа інтуітыўна адчувала, што ад гэтых злых дзядзькаў нічога добрага мы не дачакаемся.

«Садзіцеся, калі ласка, да стала», – сказала маці.

Прычапіліся да бацькі з пытаннем: чаму ён не на вайне. Бацька растлумачыў, што ў яго белы білет. Галоўны партызан падняўся з-за стала, паставіў сярод хаты доўгую лаўку і загадаў, дастаўшы з вінтоўкі шомпал: «Лажыся спіной уверх. Я табе пакажу белы білет! Я што, ... тваю маць, должан за цябе родзіну зашчышчаць? – і стаў біць бацьку шомпалам. «Дзядзечкі, за што вы б'еце майго татку?» – заенчыў я. «Брысь адсюль, сучаня, а то і табе пападзе», – і ён пнуў мяне нагой у бок, і зноў прыняўся за бацьку.

«Міленькіе, за што вы б'еце майго мужа?» – Не вытрымала маці. «Адыйдзі, баба, – і загадаў: Сцяпан, выведзі кабету на двор». Галоўны яшчэ разы тры сцебануў бацьку: «А цяпер уставай, будзешь ведаць, як ад фронту дызертыраваць».

Адчыніліся дзверы, у хату ўвайшоў той, што вывеў маці і сказаў: «Сідарэнка, схадзі і ты, баба смачная, не пашкадуеш». Праз некаторы час ён вярнуўся з заплаканай маці.

Партызаны прадаўжалі піць і весяліцца, робячы выгляд, што нічога такога не здарылася. Выйшлі яны ад нас ноччу. Забралі ўсё сала, цыбулю, грыбы. Так партызаны паступалі не толькі з намі. Усе ў нашай вёсцы партазан пачалі баяцца. Яны ваявалі больш з насельніцтвам, чым з немцамі.

Прыйшла пара вешчы назваць сваімі імёнамі. Я, малалетак, ведаю такія выпадкі, калі немцы з сялянамі вялі сябе больш прыстойна, чым партызаны».

**Рымарев Николай, г. Минск.**

«Уважаемый главный редактор, я с большим интересом читал в Вашей газете рассказ Ильи Копыла «Нябышына. Вайна». Без сомнения это честный и правдивый рассказ очевидца.

В войну мне было 13–15 лет и я тоже был свидетелем, как выживала деревня в годы войны. Особенно ярко и правдиво описал И. Копыл действия партизан. И в нашей деревне не так боялись немцев, как партизан. Не немцы, а партизаны забирали домашний

скот, продукты питания и вообще всё, что сподобалось. Избили 70-летнего старика за то, что он не отдавал гармошку.

Но самое страшное – партизаны убивали ни в чём не повинных людей. Так в конце 1942 года и весной 1943 года в нашей деревне партизаны схватили и убили 5 совсем молодых людей, из них 3 учителя: Архипенко Яков Иванович, Римарев Гавриил Асонович, Руденко Павел, Шиленков Захар Алексеевич, Римарев Павел Асонович.

В соседней деревне Кирово схватили директора школы Корицкого, набросили на шею верёвку и тащили через деревню, пока не умер».

**Міхаіл Дубаўцоў, г. Мінск.**

✍ «Вялікі дзякуй «Народнай Волі» і яе аўтару Іллі Копылу за публікацыю «Нябышына. Вайна». Такую праўду аб вайне мала хто пісаў. Толькі такія мужныя творцы як наш Васіль Быкаў, ці рускія пісьменнікі Віктар Астаф'еў, Рыгор Бакланаў гаварылі аб тым, што насамрэч перажыў народ падчас страшнай трагедыі. Што да жыцця насельніцтва на акупаваных тэрыторыях, то гэта было ледзь не табу. У савецкі час лічылася, што ўсе, хто быў на акупаванай тэрыторыі – гэта ворагі.

З'яўленне ўспамінаў Іллі Копыла падымае заслону над схаванай праўдай. Тым больш цікава, што аўтар згадвае былыя падзеі, якія ўрэзаліся ў памяць вясковага хлапчука, які на сваіх дзіцячых плячах разам з дарослымі выносіў жудасці той трагедыі. Я і сам знаходзіўся на акупаванай немцамі зямлі тут у Мінску ўсе 3 гады. Мне было 12 гадоў. Аб чым піша І. Копыл, бачыў на ўласныя вочы...»

**Бацяноўскі Іван, г. Мінск.**

✍ «Здравствуйте, уважаемая редакция «Народнай Волі» и уважаемый Илья Копыл.

В 1-й год войны я видел немцев раза 3–4. Они приходили в нашу деревню Панишевщина и обращались к жителям: «Матка, яйка». Но в 1942 году события коренным образом изменились. Однажды ночью пришли к нам трое «партизан» и требовали отдать корову. Родители отказались. Тогда они избили моих родителей, взломали сарай, забрали корову.

Как-то зашёл к нам «партизан» с юным «партизаном», лет 10–12. Взрослый стоял с оружием, а юный партизан делал обыск под печью, в шкафу, в койках и забирали то, что считали нужным».

**Кахановіч Мікола, г. Пружаны.**

«Напярэдадні 65-й гадавіны заканчэння 2-й сусветнай вайны ідзе вельмі інтэнсіўная прапаганда той «гераічнай барацьбы савецкага народу» супраць гітлераўскай нямеччыны. Але ў гэтай прапагандзе значна больш хлусні, чым той праўды. Усё гэта падаецца нейкім агулам, казёншчынай, без усялякай канкрэтыкі, і замоўчваннем той жудаснай праўды, той трагедыі, якая выпала на долю беларусаў у прыватнасці. За пасляваенны час выдадзена мільёны і мільёны кніг пра тую вайну, але праўды пра чалавечыя лёсы там і паловы няма.

Што ж тычыцца так званага партызанскага руху на Беларусі, дык гэта навогул белая пляма і яна бадай больш за ўсё засакрэчана. І вядома чаму, бо сучасная пракамуністычнарасейская ўлада баіцца раскрыцця той праўды, якую тварылі так назоўныя партызаны над мірным бяззбройным насельніцтвам. І як бы ні хавалі праўду, усёроўна яна навідавоку, бо ёсць яшчэ жывыя сведкі таго, што амаль кожная спаленая вёска на Беларусі справацыравана партызанамі. З гэтай нагоды даўно пара нашым навуковым даследчыкам дэталёва правесці падрабязнае даследаванне па канкрэтнаму факту кожнай спаленай вёскі падчас 2-й сусветнай вайны на Беларусі...

Але вернемся да канкрэтнага выпадку таго далёкага і трагічнага часу. Наша сям'я тады жыла ў вёсцы Шані. Немцы заязджалі ў вёску нярэдка, але вёска жыла ціха і мірна. Немцы насельніцтва не рабавалі, нікога не забівалі, наадварот, прывозілі ў краму соль, запалкі, газу, мыла і іншы тавар, неабходны селяніну. Яны былі зацікаўлены, каб людзі працавалі на ўласных палетках і плацілі адпаведныя падаткі.

Першае гора ў нашу сям'ю, па расказу маіх бацькоў, прыйшло ў ноч на 3 дзень Раждества Хрыстова 1943 года, гэта значыць у ноч з 9-га студзеня 1943 года. Мне на той момант было ўжо трошкі больш за 4 гады, майму брацiку толькі каля 2 гадоў. У тую ноч наша сям'я праснулася ад звону разбітай шыбы, потым грукат у дзверы, лаянка незнаёмых людзей на расейскай мове. У хату ўварваліся толькі двое «партызан», а астатнія засталіся ў двары. Наставіўшы вінтоўкі, бацьку і маці ў ніжняй бялізне паставілі да сцяны. Маці паспела ўзяць на рукі брацiка, а я, як старэйшы, стаў побач з маці, ухапіўшыся ад страху за яе начную сарочку.

Кожны ведае, што заўсёды дбайны селянін перад Новым годам закольвае вепрука. Таму адразу тыя бандыты з лесу сталі патрабаваць ад бацькі паказаць, дзе схаваны цабэрак з салам, кумпякі, каўбасы і г.д. Бацька ўсё ім аддаў. Потым тыя партызаны вынеслі з клеці мяхі



*Андрэй Копыл, родны брат Іллі. Трагічна загінуў 4 лютага 1984 г. ва ўзрозсце 53 гадоў*

з мукою, грэчкай, просам. У той жа самы момант другія «партызаны» ўжо гаспадарылі ў хляве, звязалі дзве авечкі – і ўвесь гэты нарабаваны скарб паклалі на сані. Яны прыехалі аж на 3-санным абозе. Бацька потым казаў, што бачыў усяго 5 тых бандытаў.

Але справа на гэтым не скончылася. Бандыты забралі бацькаў кажух і валёнкі. Бандыты чамусьці ведалі, што ў бацькі ёсць хромавыя боты, хромавая тужурка і добрыя святочныя нагавіцы. Усё гэта было надзейна схавана. Бацька да апошняга не збіраўся ўсё гэта аддаваць партызанам. Але бандыты, настойліва пагражаючы, патрабавалі ім аддаць усё. Адзін з іх сказаў, што калі бацька не аддасць добраахвотна ім названыя рэчы, то першым застрэліць гэтага шчанюка, тычучы ў мае дзіцячыя грудзі ствол вінтоўкі. Потым падымае ствол вінтоўкі вышэй маёй галавы і страляе ў сцяну. Што было далей, я на той момант ужо не памятаю. Потым маці сказала, што я адразу ўпаў і страціў прытомнасць. Але самае страшнае для нашай сям'і было тое, што я ад таго страху анямеў. Наогул перастаў размаўляць. (Вылечыў немец, доктар-знахар. Мова паступова вярнулася.) Бацька таму немцу-чараўніку вырашыў заплаціць двума, сваім і матуліным, залатымі пярсцёнкамі. Але той немец-чараўнік катэгарычна адмовіўся браць плату.

Пасля той зімы 1943 года яшчэ шмат нацярпеліся страху, бо кожнае з'яўленне партызан у вёсцы магло скончыцца трагедыяй для вяскоўцаў.

Савецкія партызаны-камуністы не шкадавалі нават дзяцей, а фашысты іх лячылі».

Вось такія лісты чытачы «Народнай Волі» дасылалі ў рэдакцыю. Трэба адзначыць, што большасць аўтараў лістоў – састарэлыя людзі, якія перажылі акупацыю, будучы падлеткамі. Усё, аб чым яны пішуць, гэта асабісты досвед. Газета друкавала мае ўспаміны, людзі з захапленнем іх чыталі, сапераджывалі, пісалі і тэлефанавалі як у рэдакцыю, так і асабіста мне. 26 сакавіка 2010 года выйшаў апошні нумар «Народнай Волі» з маімі ўспамінамі. Усё было ціха, і раптам, праз тыдзень, як гром з яснага неба – пікет!

Пра пікет я даведаўся адразу. У мяне была сустрэча каля ўніверсама «Рыга» з пісьменнікам, журналістам Яўгенам Лецкам. Якраз у гэты самы час зазваніў мой мабільнік, званіла карэспандэнт Радыё Свабода Галіна Абакунчык. Яна запыталася ў мяне, ці ведаю я, што зараз адбываецца перад рэдакцыяй «Народнай Волі»? Я нічога не ведаў. Яна мне і расказала, што актывісты ветэранскіх арганізацый праводзяць пікет каля рэдакцыі «Народнай Волі». Яны пратэстуюць супраць публікацыі ў газеце маіх успамінаў «Нябышына. Вайна». Пікет дазволены ўладамі. Галіна Абакунчык папрасіла мяне, як аўтара публікацыі, пракаментаваць гэтую акцыю ветэранаў. Вось мой каментар карэспандэнту Свабоды, ён маецца на сайце *(Архіў за 6.04.2010 г.)*:

> «Ветэраны прывыклі жыць паводле прыгожых мітаў і яны працягваюць у гэтых мітах жыць. Мне на хатні тэлефон тэлефанаваў адзін ветэран і казаў: як жа вы маглі напісаць такі бруд перад Днём Перамогі. Вы ж, маўляў, маглі прыйсці да нас у саюз афіцэраў ці саюз ветэранаў. Мы б селі за круглы стол і ўсё б абмеркавалі. Я яму адказаў, што ў вас было 65 гадоў для круглых сталоў, чаму вы не абмяркоўвалі? Але ёсць і іншыя званкі, мне тэлефануюць людзі з усёй Беларусі, запрашаюць у госці. Яны кажуць, што ў іх вёсках адбывалася тое ж самае – па ўсёй Беларусі. Таму я нічога не шкадую, бо я напісаў праўду».

Ветэраны-пікетоўцы, якіх было чалавек 30–40, трымалі ў руках плакаты: «Позор фальсификаторам истории!», «Долой клевету», «Ветераны против лжи!», «Нацизм не пройдёт!» ды іншыя. Што цікава, калі я пазнаёміўся са зместам плакатаў, то злавіў сябе на думцы, што я згодзен з іх зместам. І я і, спадзяюся, мільёны людзей як у Беларусі, так і за яе межамі супраць хлусні, супраць паклёпу, супраць нацызму. Безумоўна, я падтрымліваю плакат: «Позор фальсификаторам истории!» Разам з Вамі, шаноўныя ветэраны,

я гатовы паставіць тых фальсіфікатараў да ганебнага слупа. Нельга і шкодна выкладаць у школах і ВНУ гісторыю, якая грунтуецца на мітах і хлусні і не мае нічога агульнага з рэчаіснасцю. Але бяда ў тым, што вы, ветэраны-пікетоўцы, сваім пікетам якраз і абараняеце фальсіфікатараў гісторыі.

У гэты ж самы дзень, калі адбываўся пікет ветэранаў, а гэта было 6 красавіка 2010 года, Радыё Свабода запрасіла мяне паўдзельнічаць у перадачы «Начная Свабода». Я пагадзіўся. Галоўная думка, якую я выказаў у размове з карэспандэнтам Свабоды, было наступнае: «У часы акупацыі адбываўся генацыд беларускага народа з двух бакоў, як з боку немцаў, так і з боку партызан, прычым вядучая роля належала партызанам».

На наступны дзень на мяне абрынуўся шквал тэлефонных званкоў, не змаўкалі і хатні тэлефон і мабільны. У гэты ж дзень мяне запрасілі на Радыё Свабода правесці онлайн-канферэнцыю. Вось яе матэрыял, ніякіх правак я не рабіў:

• **Мікола:**

«Ці вам не сорамна красавацца адзетым у ўніформу маёра акупацыйнай Чырвонай Арміі, ці вы проста не разумееце што робіце?»

*І. Копыл:*

«Я ў Чырвонай Арміі не служыў, я служыў у Савецкай Арміі. Гэта вялікі адрэзак маёй біяграфіі. Я не збіраюся ад яго адмаўляцца. Асабіста я, ды і ніхто з маіх калег-афіцэраў, ніколі не адчувалі, што мы – акупанты. Я проста вывучаў салдат выконваць свае абавязкі. Акрамя таго я сам нёс баявое дзяжурства ў ракетнай пускавой шахце. У шахце прайшла большая частка маёй службы. Таму мне не сорамна за маю «ўніформу». Я афіцэр і, магчыма, дзякуючы гэтаму статусу я зараз на Радыё Свабоды адказваю на ваша пытанне».

• **Язэп, г. Мінск:**

«Спадар Ілля, з вялікай цікавасцю прачытаў публікацыю вашай кнігі ў «Народнай Волі», карыстаючыся нагодай хачу выказаць Вам і рэдакцыі «Народнай Волі» шчырую падзяку і даведацца, ці выйдзе ваш твор асобнай кнігай?»

*І. Копыл:*

«Вялікі дзякуй Вам, Язэп за добрыя словы. Кніга ўжо выйшла напрыканцы мінулага года, але наклад невялікі. Я ўсё раздаў на прэзентацыі».

**· Николай, г. Минск:**

✍ «Если б НКВДисты не пикетировали офис НВ, я бы не узнал о такой хорошей и правильной книге. Благодарность автору».

*І. Копыл:*

«Дзякуй, Мікалай, за добрыя словы. Калі выйшла кніга, пра яе даведаліся некалькі сотняў людзей. «Народная Воля» пашырыла гэта кола зацікаўленых людзей да дзесяткаў тысяч. Пікет ветэранаў зрабіў маю кнігу вядомай на ўвесь свет. Інфармацыя ёсць на шмат якіх сайтах у Інтэрнэце.

**· Ветэран, г. Мінск:**

✍ «Шаноўны спадар Ілля! Ваша публікацыя выклікала буру эмоцый. Вас, пацана, якому ў вайну было 7 гадоў, папракаюць тыя, хто пакінуў вас на закланне ворагу. Наша «баявая» армія адкацілася і пакінула беларускіх хлапчукоў зведаць усе цяжкасці лёсу. Тыя бравыя ветэраны, якім у вайну і пасля яе хапала і хапае здароўя, павінны былі цаной свайго жыцця не дапусціць акупацыі. Але дзе яны былі тады, чаму не палеглі на полі бітвы? Заткнуць рот дзіцяці прасцей, чым адказаць на гэта пытанне. Маўчаць усе, хто ведае праўду пра вайну. Здзіўляе і наша «ідэалогія». «Адшукалі» сякеру пад лавай: знайшлі ворага ў ваенным пацану, падлетку, які на свае вочы бачыў тое, што было».

*І. Копыл:*

«Дзякуй, шаноўны Ветэран за ваша меркаванне. Вы сказалі вельмі слушна, я з вамі згодзен».

**· Виктор, г. Барысаў:**

✍ «Я могу представить живых свидетелей войны в Борисове, которым было по 10–14 лет на тот момент и они прекрасно помнят всё происходящее в реальности. Как относились партизаны к мирному населению и что они делали! И это всё подтверждается: грабежи, унижения жителей деревень и т.д. И пусть они скажут, как и что происходило. Своему народу надо верить и об этом говорить правду. Когда свой народ уничтожал своего. Не стоит об этом забывать. А те, кто пикетирует по заявкам «Народную Волю» и высказывают свою точку зрения, пусть выступят на страницах НВ и расскажут о себе, как они, которым сегодня 60–65 лет, защищали Родину и что они видели?»

*І. Копыл:*

«Я з вамі згодзен, шаноўны Віктар. Сведак той вайны яшчэ шмат, хто быў падлеткамі. Але іх застаецца ўсё менш і менш. Шаноўны

Віктар, калі сярод іх ёсць вашы знаёмыя, сваякі, паразмаўляйце з імі і напішыце ў «Народную Волю». Так пішацца гісторыя. Гэта застанецца ў памяці».

**· Вячак, г. Берасьце:**

✍ «Спадар Ілля, перш за ўсё хачу выказаць вам падтрымку. Як пры Саветах так і сёння ўлада цкавала тых, хто кажа праўду. І дзякуючы такім, як вы, яе не схаваць пад кіпаю ілжы.

Маё першае пытанне. На вашу думку, хто пікетаваў рэдакцыю НВ і што гэта за ветэраны? 2-е пытанне. Што рабілі партызаны ў ВАВ на Беларусі, а што Народная самаабарона? 3-е пытанне. Што рабіць, каб гісторыю ВАВ (без усялякай хлусні) разгледзелі на самым высокім узроўні і пачалі друкаваць у дзяржаўных газетах?»

*І. Копыл:*

«Хто аргіназаваў пікет, дакладна не ведаю. Але я не аднойчы бачыў, як ветэранаў падвозілі на аўтобусах на падобныя акцыі. Гэта былі пенсіянеры, не абавязкова ветэраны ВАВ, сабралі тых, каго можна было сабраць.

Што рабілі партызаны? На маю думку, змагацца супраць немцаў, гэта была не галоўная іх задача. На маю думку, калі прааналізаваць, як палілі Хатынь, усяго 619 вёсак, то можна прыйсці да высновы, што галоўнай мэтай партызан было правакаваць немцаў на рэпрэсіі супраць мірнага насельніцтва. Гэта прымушала насельніцтва папаўняць шэрагі партызан і давала магчымасць савецкаму рэжыму пераключыць увагу сусветнай супольнасці з уласных злачынстваў на злачынствы немцаў. Самаабарона была створана ў сакавіку 1944 года, калі вы маеце на ўвазе БКА. Яна не паспела як мае быць развярнуцца. Пасля вызвалення Беларусі БКА працягвала змагацца супраць Чырвонай Арміі за межамі Рэспублікі. Што тычыцца БСА – Беларускай самааховы, то яна была створана ў чэрвені 1942 года, а вясной 1943 года была распушчана. Яна абараняла вёскі ад партызан, але немцы не жадалі ўзбройваць насельніцтва».

**· Мікола, г. Мінск:**

✍ «У сваёй кнізе вы ставіцеся з нянавісцю да партызан, да немцаў – з сімпатыяй. Галоўная думка твора: «Маскоўскі рэжым» стварыў партызанскі рух для таго, каб з дапамогай правакацый ажыццявіць генацыд беларускага народу рукамі немцаў. Маўляў, партызаны рабілі ўсё магчымае, каб беларускія вёскі былі спаленыя, а немцы хіба толькі клюнулі на нажыўку. Як вы на фоне гэтага можаце пракаментаваць тое, што немцы праводзілі не толькі кар-

ныя экспедыцыі, а яшчэ ад пачатку вайны будавалі канцлагеры, дзе памірала мірнае насельніцтва; што паводле плана «Ост» павінна быць знішчана 75 % насельніцтва Беларусі?»

*І. Копыл:*

«Шаноўны Мікола, калі ў вашым пытанні прыбраць пытальнік і паставіць кропку, то гэта і будзе мой вам адказ. У сваёй кнізе я не стаўлюся з сімпатыяй, ці антыпатыяй, ці з нянавісцю ні да немцаў ні да партызан. Прайшло шмат часу, усе гэтыя пачуцці прытупіліся. Я проста пішу аб тым, што бачыў і як усё гэта ацэньваю асабіста. Пра злачынствы немцаў ужо пішуць амаль 70 гадоў. Надышоў час казаць і пра злачынствы прамаскоўскіх партызан.

**• Мікола, г. Мінск:**

✍ «Тым, хто пытаецца, што за ветэраны такія пікетавалі, раю паглядзець сюжэт АНТ. Яромін, у якога бралі інтэрв'ю, дагэтуль пісаў ужо ў Совбелку і падпісаўся як «партызан 100-й брыгады імя Кірава».

*І. Копыл:*

«Я Савбелку не чытаю. Дзякуй за падказку, зазірну.

**• Wojsza:**

✍ «Пане маёру, не ўпершыню чую на РС Вашыя выказванні пра нашу Радзіму – Літву – і мяне яны вельмі ўсцешваюць. Бо ўважаю і паўсюд адкрыта дэкларую сябе за літвіна, і на перапісы-2009 – з сям'ёю, з сябрамі ды іхнымі сем'ямі запісаліся літвінамі. Здаровейка пану літвіну і крэўным ягоным!»

*І. Копыл:*

«Дзякуй за пажаданні. Кіраўнікі Беларусі – і савецкія і сучасныя – з лёгкасцю адракаюцца ад нашай тысячагадовай гісторыі, аддаюць яе суседнім краінам. Калі нас будзе большасць, то мы ўсё згубленае вернем».

**• Уладзімір, г. Мінск:**

✍ «Кідаецца ў вочы, што ў тых «ветэранаў» усе надпісы парасейску. Пэўна гэта не беларускія партызаны? Здзіўляюся з гэтых старых людзей... Чым лямантаваць каля чужой ім газеты, лепш напісалі б сваё бачанне тых часоў і надрукавалі ў сваіх газетах: ці «Савецкая Б...» ці ў «Товаріще». А спадара І. Сярэдзіча прашу іх камуняцкую хлусню не друкаваць, бо не таму я падпісваўся на «Народную Волю», каб чытаць нейкі вздор. Друкуйце больш такіх цікавых і шчырых твораў, як успаміны Копыла, Шаранговіча, Садоўскага».

*І. Копыл:*

«Дзякуй, Уладзімір. Справа ў тым, што тыя ветэраны ўжо свае міты напісалі. Больш пісаць няма чаго. Зараз ім трэба тыя міты бараніць».

**• Миронов Константин:**

✍ «Спасибо Илье Копылу за те слова правды, что он говорит!»

*І. Копыл:*

«Дзякуй, Канстанцін, за падтрымку».

**• Цікаўны:**

✍ «А ці ёсць вашы равеснікі, якія падзяляюць вашы погляды на вайну?»

*І. Копыл:*

«Шаноўны Цікаўны, маіх равеснікаў, якія маюць тыя ж самыя погляды на вайну, як і я, вельмі шмат. Калі выйшла мая кніга, мне штодзённа паступалі званкі падтрымкі. Але гэта было не так шмат, бо кніга мела наклад толькі 100 асобнікаў. Калі ж «Народная Воля» перадрукавала маю кнігу, то яе прачыталі дзесяткі тысяч чалавек. На мае тэлефоны штодня паступаюць званкі падтрымкі, усе пытаюцца, дзе можна набыць кнігу. Больш за 20 званкоў было ад людзей якія запрашалі мяне да сябе ў госці ў свае вёскі, і абяцалі распавесці ўласныя гісторыі, каб я потым напісаў кнігу пра тое, што перажылі яны і іхнія вёскі ў часы вайны. А калі адбыўся пікет каля рэдакцыі «Народнай Волі», на мяне абрынуўся шквал званкоў, у тым ліку з іншых краін свету. І ўсе пыталіся, дзе набыць маю кнігу. Людзі цікавяцца, ці будзе другое выданне. Але я выдаў кнігу за свае грошы. На другое выданне грошай у мяне няма».

**• Віктар, г. Менск:**

✍ «Ці былі вы ў КПСС? Як вы ставіліся да камуністычнай ідэалогіі? І як ставіцеся цяпер?»

*І. Копыл:*

«Шаноўны Віктар, я быў афіцэрам Савецкай Арміі і я абавязаны быў быць сябрам КПСС. У яе шэрагах я прабыў 29,5 гадоў. Выйшаў з яе за год і тры месяцы да ГКЧП. І я ганаруся сваім учынкам, тым, што зрабіў гэта тады. Калі я зрабіў гэты ўчынак, то адчуў вялікую палёгку, нібыта я пазбавіўся ад нейкага ярма. У той час я займаў інжынерную пасаду ў ваенным прадстаўніцтве аднаго з заводаў г. Мінска.

• **Юля:**

✍ «Вы жылі на мяжы двух сістэм да 1939 года. Ці быў нейкі яскравы ўспамін малога хлапчука таго перыяду».

*І. Копыл:*

«Да польскай мяжы ад маёй вёскі, што знаходзілася на савецкім баку, было 6 кіламетраў. На мяжы нічога незвычайнага не адбывалася. Што рабілася на тым баку, мы нічога не ведалі. Адзінае, што мне запомнілася, што ў нашай хаце часта бывалі памежнікі. Яны прыходзілі да майго бацькі, які быў старшынёй калгаса, вырашаць свае пытанні. Часам яны нават распачыналі са мной розныя дзіцячыя гульні».

• **Сергей Кн. г. Минск:**

✍ «Большое спаспибо за Вашу книгу. К сожалению наши старики-свидетели уходят от нас, а они ещё много чего могут рассказать. Нужно дать им слово, а не этим военным «политрукам» и бывшим НКВДешникам. Газета никогда не опубликует все воспоминания – у неё места не хватит. Я думаю, что следовало бы открыть сайт или ЖЖ (журнал), в котором люди могли бы оставлять свои воспоминания или воспоминания своих родителей (знакомых) о войне. Без всякой цензуры публиковать все воспоминания. Пришло время говорить правду о той войне, а не повторять сталинско-коммунистический взгляд на вторую мировую».

*І. Копыл:*

«Стварыць такі сайт было б вельмі добра. Пра другую сусветную вайну трэба яшчэ шмат чаго сказаць. Многія ветэраны праўду не жадаюць казаць і слухаць, бо ім зручней жыць у мітах, якія яны самі для сябе і стварылі. Калі судзіць па лістах і званках, якія я атрымаў (а іх былі сотні), то ў людзей ёсць што сказаць...»

• **Павел:**

✍ «Шаноўны Спадар, скажыце, калі ласка, чаму ж Вы выйшлі з камуністычнай партыі аж толькі ў 1991 годзе? Вядома, што паважаныя асобы пачалі гэта адважна рабіць з 1988 года. Ці прымаеце Вы прынцыпы і метады працы гэтай партыі і ці гатовы былі б за яе аддаць сваё жыццё?»

*І. Копыл:*

«Шаноўны Павел, па-першае, я выйшаў з КПСС не ў 1991-м годзе, а 1 чэрвеня 1990 года. быў удзельнікам выбараў 1990 года, калектыў 8-га цэха МЭМЗа вылучыў мяне кандыдатам у дэпутаты Менгарсавета. Я агітацыю правёў з партыйным білетам у кішэні

і пад бел-чырвона-белым сцягам. На сустрэчах з выбаршчыкамі мне задавалі пытанне, чаму я, член КПСС, сяджу пад бел-чырвона-белым сцягам, і чаму б мне не выйсці з КПСС. На што я адказаў, што буду знаходзіцца ў КПСС, пакуль у мяне будзе магчымасць разбураць гэтую партыю знутры. У сярэдзіне 1990 года заставацца ў КПСС ужо мне было немагчыма, і я пакінуў яе шэрагі».

## Два інтэрв'ю ў «Белгазеце»

На гэтым онлайн-канферэнцыя закончылася. А ў пад'езда дома, дзе я жыву, мяне ўжо чакаў карэспандэнт «БелГазеты», каб задаць свае пытанні.

У гэты ж самы час для «БелГазеты» даваў інтэрв'ю мой апанент, арганізатар пікета Адоньеў, старшыня Мінскай арганізацыі ветэранаў.

### *«Клеветников к ответу!»*

«Анатолий Адоньев: «Заскакиваю в нашу хату – а там немцы: один играет на губной гармошке, второй чистит карабин. И вот он я – ребенок, без оружия, без ничего, безвинное дитя. Один из немцев поворачивается – и штыком на меня!»

***Справка «БелГазеты»:*** Анатолий Адоньев родился в 1937 г. в Ставропольском крае. Закончил Вильнюсское радиотехническое училище войск ПВО, военно-политическую академию им. Ленина, Академию Генштаба. В 1970–72 гг. участвовал в боевых действиях в районе Суэцкого канала (Египет). Был переведен в Брест на должность начальника политотдела зенитно-ракетной бригады ПВО. Работал в политотделах Туркменского, Уральского и Закавказского военных округов, член Военного совета, начальник политотдела армии ПВО. Награжден орденами и медалями. Председатель совета Минской городской организации Белорусского общественного объединения ветеранов.

6 апреля в Минске белорусские ветераны провели санкционированный Мингорисполкомом пикет у здания редакции газеты «Народная Воля». В руках у пикетчиков были плакаты «Клеветников к ответу!», «Победили фашистов – победим и клеветников», «Нацизм не пройдет!».

Таким образом ветераны выразили свое возмущение по поводу публикаций в газете избранных глав из книги воспоминаний Ильи Копыла «Небышино. Война». В этой книге, по мнению пикетчиков, Копыл, основываясь на собственных воспоминаниях, очерняет белорусских партизан, действовавших на оккупированных немцами территориях. Чтобы разобраться, где правда, а где ложь, корреспондент «БелГазеты» Кирилл Борисенко встретился с организатором пикета, председателем совета Минской городской организации ветеранов Анатолием Адоньевым и автором книги Ильей Копылом.

Анатолий Адоньев: «Правда в том, что мы победили!»

**– Что-то не припоминаю случая, когда кому-то удавалось получить согласие властей на проведение подобных акций в непосредственной близости от здания администрации президента. Как вам удалось?**

– Мы живем в свободной республике – поэтому просто обратились в Мингорисполком с заявлением, что хотим провести пикетирование редакции газеты «Народная Воля». Я не берусь оценивать действия Мингорисполкома и обстоятельства, в которых принималось решение разрешить нам провести пикет. Мы действовали в соответствии с нашим законодательством.

**– Чего вы хотели добиться пикетированием?**

– Я руководитель ветеранской организации, и когда ко мне приходят живые участники партизанского движения, которых теперь обливают грязью, – ну как я должен поступать? На пикете мне задали вопрос: «Почему вы возмущаетесь?» Я ответил: *«У вас участники войны в семье есть? Дедушка? А если вашего дедушку, которого вы любите, который воевал, будут обливать грязью – вы что будете делать?»*

Почему оппозиционные СМИ стараются поднять эту грязь? Зачем оппозиция однобоко чернит героические подвиги людей?

– А кстати, зачем?

– Потому что других возможностей привлечь к себе внимание у них нет. И кое-кто клюет на эти жареные факты...

**– В «БелГазете» в 2002 г. по материалам Национального архива была опубликована серия статей под рубрикой «Неиз-**

**вестная война» — о нелицеприятных действиях партизан на оккупированной немцами территории.**

– Я пользуюсь информацией из наших государственных СМИ.

*– ...где упоминались многочисленные факты мародерства, погромов, пьянства и изнасилований местных жительниц партизанами. По сравнению с этими фактами воспоминания Копыла вполне безобидны...*

– Копыл в этих архивах не был. Общаясь с Александром Слободой, командиром партизанского отряда, с Зинаидой Корж, дочерью прославленного партизанского командира, с другими партизанами-подпольщиками и читая их воспоминания, я не столкнулся с такими фактами. Поэтому сказать, что партизаны допускали подобное, я не могу.

**– Вот смотрите: «Среди отчетов о боевых действиях»...**

– Ну, это не надо зачитывать. Может, эти документы, на которые вы ссылаетесь, сотворили немцы, оставив их для того, чтобы у нас были сомнения? Объективность этих документов трудно установить. А мы говорим с живыми людьми.

*– «...посылаемых первому секретарю ЦК КП(б)Б Пантелеймону Пономаренко, были и такие: «Довожу до вашего сведения об исключительном безобразии отряда Богатырева. Начиная с июня отряды не вели никаких боевых действий. Занимаются мародерством и пьянством. Основали 5 винокуренных аппаратов. Устраивают именины и дни рождения, сопровождаемые недельными попойками»...*

– Я не знаю таких фактов и не берусь их комментировать – после двусмысленностей, которые здесь изложены и которые дают совершенно противоположную оценку тому, с чем я встречаюсь. Ни от одного из партизан я не слышал ничего подобного.

**– Не пора ли вам тогда прийти в Национальный архив и потребовать убрать оттуда ложь?**

– Не пора ли СМИ не обобщать, а брать какое-то конкретное лицо и о нем говорить? Берется единичный факт, и из него выводят оценку общего партизанского движения – это же неверно! Сомнения о вкладе белорусского партизанского движения в борьбу с фашистскими захватчиками сеются не для нас (нас-то уже трудно перевоспитать!) – легче вложить это в голову молодому поколению!

**— А почему, кстати, патриотическая молодежь БРСМ не поддержала вас в пикетировании?**

– Мы их и не просили нас поддерживать. Но если бы попросили – они бы все пришли туда: и БРСМ, и пионеры, и школьники... Мы решили вначале пойти сами и попытаться поговорить. Но Середич (Иосиф Середич – главный редактор «Народнай Волі». – «БелГазета») сбежал, Лебедько (Анатолий Лебедько – лидер Объединенной гражданской партии. – «БелГазета»), находившийся тогда в редакции, прошмыгнул.

– И чего вы добились своей акцией?

– Мы просто попытались привлечь внимание СМИ к тому, что не должно быть извращения фактов.

**— А если дело в том, что наше общество просто еще не созрело для того, чтобы услышать всю правду о партизанском движении в Беларуси?**

– Какую правду? Правда в том, что мы победили! Так почему же мы эту правду втаптываем в грязь?

**—Что сохранилось в ваших воспоминаниях о жизни в оккупации?**

– Я в то время был в таком же возрасте, как и Илья Копыл – и у меня остались совсем другие воспоминания. До сих пор помню, как пришли к нам немцы и как – наши. Заскакиваю в нашу хату – там немцы: один играет на губной гармошке, второй чистит карабин. И вот он я – ребенок, без оружия, без ничего, безвинное дитя. Один из немцев поворачивается – и штыком на меня! И второй пример: ушли немцы, утром я пришел к деду с бабкой, смотрю – в палисаднике сидят наши солдаты. Бабка нажарила семечек, говорит – иди угости солдатиков. Я подхожу к ним с этим решетом – один меня по голове погладил, другой подарил мне бинокль, третий подарил очки мотоциклиста...

И теперь, когда я читаю воспоминания Копыла, я думаю: *«Ну о чем пишет этот человек Почему он обеляет фашизм?»* Он же офицер! Что у него в мозгах, куда они повернулись? Он пишет, что при немцах в их деревне был рай – и школы работали, и они учились, и жили богато, и по три кабана держали, и по десять овец было. Это же был центр партизанского движения – ну какой там рай?

**– Собираетесь подать на Копыла в суд за клевету и искажение фактов?**

– Ветераны как раз это и предложили! Мы еще посмотрим, что придумают СМИ... Ветеранская боль, боль тех людей, которые все это пережили, от этих фактов клеветы только обостряется – задето живое, задеты люди, которые освобождали Беларусь, воевали здесь в партизанах...

**– Сейчас наблюдается тенденция: за ветеранов войны все чаще говорят люди, которые к участию в военных действиях прямого отношения не имели...**

– Как может руководить ветеранскими организациями человек в 90 лет? Да, он предан нашей республике душой и телом, он все понимает, но не хватает сил и возможностей... А я руководитель – если ко мне идут партизаны со своими проблемами и заботами, я выражаю их мнение.

## *Своё отпартизанили*

Илья Копыл: «**Действия партизан во время войны можно рассматривать как целенаправленное уничтожение белорусского народа**».

***Справка «БелГазеты»:*** Илья Копыл родился в 1934 г. в деревне Небышино Бегомльского района Минской области (ныне Докшицкий район Витебской области). Во время Великой Отечественной войны находился с семьей в немецкой оккупации. В 1957 г. окончил Минское артиллерийско-минометное училище. В 1957–61 гг. служил в частях Приволжского военного округа, 1961–81 гг. – в ракетных войсках стратегического назначения. В 1970 г. окончил Ростовское высшее командно-инженерное ракетное училище. В 1981 г. уволен в запас. До 1997 г. работал инженером в военном представительстве ракетных войск на Минском электромеханическом заводе. В 1990 г. выдвигался кандидатом в депутаты Минского горсовета». В 1990 г. вышел из КПСС.

Илья Копыл: «**Для ветеранов важно дожить, купаясь в мифах**».

❧ ❧ ❧

**– При написании книги вы пользовались документами Национального архива?**

– Я отталкивался только от собственных воспомнаний, в архивах я не был. В этом не было надобности – писал я в основном про себя и про свою семью. Даже про свою деревню я не всё написал.

**– Почему ветераны так бурно отреагировали на публикацию глав из вашей книги в газете «Народная Воля»?**

– Ветераны привыкли жить в красивых мифах, которые сами же про себя и сочинили – сразу же, как им позволили писать воспоминания. На самом деле в этих мифах все неправда, происходило все совсем не так. А ветераны теперь свои мифы вынуждены защищать – больше им ничего не остается.

Что касается пикета, то видно было, что он организован не самими ветеранами: книга вышла в прошлом году осенью, газета с марта публиковала мои материалы из книги, а ветераны устроили пикет спустя полторы недели после этого.

**– Ветераны пришли на пикет, возмущенные до глубины души...**

– Сейчас в живых ветераны какие – те, кто застал конец войны, 1926 г. рождения. Они войны почти не видели. Не надо забывать, что ветераны были и такие, которые стояли под Сталинградом в заградотрядах и гнали в атаку. Они же тоже ветераны! И они протеснуют... Старые люди. Для них это важно – дожить, купаясь в этих мифах.

**– Смогут ли ветераны выдержать правду о партизанском движении в Беларуси? Может, еще не настало время публиковать такие воспоминания?**

– Если сейчас это время не настало, то скоро не будет ни одного живого свидетеля войны и не будет, у кого спросить, что и как было. Правду нужно сказать – какой бы горькой она ни была. И историю войны надо написать такой, какой она была. В России есть такой историк Марк Солонин – он перевернул все архивы и описал правдивую войну. Я еще подумал, когда был этот пикет: *«Почему бы ветеранам не пойти к российскому посольству и не протестовать против трудов Марка Солонина?»*

**— Государство сейчас поддерживает не вашу правду, а правду бывших партизан. Почему оно до сих пор не почистило Национальный архив, где хранятся документы, повествующие о нелицеприятных действиях партизан на оккупированной немцами территории?**

– Я думаю, что многие документы уничтожены – остались крохи. Наверное, не хватает у властей решительности – надо же что-то оставить про войну, иначе получится, что и войны не было.

**— В руках участников пикета были плакаты с лозунгом: «Фашизм не пройдет!». Вы пропагандируете фашизм в своих воспоминаниях?**

– Я написал то, что происходило в моей деревне. Я написал, что немцев видел только четыре раза за всю войну – и в совершенно безвинной ситуации, чего я не могу сказать о партизанах. Немцы за всю войну не убили у нас в деревне ни одного человека – партизаны убили одну девушку и человек 15–20 спалили полицаи. Вот и все жертвы нашей деревни.

**— Факты мародерства, насилия, пьянства и убийств в белорусской партизанской среде единичны или складываются в общую характеристику партизанского движения в Беларуси?**

– За все это время мне поступила маса звонков и более 20 приглашений приехать в другие деревни, где мне расскажут, как все было (а ситуация нашей деревни повторялась и в других деревнях). Я им отвечал: «*У вас же есть люди, они лучше знают ситуацию, они лучше напишут. Я же не журналист, не историк*».

Но то, о чем я пишу, происходило повсеместно. Освещается правда о действиях партизан. В моем районе действовала бригада «Железняк»: единственное, что она делала, – это всю войну провоцировала немцев на карательные мероприятия. В мемуарах командир бригады «Железняк» пишет, что они дважды разгромили в Небышино немецкий гарнизон. Но в моей деревне никогда в жизни немцы даже не ночевали! Как можно разгромить то, чего нет?

**— По-вашему, партизанское движение — это сплошной набор мистификации?**

– Возможно, все намного сложнее. Действия партизан во время войны можно рассматривать как целенаправленное уничтожение белорусского народа. Постоянные провокации немцев на карательные операции против населения – все эти 619 деревень были сожжены по одному и тому же сценарию, который разрабатывался, я думаю, непосредственно в партизанских штабах. Сначала партизаны провоцировали немцев – стреляли по одиночной машине и бежали к деревне, где их след пропадал, а потом получалось, что засаду организовали жители деревни. Немцы деревню окружали и уничтожали.

**– Вы готовы к тому, что ветераны могут подать на вас в суд за очернение образа белорусских партизан?**

– Я очернения никакого не вижу: я написал только свою правду.

**– Эта книга – заказ?**

– Заказа никакого не было. Всю эту правду я с детства носил в себе. Первый раз я попробовал написать об этом в 2003 г., опубликовал в газете «Народная Воля» небольшой отрывок. А когда в 2005 г. готовились отмечать 60-летие Победы, на радио «Свобода» объявили: присылайте свои воспоминания о войне. Вот я и написал эту книгу. Рукопись передал на «Свободу», книгу передали в Прагу в архив, – и больше ни звука не было. Тогда я решил сам искать издателя: отложил две свои пенсии, заплатил за книгу, и книга вышла в октябре 2009 г.

**– На появление отрывков из вашей книги в «Народнай Волі» остро отреагировала только городская организация ветеранов Минска. Не говорит ли это о том, что сегодня общество готово спокойно воспринимать всю правду о войне?**

– Судя по телефонным звонкам из Беларуси, Литвы, с Украины, из Казахстана, Германии – да. Вся Беларусь заверяла меня в том, что я написал про них, у них было все точно так же. Не знаю, как можно эти материалы опровергать.

И ветераны ведь тоже не все были на пикете – есть среди них и те, которые думают по-другому.

**– Почему же БРСМ не поддержал ветеранов на пикете?**

– Видно было, что пикет собирался в спешке – просто не успели как следует организовать. Ветераны пришли к редакции «Народнай Волі» и стали требовать изъять из продажи мою

книгу... Книги в продаже не было – я издал только 100 экземпляров, все раздал, только 10 книг поступило в «Академкнигу». Да и как «Народная Воля» может изъять мою книгу из продажи, если она ее не издавала?

В спешке их обзвонили, автобусом собрали, высадили у Александровского сквера – и пешочком до редакции ветераны прошлись. На все революционные праздники ветеранов так собирают: обзванивают, а потом приезжает автобус и привозит.

Газета з маім інтэрв'ю выйшла з друку 13 красавіка 2010 года. Вось з яе я і даведаўся пра інтэрв'ю Адоньева. Яно мяне абрадавала, бо я даведаўся, што «мы живём в свободной республике...»

У адным з пытанняў карэспандэнт «БелГазеты» напомніў Адоньеву, што ў 2002 годзе па матэрыялах Нацыянальнага архіва газета апублікавала шэраг артыкулаў пад рубрыкай «Неизвестная война». У іх ідзе гаворка аб непрыглядных дзеяннях партызан на акупаванай немцамі тэрыторыі. Там упамінаюцца шматлікія факты марадзёрства, пагромаў, п'янства і гвалтавання мясцовых жанчын партызанамі. Карэспандэнт падкрэсліў, што ў параўнанні з гэтымі фактамі ўспаміны Копыла зусім бяскрыўдныя. На гэта Адоньеў адказаў няўцямліва, што ён карыстаецца інфармацыяй дзяржаўных СМІ. Яму непрыемна было слухаць пытанні карэспандэнта.

І калі той стаў агучваць справаздачу аб баявых дзеяннях партызанскага атрада Багатырова (справаздача для Панамарэнкі), то Адоньеў узмаліўся: «Ну, это не надо зачитывать...» Хочацца адказаць яму на гэта словамі кінагероя Аляксандра Дзям'яненкі – Шурыка: «Надо, Федя, надо». На жаль, асабіста я сам не быў знаёмы з артыкуламі «БелГазеты» 2002 года «Неизвестная война». Прышлося шукаць іх зараз. Калі нарэшце я прачытаў той матэрыял, то вельмі здзівіўся, чаму Адоньеў не наладзіў пікет ветэранаў каля рэдакцыі «Беларускай Газеты» 7 гадоў таму назад, у снежні 2002 года.

На пытанне карэспандэнта: «Чаго вы хацелі дамагчыся пікетаваннем?» – Адоньеў адказвае пытаннем: «Зачем оппозиция однобоко чернит героические подвиги людей?»

Па-першае, прычым тут апазіцыя? Хутчэй за ўсё Адоньеў – асоба з завышанай самаацэнкай. Ён, магчыма, лічыць, што толькі яго

выказванні, яго меркаванні правільныя. А хто выказвае супрацьлеглую думку, той ужо абавязкова залічваецца ў апазіцыю. Хачу запэўніць чытачоў, што да маёй кнігі «Нябышына. Вайна» апазіцыя не мае ніякага дачынення.



*Маёр Ілля Копыл у кастрычніку 1981 г.*

Па-другое, у маёй кнізе няма ніводнага прыкладу ачарнення подзвігу людзей. Я паказаў негатыўны бок партызаншчыны. А пра подзвігі я напісаў, што гэта ў большасці сваёй – міты. І міты гэтыя стварылі як самі партызанскія камандзіры, так і савецкія пісьменнікі. І вось па гэтых мітах і мастацкіх творах мы і вывучалі гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, хоць да гісторыі яны не маюць ніякага дачынення. Вось што сказала карэспандэнту газеты «Наша ніва» дачка Канстанціна Заслонава Муза Заслонава:

«Пра Канстанціна Заслонава пісалі шмат. Але не ўсё было праўдай. Міхась Лынькоў, напрыклад, у рамане «Векапомныя дні» ад рэальнай асобы пакінуў выключна прозвішча – астатняе па-мастацку прыдумаў». (НН № 18 ад 15.05.2013) А людзі, асабліва школьнікі, чыталі гэты твор і верылі, што так яно і адбывалася. Яны нават уявіць сабе не маглі, што ўсе гэтыя гераічныя подзвігі існуюць толькі ў галаве аўтара тоўстага рамана. Потым Міхась Лынькоў прасіў у сям'і Заслонавых прабачэння за хлусню, маўляў, было тэрміновае заданне партыі – напісаць раман пра героя».

Адоньеў кажа, што ён размаўляў з камандзірам партызанскага атрада Аляксандрам Слабадой, з дзецьмі іншых камандзіраў, чытаў іх успаміны і не сустракаўся з такімі фактамі, як марадзёрства, п'янства, гвалтаванне. Тое, што дзеці выгараджваюць сваіх

бацькоў, гэта нармальна. Дзякуй Богу, савецкая ўлада не здолела пераўтварыць усіх дзяцей у Паўлікаў Марозавых.

Я таксама сустракаўся і размаўляў з дзецьмі партызанскіх камандзіраў і яны мне казалі: «Магчыма, так і было, як вы напісалі. Але наш бацька такім не быў».

Адоньеў пратэстуе супраць маіх успамінаў. Для будучых чытачоў гэтых нататкаў прывяду некалькі прыкладаў партызанскага бязмежжа ў адносінах да мірнага насельніцтва, апублікаваных «Беларускай Газетай» у 2002 годзе (№ 46 ад 25 лістапада):

Справаздача першаму сакратару ЦК КП(б)Б Панцелеймону Панамарэнку: «Довожу до вашего сведения об исключительном безобразии отряда Богатырёва. Начиная с июня, отряды не вели никаких боевых действий. Занимаются мародёрством и пьянством... Богатырёв вызывает смех и презрение населения.»

Сялянскія скаргі, накіраваныя тым жа камандзірам партызанскіх атрадаў і мясцовым органам НКУС:

«22 июня 1943 г. партизанами отряда «За Советскую Белоруссию» взята коровка рябой масти, которая у меня одна. С хозяйства больше ничего не имею...»

«С 11 на 12 января 1943 г. к нам зашли партизаны из отряда Захарова, трое человек и потребовали от нас одежду и сапоги. Голого Владимира (хозяина дома) выводили стрелять. После этого мы были вынуждены отдать брюки двое суконных, сапог две пары хромовых и одну пару простых. Кроме этого сделали обыск и взяли белья, овса мешок. Вышеуказанные вещи были последние, и мы совершенно без одежды.

По словам жителей деревень, «грабительские заготовки» отличались от карательных экспедиций немцев лишь тем, что одни говорили по-русски, а другие – по-немецки.

З дакладной запіскі сакратара Лагойскага райкама партыі Івана Цімчука: «на заготовках настолько обобрали крестьян Ильянского, Курилецкого, Кривичского районов, что получились антисоветские настроения». «Партизаны отряда им. Котовского избили 60-летнего сторожа. Старик показывал нам избитые места, это что-то ужасное: тело порублено и синее».

Партизанский отряд им. Котовского появился в Логойском районе в декабре 1942 г. и почти сразу же стал известен. Прославили его отнюдь не боевые операции. По информации уполномоченных особого отдела (сотрудников НКВД) и многочисленным заявлениям крестьян, командир отряда Митрофан Красненков «организовал под видом разведки Минска группу своих «партизан» и занялся торговлей народным добром». Партизаны отряда мародёрствовали, забирая в деревнях то, что удалось сберечь от немцев, и возили на минские базары. «за вырученные деньги доставались в неограниченном количестве водка, папиросы, духи, пудра, табак, женские чулки, туфли, кожи хром на три пальто для командира отряда...»

Это не единственный компромат, собранный на партизан отряда им. Котовского. Командир роты Цыганков, уже приговорённый ранее условно к расстрелу за мародёрство, проиграл однажды бой с полицаями, после чего «рассвирепел и отдал приказ поджечь деревню Стайки. Село подожгли через дом. Сгорело 64 крестьянских двора».

В годы войны в Логойском районе были известны 9 партизнских бригад. Одна из самых крупных, объединившая 5 отрядов, называлась «Народные мстители». Первым командиром бригады, который её и основал, стал Василий Воронянский. По рассказам Тимчука, Воронянский, Красненков и Цыганков женились на трёх сёстрах. «Общие встречи у тёщи, общие разговоры перенеслись на служебные дела».

А вот что пишет о комбриге капитан Серёгин, начальник штаба бригады: «Воронянский с момента появления женщин в отряде, несмотря на то, что по возрасту ему более 40 лет, женился на Бабитской Лизе, которая дважды выходила замуж, имея от роду 22 года. Имевший уже жену и детей, оказался в таком положении из расчёта, что его всё равно застрелят, и решил жениться на этой женщине. Тимчук протестовал против женитьбы комбрига и других морально разложившихся людей, которые также, следуя примеру, решили пожениться, несмотря на то, что есть жёны и дети». По сведениям Серёгина, партизанская жена комбрига была представлена к ордену Красной Звезды за то, что она «с ним спит вместе и готовит ему кушать».

Частымі былі выпадкі гвалтавання партызанамі мясцовых жанчын:

Изнасилованные и оставшиеся в живых могли считать, что им ещё повезло. Бывало, что девушку, оказавшую сопротивление, расстреливали на месте отказа. Начальник разведки отряда имени Лазо Борис Келлер, бывший секретарь Минского обкома партии, под угрозой расстрела изнасиловал 15-летнюю дочь старосты деревни. Крики девушки разбудили всю деревню, и Келлер приказал убить её. Исполнительный подчинённый застрелил девушку, когда она была под партизаном Тарасевичем. Случай этот произошёл в деревне Мочулище...

(БГ № 46, 25.11.2002)

Подвиги на бумаге: неудачи в боях старались скрыть, пользуясь приписками. Если сложить длину железнодорожных путей, выведенных из строя всеми партизанскими отрядами за годы войны, окажется, что ими можно несколько раз опоясать нашу планету. А вот и реальная история, подтверждающая правоту этого... В начале лета 1943 г. на перегоне Уша-Радошковичи группой партизан под командованием некоего Драпека была совершена диверсия: взорван эшелон противника. Драпека составил рапорт о том, что «уничтожен 1 паровоз и 14 вагонов».

Продолжает историю Тимчук: «Через час почему-то переделали этот рапорт на 19 вагонов, а после беседы с командиром отряда Красненковым почему-то рапорт был составлен, что уничтожено 39 вагонов с техникой и живой силой врага. За это действие вся группа представляется к правительственной награде, а Драпек – на звание Героя Советского Союза».

Позже стало известно, что на эшелон нашлось много претендентов. В отчёте отряда «Дяди Димы» говорилось, что переезд был заминирован их бойцами, что привело к подрыву 64 вагонов. Группа Кузьмича сообщала то же самое, с той лишь разницей, что вагонов было 57.

(БГ № 47, 2.12.2002)

Ну вось, шаноўныя чытачы, вы азнаёміліся з прыкладамі, якія я тут прывёў. Такім было штодзённае партызанскае жыццё. Я тут нічога не выдумляў, не дабаўляў. Яшчэ раз кажу, што гэта вытрымкі з артыкулаў, якія публікавала на сваіх старонках «Беларуская Газета» ў 2002 годзе, на 7 гадоў раней, чым выйшлі мае ўспаміны

«Нябышына. Вайна». Аўтар артыкулаў БГ «Неизвестная война» Елена Анкудо – смелая журналістка.

Мяне асабліва ўразіла тое, што ў акупаваны Мінск партызаны прывозілі вазы з дабром, награбленым у беларускага насельніцтва, і спакойна, з выгадай для сябе ўсё гэта прадавалі немцам, акупантам. Немцы іх чакалі і сустракалі з распасцёртымі рукамі. Магчыма, каб гэтых партызан-гандляроў не затрымлівалі на ўездзе ў Мінск, ім выдалі «аўс-вайсы», падпісаныя самім брыгадэнфюрэрам войск СС фон Готбергам. На выручаныя грошы партызаны закупалі ў немцаў прадметы роскашы.

Не выключаю, што з акупаванай, абрабаванай, шматпакутнай Беларусі партызанскія камандзіры адсылалі ў глыбокі савецкі тыл (авіяпаветраныя зносіны існавалі) куды-небудзь у Саратаўскую ці Омскую вобласць сваім сем'ям дэфіцытныя пасылкі. Цяжка сабе ўявіць, як радаваліся французскім духам іх жонкі, і нямецкім цукеркам – іх дзеці. Таму зараз ад іх дзяцей на нашы неўразумелыя пытанні (чаму? за што?) мы чуем адказы: «Не, наш бацька такім не быў, наш бацька – добры».

Не ўстрымаўся, прывяду яшчэ адзін прыклад з БГ.

«Пьянство является основным злом партизанского движения», – писал руководству секретарь Логойского райкама партии Иван Тимчук. «Ясновский Винок – партизан из отряда Захарова, в деревне Лобуньщина в пьяном виде ранил ребёнка».

Начальник штаба партизанского отряда имени Калинина Василий Алай «25 апреля 1943 года в пьяном виде приехал в деревню Горожанку, открыл стрельбу, ворвался в квартиру гражданки Ганух Антонины, которую поставил к стенке, вынул маузер и пытался расстрелять...» Командир отряда «За Отечество» Владимир Захаров «систематически пьянствует...»

(БГ № 47, 2.12.2002)

З усяго вышэйсказанага можна зрабіць выснову, што ў партызанскім асяроддзі не існавала дысцыпліны і законнасці. Вышэйшае камандаванне не ўпраўляла сітуацыяй. У такіх умовах цяжэй за ўсіх было выжыць мірнаму мясцоваму насельніцтву. Сённяшнія ветэраны, якія не маюць ніякага дачынення да вайны, спрабуюць даказаць, што партызаны дапускалі адзінкавыя выпадкі злачынства. Я мяркую, што партызанскае бязмежжа, злачыннасць – гэта з'ява масавая. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць лістоў з роз-

ных куткоў Беларусі, якія паступілі ў рэдакцыю «Народнай Волі» пасля публікацыі маіх успамінаў «Нябышына. Вайна».

Але і сярод партызан і іх камандзіраў былі такія, якія зберaглі сваю чалавечую годнасць і сумленне. Да іх можна аднесці сакратара Лагойскага райкама партыі камісара Івана Цімчука. Нават ён, займаючы высокія пасады, не здолеў справіцца з разбэшчанасцю, з бязмежжам партызан. Але Цімчук не хаваў гэтага, называў рэчы сваімі імёнамі. Ён дасылаў вышэйшаму камандаванню свае данясенні, рапарты, справаздачы аб рэальным становішчы дысцыпліны і парадку ў партызанскіх атрадах і брыгадах. Гэтыя дакументы, магчыма, яшчэ не знішчаны, ёсць у архівах і чакаюць даследчыкаў партызаншчыны 1941–1944 гадоў.

Сваёй прынцыповасцю і прыстойнасцю Іван Цімчук падвяргаў сябе небяспецы. У любы момант «пакрыўджаныя» ім партызаны маглі стрэліць яму ў патыліцу. Такія выпадкі былі.

Некалькі слоў пра Івана Цімчука. Ён нарадзіўся 14.02.1901 года ў вёсцы Грушка Івана-Франкоўскай вобласці, Украіна. З 1919 г. па 1926 год служыў у арміі. У 1924 г. закончыў Смаленскае ваенна-палітычнае вучылішча. Член ВКП(б) з 1924 г. У 1929 г. закончыў камвуз у Харкаве, на працу размеркаваны ў Беларусь. Удзельнік ВАВ з чэрвеня 1941 г. З лютага 1942 г. камісар партызанскага атрада «Мститель». З верасня 1943 г. – камісар 1-й антыфашысцкай партызанскай брыгады, з мая 1944 г. яе камандзір. 1.01.1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. З 1944 г. намеснік старшыні Дзяржплана БССР. Памёр 17.10.1982 г.

І нарэшце, апошняе маё меркаванне наконт інтэрв'ю Адоньева. Такіх ветэранаў, як ён, у Беларусі набярэцца, можа, сотні тысяч. Яшчэ за савецкім часам іх з розных куткоў СССР размеркавалі сюды на працу, накіравалі на ваенную службу ў БВА – Беларускую ваенную акругу. Гэта быў адзін са спосабаў русіфікацыі. Адпрацаваўшы, адслужыўшы свой тэрмін, яны не вярнуліся на сваю радзіму, як гэта зрабіў я, а засталіся тут на сталае пражыванне.

Можа, я памыляюся, але мне здаецца, што Беларусь так і не стала для іх Радзімай. Беларусь для іх – гэта проста ўтульнае месца для пражывання. Як яны ставяцца да тутэйшага насельніцтва? Прывяду прыклад: неяк мяне палажылі ў вайсковы шпіталь. У палаце ўжо ляжалі чацвёра пацыентаў, я – пяты. Калі пазнаёміліся, тыя чацвёра былі вельмі здзіўлены, што я, вайсковы пенсіянер,

і беларус. На іх думку, я павінен быў пражываць там, дзе служыў, у Кіраўскай вобласці. Але Кіраў не стаў для мяне Радзімай, і я вярнуўся ў Мінск. Гэтыя чацвёра завочна мяне называлі абарыгенам. Яны – надзейная апора ўлады.

## Водгукі на пікет ветэранаў

Пікет ветэранаў выклікаў новую хвалю лістоў у адрас рэдакцыі «Народнай Волі» ад чытачоў газеты. Гэта былі лісты падрымкі. Вось некаторыя з іх:

**Пукало Василий, Брестская обл.**

«Посмотрел на канале ОНТ, как группа пожилых людей протестовали у стен редакции «Народнай Воли». Это был протест против свободы слова.

Я несколько моложе Ильи Копыла, автора «Нябышына. Вайна», не первую конфету съел из рук немецкого солдата.

Рядом с нами жил сосед – партизан. Он рассказывал про свои партизанские будни. В основном это были небольшие вылазки против полицейских участков и гарнизонов. Фактов о походах на «железку» он не приводил, хотя в 10 км от нашей деревни проходит ж/д Брест–Москва.

Вспоминаются рассказы бабушки о ночных визитах партизан. Однажды потребовали сапоги. Они были спрятаны на чердаке, но ночные гости их нашли и унесли. Не гнушались они и красивыми женскими платками».

**Транчонок Владимир, г. Минск.**

«6 апреля с.г. по ОНТ был показан сюжет, как группа озлобленных людей пожилого возраста пыталась заклеймить оппозиционную газету. Ветераны гневно осуждали на мой взгляд правдивое произведение Ильи Копыла «Нябышына. Вайна». То, что происходило в Нябышыне, характерно для всей оккупированной нашей Родины. Когда я читал «Нябышына. Вайна», я вспоминал своё тяжёлое детство.

Все ли белорусские ветераны настоящие? Мой тесть рассказывал мне, что к нему неоднократно обращались жители Борисовского района дать письменное подтверждение, что они якобы являлись участниками партизанского движения. За это ему предлагались всевозможные материальные блага».

**Бедункевіч Вацлаў, г. Маладзечна.**

«Праз «Народную Волю» хачу выказаць глыбокую падзяку спадару Іллю Копылу за яго нататкі «Нябышына. Вайна». Усё тое, аб чым піша Ілля Копыл, вельмі блізкае мне. Калі пачалася вайна, мне споўнілася 5 гадоў. Памятаю, як у апошнія дні чэрвеня па бальшаку міма нашай вёскі прайшла калона нямецкіх машын і салдат. У вёску яны не заходзілі, на тых, хто падышоў да дарогі, асаблівай увагі не звярталі.

Мая родная вёска Студзёнка з 24 двароў знаходзілася ў Бялыніцкім раёне на мяжы з Бярэзінскім. Першай ахвярай вайны ў Студзёнцы, як і ў Нябышыне стала маладая дзяўчына, і таксама ад партызанскай кулі. Гэта 18-гадовая Ядзя.

Першыя партызаны, што з'явіліся восенню–зімой 1941 года, займаліся ў асноўным тым, што забіралі ў насельніцтва ўсё, што трапляла ім на вочы. За зіму 1941–1942 года партызаны з'елі ўсіх парсюкоў і авечак. З восені 1942-га сталі ўвадзіць з хлева кароў. К 1943 году ў вёсак, акрамя курэй і катоў , хатняй жывёлы не засталося.

Як напісала «Народная Воля» і паказала казённае тэлебачанне, супраць газеты і аўтара нататкаў «Нябышына. Вайна» выступілі пікетоўшчыкі. Я асабіста маю вялікі сумнеў у тым, што хто-небудзь з тых пратэстоўцаў прачытаў тыя ўспаміны Іллі Копыла. Самаму малодшаму партызану цяпер далёка за 80 гадоў».

**Короткин Леонид.**

«После публикации И. Копыла ждал отлупа со стороны официоза, дождался пикета.

Но вот что люди говорят, я им давал газету почитать – днём грабила полиция, ночью «брали» партизаны, заявляя: «Ты дома сидишь, а мы тебя защищаем».

Моя сестра Вера и сейчас помнит (она ровесница И. Копыла) и мать рассказывала, как зимой 1943 года ночью пришли партизаны. Зорким оком узрели, что в детской кроватке подо мной слишком много подстелено, вытащили меня и нашли пальтишко старшего брата Коли, забрали».

**Жукова К.А.**

«Прочла в газете, как ветераны пришли к редакции «Народнай Волі» и с возмущением публикацией воспоминаний Ильи Копыла «Нябышына. Вайна».

Когда я читала Копыла, то думала: «Боже мой! Так это же было всё со мной и с моей семьёй». Точно так же нас, детей, крестил ба-

тюшка в какой-то хатке. Нас четверо детей были не крещёнными, так как папа и мама были членами партии. Из города мы с мамой добрались до деревни Курковщина около г. Мстиславля. На следующий день под вечер пришли немцы. И потом иногда в деревне останавливались немцы, разводили свою кухню, что-то варили, иногда предлагали нам, детям. А зимой, когда мы были на печке, они заходили, смотрели на нас, угощали леденцами и что-то говорили.

Партизаны приходили ночью в деревню и вели себя так, как написал Копыл. Тётя Соня рассказала про партизан, как они и еду и одежду забирали. Убьют 1–2 немцев, а те уничтожают всю деревню».

Пікет ветэранаў проста ўзарваў інтэрнэт. На форумах шматлікіх сайтаў пачалося бурнае абмеркаванне гэтай падзеі. Вось некалькі каментараў з сайта Радыё Свабоды:

**Алег Гаеўскі (75 год), г. Менск.**

«Канешне, бо «Нябышына. Вайна» – гэта поўны разгром той палачкі – вярхом на якой улада знайшла спосаб улазіць у душы даверлівых людзей, а тады ўжо і сядзець пры ўладзе праз іхнюю падтрымку...»

**Уладзімір Вярховіч, г. Мінск.**

«Гэта ветэраны Вандэі! Упэўнены, што яны не выпісваюць «Народную Волю» і не чыталі твор Іллі Копыла. Я яго прачытаў з цікавасцю і хацеў выказаць за яго рэдакцыі «НВ» вялікую ўдзячнасць. Калі ласка, друкуйце больш такіх праўдзівых і шчырых твораў».

**Генадзь, г. Масква.**

«Мае ўсе ваявалі. Дзед-партызан аднойчы, чытаючы мемуары аднаго чэкіста, парваў кніжку: «Што ён брэша, там жа яго не было». Мае даўно на тым свеце. А жывыя, гэта тыя чэкісты, якія стралялі ў спіну жаўнерам у заградатрадах...»

**Дзяніс, г. Калінкавічы.**

«Трэба выказаць падзяку Іллю Копылу за яго смеласць. «Нябышына. Вайна» – гэта суровая праўда пра падзеі вайны, тым больш, што пісаў гэта сведка падзей. Трымайцеся. Дзякуй Вам!»

**Язэп, г. Мінск.**

«...Як можна франтавікам-ветэранам ганьбіць Копыла, дзіця вайны, якога яны кінулі ў акупацыі? Уявіце сабе толькі (!) дзіця, якога яны аддалі ў рабства немцам, не можа і зараз адкрыць рот! Вось гэта ўлада! Вось гэта ветэраны! Вось гэта логіка! Дык што загадаеце яму, тады 7–8-гадоваму, крычаць сёння: «Да здравствует Сталін!» А вы пабылі ў яго скуры там, у Нябышыне, вы, чые грудзі ў ордэнах? Чым вы дапамаглі канкрэтна гэтаму пацану? Вы змагаліся за Радзіму? То і ён за Радзіму, за сваю маленькую, якой яе ведае і любіць... На вас Бога няма. І не было ніколі».

**Павел Толкач, г. Барысаў.**

«Мне вельмі спадабалася кніга «Нябышына. Вайна». Ілля Копыл, дзякуй вам за вашу працу! Жадаю вам 100 год жыцця і новых творчых поспехаў».

**Норд, г. Менск.**

«Шаноўны Ілля, дзякуй за цікавую кнігу і, галоўнае, за праўду! А на піктоўшчыкаў і правакатараў не звяртайце ўвагі. Вы Афіцэр, чалавек гонару... Вы служылі ў войску сапраўдным афіцэрам, гэтыя працавалі на НКВД. Мужнасці і ўдачы».

**Антон.**

«Дзякуй Іллє Копылу за праўду! Апошнім часам нам усім становіцца зразумела, што ўлады хаваюць праўду пра вайну. Але праўду нельга схаваць, рана ці позна мы будзем ведаць, як сапраўды ўсё адбывалася на тэрыторыі Беларусі. Але ж і зараз хапае гістарычнага матэрыялу, з якога мы бачым, што ў Беларусі ў час вайны было самае складанае становішча, бо бальшавікі і немцы былі ворагамі беларусаў і невядома яшчэ хто больш. Трымайцеся, спадар Копыл. Пішыце яшчэ. Вы вельмі добра, цікава пішаце, у Вас ёсць талент».

**Генрых, г. Мінск.**

«Вялікі дзякуй Вам, спадар Копыл. Усё, што Вы напісалі, так адпавядае таму, што расказвалі мае бацькі і аднавяскоўцы, хоць мы і жылі далекавата ад Вас – на Валожыншчыне ля Налібоцкай пушчы. Хто сумняваецца ў напісаным, няхай пагутарыць з тымі, хто перажыў «партызанку».

**Апанент.**

«Што датычыць партызанаў, то зразумела, анёламі яны не былі. Я калісьці працаваў у архівах і чытаў матэрыялы... І не ўсё там было чорна-белае, спадар Копыл, як у вас. Маўляў, гэтыя добрыя, а гэтыя дрэнныя. Ці працавалі вы ў архівах? Вы як чалавек ваенны разумееце, што вайна рэч крывавая. А партызанская вайна крывавая ўдвайне... І ў гэтай вайне можна знайсці заўсёды шмат бруду, нават калі і не шукаць асабліва».

**Ільля Копыл.**

«У архівах я не працаваў, у мяне не было такой неабходнасці. Я ў сваёй кнізе, у сваіх успамінах вёў гаворку пра сваю сям'ю. Які тут патрэбен архіў? Тое, што вайна – брудная справа, гэта не дае нам права апраўдваць злачынствы ні тых, ні другіх. Рэчы трэба называць сваімі імёнамі».

**Ветэран, г. Мінск.**

«Копыл прынцыпова правы. Каб выдаць свае мемуары накладам у 100 асобнікаў, у архівы хадзіць не трэба. Аўтар не ставіў сабе задачу чарніць каго-небудзь. Калі ў яго вёсцы вайна была такой, то ён – аб гэтым і піша. Ветэранам павінна быць сорамна, што яны ў свой час дапусцілі акупацыю, аддалі старых, баб і дзяцей на волю лёсу...»

Адзін з даследчыкаў гісторыі Другой сусветнай вайны доктар гістарычных навук Эмануіл Іофэ пра мае ўспаміны «Нябышына. Вайна», апублікаваныя ў «Народнай Волі», карэспандэнту Радыё Саботы сказаў наступнае:

«Там ёсць, канечне, памылкі і недакладнасці... А так – цікавыя матэрыялы, пададзеныя чалавекам, які сам гэта бачыў і перажыў. Гэта інфармацыя для роздуму, для пераасэнсавання гісторыі. Я займаюся гісторыяй партызанскага руху, пераасэнсоўваю гэтую частку гісторыі і прыходжу да высновы, што трэба адмаўляцца ад штампу «ўсенародная вайна».

А вось што сказаў для Радыё Свабоды прафесар ЭГУ, гісторык Алесь Смалянчук:

«Я праводжу шмат экспедыцый па беларускіх вёсках цягам дзесяці гадоў. І тое, што людзі ўзгадваюць пра гэтую вайну, – моцна адрозніваецца ад падручнікавай гісторыі вайны. Ні партызаны ні немцы не малююцца аднымі фарбамі. Гэтая вайна рознакаляровая і ў большай ступені трагедыя, чым тое, што напісана ў падручніках. З той абсалютна ідэалагізаванай версіяй вайны, прыдуманай яшчэ савецкімі гісторыкамі ці партыйнымі функцыянерамі, камусьці, канечне, з такой праўдай лягчэй і спакайней».

Пасля пікета ветэранаў цэлы тыдзень стаяла адносная цішыня. Вакол маёй публікацыі ў «Народнай Волі» нічога не адбывалася, нават стала сумна. І вось 14 красавіка 2010 года зноў адбыўся пікет. На гэты раз «Народную Волю» пікетаваў БРСМ. Зноў ажыў інтэрнэт. Вось што я знайшоў на сайце forum.ixbt.com. Каментар пакінуў нехта All:

«Признаюсь, до сегодняшнего дня не читал нашумевшую статью Ильи Копыла в Народной Воле «Нябышына. Вайна», – статью, так возбудившую «ветеранов» и «гитлерюгенд», что и те и другие взялись пикетировать редакцию газеты. Странно, но поколение моего отца и сам отец рассказывали много историй, похожих на повествование Копыла. Я верю Копылу, это обычная история обычной белорусской деревушки».

Я не буду распавядаць пра пікет БРСМ – лепш, чым напісала сама «Народная Воля», не скажаш:

## *Каму трэба асвяжаць памяць?*

Пазаўчора ў разгар працоўнага дня ля офіса «Народнай Волі» сабралася з дзесятак актывістаў Мінскай гарадской арганізацыі так званага Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі (БРСМ). Па сутнасці, гэтую акцыю можна назваць пікетам. Паколькі дазволу на правядзенне яго ўлады не давалі, то ўдзельнікаў мерапрыемства магла разагнаць міліцыя ў адзін момант...

Але ж на гэты раз не апазіцыя ладзіла пікет! Ніхто і не думаў разганяць маладзёнаў. Хвілін трыццаць яны пазіравалі перад тэлекамерамі Першага канала і СТБ.

Журналісты «Народнай Волі» ўдзячны Алене Хадыка, першаму сакратару Мінскай арганізацыі БРСМ, якая разам са сваімі сябрамі

зайшла ў прыёмную галоўнага рэдактара (у гэты час ён вырашаў службовыя пытанні па-за межамі рэдакцыі) і пакінула ў падарунак цэлы камплект кніг гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць». Вось толькі з прыпіскай «Освежите свою память», наклеенай на вокладцы кожнай кнігі, атрымаўся казус. Праблема з памяццю не ў журналістаў «Народнай Волі», а ў тых жа бээрэсэмаўцаў. Замест таго каб сказаць, што ў мемуарах Іллі Копыла «Нябышына. Вайна», на іх меркаванне, ёсць факты, якія не адпавядаюць сапраўднасці (калі на самай справе такое ёсць), яны, як і заідэалагізаваныя тэлевізіёншчыкі, настойліва парэкамендавалі вывучаць гісторыю з «праўдзівых крыніц».

Трэба думаць, што такой праўдзівай крыніцай і ёсць падараваная рэдакцыі кніга «Памяць» (Мінск, БЕЛТА, 2005 г.). Нам, журналістам «Народнай Волі», гэтую гістарычна-дакументальную хроніку падарылі, але самі, напэўна, і не разгортвалі. Чытаем:

Верхаводзька Вера Фёдараўна, пайшла ў 1943 у партызанскую брыгаду «Штурмавая», дзе незаконна расстраляная паводле загаду камандавання (стар. 321);

Вішнеўскі Сяргей Казіміравіч, н. у 1903, пайшоў у снежні 1942 у партызанскую брыгаду «Штурмавая», дзе незаконна расстраляны ў студзені 1943 паводле загаду камандавання (стар. 321);

Загорская Марыя Цярэнцьеўна, н. у 1912, пайшла ў снежні 1942 ў партызанскую брыгаду «Штурмавая», незаконна расстраляна ў студзені 1943 паводле загаду камандвання брыгады (стар. 323);

Загорскі Аляксандр Дзям'янавіч, н. у 1915, пайшоў у снежні 1942 у партызанскую брыгаду «Штурмавая», незаконна расстраляны ў сакавіку 1943 паводле загаду камандавання (стар. 323);

Кухта Вольга Іванаўна, н. у 1919, незаконна расстраляна ў студзені 1943 паводле загаду камандавання партызанскай брыгады «Штурмавая» (стар. 325);

Лісецкая Марыя Мікалаеўна, н. у 1923, незаконна расстраляна ў студзені 1943 паводле загаду камандавання партызанскай брыгады «Штурмавая» (стар. 326).

А вось архіўны дакумент ваеннага часу – данясенне на імя першага сакратара ЦК КП(б)Б Панцеляймона Панамарэнкі: «Довожу до вашего сведения об исключительном безобразии отряда Богатырева. Начиная с июня отряды не вели никаких боевых действий. Занимаются мародерством и пьянством. Основали 5 винокуренных аппаратов. Устраивают именины и дни рождения, сопровождаемые недельными попойками...»

Стоп! Не гэтыя факты, у рэшце рэшт, вырашалі лёс Айчыны. Дарэчы, не пра гэта і мемуары І. Копыла. Ён расказаў толькі тое, што

перажылі падчас вайны яго сям'я, яго родныя, аднавяскоўцы. І хто меў права забараніць яму пра гэта сказаць?

Асвяжаць памяць можа той, у каго яна ёсць. А калі яе наогул няма?..

*Рэдакцыя газеты «Народная Воля».*

---

**P. S.** 14 мільярдаў 783 мільёны рублёў – столькі запланавана выдзеліць у 2010 годзе з бюджэту краіны Беларускаму рэспубліканскаму саюзу моладзі. Ці не за гэтыя народныя грошы былі куплены Аленай Хадыка кнігі «Памяць»? І чаму ў той час, калі ўсе людзі працуюць, бэрэсэмаўская моладзь шастае па горадзе?

* * *

Ветэраны не абмежаваліся адным пікетам пад вокнамі рэдакцыі Народнай Волі. Яны пайшлі далей. Як высветлілася, старшыня Савета Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Анатолій Адоньеў хутчэй за ўсё да ўсяго гэтага мае ўскоснае дачыненне. Ініцыятыва сыходзіла ад іншага ветэрана, жыхара Смалявіцкага раёна Аляксандра Пестракова. Менавіта ён абзвоньваў розныя арганізацыі, дасылаў пратэсты супраць публікацыі маіх успамінаў «Нябышына. Вайна» газетай «Народная Воля».

Я сустракаўся з Аляксандрам Пестраковым у офісе газеты. Сустрэча адбылася выпадкова ці аб гэтым паклапаціўся рэдактар, не ведаю. Пестракоў – гэта звычайны савецкі чалавек, звычайны пенсіянер, якія сустракаюцца нам у кожным пад'ездзе, у кожным двары, на кожным кроку – усюды. Ён мне не паказаўся занадта агрэсіўным. Магчыма, і ён прыглядаўся да мяне, ацэньваў, што я за птушка. Напачатку адчувалася напружанасць. Памятаю, мы задалі адзін аднаму па некалькі пытанняў. Мне здалося, што яго і пытанні і адказы былі нейкія завучаныя, палітызаваныя.

Калі характарызаваць чалавека армейскімі вымярэннямі (а я – былы афіцэр), то Пестракова нельга параўноўваць нават з нампалітам. Нампаліты больш гнуткія, здольныя лавіраваць. А гэты – вельмі ўпёрты. У савецкі час у войску існавала такая пасада, як прапагандыст палка. Яны не неслі ніякай адказнасці, проста чыталі нудныя лекцыі. Гэтымі лекцыямі яны гранілі амерыканскі імперыялізм. І такое паўтаралася з месяца ў месяц, з года ў год. Вось такім «занудай» і паказаўся мне А. Пестракоў. Сваімі званкамі, лістамі, скаргамі ён задзёўб «Народную Волю».

Пасля гэтай сустрэчы ў чарговым нумары «Народная Воля» надрукавала артыкул А. Пестракова і мой яму адказ. У вас, шаноўныя чытачы, ёсць магчымасць зараз пазнаёміцца з гэтымі артыкуламі.

*(Глядзі «Народная Воля» № 80–81 ад 25–27 мая 2010 г.).*

## *Ад рэдакцыі «Народнай Волі»:*

Успаміны Іллі Копыла «Нябышына. Вайна» друкаваліся на старонках газеты з канца лютага па канец сакавіка. І на працягу ўсяго часу было ціха, ніякіх пярэчанняў, не кажучы пра пратэсты. І раптам... Адзін пікет ля сцен офіса рэдакцыі, другі. Мы разумелі: многія з тых, хто такім чынам выказваў нязгоду з аўтарам публікацыі, з пазіцыяй газеты, якая з першых нумароў прытрымліваецца плюралістычных падыходаў, пэўна ж не чыталі ўспаміны І. Копыла. Значыць, нехта іх падняў, арганізаваў... Хто?

Адказ на гэта пытанне пачулі літаральна некалькі дзён таму. Пачулі з вуснаў аднаго з сённяшніх аўтараў дыскусіі – Аляксандра Уладзіслававіча Пестракова са Смалявіч: «Я, можа, пяцьдзесят устаноў абзваніў, усім тлумачыў, што трэба выступіць супраць публікацый Копыла ў «Народнай Волі». Вось, аказваецца, хто ініцыятар «паходаў на рэдакцыю».

Пасля публікацыі ўспамінаў І. Копыла на старонках газеты з'явілася нямал іншых матэрыялаў, звязаных з ваеннай тэматыкай. Магчыма, да мемуараў «Нябышына. Вайна» мы і не вярталіся б, калі б не тая ж неўтаймаванасць спадара Пестракова. Ён не толькі ў катэгарычнай форме запатрабваў надрукаваць яго артыкул (дарэчы, у якім ён не вядзе дыскусію з І. Копылам па канкрэтных фактах, палеміка яго мае чыста ідэалагічны аспект), але і накіраваў адпаведны ліст у Міністэрства інфармацыі. А тое ў сваю чаргу звярнулася за заключэннем у Інстытут гісторыі Акадэміі навук. Кола, як кажуць, закруцілася па-новаму.

Каб расставіць кропкі над «і», журналісты «Народнай Волі» вырашылі паслаць свой ліст міністру інфармацыі А. Праляскоўскаму, Вось яго тэкст:

«Як стала вядома, па запыце Міністэрства інфрмацыі Рэспублікі Беларусь Інстытутам гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук падрыхтавана заключэнне па публікацыі І. Копыла «Нябышына. Вайна» («Народная Воля», №№ 30–47). Здзіўляе, што публіцыстычны матэрыял, а тым больш успаміны, якія, вядома ж, заўсёды носяць

суб'ектыўны характар, сталі прадметам разгляду ў высокай навуковай установе.

Не ведаем, як міністэрствам будзе выкарыстана заключэнне Інстытута гісторыі НАН РБ, але ў рэдакцыі газеты «Народная Воля» ёсць прапанова: надрукаваць яго ў адным з чарговых нумароў нашага выдання.

Што тычыцца А. Пестракова, які, па некаторых звестках, звярнуўся з лістом у Міністэрства інфармацыі, то хочам сказаць наступнае. Ён не аднойчы друкаваўся на старонках «Народнай Волі». Можа ўзнікнуць пытанне: чаму пакуль не з'явіўся яго матэрыял адносна публікацыі І. Копыла «Нябышына. Вайна»? На тое ёсць прычыны. Дыскусію па канкрэтных фактах ён падмяняе агульнымі разважаннямі. З гэтай нагоды А. Пестракову было сказана: «Пры першай магчымасці Вы будзеце запрошаны ў рэдакцыю не толькі для абмеркавання спрэчных момантаў, але і для сумеснай работы над падрыхтоўкай Вашага матэрыялу да друку». (Але з заўвагамі рэдакцыі А. Пестракоў не палічыўся і запатрабаваў надрукаваць яго артыкул у першапачатковым выглядзе. – *Рэд.*)

Дарэчы, у апошнія месяцы на старонках «Народнай Волі» з'явілася не толькі публікацыя І. Копыла, але былі змешчаны лісты многіх іншых аўтараў, якія разглядаюць ваенны перыяд з самых розных бакоў.

Мяркуем, Міністэрству інфармацыі цікава ведаць, як наогул успрынята публікаця І. Копыла чытачамі газеты. Таму прапануем азнаёміцца з невялікай часткай лістоў, якія зараз знаходзяцца на разглядзе ў рэдакцыі (іх копіі дадаюцца).

Матэрыялы, у якіх могуць утрымлівацца пераканаўчыя доказы аб памылковасці некаторых фактаў, выкладзеных І. Копылам, газета абавязкова надрукуе. Наогул, галоўнае правіла рэдакцыі – дзейнасць у адпаведнасці з Законам аб друку. А заканадаўца прадугледзеў усё – не толькі прадаставіў СМІ права на памылку, але і прапісаў у законе, як яна тым жа сродкам масавай інфрмацыі павінна выпраўляцца».

Адказу з Міністэрства інфармацыі пакуль няма. А таму сёння друкуем толькі артыкулы А. Пестракова і І. Копыла. Чаму яшчэ раз даём слова аўтару ўспамінаў? Як ні дзіўна, але абодва аўтары сустрэліся на мінулым тыдні ў рэдакцыі, і была дасягнута такая дамоўленасць.

*Александр Пестряков*

## *Чего хотят злопыхатели Победы...*

Отдаляются события ВОВ, все меньше становится непосредственных участников тех страшных событий. Тем не менее больше находится обиженных на свою судьбу и иных осмелившихся неучастников войны, берущихся дать под видом всенародного просвещения свои детско-примитивные осмысления событий мирового масштаба. В их откровениях подводится вывод, что Красная Армия победила сильного врага не за счет своего превосходства над хваленым вермахтом и не благодаря неоценимой, безмерной поддержке большинства нашего народа, а в силу случайных причин. Поиски негативных фактов, их ложная интерпретация позволяют самозваным историкам иронизировать, а порой злорадствовать над теми военными событиями и действиями наших ветеранов.

Обидно, что явления в виде «Нябышына. Вайна» («Народная Воля», №№ 26.02.2010 г. по 29.03.2010 г.) все чаще появляются и в нашей родной Беларуси. Глядишь, вскоре «созреем» пойти по известным путям стран Балтии и Украины.

Понятно, что тотальная жестокость завоевателей, с одной стороны, и инстинкт «выжить любой ценой» остро ставили перед оказавшимися в тех условиях вопросы: как быть? Идти сражаться, чтобы ценой своей жизни лишить жизни одного-двух, а еще лучше сто врагов или стать медсестрой, телефонистом, поваром и тем самым способствовать приближению Победы, или тихонечко отсиживаться в тылу, в подвале, в теплой хате, отстранившись от происходившего вокруг, как родители автора? Или идти не в услужение (автор ведь не отрицает, что часть урожая его семья отдавала немцам, т.е. таким способом поддерживала их), а в предатели-полицаи, чтобы уже палаческими услугами устанавливать новый порядок, а сейчас получить одобрение нашего «продвинутого» автора: «Молодцы, что выжили, несмотря, на чьей стороне воевали, ведь это наши «набыткі», т.е. в переводе с белорусского «достояние»?! Не читал он, наверное, произведений нашего Василя Быкова. А ведь у него эта драматическая тема раскрыта, пожалуй, как ни у кого из всех остальных авторов военной прозы.

Сколько же всего было отсиживающихся, немецких пособников и предателей в Беларуси? Столь ли это важно? Наверное, не одна сотня тысяч. Ведь говорят же издавна: «В семье не без урода». Часть их автор, по понятным причинам, пытается обелить, но ни одним словом не упомянул, что всеобщий подъем народа на защиту

Родины (в данном материале такое понятие вообще отсутствует) был гораздо больше и исчислялся миллионами добровольцев. В их числе и моя мама Пестрякова (Ефимова) Таисия Антоновна, в 1942 г. в семнадцатилетнем возрасте ушедшая на фронт. Вечная всем им память и слава Богу, что им не пришлось услышать оскорбления. Именно такие победители, показав примеры мужества и патриотизма. Они «приближали победу, как могли», ибо понимали, что каждый лишний день войны давал гитлеровцам возможность уничтожать неповинных людей. А приспособленцев, читая данного автора, кроме бытовых вопросов, как спрятать и спрятаться, больше ничего не волновало.

Вообще-то, следует отметить, что это изложение опоздало на 65 лет. А пригодилось бы оно в конце 1945 года обвиняемым в Нюрнберге. Они, ближайшие подельники Гитлера, очень искали доказательства своей непричастности к чудовищным преступлениям против человечности и смягчающие обстоятельства. И, глядишь, данное авторское свидетельство могли судьи учесть и некоторые из приговоренных к повешенью получили бы только тюремный срок. А потом, наверное, лет через 20 встретились бы с данным автором, чтобы отблагодарить его кружкой пива. А сейчас он, очевидно, довольствуется пенсией из рук тех, кого хает и унижает.

Абсолютно безнравственно представлять агрессора безобидным и справедливым – ведь Гитлер неоднократно заявлял, что во имя военной необходимости отменяет для своих подчиненных все германские законы и международное соглашение па защите человеческой жизни. Сверхнаглость пытаться сравнивать их кровавые преступление и действия Красной Армии в период ВОВ, используя единичные эпизоды в отчаянной схватке.

Автор явно не удосужился посмотреть главный итоговый документ Великой мировой войны – материалы Нюрнбергского процесса. За что все же осужден немецкий национализм-фашизм Международным судом?

Напомню хотя бы такие факты:

1. В обвинительных докментах довольно часто упоминалось, что гитлеровцам на восточных территориях надлежало уничтожить 30 (тридцать!!!) миллионов человек. Поэтому все у них шло по четкому плану и счету. Автор даже с похвалой отозвался, насколько немцы пунктуальны в этой работе: «Счет с точностью до 1-го человека». Под эти объемы были построены крематории и газовые камеры с производительностью до 2,5 тыс. человек в сутки (только в лагерях Освенцим, Майданек, Дахау, Бухенвальд было сожжено 12 миллионов человек). Изобретались высокотоксичные газы типа

Циклон А, Б, душегубки. С целью истощения и истребления военнопленных использовался каторжный труд. Топили гражданские суда, а затем расстреливали спасающихся. А сколько наших людей погибло при бомбежках, обстрелах, от голода и холода?

Но у представленного автора немцы совсем безобидные. Так, может быть, свидетели обвинения в Нюрнберге были не правы, когда рассказывали и предъявляли снимки, как у отправляемых в печи молотками выбивали золотые протезы? А пепел уже сожженных просеивали в поисках утаенных золотых вещей. Какая-то определенная часть отобранного, в частности часы, раздаривались даже генералам. С чисто немецкой рачительностью пепел от людей применяли как удобрение, часть тел шло на изготовление мыла, волосы использовались для набивки матрасов и вязания теплых чулок, высушенные черепа становились, как и абажуры из человеческой кожи, настольным интерьером. Над людьми, в том числе и детьми, проводились изуверские опыты.

Не знаю, как автор, но я бы не хотел ни себе, ни другим такой участи, пусть даже от писателя и театрала, как с теплотой отзывается о нем автор, гауляйтера Беларуси – Кубе, только за то, что мы славяне.

2. Про партизан авторское мнение совпадает с немецкими приказами в годы оккупации (которые можно было, прежде чем писать пасквиль, увидеть в нашем музее ВОВ) и приказами верховных германских военачальников Кейтеля и Оделя (кстати сказать, повешенных), в которых партизаны признавались бандитами и, в отличие от военнопленных, подлежали расстрелу без суда и следствия. Авторские слова: «Они (партизаны) выглядели по-бандитски». Да и дальнейшие размышления были только осуждающими.

Ну что тут можно возразить человеку, не способному различить правду от лжи, предателя от патриота?

Партизаны, как известно, сражались на всех захваченных немцами европейских территориях и нанесли фашистам колоссальный урон, заставляя их снимать с фронтов боеспособные части. Это хоть знает горе-историк или будет продолжать утверждать, что важнее для партизан было писать отчеты. Конечно, по сравнению с действующими армиями у них не было тыла, регулярного обеспечения всем необходимым и возможностей пополнения потерь. Поэтому и важна была для них поддержка населением. Почему же автор не укоряет свою семью, которая безропотно что-то отдавала немцам, кормила других немецких холуев, а от партизан все прятала. Кстати, родионовцы, которыми восхищается автор, ничего не отбирали, а покупали какие-то товары у населения, потому что со-

стояли на довольствии у немцев. И нужно быть совсем непонятливым, чтобы не соображать: создавались эти формирования и вооружались не для безделья. Наверно, сознательных людей у нас все же было больше, которые партизан кормили, одевали, лечили, и они этих людей берегли и защищали. Поэтому мы и победили, вопреки стараниям тех, кто был против нас, и тех, кто, подобно семье автора, ничего не делал для Победы.

Очень удивляет позиция редактора газеты «Народная Воля»: следует ли, прикрывая и оправдывая себя беспринципной «свободой слова», печатать неуважительный по отношению к ветеранам ВОВ и в целом антинародный материал? Понятно, что под этот лозунг подстраиваются люди с неадекватным мышлением не стыдящиеся показать себя в любом виде, попирая святое и оскорбляя чувства заслуженных людей. Обычно редактор, даже по менее серьезным расхождениям с авторами заметок дает свои гневные отповеди, а здесь, как говорится, «без комментариев». Таким образом, не проявляется ли здесь злой умысел? Стоит все-таки заметить, что во всем мире осуждается восхваление фашистских порядков, а где-то оно наказуемо. Выходит, газета сама себя опозорила.

Можно предвидеть, с каким упоением будут читать мнение данного автора недобитые фашисты. Быть может, захотят медаль вручить и даже звание «гансфюрера» дать – он т-а-к старался, что, возможно, и свой китель с советскими наградами поменяет на рьяно заслуживаемый немецкий.

Если ранее фашистам победить помешали, по их утверждениям, русские морозы, плохие дороги, всякие «бандиты» и заградотряды НКВД, то теперь могут надеяться от подобной швали на поддержку и оправдание. И тогда можно будет беспрепятственно проводить СВОИ победные парады (представьте, читатель, подобное шествие в Минске), гордо выставляя награды за убийства беззащитных и невинных. Да будет проклят тот, кто пытается обелить их и этим пытается возрождать фашизм!!!

Приводимые факты автором преследуют явную цель умалить Победу над чумой XX века. Весь мир тогда стоял на грани рабства. Это мог не понимать несмышленыш из сельской глубинки тех времен, но стыдно не осознавать взрослому человеку, тем более в наше информированное время, но все равно нельзя унижать победителя, который, жертвуя собой, предотвратил эту угрозу. Вот почему во всей Европе у благодарных людей трепетное отношение к памятникам советских солдат. А главы иностранных государств считают обязательным для себя склонить головы перед ними и возложить венки. Есть и противоположные примеры, но разве это показатель!

Особенное старание проявил автор на последнем издыхании своих исследований. Это, очевидно, только в бреду можно притянуть пускай даже достоверный факт, что немецкие женщины в 1946 г. сделали 800 тыс. абортов к обвинению советских воинов в их изнасилованиях. То, что то время было голодным и не устроенным и эти женщины могли из этих соображений пойти на такой шаг, автора не устраивает. Но кинохроника тех лет сохранила эпизоды той жизни, в частности, толпы голодных у советских солдатских полевых кухонь. Это было милосердием, невзирая на, казалось бы, накопленное чувство мести! Было ли такое во время немецкой оккупации? Автор даже паек у заключенных немецких концлагерей старается приукрасить! Почему же тогда они такие истощенные и сколько из-за голода их умерло? Да и в предатели из их числа вынуждены были идти из-за лишнего пайка.

А сможете ли вы ответить: за какие грехи НАШИ женщины были брошены в ужасные условия именно немецкой агрессией, а затем не то что не смогли испытать радость рождения своих детей, а хоронили их и тянули вместе с подростками лямку тяжелых работ? Это что, нужно забыть? Сочувствие к поверженным действительно есть проявление гуманизма. Но об этом благородном понятии не таким, как вы, рассуждать. Наш народ в целом, наверное, уже успокоил свое негодование к Германии, хотя в глубине души вряд ли простил. (У меня сосед 8-летним мальчиком был поставлен на колени голым в грязь вместе с другими подростками, вытащенными из бани немцами для расстрела. Лишь кто-то из врозслых прибежал на крики и объяснил, что это не партизаны. До сих пор он считает за чудо тогдашнее свое спасение.) Такое никогда не может заслужить прощения! Кстати, есть документальное свидетельство, что СССР отказался от контрибуции с Германией, отправив немецких военнопленных домой раньше времени из гуманных соображений (часть немцев осталась, добровольно создав семьи с русскими девушками и, быть может, поэтому цифра возвратившихся меньше, чем могла быть. Зачем же автор спешит выдать их за уморенных голодом?).

Зато СССР, а потом Россия продолжали до конца XX столетия возмещать «бескорыстную» помощь США (так утверждает автор), о которой якобы умалчивали советские власти (тоже утверждает данный автор) десятками тонн золота. Так кому должно быть стыдно обнародовать такое? Невежественные люди, конечно, это могут не понимать и не знать. Что были северные конвои и трагичные события вокруг них. Обо всем рассказать, чтобы развенчать утверждения лжеисторика, нужно только больше времени.

Вот, допустим, взять его утверждение: никакого большого подполья в Минске не было. Может ли такое говорить здравомыслящий человек? Ну, не удосужился прочитать или поленился сходить в музей, так и промолчал бы по крайней мере, а не оплевывал бы, походя, тех, кто немцами был зверски повешен и расстрелян. Или, быть может, музейные экспонаты сфабрикованы, изданные воспоминания участников подполья приукрашены? Но дополняют их отчеты, донесения, смертные приговоры подпольщиков и дневниковые откровения скрупулезных немцев. Все это предъявлялось подсудимым на судебных процессах (в том числе и в Беларуси) в послевоенные годы.

Смысл таких очернительных стараний объясняет сам автор: «Я только хотел сравнить (читай уравнять. – *А.П.*) между собой тех и дургих». Наш народ, думается, благодарно такие подделки не оценит, а вот побить может, только стоит ли марать руки?

В последнее время в различных странах открываются архивы, появляются сведения, дополняющие наше представление: насколько глубоки были причины войны (ну, кто сможет оспорить такой глобальный факт, что мировая империалистическая колониальная система оказалась поверженной, хотя противостояла одной советской стране с полуголодным и раздетым народом, но уверенным в свои идеи), насколько жестоким был агрессор и каких усилий стоило, чтобы наступил долгожданный мир. Но вызывает сожаление, что делают это не аналитики-историки, а преподносится газетенками (не зря появилось определение таблоиды) как сенсация с определенными акцентами с целью своего пиара, зарабатывания дешевой популярености, действуя наподобие чернокопателей. И все это потом расплывается и тиражируется по городам и весям. Попадая, конечно, и в руки плохо информированным, с поверхностными знаниями истории, да и просто аморальных людей, вызывая у них извращенный вывод. Что явно проявилось на примере представленного автора.

Для любого нормального воспитанного современника понятно из текста, что мотивом данной написанной небывальщины является синдром ущербного человечка, пронесшего через всю свою жизнь комплекс неудовлетворенности происходящим, отсюда вынужденного существовать двойной жизнью, притворяться и маскироваться. Сын уклониста (от исполнения долга, что кстати, наказуемо), который просидел всю оккупацию, прикрываясь семьей, не испытывая угрызения совести, что не сражается за Родину, что за него это сделают другие. А наоборот, даже гордился, что уцелел: «Мы герои» приводит его слова автор. Не удивительно, что все его

разговоры и поступки и впитал в себя его малолетний отпрыск, а затем копил злобу и выбирал подходящий момент и сообщников, чтобы ее выплеснуть.

Думается, если равнодушно взирать на подобные опусы, то скоро появятся воспоминания полицаев или их наследников. И тогда написанное будет еще более циничным, абсурдным и бесстыдным. А для лучшего распространения лжи нужна постепенная подготовка почвы, что подобными вбрасываниями и осуществляется. Заслуживаем ли мы, белорусы, таких издевательских экспериментов над нами и нашими потомками?

Но гораздо обиднее за еще живых ветеранов ВОВ. Сейчас их и мало, и силы не те, чтобы достойно ответить. Так и видишь удручающую картину: сидят, вспоминают, что пришлось испытать, потерю родных и друзей, плачут от отчаяния и шепчут тихо: «Добейте нас поскорее, но не мучайте!» Невольно задумываешься, насколько они сейчас беззащитны. Наш сыновний долг перед ними вдохновляет на отпор злопыхателям. Хотя это унизительно вступать с ними в полемику. Несправедливо, что государство вспоминает о них только в праздник Победы, а, с другой стороны, мы, рожденные после войны, как ни прискорбно признавать, тоже зачастую оказываемся бесчувственными и неблагодарными за добытое и созданное ими. А ведь это видят и перенимают наши дети. Неудивительно, что для многих из нынешних подростков война – это лишь не очень интересный учебный материал, который выучил, ответил и забыл. Мы, послевоенные мальчишки, тянулись к возвратившимся с войны. Именно они (а не урки, которых тогда распустили из лагерей и они расхваливали свою, так популярную нынче блатную романтику) были для нас непререкаемыми идеалами и примерами. Вспоминаю, что играли мы тогда и в партизанов, благо в лесах под Минском еще целы были окопы, останки блиндажей. Находили мы и немецкие, пробитые пулями, каски и другие свидетельства о проходящих здесь боях. Сейчас невольно сравниваешь, что у нынешних ребят в почете лишь азартные виртуальные стрелялки.

За свою жизнь я посетил много музеев, могу сравнить их, в частности, с нашим музеем ВОВ, вроде бы одним из лучших. Я в нем был год назад. Людей минимум – я да внук. Экспозиции, как лет 40 назад: вот плохие немцы, а напротив храбрые, удачливые, улыбающиеся партизаны. Написал в книгу свои предложения, что нужно подработать под современного человека. Но ответ админинстрации – равнодушное молчание. То есть надо понимать – их все устраивает! Не дает ли все, мной высказанное, необходимость переосмыслить происходящее, чтобы окончательно не потерять связь героев-по-

бедителей с их потомками, и они станут жертвами и последователями подобных «просветителей»?

Рушатся и кем-то намеренно разрушаются памятники защитникам и героям, отстоящим право на нашу жизнь. Это кощунство, экстремизм отщепенцев. Но их можно остановить, а памятники быстро восстановить. Гораздо трагичнее, когда злонамеренные печатные слова целеустремленно и методично развращают души, охаивают наше наследие, и, используя геббельские методы, натравливают на народы других стран, а мы не задумываемся, что молчать нельзя.

Нужно быть бдительным, чтобы те ужасы не повторились. Погибшие хотели, чтобы мы, их потомки, больше не знали войны, жили свободно и счастливо. Для этого надо чтить защитивших нас, ЗАЩИЩАТЬ ИХ НАСЛЕДИЕ и хранить им вечную благодарную память.

*г. Смолевичи.*

## *Адказ «ветэрану»*

Больш за месяц, з 26 лютага па 29 сакавіка бягучага года, газета «Народная Воля» публікавала мае ўспаміны «Нябышына. Вайна», ці «Акупацыя вачыма падлетка». Свае ўспаміны я напісаў яшчэ ў 2005 годзе, але да шырокага кола чытачоў яны дайшлі толькі ў 2010 годзе, дзякуючы «Народнай Волі».

Чаму я ўзяўся за гэтую працу? Справа ў тым, што чым больш мы аддаляемся ад падзей Другой сусветнай вайны, тым менш застаецца ўдзельнікаў і сведак тых страшных падзей, тым больш хлусні з'яўляецца ў афіцыйных СМІ, усё больш раздзьмухваюцца гераічныя міфы пра Вялікую Айчынную вайну і партызанскі рух у Беларусі. Я не аспрэчваў і не збіраюся аспрэчваць гераічныя подзвігі, якія на самай справе былі. Але пра гераічнае напісана вельмі многа, я ж паказаў другі бок медаля, дакладней сказаць, напісаў усё так, як на самай справе адбывалася ў межах адной сям'і, адной вёскі. Лічу, што кожны чалавек мае права на свае ўспаміны.

У рэдакцыю «Народнай Волі» ад чытачоў газеты паступілі ўжо і працягваюць паступаць дзесяткі лістоў з водгукамі на мае ўспаміны. Я без усялякага выбару прачытаў больш за 30 лістоў. Вельмі цяжка чытаць пра тое, што давялося перажыць людзям у тыя часы. І толькі ў трох лістах выказана іншая думка, нязгода са мной, сярод іх і ліст А.У. Пестракова са Смалявіч. У мяне не было жадання спрачацца з ім, тым больш што яго ліст я чытаў, адчуваючы нейкую агіду. І справа не ў тым, аб чым ён піша, а справа ў тым, як ён падае свой матэ-

рыял. Там суцэльная абраза як у мой бок, так і ў бок маіх бацькоў. Але я не магу адказаць яму тым жа самым. Я не магу апускацца да яго ўзроўню. У мяне іншая выхаванне. Мае бацькі навучылі мяне паважаць людзей, з павагай ставіцца да сваіх апанентаў.

Хто такі А.У. Пестракоў? Я меў з ім размову, і ў мяне складаўся такі яго партрэт: з яго слоў, ён нарадзіўся ў 1948 годзе ў Беларусі, але потым, будучы ваенным, жыў у Расіі. Ветэранам вайны ён, вядома ж, не з'яўляецца. 10 гадоў таму вярнуўся ў Беларусь. Агледзеўшыся вакол, ён зразумеў, што ў Беларусі не ўсё так добра, як яму бачылася з Расіі. Як мне стала вядома з яго слоў, ён спрабаваў уступіць у Партыю БНФ, у АГП, у ПКБ і ў іншыя партыі, але ўсюды ад яго паслуг адмовіліся. Там, думаецца, хапае сваіх пестраковых, у партыях няма згоды, і калі дабавіць яшчэ аднаго, партыя можа ляснуцца.

Тады ён перавёў сваю ўвагу на газету «Народная Воля», у якой можна знайсці і прачытаць цікавыя, праўдзівыя, злабадзённыя матэрыялы. Пестракоў, мабыць, хутка зразумеў, што праўда вельмі недаспадобы беларускім уладам усіх узроўняў і пачаў газету «Народная Воля» закідваць лістамі. З яго слоў вядома, што газета надрукавала ўсяго 2–3 яго лісты. Ён бачыць сябе ў ролі цэнзара, павучае рэдакцыю, што друкаваць можна, а што, на яго думку, нельга. Безумоўна, мае ўспаміны, на яго погляд, вельмі шкодныя. Трэба друкаваць, лічыць Пестракоў, толькі тыя матэрыялы, якія выхоўваюць моладзь у духу патрыятызму. І ён супраць нацыяналізму. Ён не разумее, што нельга быць патрыётам сваёй краіны, калі ты не нацыяналіст. Нават БРСМ яго намаганні не патрэбны. Наогул, падчас сустрэчы высветлілася, што мой апанент блытае паняцці «нацыяналізм» і «нацызм». Давялося патлумачыць, што гэта абсалютна супрацьлеглыя рэчы.

Пестракоў уявіў сябе абаронцам ветэранаў ВАВ. У маіх успамінах ён убачыў, магчыма, глядзеў у мікраскоп, нейкую абразу ветэранаў ВАВ, але ж я не назваў ніводнага прозвішча. Гэта ўспаміны толькі пра маю сям'ю. Хто замінае Пестракову ўзяць аркуш паперы і напісаць пра сябе? Замест гэтага ён абвінавачвае газету, што мой матэрыял яна апублікавала напярэдадні Дня Перамогі (хоць успаміны пачалі друкавацца яшчэ ў сакавіку). У гэтым ён убачыў злосны намер, а мае ўспаміны назваў «антынародным матэрыялам». Прывяду адну цытату з ліста Пестракова: «Можно предвидеть, с каким упоением будут читать мнение данного автора недобитые фашисты».

Падпісчыкамі і чытачамі «Народнай Волі» ў сваёй большасці з'яўляюцца ветэраны, у тым ліку і ветэраны ВАВ. Усіх іх Пестракоў залічыў у «недабітых фашыстаў». Гэта якраз і ёсць прамая абраза ветэранаў.

Вы маеце рацыю, спадар Пестракоў: мае ўспаміны, апублікаваныя ў «Народнай Волі», людзі, у большасці сваёй ветэраны, чыталі з «упоением». І ім не патрэбна ваша «абарона», яны з цікавасцю чытаюць мае ўспаміны, а не вашу злосную дэмагогію.

Вось вытрымка з ліста Галіны Гапановіч, дачкі ветэрана: «Мой бацька ветэран вайны, даўно чытае «Народную Волю». Чытаў і ўспаміны Іллі Копыла «Нябышына. Вайна». «Тут усё праўда», – так сказаў мой тата, калі прачытаў. «А цябе не абражае гэты артыкул, ты ж ветэран вайны?» – запыталася я ў бацькі. На гэта ён адказаў: «У «Народнай Волі» напісана аб тым, як было на самай справе».

Леанід Аксельбанд, ветэран ВАВ, піша: «Чытаю «Нябышына. Вайна» Іллі Копыла і магу цалкам з ім пагадзіцца. Правільна сказана, як пачыналася вайна, і што адбывалася на тэрыторыях, захопленых немцамі».

Разалія Рубінчык, пенсіянерка: «Паважаная рэдакцыя, хачу выказаць падзяку за публікацыю ўспамінаў аб вайне Іллі Копыла...»

Э. Тобін, Ф. Тобіна: «Народнай Волі» – у падтрымку рэдакцыі і аўтара кніжкі «Нябышына. Вайна» Іллі Копыла. Мы з вялікай цікавасцю прачыталі матэрыял, надрукаваны ў газеце. Былі моцна ўражаны мужнасцю і высакародствам аўтара і галоўнага рэдактара. І ўжо тады між сабою непакоіліся: «Вось мы прачыталі, нібыта вярнуліся ў тыя гады зноў, і ўсё. А што чакае І. Копыла і асабліва І. Сярэдзіча на фоне «Лініі Сталіна»?! Задзяўбуць! У іх ТБ, радыё, газеты, дзяржаўная машына і закон непісаны».

Іван Лашко. «У рэдакцыю газеты «Народная Воля», Іллі Копылу: «Дзякую за смеласць, розум, ваш учынак, што вы апісалі, што бачылі і чулі аб вайне. Чытаючы, мне здавалася, што пішаце не вы, а я».

Пестракоў вельмі абураецца, што я ў сваіх успамінах даў праўдзівую, аб'ектыўную ацэнку партызанскаму руху на тэрыторыі Беларусі. Ён спрабуе запэўніць чытачоў «Народнай Волі», што партызаны нанеслі немцам каласальны ўрон, што партызанам патрэбна была падтрымка насельніцтва. Хачу патлумачыць Пестракову, што, на жаль, былі і такія партызаны, у якіх не было звычкі звяртацца да насельніцтва за падтрымкай ці дапамогай, яны займаліся звычайным рабаўніцтвам, гвалтам, разбоем.

Э.Тобін, Ф. Тобіна: «...Партызаны забралі посцілку, ватоўку, хусткі, падушкі ды іншае. Ноччу выдралі пчол, нягледзячы на тое, што была зіма. Летам скралі карову, завязлі ў Дуброву, там зарэзалі і тыдзень пілі. Тое добра помніцца. Маці, плачучы, прасіла аддаць карову. Мы плакалі наўзрыд. Праз колькі месяцаў ад холаду, голаду памёр мой малодшы брат. Абрабаваныя партызанамі, мы былі

літаральна ў рыззі, не было чаго есці, абуць, не маглі распаліць агонь».

Вось так, спадар Пестракоў: былі партызаны, якія вялі сапраўдную вайну з фашыстамі, а былі і такія партызаны, якія наносілі шкоду мірнаму насельніцтву.




*Ілля Копыл каля помніка ў вёсцы Пруднікі. Унізе з левага боку пазначаны бацька (Піліп) і родны брат Іллі (Мікола)*

У гэтым кантэксце хачу прывесці выпіску з кнігі Васіля Якавенкі «Пакутны век». На старонцы 479 чытаем: «...У Слонімскай акрузе, напрыклад, за восем месяцаў сорак другога года партызанамі знішчана 111 немцаў, 36 паліцаяў. А сваіх мірных жыхароў у сем разоў болей – ажно 823 чалавекі!»

У сваіх успамінах я расказаў, як савецкія ваенныя, уварваўшыся ў Германію, гвалцілі нямецкіх жанчын усіх узростаў. У выніку гэтага ў савецкай зоне акупацыі жанчыны зрабілі 800 тысяч абортаў. Пестракоў пагаджаецца з колькасцю абортаў, але ён тлумачыць гэта тым, што быў галодны час і немкі вымушаны былі ісці на спыненне цяжарнасці. Які цынізм! Пестракоў не падумаў, якім чынам 800 тысяч жанчын маглі адначасова зацяжараць, калі іх мужы адны загінулі, другія – у палоне.

Лічу, Пестракоў мае вельмі прымітыўныя веды пра амерыканскую дапамогу для СССР за гады Другой сусветнай вайны. Ён карыстаецца савецкай інфармацыяй пра міфічныя дзесяткі тон золата, якія быццам бы заплаціў СССР за тую дапамогу. Савецкай прапагандзе гэта было патрэбна, каб апраўдаць жабрацкае існаванне людзей пасля вайны.

А вось якую праўду – «Праўда аб ленд-лізе» – расказаў Іван Лепешаў, доктар філалагічных навук, прафесар («Аналітычная газета», № 9, май 2009 г.): «Першыя лендлізаўскія пастаўкі прыбылі ў Савецкі Саюз у лістападзе 1941 года, і амерыканскія танкі і самалёты ўжо прымалі самы непасрэдны ўдзел у снежаньскім контрнаступленні пад Масквой. Не будзь гэтай саюзніцкай дапамогі танкамі, самалётамі, артылерыяй, снарадамі, невядома, што было б з Масквой і далейшым ходам вайны. Чырвоная Армія атрымала па ленд-лізе 19.734 танкі і самаходкі, 18.700 самалётаў, 9600 гармат, 131.000 кулямётаў. Ад саюзнікаў атрымана пораху ў тры разы, тэлефоннага проваду ў 15 разоў, паравозаў – у 22 разы больш, чым было зроблена ў Савецкім Саюзе за гады вайны. Саюзнікі далі 459 тысяч аўтамашын. Гэта ў два разы больш, чым выпусцілі аўтамабільныя заводы СССР за чатыры гады вайны. У пагадненні аб пастаўках гаварылася, што «матэрыялы, знішчаныя, страчаныя ці скарыстаныя ў перыяд вайны, не падлягаюць аплаце». Інакш кажучы, пастаўкі гэтыя былі фактычна бясплатнымі».

Пестракоў жадае атрымаць адказ: за якія грахі нашы жанчыны былі кінуты ў жудасныя ўмовы менавіта нямецкай агрэсіяй... Усё так, умовы жудасныя. Але ж яны былі не нашмат лепшымі пры феадальна-калгасным ладзе і да вайны, і пасля вайны. Жанчыны, дзеці працавалі на калгасных палях, стаялі ля станкоў, а мільёны мужчын таміліся, паміралі за калючым дротам у савецкіх ГУЛАГах. Тысячы жанчын апынуліся на фронце ў якасці санітарак, сувязістак ды выконвалі іншыя абавязкі. Але гэта не жаночая справа. Ні ў адной арміі свету не было такога дзікунства, каб худзенькая жанчына цягала раненых байцоў з поля бою. Для гэтага падбіраюцца моцныя мужчыны.

Пра мае ўспаміны «Нябышына. Вайна» Пестракоў кажа, што яны спазніліся на 65 гадоў, што яны дапамаглі б абвінавачаным на Нюрнбергскім працэсе. І вось тут я поўнасцю згодзен з Пестраковым. Я лічу і ўпэўнены ў гэтым: на лаве падсудных на Нюрнбергскім працэсе побач з фашысцкімі верхаводамі павінны былі сядзець і савецкія: Сталін, Берыя ды іншыя. Таму можна лічыць, што Нюрнбергскі суд быў не да канца справядлівым. На судзе, на працэсе не быў агалошаны Пакт Молатава–Рыбентропа

(Сталіна–Гітлера) і сакрэтны Дагавор да яго, а гэтага патрабаваў адвакат Герынга. Калі б гэта ўдалося зрабіць, то ўвесь свет убачыў бы, што Сталін такі ж агрэсар, як і Гітлер, што яны пэўны час былі вернымі саюзнікамі. Акрамя таго, Нюрнбергскі працэс прамаўчаў пра расстрэл палякаў і беларусаў у Катыні.

Але мае ўспаміны яшчэ спатрэбяцца. Вось што напісаў у «Народную Волю» ветэран ВАВ Леанід Аксельбанд: «Эта книга ("Нябышына. Вайна") будет очень кстати, когда откроется судебный процесс над ленинско-сталинским большевистским режимом».

Пестракоў вельмі пафасна вымаўляе словы – Дзень Перамогі. Няцяжка здагадацца, што ў мяне іншае стаўленне да гэтага дня. Я не разумею, як можна з высокіх трыбун заяўляць, што ў Другой сусветнай вайне загінуў кожны ці трэці ці чацвёрты беларус, і тут жа ладзіць на асфальце вясёлае шоу. Для Беларусі гэты дзень павінен называцца інакш, напрыклад, Дзень жалобы, ці Дзень смутку па загінуўшых у часы Другой сусветнай вайны. Нельга забываць, што напярэдадні і пасля вайны Беларусь згубіла значную частку сваіх тэрыторый разам з іх насельніцтвам. Якім чалавекам трэба быць, каб вінаваціць тых, хто выжыў ва ўмовах акупацыі?! Ісці змагацца, каб коштам свайго жыцця, як раіць Пестракоў, узяць жыцці аднаго-двух ворагаў, гэта, на мой погляд, усяго толькі дэмагогія. Змагацца павінна рэгулярная абучаная армія. На практыцы мы бачым, што на кожнага забітага нямецкага салдата прыпадае 12 савецкіх. Давайце адкрыта скажам: сваю перамогу, здабытую ў крывапралітнай бойні, ветэраны ВАВ добраахвотна аддалі Сталіну, калі ганебна кідалі трафейныя сцягі да яго ног на Парадзе Перамогі. Адбылася замена акупацыі многіх краін Еўропы з нямецкай, якая працягвалася 5 гадоў, на 45-гадовую акупацыю савецкую.

Пестракоў назваў мяне сынам укланіста. Прабачце, шаноўныя чытачы, але засмярдзела 37-м годам. А чаму б адразу не назваць мяне сынам ворага народа? Што, духу не хапіла?

Без камантарыяў пакіну шэраг іншых пасажаў «ветэрана» А. Пестракова.

*Мінск*

---

Ну што, шаноўныя чытачы, спадзяюся, што вы ўсё прачыталі ўважліва і ўдумліва. Хтосьці з вас падумаў – які малайчына Аляксандр Пестракоў, што паставіў на месца гэтага «злопыхателя». Хтосьці абурыўся на яго. Кожны мае права на сваё меркаванне. Разам з вамі і я зноў перачытаў «палымяны» артыкул А. Пестракова і свой «Адказ «ветэрану».

Калі я прачытаў А. Пестракова, то ўбачыў ужо зусім іншага чалавека, не таго, з якім я размаўляў усяго некалькі дзён таму назад. Яго артыкул напісаны з такім імпэтам, што нагадаў мне абвінаваўчыя прамовы Пракурора СССР Андрэя Вышынскага. Цікава, які б прысуд аўтар артыкула вынес мне, як сыну «уклониста», калі б яго надзялілі правамі – караць? На маю думку, А. Пестракоў няшчасны чалавек, незадаволены сваім лёсам, пакрыўджаны, раззлаваны на ўсіх, а таму небяспечны. У даным выпадку, гэта ўсяго толькі пенсіянер – ён можа камусьці сапсаваць настрой, не больш. А калі б ён быў чыноўнікам? Гэта ўжо зусім іншая справа.

Хачу спыніцца на некаторых момантах артыкула А. Пестракова, на якія я не звярнуў увагу ў сваім «Адказу «ветэрану».

Так, ён абураецца, што ў наш час, у XXI стагоддзі, паяўляюцца пакрыўджаныя на свой лёс «няўдзельнікі» вайны і спрабуюць даць сваё дзіцяча-прымітыўнае асэнсаванне падзей сусветнага маштабу. Давайце паспрабуем разабрацца, хто ўдзельнік вайны, а хто няўдзельнік? Калі разглядаць асабіста мяне і Аляксандра Пестракова, то якраз я і з'яўляюся паўнавартасным удзельнікам вайны ад дня першага да дня апошняга. Я на сабе адчуў увесь цяжар вайны, перацярпеў усе пакуты ваеннага ліхалецця, якія выпалі на маю долю. А вось А. Пестракова ў той час нават на свеце не было, ён нарадзіўся праз тры гады пасля заканчэння вайны.

Так, у мяне няма пасведчання, што я ветэран вайны. Я не забіў 1–2 акупантаў, у чым мяне і абвінавачвае мой апанент. Я нават не зрабіў гэтага, калі мяне падбухторваў да забойства афіцэр Чырвонай Арміі. Калі зірнуць на гэта вачыма Пестракова, то я праявіў маладушша. Я яшчэ раз сцвярджаю і ў гэтым упэўнены, што забіць з-за вугла 1–2 акупантаў і гэтым самым асудзіць на смерць жыхароў цэлай вёскі – гэта не геройства, гэта ніякае не выкананне патрыятычнага доўгу перад народам, перад Айчынай, як спрабуе запэўніць нас сваёй дэмагогіяй Пестракоў. Такія дзеянні «мсціўцаў-партызан», – гэта не проста правакацыі, гэта мэтанакіраванае злачынства супраць мірнага насельніцтва. Дзіўна, што Пестракоў гэтага не разумее.

У сваім артыкуле А. Пестракоў шмат увагі ўдзяліў майму бацьку. Ён яго абвінавачвае ў грахах, якіх не было. Часам даходзіць да абразы. А вось пра свайго ён не сказаў ні слова. Пра сваю маці прыпомніў, а пра бацьку – не. Ці быў ён на фронце? Ці ўсё тут

у норме з патрыятызмам, з выкананнем патрыятычнага доўгу перад народам? Адкажы, Аляксандр.

Мне прыйшла ў галаву думка пашукаць дадатковыя звесткі пра А. Пестракова. І вось на сайце www. smolevichi.com я адшукаў яго зварот да грамадзян Расіі. Пазнаёмімся з ім:

Уважаемые граждане России, проживающие в Смолевичском районе!

Как известно, 4 марта 2012 г. состоятся выборы Президента Российской Федерации. Нам предоставляется право принять участие в этом событии и таким образом высказаться: «Какой мы хотим видеть будущую Россию». Такой был и призыв в Минске 17 февраля в Доме Москвы на встрече с доверенными лицами кандидатов.

Находясь на гостеприимной земле Беларуси (для кого-то из нас это даже родная земля, хотя по паспорту он оказался гражданином РФ), мы не хотим, чтобы народы наших стран не понимали друг друга или имели взаимные претензии. Но ничего не делается без усилий и только лозунгами, нельзя что-то создать полезное для всех без мнения каждого.

Поэтому как представитель инициативной группы предлагаю создать международное общественное объединение граждан Беларуси и России (МООБР «Содружество»...) Его цели не только взаимопомощь россиянам адаптироваться в Беларуси (освоение языка, ознакомление с основами законодательства РБ, проведение культурно-воспитательных мероприятий), но и реализация общественного мнения в отношении поступательного развития сотрудничества наших стран.

Прошу высказаться по этому вопросу. Особенно прошу откликнуться тех, кто мог бы взять на себя часть организационных мероприятий.

Российские власти хотят нас – своих граждан видеть как активных участников демократических перемен.

Теперь слово за нами.

С уважением, *Пестряков Александр Владиславович.*

Зварот апублікаваны 27.02.2012. Я змясціў тут гэты тэкст, каб задаць адзінае пытанне: «Грамадзянінам якой краіны з'яўляецца Аляксандр Пестракоў?» Адказ у звароце. А. Пестракоў і ўсе тыя,

да каго ён звяртаецца, і ёсць «пятая калона». І працуюць яны на суседнюю дзяржаву – Расію.

Пакіну яшчэ некалькі каментараў на артыкул А. Пестракова.

Яго хвалюе, што хутка могуць з'явіцца ўспаміны паліцаяў і іх нашчадкаў. Магчыма, А. Пестракоў даўно не наведваўся ў кніжныя крамы. Такія ўспаміны ёсць, успаміны і паліцаяў, і нямецкіх генералаў. Сучасныя расійскія гісторыкі мемуарам гітлераўскіх генералаў давяраюць больш, чым савецкім. Гітлераўскія военачальнікі ў сваіх мемуарах не рабілі прыпісак, яны праўдзіва апісалі і свае поспехі і свае паразы.

А. Пестракоў праклінае тых, хто спрабуе абяліць, адрадзіць фашызм. Але ні газета «Народная Воля» ні Ілля Копыл не абяляюць і не адраджаюць фашызм. Хачу параіць А. Пестракову прачытаць, калі ён яшчэ не прачытаў, інтэрв'ю адной высокапастаўленай дзяржаўнай асобы Рэспублікі Беларусь нямецкай газеце «Хандэльсблат». Вось вытрымка з інтэрв'ю:

> «...немецкий порядок формировался веками. При Гитлере это формирование достигло наивысшей точки. Это то, что соответствует нашему пониманию президентской республики и роли в ней президента...»

А. Пестракоў лічыць звышнахабствам параўноўваць між сабой злачынствы гітлераўцаў са злачынствамі Чырвонай Арміі. Штосьці аналагічнае я ўжо чуў. Некалькі год таму назад Пуцін, будучы ў Польшчы, на пытанні журналістаў пра Катынь адказаў: «Сталинские репрессии и преступления Гитлера на одну доску ставить нельзя». Па Пестракову, а магчыма, і па Пуціну, атрымліваецца, калі вёску разам з людзьмі спалілі немцы ці паліцаі, то гэта злачынства. Так у яго і ёсць. А калі такое здзейснілі партызаны, чырвонаармейцы ці іншыя савецкія сілавыя структуры? Што тады гэта? Няўжо яны лічаць, што гэта патрыятычны подзвіг?

Пестракоў лічыць, што гэта адзінкавыя выпадкі ў адчайнай схватцы. Але ж ні ў Катыні, ні ў Хатыні, ні ў Дражна, ні ў Шуняўцы, ні ў Вітунічах ніякай адчайнай схваткі не было, было бяззбройнае, бездапаможнае насельніцтва з аднаго боку і карнікі: немцы, паліцаі, партызаны-чырвонаармейцы з другога боку. І злачынствы з боку партызан-чырвонаармейцаў былі не адзінкавыя, а масавыя.

Кола падзей працягвала раскручвацца. Аляксандр Пестракоў не абмежаваўся лістом у «Народную Волю», а паралельна накіраваў скаргу ў Міністэрства інфармацыі. Міністэрства ў сваю чаргу ўсе нумары «Народнай Волі» з публікацыяй «Нябышына. Вайна» накіравала ў Інстытут гісторыі Акадэміі навук для правядзення экспертызы. У выніку газета атрымала папярэджанне ад Міністэрства інфрмацыі. Вось гэтыя дакументы:

## *Предупреждение*

*31 мая 2010 года № 18*

Согласно статьи 4 Закона Республики Беларусь «О средствах массовой информации» (далее – Закон о СМИ) средства массовой информации должны распространять информацию, соответствующую действительности.

В нарушение вышеуказанной статьи Закона о СМИ в газете «Народная Воля» в серии публикаций И. Копыла под названием «Нябышына. Вайна» распространена недостоверная информация следующего содержания:

«Палкоўніку Гілю-Радзіёнаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза» (№№ 36–37 (3166–3167) за 10–11 марта 2010 года, страница 5);

«Чырвоная Армія наступала вельмі марудна. Толькі на пачатку 1944 года яна ўступіла на тэрыторыю Беларусі» (№№ 36–37 (3166–3167) за 10–11 марта 2010 года, страница 5);

«План распрацоўваўся ў Цэнтральным штабе партызанскага руху. Спачатку быў акрэслены і складзены спіс вёсак, якія падлягалі знішчэнню» (№№ 40–41 (3170–3171) за 16–18 марта 2010 года страница 6).

Согласно заключению Государственного научного учреждения «Институт истории НАН Беларуси» от 13 мая 2010 года № 352-01-02/321 вышеуказанная информация не соответствует действительности, а именно:

Звание Героя Советского Союза не присваивалось В.В. Гилю-Радионову вообще;

Освобождение Беларуси началось в сентябре 1943 года. К концу 1943 года был освобождён целый ряд районов Восточной Беларуси, в том числе областной центр Гомель;

План по уничтожению ряда деревень в Беларуси никогда не разрабатывался в Центральном штабе партизанского движения, список деревень, подлежащих уничтожению, там не составлялся.

Распространение в серии публикаций «Нябышына. Вайна» недостоверной информации, в том числе дискредитирующей партизанское движение в Беларуси, действия Красной Армии в период Великой Отечественной войны, стало причиной проведения гражданами, протестовавшими против распространения подобной информации газетой «Народная Воля», пикетов, а также иных проявлений негативной общественной реакции.

В соответствии с подпунктом 1.2 пункта 1 статьи 49 Закона о СМИ республиканским органом государственного управления в сфере массовой информации выносится письменное предупреждение юридическому лицу, на которое возложены функции редакции средства массовой информации, в случае распространения недостоверной информации, которая может причинить вред государственным или общественным интересам.

Министр ... *(подпись)*

Вось такое папярэджанне ад Міністэрства інфармацыі атрымала рэдакцыя Народнай Волі. А зараз давайце спакойна паразважаем, разбяром усе тры заўвагі.

1. Ці прысвойвалася Гілю-Радзіёнаву званне Героя Савецкага Саюза? У некоторых СМІ 60-х гадоў мінулага стагоддзя адзначалася, што гэта так. На жаль, пакуль што тых крыніц мне адшукаць не ўдалося, хоць у той час аб гэтым я прачытаў у адным з часопісаў. Але тады я не мог ведаць, што ўсё гэта спатрэбіцца праз 40 гадоў.

А вось што пра тыя падзеі напісала газета «Звязда» за 23.01.1991 года.

Па загаду Берыі ўсіх раздзіёнаўцаў павінны былі расстраляць. Камбрыг партызанскай брыгады «Жалязняк» І. Ціткоў не пагадзіўся з гэтым і тэрмінова вылецеў у Маскву. Разам з Панцеляймонам Панамарэнкам Ціткоў прыбыў к Сталіну і ўручыў яму сваё данясенне.

Далей цытата з газеты: «Сталін прачытаў данясенне і хутка пачаў штосьці пісаць. Згодна з рэзалюцыяй Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, Гіль-Радзіёнаву прысвойвалася званне Героя Савецкага Саюза, а афіцэры і салдаты злучэння ўзнагароджваліся ордэнамі і медалямі».

Звестак, што Сталін адмяніў гэтую сваю рэзалюцыю, няма. Інстытут гісторыі НАН ніякіх доказаў не прад'явіў. Таму я адхіляю першую заўвагу. Мне было некалькі тэлефонных званкоў, у якіх

чытачы НВ падцвярджалі, што званне Героя Савецкага Саюза Гілю-Радзіёнаву прысвайвалася.

2. Калі і як пачалося вызваленне Беларусі? Марудным яно было ці не? Дакладна вядома, што ўвайшлі ў сталіцу Беларусі горад Мінск 28 чэрвеня 1941 года, на 6-ты дзень вайны. Некаторыя звесткі называюць дату 27 чэрвеня. Вызваленне горада Мінска адбылося толькі праз тры гады (!!!) і пяць дзён – 3 ліпеня 1944 года. Гэта што, не марудна?.. Тое самае адбылося і з усёй Беларуссю! Немцы яе акупавалі дзесьці за два с паловай месяцы. А непераможная Чырвоная Армія вызваляла Беларусь, калі арыентавацца на горад Брэст, 3 гады, 1 месяц, 5 дзён. Брэст быў акупаваны 22 чэрвеня 1941 года, а вызвалены 28 ліпеня 1944 года.

Зноў задаю пытанне: Гэта што, не марудна? Можа я павінен быў напісаць, што Чырвоная Армія пры вызваленні Беларусі здзейсніла супраць немцаў «бліцкрыг»? Дык ніякага бліцкрыгу не было. Хуткасць вызвалення з-пад акупацыі Беларусі можна параўнаць з хуткасцю руху чарапахі. Вось што напісаў генерал-маёр Пыльцын А.В. («Народная Воля», № 31–32 за 2011 год), удзельнік вызвалення Беларусі: «Долго и безуспешно пыталась Красная Армия ликвидировать немецкий плацдарм в районе Рогачёва. Почти 9 месяцев наши войска не могли сломить укреплённые рубежи...»

Дык што ж гэта атрымліваецца? Наш беларускі горад Рагачоў быў нямецкім бастыёнам, мацнейшым за Берлін? Берлінская аперацыя працягвалася ўсяго 16 дзён – з 16 красавіка па 2 мая. А тут амаль 9 месяцаў!!! Можна смела параўноўваць са Сталінградам. Але адразу ўзнікае законнае пытанне да гісторыкаў, пісьменнікаў, кінематаграфістаў: «Дзе раманы, аповесці, мемуары, кінаэпапеі пра бітву за Рагачоў, як гэта ёсць пра Сталінград і Берлін?» А можа разгадка заключаецца ў тым, што кіраўніцтва Чырвонай Арміі не збіралася вызваляць Рагачоў? А проста дзень за днём на працягу 9 месяцаў арт- і авіяналётамі «вызваліцелі» выбівалі мірнае насельніцтва горада, а сам горад ператваралі ў развалiны.

Мяркую, што з такой маёй высновай не згодзен ужо вядомы нам Аляксандр Пестракоў. Выступаючы супраць публікацыі маіх успамінаў у газеце «Народная Воля», ён у сваім артыкуле з патрыятычным уздымам напісаў пра тых, хто пайшоў быццам бы добраахвотна на фронт: «Они «приближали победу, как

могли», ибо понимали, что каждый лишний день войны давал гитлеровцам возможность уничтожать неповинных людей». Гэта выказванне Пестракова не што іншае, як палітагітка. Салдат на фронце жыве адным днём, ён у любую секунду можа загінуць, яму не да высокіх матэрый...

Дык калі ж пачалося сапраўднае вызваленне Беларусі з-пад нямецкай акупацыі? Святло на гэта праліваe Маршал Савецкага Саюза К. Ракасоўскі, тады камандуючы 1-м Беларускім фронтам: «Утверждение плана Белорусской операции происходило 22 и 23 мая 1944 г.» сама аперацыя была праведзена з 23 чэрвеня па 29 жніўня 1944 года. («Военно-исторический журнал» № 6 – 1964 г.)

Нягледзячы на тое, што на тэрыторыі ўсходніх раёнаў Беларусі ўвосень 1943 года Чырвоная Армія праводзіла нейкія кропкавыя аперацыі і нават быў вызвалены Гомель, сапраўднае вызваленне рэспублікі пачалося з правядзеннем вайсковай аперацыі «Баграціён». Таму і з другой заўвагай Інстытута гісторыі НАН я не магу пагадзіцца і яшчэ раз падкрэсліваю, што вызваленне Беларусі з-пад нямецкай акупацыі адбывалася вельмі марудна. Дарэчы, горад Гомель, акупаваны немцамі 19 жніўня 1941 года, быў вызвалены Чырвонай Арміяй 26 лістапада 1943 года. Акупацыя працягвалася доўгіх два гады тры месяцы сем дзён. Мой родны Бягомль пад акупацыяй быў тры гады, з 2.07.1941 г. па 1.07.1944 г. Праўда, нейкі час ён знаходзіўся ў руках прамаскоўскіх партызан, але гэта была такая ж акупацыя, а можа, нават яшчэ больш жорсткая.

3. У сваіх успамінах я напісаў, што ўсе правакацыі партызан супраць мірнага насельніцтва былі сплanаваныя. План распрацоўваўся ў Цэнтральным штабе партызанскага руху і існаваў спіс вёсак, якія падлягалі знішчэнню (НВ 40–41 за 16–18.03.2010 г.). Дык ці існавалі такія планы?

Вось якое заключэнне зрабіў Інстытут гісторыі НАН Беларусі: «План по уничтожению ряда деревень в Беларуси никогда не разрабатывался в Центральном штабе партизанского движения, список деревень, подлежащих уничтожению, там не составлялся».

Шаноўныя чытачы, а зараз давайце яшчэ раз удумліва перачытаем гэтае заключэнне. Інстытут гісторыіі не адмаўляе тое, што план і спіс існавалі. Інстытут толькі канстатуе, што такі

план не распрацоўваўся ў Цэнтральным штабе і спіс вёсак, якія падлягалі знішчэнню, там не складаўся. З гэтага можна зрабіць выснову, што такія функцыі былі перададзены ў партызанскія злучэнні. І ўжо ў штабах злучэнняў вырашалася, якую вёску паліць першай, якую другой, якую трэцяй... і вырашаўся лёс мясцовага насельніцтва. Але пакінем у баку гэтыя здагадкі. Раз Інстытут гісторыі адназначнага адказу не даў, значыць, такое пытанне існуе, і пытанне гэта складанае. І тут трэба было б не рот затыкаць «заўвагамі» і «папярэджаннямі» таму, хто праявіў смеласць і ўзяўся за гэту небяспечную працу, а паспрыяць яму ў гэтым.

Планы і спісы знішчэння беларускіх вёсак партызанам патрымаць у руках і прачытаць проста немагчыма. Гэта вельмі небяспечны кампрамат на савецкую ўладу і КПСС, разбураліся міты пра партызанскі рух на Беларусі. Таму такія планы, калі яны існавалі, даўно знішчаны. Каму невядома, як партыйныя органы КПСС знішчалі свае архівы пасля паразы жнівеньскага путчу ГКЧП 1991 года?! Трэба яшчэ мець на ўвазе, што такія планы проста трымаліся ў галовах савецкіх функцыянераў і партызанскіх камандзіраў, загады аддаваліся ў вуснай форме. І такое назіраецца ва ўсе часы. На маю думку, напрыклад, неразумна шукаць пісьмовыя загады на выкраданне Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзмітрыя Завадскага.

Трэба ўлічваць і тое, што амаль усе архівы Другой сусветнай вайны знаходзяцца ў Расіі. Доступ да іх абмежаваны. Вялікая колькасць дакументаў засакрэчана на 75 год і нават навечна. Значыць, ёсць што хаваць. Як сказала доктар гістарычных навук расійскі гісторык Юлія Кантар, зараз у расійскіх архівах знаходзіцца 2,5 мільёна засакрэчаных дакументаў часоў Другой сусветнай вайны (!). У год дазваляецца рассакрэціць 10 тысяч дакументаў. (23.07.2011. RTVI, Цена победы). Каб разгрэбці ўсё гэта, спатрэбіцца 250 год!

Каб падмацаваць гэтыя свае меркаванні, звярнуся да артыкула расійскай журналісткі, аглядальніка «Новай газеты», кандыдата філалагічных навук Юліі Латынінай «Партизаны или каратели» (сайт «Ежедневный журнал», 31.05.2010 г.). Некалькі цытат з артыкула:

«Для понимания характера действий «красных партизан» за всей линией фронта, необходимо помнить директиву Совнаркома от 20 июля 1941 года «Не оставлять противнику

ни килограмма хлеба, ни литра горючего» и приказ ставки Верховного Главнокомандования от 17 ноября 1941 года, который приказывает отрядам диверсантов «разрушать и сжигать дотла все населённые пункты в тылу немецких войск...» Этот приказ объявлял всех жителей оккупированных территорий законными мишениями сталинских диверсантов.

«Если бы требования Сталина были выполнены, то во время оккупации вымерло бы почти всё население оккупированных территорий», – пишет красный диверсант полковник Иван Старинов.

«Этим приказом было списано всё население в оккупированных областях», – заметил историк Марк Солонин.

Мы до сих пор не знаем, сколько было убито фашистами, сколько «красными партизанами», а сколько фашистами в результате безжалостных красных провокаций...

В партизанских отчётах, отсылаемых в штаб, была специальная графа: «сожжено домов столько-то».

... за линией фронта ... «красные партизаны» в 1941–1944 годах... терроризировали мирное население не меньше, а порой больше, чем их жестокий противник».

На гэтым спыняю цытаванне артыкула Юліі Латынінай.

Калі падсумаваць усё вышэйсказанае, то Інстытут гісторыі НАН, які праводзіў экспертызу публікацыі «Нябышына. Вайна», мог зрабіць заключэнне, што планы знішчэння беларускіх вёсак і насельніцтва ў партызанскіх штабах маглі складацца і спісы вёсак для знішчэння маглі існаваць. Калі існавалі Дырэктыва Саўнаркама і Загад Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, у якіх патрабавалася знішчаць усё ў тыле нямецкіх войск, пакідаць там выпаленую зямлю, то існавалі і планы па іх выкананні.

Карацей кажучы, і з трэцяй заўвагай Папярэджання я не магу пагадзіцца. Я не магу пагадзіцца і з тым, што мае ўспаміны дыскрэдытуюць партызанскі рух у Беларусі і дзеянні Чырвонай Арміі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Я проста назваў рэчы сваімі імёнамі. І партызаны, і Чырвоная Армія дыскрэдытавалі сябе самі.

Што тычыцца пратэстаў ветэранаў, то я не думаю, што гэта іх уласная ініцыятыва, іх хтосьці падбухторвае. Ды і што гэта

за ветэраны? Як трапна напісаў адзін чытач, гэта «няўдзельнікі вайны». Яны пратэставалі супраць уладкавання нямецкіх пахаванняў, супраць незалежных СМІ, супраць сайта «Беларускі партызан», супраць прыезду ў Мінск легендарнай эстраднай нямецкай групы Rammstein...

Пасля «папярэджання» можна было б паставіць кропку. Але чытачы працягвалі званіць і пісаць. Я атрымаў пакет з газетай «Пенсионер», у якой змешчан артыкул старшыні Докшыцкага раённага савета ветэранаў Івана Пярэдні. Артыкул «Непаразуменне і агіда». («Пенсионер» № 16 (63) 2010 г.). Безумоўна, аўтар не згодзен са мной. Але чытайце самі:

## *Непаразуменне і агіда*

Іх выклікаюць некаторыя публікацыі, у якіх няпраўда і перакручванне фактаў з часоў Вялікай Айчыннай вайны ідуць уперамешку з паклёпамі і знявагай да ўдзельнікаў барацьбы з фашызмам.

Вот и отшумели-отгремели празднества Дня Победы и Дня освобождения родной Беларуси от фашизма.

Вполне понятно, что к этим датам везде были чествования ветеранов, воздавали хвалу и честь советскому солдату, партизанам, труженикам тыла, вспоминали друзей, оставшихся на поле боя. Вспоминали также зверства фашизма и в целом историю тех лет, которая уходит от нас дальше и дальше.

И со всех точек зрения справедливо и нужно сегодня, особенно молодым, что на примере героики отцов и дедов мы воспитываем патриотизм и прививаем чувство уважения и благодарности к тем, кто добыл Победу, отстоял независимость и свободу страны, право на жизнь на родной земле.

Но были в прессе и в сети Интернет и другие материалы, которые в ином ракурсе рассматривают и оценивают события и итоги Великой Отечественной. Напрочь отвергнуть очевидное не получается, но тень на плетень навести все же пытались. И на тех, кто сражался на фронтах, и на партизан, на действия высшего руководства и командования обороной страны и наступательными операциями.

Здравые люди, участники ВОВ, не верят таким публикациям, оценивают их как клевету и наветы. Но у нас есть молодежь, и она должна знать, где истина, а где заведомая чернота. С этой целью

мы выносим на страницы газеты взволнованное письмо партизана, участника ВОВ, который от имени своих коллег, ветеранов войны, дает справедливый отпор одной такой публикации и ее автору.

Письмо это в свое время было адресовано газете «Народная воля», в которой была опубликована статья, возмутившая ветеранов Докшицкого района. Но оно там не было опубликовано. И по их просьбе наша газета помещает его без сокращений.

Ветэраны вайны Бягомльшчыны, што пражываюць у Докшыцкім раёне, выражаюць, у косках, падзяку за тое, што не забылі іх і ў гонар свята 65-годдзя Дня Перамогі ў якасці «падарунка» ў газеце «Народная воля» надрукавалі матэрыял пад загалоўкам «Нябышына. Вайна». Аўтарам яго з'яўляецца наш зямляк Ілля Копыл, былы афіцэр Савецкай Арміі, і надрукаваны артыкул быў аж у дзевяці нумарах па чатыры калонкі ў кожным. Колькі ў артыкуле чарнаты і паклёпу ў адрас СССР, Чырвонай Арміі, а больш за ўсё ў адрас партызан! Затое там многа хвалы акупантам і спагады да іх.

Нябышына – вёска нашага раёна, да вайны ў ёй было каля 120 двароў. Непадалёку ад вёскі праходзіла дзяржаўная граніца. У гады Айчыннай вайны жыхары Нябышына і суседніх вёсак прымалі ўдзел у барацьбе з акупантамі. Тут дзейнічала падпольная арганізацыя, якую ўзначальваў Андрэй Фрол, які пасля быў сакратаром Бягомльскага райкама камсамола. Дзесяткі нябышынцаў прайшлі дарогамі вайны. У барацьбе з ворагам 10 чалавек загінулі, ваюючы ў партызанскіх атрадах, 25 на франтах у радах Чырвонай Арміі. 47 вяскоўцаў загублена ў час карных аперацый фашыстамі. Толькі гэтая барацьба і гэтыя факты не знайшлі адлюстравання хаця бы ў адным радку артыкула Копыла. Якімі толькі фарбамі ён не чарніць партызанскіх рух, партызан, што толькі не прыпісвае ім. Яны ўдастоены ў артыкуле слова «нечысць» і другіх. Я не думаю, што аўтар не ведаў гісторыі станаўлення партызанскага руху на Бягомльшчыне. Таму ўсё гэта я ўспрымаю як паклёп, не інача́й.

На тэрыторыі Бягомльскага раёна ў час акупацыі дзейнічаў падпольны райкам партыі, падпольныя арганізацыі ў сельсаветах. Падпольную работу ўзначальваў сакратар райкама партыі, камісар брыгады «Жалязняк» Герой Савецкага Саюза Сцяпан Манковіч, у раёне выходзіла газета «Савецкі патрыёт».

У першыя месяцы вайны сталі з'яўляцца групы партызан, якія потым аб'ядналіся ў атрады, а потым у брыгаду «Жалязняк». Да снежня 1942 года партызанамі былі разгромлены ўсе гарнізоны,

а Бягомльскі гарнізон у канцы снежня 1942 года. З таго часу ў раёне была ўстаноўлена савецкая ўлада.

Вясной 1943 года Бягомльскі аэрадром стаў прымаць самалёты і планеры з-за фронту. Паступала зброя, боепрыпасы, медыкаменты і іншыя грузы, а туды «адпраўлялі» цяжка параненых і дзяцей. Зброя давала магчымасць папаўняць баявыя рады партызанскай брыгады. Ішлі грузы праз Бягомльскі аэрадром для партызанскіх злучэнняў Мінскай і Вілейскай абласцей.

Пра гэта і пра баявыя дзеянні партызанскай брыгады «Жалязняк» няма ні слова ў артыкуле Копыла. А, між іншым, брыгада не дала магчымасці акупантам карыстацца дарогамі, што ішлі праз Бягомль на Мінск і Віцебск. Ішлі бесперапынныя баі. Прыйшлося вытрымаць некалькі карных блакад фашыстаў па разгрому партызан, у якіх прымалі ўдзел франтавыя і эсэсаўскія часці з танкамі і самалётамі. Партызаны не далі магчымасці фашыстам скарыстаць раку Бярозу ў якасці агнявога рубяжа. А ён быў выгадным для немцаў. Левы бераг, адкуль чакалі прыходу Чырвонай Арміі, балоцісты, а правы сухі, з узгоркамі. Хоць было многа ахвяр, але брыгада падрыхтавала пераправу для наступаючых часцей Чырвонай Арміі і ўтрымлівала яе, а ў час пераправы танкавых злучэнняў дапамагала аднаўляць яе пры бамбёжках праціўніка. Праз гэту пераправу ішлі нашы танкі ў розных напрамках.

Кінааператары зрабілі ў той час здымкі для фільма «Бягомльская легенда», і на многіх кадрах людзі і справы нашай брыгады. Аўтар артыкула І. Копыл мог пазнаёміцца з фільмам у раённым музеі славы, уважліва пачытаць кнігу Героя Савецкага Саюза У.П. Ціткова «Брыгада Жалязняк», дзе названа колькасць партызан у канцы 1942 года, ёсць таксама раённая кніга «Памяць». Але баявыя будні брыгады І. Копыла, як бачым, не цікавілі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны (хаця аўтар супраць слова «Айчынная») Бягомльшчына была зонай партызанскай славы. Гарадскі пасёлак Бягомль, раённы цэнтр тады, у жніўні 2009 Указам Прэзідэнта РБ быў удастоены вымпела «За мужество и стойкость в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 годов». Прамаўчаў і пра гэта аўтар.

Якой толькі няпраўды не напісаў пра партызан, якімі кепскімі словамі не называў, як іх толькі не чарніў. Дзіву даешся! Там, да прыкладу, напісана, што ў злачынствах супраць насельніцтва ў час акупацыі партызаны адыгралі не апошнюю, а можа, галоўную роль. І быццам бы, каб знішчыць вёску з людзьмі, яны (партызаны) рабілі

некалькі выстралаў у паветра і ўцякалі ў бок вёскі. Скажыце, які камандзір мог даць такі правакацыйны загад? І вось такой няпраўды у артыкуле, такіх злосных прыдумак мноства.

А пра Чырвоную Армію і чырвонаармейцаў? Пра геранчныя подзвігі арміі-вызваліцельніцы ні слова, затое ачарнення хапае. Быццам не было мабілізацыі ў раёне, апынуліся ў 44-м у арміі толькі тыя, хто па нейкіх справах быў у Бягомлі. Іх там «пахапалі». Што не абучаных і непаўналетніх узялі на фронт і кідалі ў бой. Пра запасныя і вучэбныя палкі ні аднаго слова. Дадумацца да таго, што навабранцаў у арміі нават не пераапранулі ў ваенную форму, не кожнаму выдалі зброю. З іх сфарміравалі батальён і правялі разведку боем і такім чынам камандаванне ператварыла нашых землякоў у гарматнае мяса. Або тое, што звесткі пра перамогу, пра канец вайны землякі сустрэлі без бачнага трыумфу. Аўтар таксама не бачыў, як людзі кідаліся да вызваліцеляў у абдымкі і г.д.

Адступленне Чырвонай Арміі ў 41-м называе бегствам. Ні слова пра абаронныя баі ў Брэсцкай крэпасці, пад Магілёвам, Масковой і другіх месцах. Ахайваў  подзвіг Матросава, піша, што ніякага вызвалення Мінска не было, немцы быццам самі пакінулі яго, і што 3 ліпеня наляцела савецкая авіяцыі і ўшчэнт разбамбіла беларускую сталіцу. А пра паводзіны нашых салдат за межамі СССР у вайне! Колькі бруду ў іх адрас, а ці так было? Вельмі хочацца аўтару «накапаць» на нас, тых, хто быў на вайне, на тое, як сустракалі народы нашу армію-вызваліцельніцу.

Пра ўсенародны ўздым, пра масавы патрыятызм, пра лозунг «За Родину, за Сталина» ні слова, для аўтара гэта міф.

А чаго толькі не напісана пра тых, хто служыў у органах НКУС, пра камандаванне брыгады «Жалязняк», Герояў Савецкага Саюза І.П. Ціткова і С.С. Манковіча, аб нашым земляку Барздыку, аб заслужаным настаўніку П.А. Бобрыку, інвалідзе вайны, якога дзеці на санках прывозілі ў школу. Зразумела, не лепшыя словы. І пра тое, што ў час блакады маці-адзіночка павесіла сваю маленькую дачку, а ў нейкай другой групе дзве жанчыны задушылі сваіх маленькіх дзетак. Ці ж гэта праўда?

А як аўтар піша пра свайго брата, які быў вучнем ФЗУ ў Ленінградзе і памёр у блакаду таму, што не мог есці чалавечае мяса і мышэй. Няўжо ў гады вайны было людаедства? Я быў не раз у Ленінградзе, ніхто такія факты не называў. А як жаласліва піша аўтар аб сабе, калі ён вучнем папаў у піянерскі лагер. Ішоў, бедалага, да Бягомля пяшком, а потым яшчэ з Бягомля па шашы на Лепель.

А колькі нядобрага ў адрас дзяржавы, якая дала аўтару адукацыю, арміі, дзе ён служыў, калгасе, дзе бацька быў старшынёй. І быццам СССР граміў беларусаў больш адчувальна, чым фашысты ў гады вайны.

Затое якая пахвала немцам-акупантам. У першую чаргу гаўляйтару Беларусі ў час акупацыі Кубэ, нямецкай уладзе ў Мінску. Ён немцаў паказвае амаль анёламі. Што яны людзям далі зямлю, што добра адносіліся да палонных, якіх гналі ў Докшыцы. А ці так было? Іх замучылі там голадам і холадам. Хваліць, што, калі ў бацькі ўкралі каня, дык немцы знайшлі і вярнулі. Бацька аўтара з цеплынёй гаворыць аб нямецкім афіцэры, які добра да яго адносіўся. Пры немцах, піша І. Копыл, людзі жылі лепш, пакуль не з'явіліся партызаны. І што гады акупацыі ў параўнанні з часам пасля вызвалення былі раем. Што з рук немцаў можна было атрымаць незалежнасць. Успамінае, што немцы нікога не білі, не прыгняталі, не крычалі, як паказваюць у сучасным кіно. Прыводзіць прыклад, як добра было яго дзядзьку ў Германіі і яго дзецям, куды яны былі вывезены, і пра тое, якія добрыя былі акупанты. І ні слова пра тое, колькі нашых людзей былі расстраляны, павешаны, спалены жывымі, як у Вольберавічах, пра другія зверствы акупантаў. А колькі на Бягомльшчыне помнікаў, абеліскаў і другіх знакаў, якія як бы гавораць «Помніце, людзі!»

Не забыў аўтар пахваліць і арганізацыі, сфарміраваныя немцамі: СБМ (саюз беларускай моладзі), БСА (Беларускі саюз ахоўы), што «сапраўднымі партызанамі», як ён піша, былі акаўцы (Армія Краёва).

Таму вялікае наша здзіўленне і абурэнне, што такі артыкул з няпраўдай і хлуснёй з'явіўся у друку. І як яшчэ зразумець, што такі паклёп выйшаў з-пад пяра чалавека, які калісьці быў афіцэрам Савецкай Арміі? Кожны, канешне, мае права выказваць свае думкі, але на няпраўду і перакручванне фактаў права ў нікога няма. На знявагу абаронцаў Радзімы, на ўтаптванне ў гразь святых слоў патрыятызм, чалавечая годнасць, Айчына, самаахвяраванне, любоў да свайго краю, бацькоўскай зямлі. Атрымліваецца, што ні ў аўтара ні ў газеты, надрукаваўшай яго артыкул, няма гэтых пачуццяў і разумення гістарычнай праўды, а ёсць голае кепска пахнучае палітыканства, што выклікае не толькі непаразуменне, але і агіду.

*Пярэдня Іван Міхайлавіч,*
*старшыня Докшыцкага раённага савета ветэранаў.*

*Коратка аб аўтары:* Партызан з кастрычніка 1942 г., франтавік з 1944 г. Дайшоў з баямі да Кенігсберга, інвалід вайны. Бацька расстраляны немцамі, бацька жонкі быў ранены, а бабка і сястра спалены жывымі фашыстамі.

Асаблівасць гэтага артыкула ў тым, што яго аўтар быццам бы мой зямляк. Мая вёска Нябышына ўваходзіць у склад Докшыцкага раёна. Але перш, чым каментаваць артыкул, для прыкладу хачу прывесці лісты іншых сваіх чытачоў – жыхароў Докшыц і адпаведнага раёна.

**Віктар Арпуховіч, Докшыцкі раён Віцебскай вобласці.**

«Паважаны Ілля Піліпавіч, захацелася пагаварыць з вамі, падтрымаць вас маральна, падзякаваць за праўду, за ваш праўдзівы аповед «Нябышына. Вайна». Кожны наступны номер чакаў з нецярпеннем, каб скарэй прачытаць, што было далей вакол Нябышына.

Разам з чырвонаармейцамі (пасля 17.09.1939 г.) у заходнія раёны хлынула ўсякая нечысць: суддзі, пракуроры, чэкісты – трэба было ўсталёўваць новыя парадкі.

Неўзабаве пачаўся хапун. Сталі вывозіць паноў, асаднікаў, кулакоў, інтэлігенцыю. Вывозілі на Салаўкі, ніхто адтуль не вярнуўся.

«Асвабадзіцелі» ў 1939 годзе з манастыра зрабілі турму, дзе здзекваліся з мясцовага насельніцтва... Пагэтаму многія заходнікі і сустракалі немцаў з кветкамі, думалі, што ідуць лепшыя вызваліцелі. Помню, як мноства танкаў стаяла пад старымі ліпамі. Мы, хлопцы, свабодна хадзілі каля танкаў. Немцы-танкісты частавалі нас цукеркамі.

З паяўленнем партызан адносіны немцаў да насельніцтва змяніліся. Вы, Ілля Піліпавіч, напісалі, што зрабілі немцы з Шуняўкай і чаму. Я прыгадаю толькі адзін выпадак. Калі ехаць з Докшыц у Пераф'янава, то на адлегласці паўдарогі была вёска Азарцы. Партызаны пры ўездзе ў вёску залажылі міну. Нямецкая машына на міне падарвалася. Тут жа немцы акружылі Азарцы, усіх жыхароў расстралялі, а вёску спалілі. Вы ў сваім аповедзе «Нябышына. Вайна» пішаце, чаму гэта рабілі партызаны і для чаго.

А цяпер некалькі ўспамінаў пра радзіёнаўцаў. Яны размяшчаліся па хатах у жыхароў Докшыц. 5 чалавек жыло і ў нашай хаце, занімалі адзін пакой, былі спакойнымі і добразычлівымі людзьмі. Нада сказаць праўдзіва, што ні немцы, ні паліцаі, ні радзіёнаўцы мясцовых жыхароў Докшыц не чапалі, не здзекваліся. Людзі спакойна хадзілі, жылі, працавалі, спакойна спалі».

**Кастусь Шыталь, Докшыцы.**

Гэта дастаткова аб'ёмны матэрыял на сайце westki.info. Таму я скарыстаю асобныя вытрымкі:

«Сёння раніцай (6.04.2010 г. – І.К.) каля трох дзесяткаў ветэранаў у Менску пікетавалі рэдакцыю незалежнай газеты «Народная Воля». Падставай для акцыі стала публікацыя на старонках «Народнай Волі» кнігі ўраджэнца Бягомльшчыны Іллі Копыла «Нябышына. Вайна», дзе аўтар апісаў свае ўспаміны аб фашысцкай акупацыі. На думку ветэранаў, змест кнігі з'яўляецца паклёпніцкім.

Мне як краязнаўцу даводзілася шмат размаўляць з людзьмі, якія ў сваім дзяцінстве перажылі акупацыю. Іх аповеды вельмі моцна адрозніваюцца ад вобразаў, якія навязваюцца прапагандай. Шмат хто, сапраўды, згадвае пра тое, што ў першыя дні акупацыі нямецкія салдаты частавалі бедных беларускіх дзяцей цукеркамі, і прыгадвае рабаўніцкія напады партызанаў...

У кнізе Іллі Копыла акупацыя сапраўды паказаная як трагедыя народа. Вялікае зло, якое мае шмат сваіх аспектаў і эпізодаў, якія не ўпісваюцца ні ў якія прапагандысцкія і ідэалагічныя схемы. Вось нямецкія салдаты частуюць дзяцей цукеркамі, а акупацыйная адміністрацыя стварае спрыяльныя ўмовы для гаспадарання на зямлі. А праз нейкі час, не разабраўшыся, хто вінаваты ў дыверсіях, немцы жудасна знішчаюць жыхароў Вітунічаў і Шунеўкі. А партызанаў часта даводзілася баяцца не менш, чым немцаў, тым больш, што яны і правакавалі немцаў на прымяненне жорсткіх сілавых мераў.

Вынікі акупацыі – сотні тысячаў ахвяраў па ўсёй Беларусі... А на іх крыві ўлады ўжо шэсць з паловай дзесяцігоддзяў робяць прапаганду... На магілах, на памяці нацыі ўлады спявалі і спяваюць свае хваласпевы «ўсенароднай барацьбе савецкага народа пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі...»

Сённяшні пікет – яшчэ адзін прыклад такой абароны хлусні...

А кнігу Іллі Копыла я лічу недарэмнай працай. У дэмакратычнай Беларусі з асвятлення вайны будзе знятая функцыя ідэалагічнай легетымізацыі рэжыму – і пра яе будуць пісаць як пра нацыянальную трагедыю. І кнігу спатрэбіцца перавыдаць вялікім накладам дзеля таго, каб вучні школаў Докшыцаў і Бягомля маглі пазнаёміцца з трагічнай гісторыяй XX стагоддзя на прыкладзе свайго раёна».

Я вельмі рад, што ў маіх Докшыцах ёсць сапраўдныя патрыёты Беларусі, такія, як Кастусь Шыталь, Віктар Арпуховіч і шмат іншых. Гэта азначае, што Беларусь жыве.

Аўтар артыкула «Непаразуменне і агіда» Іван Пярэдня не згодзен са мной ні па аднаму пытанню. Але і сам ён ніякіх доказаў не прывёў, каб адстаяць сваю пазіцыю. Ды і сваю пазіцыю ён не вызначыў. Як напісаў Кастуць Шыталь з Докшыц, адны «хваласпевы».

Няўжо Іван Пярэдня не ведае, што адбывалася на тэрыторыі Беларусі ці хоць бы на тэрыторыі Бягомльскага раёна ў часы нямецкай акупацыі? Ну не ў партызанскай жа зямлянцы ён прасядзеў гэтыя пасляваенныя 65 гадоў? Мы ж жывём у стагоддзі інфармацыі. Іван Пярэдня нават убачыў абразу ў тым, што ў маіх успамінах паведана, як я, першакласнік разам з іншымі дзецьмі вазіў на саначках на працу свайго настаўніка, інваліда, які згубіў нагу на вайне. Мы, дзеці, гэта рабілі шчыра і нават падумаць не маглі, што праз 65 гадоў нехта Іван Пярэдня выкажа нам сваё незадавальненне гэтым.

У сваім артыкуле ён задае шмат пытанняў. «Няўжо ў гады вайны было людаедства? – здзіўляецца ён. – Я быў не раз у Ленінградзе, ніхто такія факты не называў». Няўжо Іван Пярэдня разлічвае на тое, што хтосьці сазнаецца: «Я выжыў у часы блакады, таму што ўжываў у ежу чалавечыну?»

Хачу запэўніць ветэрана вайны, што ў блакадным Ленінградзе людаедства не проста існавала, а квітнела. Для прыкладу прывяду вытрымкі з дакладнай запіскі ваеннага пракурора горада Ленінграда Другому сакратару Ленінградскага гаркама партыі А.А. Кузняцову. Прозвішча пракурора – А.І. Панфіленка. Дакладная запіска складзена ў лютым 1942 г. Вось яе скарочаны тэкст:

В условиях особой обстановки Ленинграда, созданной войной, возник новый вид преступлений.

Все убийства с целью поедания мяса убитых, в силу их особой опасности, квалифицировались как бандитизм (ст. 59-3 УК РСФСР).

С момента возникновения в г. Ленинграде подобного рода преступлений, т.е. с начала декабря 1941 года по 15 февраля 1942 года органами расследования за совершённые преступления было привлечено к уголовной ответственности в декабре 1941 г. – 26 чел., в январе 1942 г., 366 чел. и за первые 15 дней февраля 1942 г. – 494 чел.

В ряде убийств с целью поедания человеческого мяса, а также в преступлениях поедания трупного мяса участвовали целые группы лиц.

В отдельных случаях лица, совершавшие подобные преступления, не только сами поедали трупное мясо, но и продавали его другим гражданам.

Социальный состав лиц, преданных суду за совершение указанных выше преступлений, характеризуется следующими данными.

1. По полу:
   - Мужчины – 332 (36,5%)
   - Женщины – 564 (63,5%)
2. По возрасту:
   - от 16 до 20 лет – 192 (21,6%)
   - от 20 до 30 лет – 204 (23%)
   - от 30 до 40 лет – 235 (26,4%)
   - старше 49 лет – 255 (29,0%)
3. По роду занятий:
   - Рабочих – 363 (41%)
   - Служащих – 40 (4,5%)
   - Крестьян – 6 (0,7%)
   - Безработных – 202 (22,4%)
   - Лиц без определённых занятий – 275 (31,4%)

Из 886 чел., привлечённых к уголовной ответственности, только 18 чел (2%) имели в прошлом судимости.

Военный прокурор г. Ленинграда бригвоенюрист А. Панфиленка.

Калі Іван Пярэдня і зараз не паверыў, што ў блакадным Ленінградзе квітнела людаедства, то я параіў бы яму пазнаёміцца з навуковымі працамі кандыдата гістарычных навук, дацэнта Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Нікіты Лама-

гіна. З-пад яго пяра выйшла манаграфія «Неизвестная блокада» ў дзвух кнігах, а таксама зборнік дакументаў: «В тисках голода. Блокада Ленинграда в документах германских спецслужб и НКВД». З такой жа назвай у 2000 годзе выйшла кніга гэтага навукоўца.

Каб напісаць гэту ўнікальную кнігу, Нікіта Ламагін працаваў у Нацыянальным архіве ЗША, дзе знаходзяцца дакументы ваеннай разведкі 18-й арміі (з групы «Поўнач») і службы СД. Ён таксама працаваў і ў архіве УФСБ па Ленінградскай вобласці, дзе знаходзяцца дакументы НКУС часоў блакады. Працуючы ў ЗША, Нікіта Ламагін выступаў з лекцыямі аб блакадзе Ленінграда ў Кембрыджскім, Гарвардскім, Пітсбургскім, Індыянскім і ў іншых універсітэтах ЗША, а таксама ва ўніверсітэтах Еўропы.

І Еўропа і Амерыка ведалі жудасную праўду пра блакаду Ленінграда. Там не трымаюць пад замком архіўныя дакументы, а даюць магчымасць вывучаць іх не толькі сваім вучоным, а і зацікаўленым вучоным іншых краін. У нашым жа ўяўленні блакада Ленінграда – гэта 900-дзённая гераічная абарона горада на Няве. Каб чытачы не задавалі пытанне: «Няўжо ў гады вайны было людаедства?» – прывяду некалькі прыкладаў таго самага людаедства. Такіх дакументаў у кнізе Нікіты Ламагіна набярэцца каля 40.

**Сообщения НКВД:**

– Рабочий ленинградского речного порта С.А.М., 42 года, проживавший в барже в Гребном порту, и его сын Николай, 17 лет, убили проживавших совместно с ними рабочих М. и И. Трупы убитых расчленили, ели сами и променивали рабочим соседних общежитий на вино и папиросы под видом конского мяса.

*12 января 1942 года.*

– Сёстры И. Анастасия 29 лет и Серафима 16 лет, решив употребить в пищу человеческое мясо, совершили убийство своей 14-летней сестры, труп которой расчленили и употребляли в пищу.

*28/29 января 1942 года.*

– Случаи людоедства в городе уменьшились. Если за первую декаду февраля за людоедство было арестовано 311 человек, то за вторую декаду арестовано 155 человек.

Работница конторы «Союзутиль» П. 32 года, жена красноармейца, имеет на иждивении 2-е детей в возрасте 8–11 лет, при-

вела к себе в комнату 13-летнюю девочку Е., убила её топором и труп употребляла в пищу.

В., 69 лет, вдова, убила ножом свою внучку Б. и совместно с матерью убитой и братом убитой, 14 лет, употребляли мясо трупа в пищу.

Л., 34 года, уборщица 3-й стройконторы и её соседка по квартире К., 35 лет, безработная, употребляли в пищу труп умершего мужа Л., скрыв его от регистрации смерти и похорон.

Всего за эти преступления арестовано 879 человек. Дела на 554 человека следствием закончены и переданы на рассмотрение Военного Трибунала, 329 человек уже расстреляны, 53 человека приговорены к 10 годам лишения свободы.

*23 февраля 1942 года.*

– Всего за людоедство арестовано 1171 человек.

*13 марта 1942 года.*

Далей цытаваць не буду, а проста дабаўлю, што ў данясенні за 14.041942 г. колькасць арыштаваных за людаедства ўжо значылася 1557 чалавек, за 3.05.1942 г. – 1739 чалавек, за 2.06.1942 г. – 1965 чалавек. Па падліках доктара гістарычных навук, прафесара, начальніка кафедры Санкт-Пецярбургскай акадэміі МВД Расіі Віктара Іванова, у часы блакады Ленінграда органамі дзяржбяспекі было выяўлена 2057 выпадкаў людаедства.

Лічба ўражвае. Гэта ж не кішэнныя крадзяжы, а забойствы людзей з мэтай ужывання іх у ежу. Якога размаху дасягнула людаедства ў блакадным Ленінградзе, можна толькі здагадвацца. Трэба ўлічваць тое, што раскрыванне такіх злачынстваў было невысокім. У рукі савецкіх спецслужб пападаліся часцей нявопытныя злачынцы. Арганізаваныя злачынныя групоўкі маглі існаваць доўга.

Адной з прычын, што голад у Ленінградзе распачаўся з першых дзён блакады, было тое, што ў горадзе не было дастатковых прыпасаў харчавання і паліва. Кіраўніцтва горада лічыла, што ствараць такія запасы няма неабходнасці. Жданаў, Варашылаў, Кузняцоў, Мяркулаў і іншыя кіраўнікі горада ўжо з верасня 1941 года рыхтавалі ўзрыў Ленінграда. Усё гэта рабілася з ведама кіраўніцтва СССР. Мяркулаў быў непасрэдным прадстаўніком Сталіна ў Ленінградзе. Было замініравана 58.500 аб'ектаў горада, закладзена 325 тон узрыўчаткі. Горад мог узляцець у паветра ў любы момант. За секунды ён бы пераўтварыўся ў руіны і разам

з насельніцтвам апынуўся б пад тоўшчай вады. Гэтую жахлівую тайну знайшоў у архівах і паведаў свету доктар гістарычных навук, прафесар, кіраўнік кафедры Санкт-Пецярбургскай акадэміі МВД Расіі, Віктар Іваноў. Аб гэтым напісаў журналіст Сяргей Краюхін («Известия», 19.06.1997).

Пра блакаду Ленінграда можна распавядаць бясконца, але, мяркую, хопіць нагружаць Івана Пярэдню, хай асэнсуе напісанае.

Іван Пярэдня скардзіцца, што не лепшымі словамі я ахарактэрызаваў С.С. Манковіча, камісара брыгады «Жалязняк». Тады я параіў бы ветэрану прачытаць, што пішуць пра Манковіча, пра партызан іншыя жыхары Бягомльшчыны.

## *Бераснёўка – партызанскія Курапаты*

Уважаемая «Народная Воля!»

Каждый раз, когда речь заходит о массовых репрессиях 30–50-х годов прошлого века, символом которых стали у нас, в Беларуси, Куропаты, находятся люди, которые если и не отрицают эти преступления, то говорят примерно так: зачем, мол, тревожить эту рану, уже все известно, надо сплотиться для будущего. А как же без достоверного знания того, что было в прошлом, «сплачиваться» для будущего?

Сам я житель Бегомля, провожу свое расследование событий, которые происходили в этих местах до войны, во время войны и после войны.

Для нашей семьи эти события начались в январе 1929 года, когда арестовали двух старших братьев моего отца – Михаила и Александра Глазко. Отвезли на хутор в Пострежье, заперли в сарай, а через неделю, придушенных холодом и голодом, доставили в Витебск, где 10 апреля военный трибунал приговорил их к 10 годам каждого за... шпионаж.

Дальнейшие подробности пока опущу. Скажу только, что деревню, где с начала войны жили дядька Михалка и семья его сына Виктора и где одно время базировались партизаны, 9 июля 1942 года сожгли каратели. Людей, правда, не тронули...

19 декабря 1942 года партизаны снова заняли Бегомль. И тут же составили списки так называемых неблагонадежных. В эти списки попали те, к кому немцы в хату заходили, кто в прошлом «нарушал» советские законы и т.п. Попали в список и дядька Михалка и его сын Виктор.

8 января 1943 года начался массовый отстрел «неблагонадежных». Отвозили в ближайший лес под Бересневку и с левой сторо-

ны, в ельнике расстреливали. Отвезли туда и дядьку Михалку. Виктора расстрелял сам партизанский начальник. Прибежала жена Виктора Настя – он и ее застрелил. Потом приказал их тела повесить на дереве. Но люди зароптали, и тела отвезли куда-то в лес... Где их косточки – никто не знает...

В тот день расстреляли более 60 человек. Спецгруппы выезжали в деревни и истребляли людей семьями. Не щадили даже младенцев и детей. А потом пять дней не разрешали забирать тела для погребения...

Когда я расследовал эту историю, то получил письмо от Александры Андреевны Сенченко (см. ниже. – Ред.). Напечатайте, пожалуйста, это письмо, чтобы люди знали ВСЮ правду.

*Константин Гайдук.*
*г.п. Бегомль Витебской обласци.*

## «Як аўсы жалі...»

...Хачу, каб хоць хтосьці пачуў крык душы. Таму і пішу адкрыта, бо ўжо даўно перастала баяцца, выпрамілася, падняла галаву. Адзінае: баюся за сваіх дзяцей і ўнукаў. Многа разоў думала напісаць пра нечалавечыя пакуты, якія выпалі на нашу сям'ю, на дарослых і нас, дзяцей. Хоць самі ўжо састарыліся, а боль не сціхае...

У 60-х гадах нам прыслалі рэабілітацыю на бацьку. Але бальшавікі і тут не маглі без маны: пісалі, што бацька памёр ад запалення варотнай вены ў 1942 годзе. Прыдумалі ж хваробу!

Прайшлі гады. Мой старэйшы сын быў у Віцебску і папрасіў У КДБ дакументы на майго бацьку. Яму паказалі. Там было толькі два лісты: адзін пратакол, у якім ён адмаўляў прыпісаную яму контррэвалюцыйную дзейнасць, а ў другім – поўнасцю пацвярджаў. Так яго там катавалі! У канцы другога допыту было напісана: расстраляць. І прыгавор быў выкананы 19 снежня 1937 года. А ўзялі яго ў жніўні. Мама казала: «Як аўсы жалі...».

Засталося нас у мамы чацвёра, і яшчэ дзяўчынка нарадзілася пасля бацькі, пятая. З калгаса выкінулі, соткі абрэзалі...

У нашым пасёлку быў завод, дзе палілі вугаль, гналі скіпідар. Мне тады было чатыры гады, а ўжо хадзіла вугаль сеяць, каб не памерці з голаду, да сіта не даставала, цягнулася ручонкамі... Як нас маці зберагла – не ведаю. Толькі памятаю голад, голад, голад...

Пачалася вайна. Каго першымі трывожылі «партызаны»? Нас! Памятаю, прыехалі, паставілі калодку сярод хаты, налавілі гусей, паадсякалі ім галовы і паехалі ў Асавы, дзе пражылі гэтых гусей і пілі гарэлку. Ой, было, было... Слова не скажы – ворагі...

Арыштавалі маці і сястру Ніну дзесьці ў студзені 1943 года, патрымалі некалькі дзён у Бягомлі ў партызанскай камендатуры, а потым расстралялі ў лесе пад Бераснёўкай. Там было многа расстраляных. Не давалі і пахаваць. Брат (яму было тады 15 гадоў) некалькі разоў ездзіў, каб скрасці забітых маці і сястру і пахаваць. Удалося яму гэта дзесьці ў сакавіку, бо, памятаю, ужо было сонечна і таяў снег.

Ляжалі маці і сястра на возе зусім змёрзлыя. Каб у дамавіну палажыць, вытапілі лазню, адагрэлі. Ой! А мы, малыя, паўзаем каля дзвюх трун. Не давядзі Бога!

Пахавалі маці і сястру ў Замасточчы. А выжылі мы, малыя дзеці, толькі дзякуючы нашаму брату і таму, што ніколі не сварыліся, беraглі адзін другога. Дарэчы, у так званых партызанаў, казалі, была думка забіць і брата, каб не было каму адпомсціць. Але чамусьці пакінулі. І ён стаў для нас і бацькам, і маці, і братам. Яшчэ была цётка гарбатая, бацькава сястра. Так і жылі. Самі сябе кармілі: сеялі, жалі...

У 1944 годзе брата, семнаццацігадовага хлапчука, узялі ў армію, не паглядзелі, што на руках ў яго малалетнія дзеці... Памятаю, як у 1945 годзе чырвонаармейцы прывезлі ў Бягомль дапамогу сіротам, нейкую тканіну. Усе сіроты пайшлі, усім давалі: каму на кашулю, каму на сукенку. Суседка кажа нам: «Ідзіце, вы ж таксама сіроты». Пайшлі з сястрой, доўга стаялі ў чарзе. Чырвонаармеец адарваў нам паркалю на сукенкі, а намеснік старшыні райвыканкама, які, дарэчы, добра ведаў нас, бо быў жанаты на стрыечнай бацькавай сястры, сказаў: «Ім не трэба даваць, іх бацька быў рэпрэсаваны ў 37-м годзе». Чырвонаармеец паглядзеў на нас жаласліва, але тканіну забраў...

З усёй сям'і вышэйшую адукацыю атрымала толькі я, меншая. Бо ўсе ўжо працавалі і дапамагалі мне як маглі. Маю нават дзве вышэйшыя адукацыі, працую настаўніцай беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі. Але забыць пра мінулае не магу. Усё адабралі, спаганілі камуністы і савецкая ўлада: дзяцінства, юнацтва, маладосць.

Адзінае, што захавалі мы на ўсё жыццё, – гэта пачуццё чалавечай і нацыянальнай годнасці. Мусіць, моцныя ў нас гены, моцная парода...

*Аляксандра Сенчанка (Шыла).*

*Канстанцін Гайдук:*

## *«Увесь род наш зніштожылі»*

Яго бацька быў рэпрэсаваны НКВД, вёску спалілі нацысты, дзядзькоў расстралялі савецкія партызаны.

Канстанцін Іванавіч Гайдук зведаў і больш сталінскіх рэпрэсій, і жахі вайны, і пасляваенную разруху. Ён нарадзіўся 79 год таму ў вёсцы Саўскі Бор, каля Бягомля. Спадар Гайдук абышоў усе ваколіцы, збіраючы сведчанні людзей, якія, як і ён, пацярпелі ў вайну і ад немцаў, і ад партызанаў.

## *1930-я: арышт за арыштам*

«Я пачаў займацца гэтым пытаннем, таму што ўвесь род наш знішчожылі», – з горыччу кажа Канстанцін Іванавіч. Яго продкі – прыгонныя сяляне. Бацька, Іван Аляксеевіч Глазко, пайшоў у Чырвоную Армію добраахвотнікам. Пад Бягомлем трапіў у палон да палякаў, але здолеў збегчы.

У 1929 г. НКВД арыштавала дзядзькоў спадара Канстанціна, старэйшых братоў яго бацькі – Міхаіла і Аляксандра Глазко. Трыбунал у Віцебску асудзіў іх да дзесяці год лагераў як шпіёнаў. «Былі яны моцныя, здаровыя, працаваць умелі. Дзядзька Міхалка з зямлёй размаўляў, як з чалавекам. Ідзе па полі, возьме зямлю ў руку, прыкладзе да вуснаў: «Вой, зямліца мая, вой, ужо ж я хутка цябе буду араць ды засейваць!» – узгадвае спадар Гайдук.

У 1933 г. – новы ўдар: арыштавалі бацьку спадара Канстанціна разам з пляменнікам Арціпам, сынам «шпіёна» Міхалкі. Дадому бацька ўжо не вярнуўся. Пазней Канстанціну Іванавічу паказалі ў КГБ загад на яго расстрэл. Рэпрэсіўная машына праглынула амаль усю мужчынскую частку сям'і.

## *Нечаканае вызваленне*

«Жылі мы – не дай Бог, – узгадвае Канстанцін Гайдук. – У нас усё-ўсё забралі. Кубак, вядро, зерне да кропелькі. І нават забаранілі маме хадзіць у лес па дровы». А ў яе было трое малых дзяцей на руках. Знаёмы міліцыянер параіў жанчыне развесціся з мужам, ворагам народа. Інакш, маўляў, самі патрапіце ў Сібір. Так Канстанцін Іванавіч атрымаў прозвішча маці – Гайдук. Але – дзіва дзіўнае: у 1933 г. дзядзькі Міхалка і Аляксандр вярнуліся з лагераў у Карэліі, бо ім скарацілі тэрмін. Дзядзьку Міхалку дазволілі пасяліцца ў Лепелі. У начы ён употайкі прыходзіў у Саўскі Бор. Калі пачнецца вайна, Міхалка здолее вярнуцца ў родную хату. На сваю бяду...

## *Налёт карнікаў*

Наступ немцаў быў імклівы. На акупаванай Бягомльшчыне пакрысе арганізоўваліся партызанскія атрады.

«Адна з групаў, пад кіраўніцтвам Сцяпана Манковіча і Рамана Дзякава, захапіла нямецкую машыну на шашы, расстраляла шафёра. І прыгнала яе ў нашую вёску! – распавядае Канстанцін Гайдук. –

Нашто? Немцы ж расстрэльвалі сялянаў за малейшае падазрэнне ў сувязях з партызанамі! А атрад Міхаіла Бычкова прыйшоў у Бягомль і абрабаваў краму. Ішлі адтуль, курылі, кідалі паперкі – і зноў-такі ў нашую вёску. Ну, немцы паслалі карнікаў. Добра, што гэта былі літоўцы, яны толькі хаты знішчылі. Калі б немцы – яны б нас там як мышэй папалілі».

## *Народныя мсціўцы*

19 снежня партызаны занялі Бягомль і пачалі складаць спісы вяскоўцаў, падазраваных у сувязях з немцамі. Патрапіў у спісы і «былы шпіён» дзядзька Міхалка. Далей разыгралася драма, пра якую Канстанціну Гайдуку расказваў яе непасрэдны ўдзельнік, партызан Пётр Шаман: «На другі дзень Каляд, 8 студзеня, партызаны пад'ехалі да хаты, дзе жыў дзядзька Міхалка: «Хадзі-ка сюды, садзіся». Завезлі пад вёску Бераснёўку, у ельнічак: «Злазь!» Дзядзька Міхалка перахрысціўся, стаў. Ведаў ужо, што апошняя дарога. Раптам – ляціць вазок. Пад'язджае чалавек з Дамжарыц, Вашкевіч Іван, сябра Манковіча. Гэты Іван дужа ненавідзеў дзядзьку Міхалку. Як нашых арыштавалі, ён, Вашкевіч, забраў сабе хату Уладзіміра, малодшага брата дзядзькі Міхалкі.

Прыйшоў дадому – а ні сёстраў, ні жонкі, ні бацькі няма. Жанчынаў партызаны застрэлілі, а бацьку – немцы.

І вось дзядзька Міхалка патупаў па снезе, шапка такая старэнькая, валёнкі старэнькія – ну дзе ж яму, ведаеце, было пасля лагера новае справіць... А Іван Вашкевіч узяў у аднаго з партызанаў вінтоўку і сам яму ў спіну стрэліў. Такая была нянавісць!»

## *Працяг расправы*

Пра тое, што адбылося далей, спадару Гайдуку распавяла яго пляменніца, Надзея Глазко: «Сын дзядзькі Міхалкі, Віктар, паехаў у Бераснёўку на Каляды ў госці. Партызаны – за ім. І павезлі ў тое самае месца, каб расстраляць».

Кала ўзлеску іх дагнала сястра Віктара, Ксенія, якая ехала следам. А з суседняй вёскі ўжо ляцела поўная жаху Надзея Глазко. Па дарозе ехалі і іншыя людзі з Бераснёўкі – за сенам. Паднялі крык: «А што вы робіце! Немцы забівалі, а цяпер вы забіваеце!» – узгадвае спадар Канстанцін аповед Надзеі. – Тады партызаны пасадзілі Віктара ў сані і прывезлі ў штаб да Манковіча. Ён на іх: «Чаму не расстралялі?» А Віктар з Манковічам – землякі, разам служылі ў арміі ў 1922 г., ложкі побач стаялі. Цераз дзверы было чутно, як Манковіч казаў Віктару: «Я памыляўся ў табе. Чаго ты жывеш са шпіёнам?» «Гэта ж мой бацька, які ён шпіён?» – спытаўся Віктар. Грымнуў стрэл. А жонцы Віктара Насці ўжо сказалі, што Віктара

забралі. Тая так ляцела, здаецца, ніякая б сіла не спыніла. Уламілася туды, упала на мужа: «Ай, мой родненькі!» А Манковіч падышоў – і ёй у галаву стрэліў. Потым сказаў: «Вязіце ў Беразіно (гэта радзіма Манковіча, дваццаць кіламетраў ад Бягомля) і павесьце там на дрэве».

Вёз трупы ў Беразіно той самы партызан Пётр Шаман, з якім спадар Гайдук гутарыў пасля вайны: «Прывезлі. Сабраліся людзі: «Каго ж будуць казніць, што такое?» Іх целы выкінулі з вазка, адзін партызан, прахадзімец такі, пачаў вяроўку вешаць на бярозе. А людзі як закрычалі! Яны пабачылі, што гэта Віктар. Знаёмыя, нават родныя былі. Дык партызаны трупы зноў у вазок за рукі-ногі ўкінулі і кудысьці завезлі».

## *Знішчэнне «падазроных»*

«Я вельмі шмат пахадзіў па гэтым раёне, у кожнай хаце быў, – запэўнівае Канстанцін Гайдук, гартаючы свае запісы. – Вось, напрыклад, Іван Ставер. Польскую вайну прайшоў, фінскую прайшоў і на другі дзень добраахвотнікам у гэтую вайну пайшоў. Абараняў Маскву, Ленінград, быў двойчы паранены. Прыйшоў дадому – а ні сёстраў, ні жонкі, ні бацькі няма. Жанчынаў партызаны застрэлілі, а бацьку – немцы. Яго сёстраў, Кацю і Алу, і жонку Марыю партызаны абвінавацілі ў супрацоўніцтве з немцамі і расстралялі ў лесе пад Бераснёўкай. Чаму, маўляў, не забаранялі немцам да вас у хаты заходзіць? А куды людзям было падзецца? Увогуле, у тыя дні партызанскія спецгрупы знішчылі ў нашых ваколіцах больш за 60 чалавек».

## *Расплата за спаленую вёску*

Гісторыя са спаленай вёскай Саўскі Бор мела крывавы працяг. Партызаны абвінавацілі сям'ю Рашэўскіх, якая жыла на хутары Перасоў, у тым, што яны навялі карнікаў. «Усю сям'ю выбілі, – абураецца Канстанцін Гайдук. – Партызаны самі след праклалі ў вёску скрадзенай нямецкай машынай. Але трэба было на некім адыграцца».

Хлопчык, які ў калысачцы быў, закрычаў. Дык партызаны яму прыкладам разбілі ўсю галоўку.

Канстанцін Гайдук добра ведаў Рашэўскіх: «На тым хутары адзінаццаць чалавек жылі, у асноўным – жанчыны і дзеці. Добрыя былі людзі, бедныя. Бацька да вайны ляснікам быў». Пра тое, што адбылося на хутары, Канстанціну Гайдуку распавёў сын гаспадара хутара Канстанцін Рашэўскі, які тады быў яшчэ хлопчыкам і цудам выжыў. Спадар Гайдук адшукаў яго пасля вайны ў Барысаве: «Ён мне расказваў, што тата і мама плакалі, прасілі: вы нас пастраляй-

це, дзяцей толькі не кранайце. А партызаны іх і пачалі страляць. Хлопчык, які ў калысачцы быў, закрычаў. Дык яны яму прыкладам разбілі ўсю галоўку. Яму тры годзікі было. А другі хлопчык, Косця, які ляжаў на ложку (яму пяць год было), галаву прыўзняў, і нехта стрэліў яму ў грудзі. Куля дайшла да хрыбетніка і засела. І ён згубіў прытомнасць. Праз нейкі час людзі з вёскі Вускрам'е ішлі туды, за раку, у ягады. Падышлі да хутара, а там сабакі брэшуць, выюць.! Каровы равуць дзіка! Яны зайшлі ў хату, а там – трупы. Тады яны хуценька паведамілі ў Падстрэжжа, дзе гэтых хутараў, католікаў, радня. Прыехалі яны на хутар і заўважылі, што гэты хлопчык жывы, кроў цячэ... Адвезлі яго ў Падстрэжжа. Там дактары партызанскія яму рабілі аперацыю, дасталі кулю».

Размаўляў спадар Гайдук і з Іванам Аўтушкам, родным братам партызанскага камандзіра Кузьмы Аўтушкі. Канстанцін Іванавіч кажа, што Іван распавядаў яму, як «стаяў пад акном хаты», пакуль там чынілася партызанская помста.

## *Нямецкія прыслужнікі*

Нацярпеліся жыхары Саўскага Бору і ад беларусаў, якія прыслугоўвалі немцам. У 1943 г. вёску зноў спалілі. Сям'я Гайдукоў перазімавала ў вёсцы Пераходцы, а ўвесну вярнулася на сваё пажарышча. «Пасеяліся неяк, загатавалі матэрыял, дошак – і пачалася блакада, – узгадвае спадар Канстанцін. – Як гэта страшна было! Немцы ідуць – усё жывое паляць, забіваюць... Мы пазакопвалі тоесёе і паехалі ў балота, у лес, схаваліся ў шалашы. Раніцай я залез на высокую елку і паглядзеў у бок Бягомля. Вёскі гараць, як свечкі! Дымы, здавалася, аж пад неба падымаюцца».

Неўзабаве ся'я Гайдукоў наважылася вярнуцца ў Саўскі Бор. Ажно выявілася, што вёску зноў знішчылі. Прычым найбольш шкоды нарабілі падводчыкі – тыя, што немцы нарабілі з мясцовага насельніцтва для арганізацыі перавозак. «Падводчыкі – мярзотнікі, нягоднікі, параскрывалі нашыя ямы-схованкі, патапталі гароды, усё, што мы нарыхтоўвалі, у дварах папалена, – абурана ўзгадвае Канстанцін Гайдук. – У каго хата была нясkладзеная – таксама спалілі. Я потым іх адшукаў. Гэта людзі былі з Лепельскага раёна. Я, праўда, не заяўляў на іх у КДБ. Можна было, але перадумаў...»

## *Лясны шпіталь*

Партазаны пастанавілі стварыць лясны шпіталь за 3 км ад Саўскага Бору. Канстанцін Гайдук разам з іншымі вяскоўцамі да лістапада 1943 г. пабудавалі там сем зямлянак. Дапамагаў падвозіць раненых.

Трэба было немцаў перамагчы. Бо ў нас бы інакш і кропелькі свабоды не было.

Спадар Канстанцін з жахам узгадвае нямецкую бамбардзіроўку ў маі 1944 г.: «Мы крышку адбегліся з сястрычкай маленькай, пад паветку схаваліся, чуем: гудзяць самалёты. Стогн такі цяжкі. Налічыў васямнаццаць самалётаў. Як пачала калаціцца зямля, як пачало ўсё трашчаць, ірвацца, ламацца! Я далёка адбегся, а ўсё здаецца – над галавой ляцяць. У вёсцы – поўна дыму! На вуліцы, на гародах – ямы вялізныя, сцены павыламаныя, дахі з буйнакаліберных кулямётаў пасечаныя... Ай, як цяжка было! Як нас немцы ганялі! Мы пераначавалі на адным астравочку пасярод балота, а пасля пабеглі далей. Куды ні пабяжы – страляюць. Паўтопталіся неяк у гэтае балота, паўціскаліся і травой зверху прыкрыліся. Адзін дзень, потым другі дзень таксама і трэці дзень... Памятаю, сядзеў я пад карчом – і раптам дождж пайшоў. Якая радасць, калі дождж ідзе! Я любіў дождж – бо немцы тады не хадзілі па лесе. Я сеў на карчы, ногі выцягнуў – а сам басанож, увесь мокры. І раптам бачу: даўжэзная гадзюка скруцілася каля ног маіх! Чорная такая, у лусачкі. Галаву крыху прыўзняла – і папаўзла прэч. А я ёй пазайздросціў. Думаю: якое ёй шчасце, як ёй добра жыць! Нікога не баіцца...»

## *Свае!*

Праз тыдзень вярнуліся ў спаленую вёску. «Спалі, не распрануўшыся», – распавядае спадар Канстанцін. І раптам: «У небе ляцяць самалёты. Зорачкі на крылах! А па дарозе чалавек скача, ногі ледзь не да зямлі: кабылка маленькая. Пад'язджае да нас і крычыць: «нашы прыйшлі, нашы прыйшлі!» Мы пабеглі, глядзім: так, салдацікі нашы! Ой, мы як рынуліся да іх... Пачалі абдымаць, цалаваць! Сталі распавядаць, як нам цяжка было, як мы доўга пакутавалі, мучыліся», – узгадвае спадар Канстанцін са слязьмі на вачах.

Танкі з савецкімі салдатамі дайшлі да вёскі Броды. Але радасць была заўчаснай: «А потым сцярвятнікі наляцелі нямецкія... І знішчальнікі, і бамбавозы. Як пачалі яны бамбіць лес, дзе танкі стаялі... Як грымела ўсё! І зеніткі былі . У небе ірвецца снарад – і адразу аблачынка ўзнікае. Здавалася, што тымі баранчыкамі ўсё неба накрылася. А потым мы даведаліся, што былі пабітыя нашы танкісты. Ой, як мы гаравалі, як сумавалі... Яны ж ішлі нас ратаваць, недзе і родныя іхнія, і жонкі, і сем'і, і дзеці. Такі сум нас браў, што яны прыйшлі і тут ужо палеглі навечна...»

## *Розныя былі партызаны*

Жыццё пасля вайны было цяжкае. Мужчыны загінулі – хто ў сталінскіх лагерах, хто на вайне. Гаспадарку цягнулі жанчыны

і падлеткі. Неўзабаве калгас, у якім працаваў малады Косця Гайдук, расфармавалі, і ён падаўся на Мінскі трактарны завод. Папрацаваў пяць год і паступіў у пединстытут на завочнае аддзяленне. 35 год адрабіў школьным настаўнікам. Толькі пад самую пенсію вярнуўся ў родны край. Яшчэ і дзецям, і ўнукам дапамагае грашыма з пенсіі ў часы крызісу: «Але і тое гэта радасць, што ёсць каму памагчы! Здаецца, недарма жыву...»

Ілюзіяў пра нацыстаў спадар Гайдук не мае:

«Ідэя іх была галоўная – зрабіць нас рабамі. Трэба было немцаў перамагчы. Бо ў нас бы інакш і кропелькі свабоды не было. І так яе не бачылі, а калі б немцы прыйшлі – то нам было б вельмі цяжка».

Спадар Канстанцін не мае нянавісці да партызанаў, але прагне гістарычнай справядзівасці:

«Я бачыў партызанаў, я бачыў, што там многія пакутуюць, але бачыў і тое, што там многія былі прахадзімцы. Скуралупы. Не кажу, што ўсе партызаны былі дрэнныя. Я ж вазіў у шпіталь раненых, хворых. Былі сапраўды добрыя, шараговыя. Бачыў партызана ў самаробных лапцях з гумы. У яго сумлення не хапала ў некага зняць боты. Былі сапраўдныя партызаны. Але былі і нягоднікі, у тым ліку і сярод тых, каго цяпер лічаць героямі».

І ўсё роўна, калі Канстанцін Гайдук узгадвае, як падлеткам працаваў у партызанскім шпіталі, то ў яго вачах запальваюцца зухаватыя агеньчыкі: «Калі б, не дай Бог, і сёння... То зноў бы ў партызаны пайшоў, чэснае слова!»

*Запісаў Алесь Кудрыцкі.*
*Аўдыёзапіс успамінаў Канстанціна Гайдука*
*слухайце на сайце www.NN.by*

---

«Сцяпан Сцяпанавіч Манковіч не любіць шмат расказваць пра свае падпольныя і баявыя справы», – такімі словамі пачынаецца кніга «Брыгада «Жалязняк».

Сакратар бягомльскага райкама партыі С. Манковіч лічыцца стваральнікам мясцовай партызанкі. Першы атрад ён стварыў у красавіку 1942 г. на базе групы падпольшчыкаў і афіцэраўакружэнцаў.

Што да адмоўных успамінаў вяскоўцаў пра партызанаў, то ў афіцыйных публікацыях пашырана такое тлумачэнне: «Паліцаі, якія рабавалі сялянаў, часцяком прыкідваліся партызанамі, каб настроіць іх супраць сапраўдных народных мсціўцаў».

Варта адзначыць, што брыгада «Жалязняк» складалася ў асноўным з мясцовых людзей. Паводле афіцыйных звестак, партызанілі 23 % жыхароў Бягомльскага раёна. Прытым вайс-

коўцы, якія выйшлі з акружэння ці збеглі з палону і далучыліся да мясцовай партызанкі, складалі не больш за 8 % брыгады.

Кіраўнікі брыгады «Жалязняк» Манковіч і Ціткоў атрымалі званне Героя Савецкага Саюза.

Вы прачыталі расказ Канстанціна Гайдука, які сам, яго сям'я і сваякі перанеслі ўсе пакуты жыцця як у даваенныя часы, так і ў часы вайны, нацярпеліся і ад савецкай улады і ад немцаў і ад партызан. Зараз ён імкнецца данесці пра ўсё перажытае людзям, звяртаецца ў газету «Народная Воля». Я думаю, што ён застаўся незадаволены тым, што газета надрукавала яго ліст у скароце і не назвала прозвішчы партызанскіх камандзіраў і камісараў брыгады «Жалязняк», якія тэрарызавалі мясцовае насельніцтва на Бягомльшчыне. Тады Канстанцін Гайдук звярнуўся ў газету «Наша Ніва». Тут ён сустрэў паразуменне.

Я мог бы для былога партызана ветэрана вайны Івана Пярэдні проста ўзяць цытату з расказа Канстанціна Гайдука, дзе камісар партызанскай брыгады «Жалязняк» Сцяпан Манковіч асабіста сам забівае людзей, страляе ў галаву жанчыне. Ён упіваецца сваёй уладай, што можа зрабіць што заўгодна з бездапаможным чалавекам. Гэта яскравы прыклад, што партызаны змагаліся больш з мірным насельніцтвам, чым з акупантамі. Мой апанент Іван Пярэдня мог бы абвінаваціць мяне, што я наўмысна выбіраю кампрамат, каб ачарніць светлы вобраз камісара Сцяпана Манковіча, якога І. Пярэдня так абяляе. Я разлічваю, што рэдакцыя маёй любімай газеты «Наша Ніва» даруе мне, што скарыстаў яе артыкул цалкам.

Далей Іван Пярэдня ў сваім артыкуле «Непаразуменне і агіда» напамінае мне, што з маёй вёскі Нябышына «у барацьбе з ворагам 10 чалавек загінулі, ваюючы ў партызанскіх атрадах, 25 на франтах у радах Чырвонай Арміі, 47 вяскоўцаў загублена ў час карных аперацый фашыстамі». Ён папракае мне, што вось пра іх я нічога не напісаў. Давайце будзем разбірацца. 10 чалавек загінулі ў партызанах. Як яны загінулі?

Першы загінуўшы партызан – гэта Мікалай Ляўко, адзіны паліцай нашай вёскі і самы першы партызан. Ён са сваёй зброяй перайшоў да партызан, але партызаніў нядоўга. Яго знайшлі забітым стрэлам у патыліцу побач з партызанскім лагерам. Другі партызан Аляксандр Топік. Знойдзены мёртвым на ўскрайку суседняй вёскі, заколаты біламі. Хутчэй за ўсё яго закалоў нехта з сялян, таму што немцы і паліцаі былі ўзброены стралковай зброяй,

а не віламі. Майго роднага брата, партызана Мікалая Копыла забіў кулямётнай чаргой другі партызан у час адпачынку.

Мая стрыечная сястра Клаўдзія Салянка пайшла ў партызаны разам са сваім мужам. Яе мужа Уладзіміра забіў наш вясковец Мікалай Ляўко, вясковая мянушка – Самсура. Самсуру потым забілі партызаны, я ўжо пра гэта пісаў. А Клаўдзія прапала без вестак у партызанскім бязмежжы.

Мой стрыечны брат партызан Іван Топік, непаналетні, прапаў без вестак.

На гэтым спынюся. Можа, былы партызан, ветэран вайны Іван Пярэдня зразумеў, чаму гэтыя трагічныя факты не знайшлі адлюстравання ў маіх успамінах? Нашчадкам гэтых трагічна загінуўшых людзей, іх сваякам не заўсёды прыемна варушыць мінулае. Нават мае сваякі выказалі незадавальненне, што я напісаў пра іх цётку Веру Салянку.

«А пра паводзіны нашых салдат за межамі СССР у вайне! Колькі бруду ў іх адрас, а ці так было?» – абураецца на мяне Іван Пярэдня.

А вось што піша Іван Лашко з Івацэвіцкага раёна ў сваім лісце ў газету «Народная Воля»:

«О Второй мировой войне хорошо помню. Я много расспрашивал о войне у мужчин, вернувшихся с фронта. Их рассказы заключались о жестоких условиях и отношении к рядовому солдату. Ни одного рассказа я не слышал о героическом подвиге, почти все заканчивались изнасилованием немок. Об одном из них я напишу.

«Дядька Василий, расскажите что-нибудь о войне?»

Он долго молчал. Думал. Сказал: «Спрятавшись от военных действий, сидели немки: бабушка, дочка и внучка. Заходит наш освободитель и сразу на внучку. Мать зовёт его на себя, он оставляет внучку. За ним второй и тоже на внучку. Бабушка за ногу стаскивает его. Он достаёт пистолет и стреляет в бабушку в голову. Под последние вздохи бабушки они продолжали своё дело.»

Пасля чаго сыходзяць, не нарабіўшы шкоды. Але ў 1944 годзе, пасля шэрагу правакацый з боку партызан, спалілі вёскі Алесіна і Верхмень».

І яшчэ адна цытата з ліста Э. Тобіна: «Людзі хавалі жывёлу ў Навасёлках, дзе былі немцы, ім давяралі». Зразумела, што хавалі жывёлу ад партызан.

А вось што на гэта піша гісторык, журналіст, краязнавец Анатоль Валахановіч у сваёй працы «Бараўская сярэдняя школа – пачатак маёй працоўнай дзейнасці»:

> «У той недалёкі час ад заканчэння вайны людзі называлі часам партызан «кароўнікамі», што ў асноўным адпавядала сапраўднасці, і партызаны ў іх уяўленні не зусім сур'ёзна і актыўна ваявалі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. І такое нам распавядалі жыхары многіх вёсак Бараўскага сельсавета».

---

І яшчэ ад Анатоля Валахановіча:

> «Увогуле ў той час пра партызанскі рух не так гучна гаварылі, як цяпер, не было тады нават назвы Беларусі – «Беларусь – партызанская рэспубліка».

Іван Пярэдня пакрыўдзіўся на мяне, што ў сваіх успамінах я нічога не напісаў пра абаронныя баі пад Масквой і ў іншых месцах, а адступленне Чырвонай Арміі ў 41-м назваў бегствам. Я не ставіў перад сабой мэту пісаць пра «10 сталінскіх удараў». Гэта ж усяго толькі мае ўласныя ўспаміны і разважанні. Атрымаўшы прэтэнзію ў свой адрас, што ў мяне нічога не сказана пра абарону Масквы, я падрыхтаваў матэрыял пра 28 героеў-панфілаўцаў. Але з гэтым матэрыялам я спазніўся. Зусім нядаўна выйшла кніга Міхаіла Галдзянкова «Сражения, которых не было». У кнізе ёсць глава і пра «подзвіг» панфілаўцаў. Таму я быў вымушаны выключыць гэты матэрыял са сваёй кнігі.

Але хопіць спрачацца з ветэранам, тым больш, што яго аргументы, як мне паказалася, узяты з адзінай крыніцы – мемуараў Ціткова «Бригада «Железняк», камандзірам якой ён сам і быў. А хто будзе пра сябе пісаць дрэнна?

* * *

Нягледзячы на пратэсты ветэранаў, на пікеты, на папярэджанні, на суды, на абражальныя артыкулы ў СМІ, мая кніга «Нябышына. Вайна» выстаяла. Яна ёсць у інтэрнэце, яе перакладаюць на рускую мову, яе чытаюць ва ўсім свеце. Яе надрукаваў

часопіс «Беларуская думка», які выдаецца ў Нью-Ёрку. Часопіс рассылаецца ва ўсе краіны, дзе ёсць беларуская дыяспара.

Ужо збіраўся напісаць апошні абзац і на гэтым паставіць кропку, як раптам зазваніў тэлефон. Паразмаўлялі... А потым ён мне кажа:

> «Вот ты ў сваёй кнізе напісаў, што ў 30-я гады ў Нябышыне чалавек 25 рэспрэсавалі... А хто яны? Ты б хоць па аднаму радку пра іх напісаў...»

Я не збіраўся пра гэта пісаць, гэта па-за межамі маіх успамінаў. Але і свайго земляка трэба ўважыць. Каб зрабіць апытанне жыхароў вёскі – пройдзе шмат часу. Уся надзея на інтэрнэт. На сайце «Свабоды» (тэма «картатэка Сталіна) я знайшоў у спісе рэпрэсаваных 22 чалавекі з маёй вёскі Нябышына. І гэта не ўсе. Напрыклад, я не знайшоў свайго роднага дзядзьку Копыла Аляксандра, у памяць якога я ў Курапатах усталяваў крыж.

За што рэпрэсавалі маіх землякоў? Яны працавалі на зямлі, непісьменныя, у крайным выпадку мелі пачатковую адукацыю.

Больш за ўсё асуджаных – як агенты польскай выведкі:

Ананіч Рыгор Пятровіч, Бобрык Кузьма Якаўлевіч, Бунец Павел Лявонавіч, Ляўко Нічыпар Дзянісавіч, Маскалейчык Даніла Лявонавіч, Мышкоўскі Антон Усцінавіч, Салянка Антон Фаміч, Цапкоўскі Павел Андрэевіч, Цецяронак Іван Кузьміч, Цецяронак Мітрафан Фаміч.

Усе яны асуджаны ў розны час Пастановай НКУС СССР і Пракурора СССР як агенты польскай выведкі паводле артыкула 68 КК БССР да ВМП. Расстраляны ў Аршанскай турме.

За садзеянне ў пераходзе мяжы паводле артыкула 63-1 КК БССР асуджаны на 10 гадоў лагераў:

Бобрык Іван Мікітавіч, Ляўко Іван Канстанцінавіч, Стэльмах Уладзімір Паўлавіч.

Адзін мой аднавясковец, гэта Бобрык Міхаіл Давыдавіч быў асуджаны паводле артыкула 72а КК БССР на 5 гадоў лагера за антысавецкую агітацыю. Гэта адбылося ў верасні 1938 года. За антысавецкую агітацыю хутчэй за ўсё палічылі тое, што ён адмовіўся ўступаць у калгас, заставаўся аднаасобнікам.

Савецкія органы НКВД (НКУС) знайшлі ў маёй вёсцы Нябышына і контррэвалюцыйную арганізацыю. Так, Бунец Аляксандр Паўлавіч пастановай НКВД СССР і Пракурора СССР асуджаны

9.12.1937 паводле артыкула 64, 76 КК БССР да ВМП. Расстраляны ў Аршанскай турме, як член к/р арганізацыі.

25.11.1937 года за членства ў контррэвалюцыйнай групе і за антысавецкую агітацыю быў асуджаны «тройкай» паводле артыкула 72, 76 КК БССР Ляўко Аляксандр Канстанцінавіч на 10 гадоў лагера. І А. Бунец і А. Ляўко былі аднаасобнікамі, адмовіліся ўступаць у калгас. Магчыма, ў гэтым і была іх віна.

Два «контррэвалюцыянеры» з вёскі Нябышына з'ехалі на працу ў Ленінград. Бобрык Мікалай Савельевіч уладкаваўся на завод імя Молатава вулканізатарам. 9 жніўня 1937 года яго арыштавалі. Асобай тройкай УНКВД ЛВ 22 жніўня прысуджаны паводле артыкула 58-10 УК РСФСР да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Ленінградзе 24 жніўня 1937 года. Канвеер смерці працаваў па-ўдарнаму, без перапынку. Другі нябышынец Узлоўскі Міхаіл Юліянавіч уладкаваўся загадчыкам школы-інтэрната ў Ленінградзе. Арыштаваны 17 ліпеня 1937 года. Камісіяй НКВД і Пракуратуры СССР 23 верасня 1937 года прысуджаны паводле артыкула 58-6 УК РСФСР да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Ленінградзе.

Існаваў у КК БССР артыкул 73 – адказнасць за неданясенне. Па гэтаму артыкулу асуджана 4 чалавекі з вёскі Нябышына. Гэта:

- Бобрык Аляксандр Кліментавіч, 4 гады, Тайшэтлаг.
- Бобрык Вікенцій Кліментавіч, 3 гады, Даллаг.
- Копыл Уладзімір Нестаравіч, 2,5 года.
- Ляўко Мікалай Аляксеевіч, 2,5 года, Комі АССР.

Як бачым, НКВД моцна зачысціў вёску Нябышына ад «ворагаў». Больш за ўсіх пацярпелі Бобрыкі. Мне прыпомніўся адзін выпадак. 22 чэрвеня 2003 года ў газеце «Народная Воля» быў змешчаны мой артыкул пра падзеі Другой сусветнай вайны, якія адбываліся ў маёй вёсцы.

Тады мне таксама паступіла шмат тэлефонных званкоў. Адны мяне падтрымлівалі, іншыя абражалі. Такое адбывалася і пры асабістых сустрэчах. Адзін палкоўнік у адстаўцы, мой знаёмы, назваў мяне здраднікам і дадаў, што больш рукі мне не падасць. Гэта мяне нават рассмяшыла. Другі такі ж палкоўнік, удзельнік вайны, прачытаў мой артыкул з цікавасцю і паразуменнем і нават папрасіў, каб я яму пакінуў гэты нумар «Народнай Волі».

Праз некалькі дзён пасля выхаду артыкула ў маёй кватэры раздаўся чарговы тэлефонны званок, званіў Пётр Мікалаевіч Бобрык з горада Паставы Віцебскай вобласці. Ён сказаў, што з цікавасцю прачытаў мой артыкул і запытаўся: «Ці не сынам ты будзеш даваеннага старшыні калгаса Піліпа Копыла і ці не ты ёсць той хлапчук, які ў ліпені 1941 года выйграў самага «лепшага каня»? «Так, гэта быў я», – адказваю. Мне было дзіўна, цікава і прыемна, што чалавек памятае тую далёкую падзею, у якой я быў удзельнікам, а ён – сведкай. Яму было тады гадоў 15–16. Яго бацькі таксама з'ехалі з Нябышына на працу ў Ленінград. У 1941 годзе ён прыехаў у вёску на лета на канікулы, тут яго і застала вайна. Як ён перажыў акупацыю, не ведаю, але ён ветэран вайны.

А як склаўся лёс іншых герояў маіх успамінаў? Мой родны брат Андрэй загінуў у 1984 годзе ў аўтамабільным здарэнні. Яму было 55 гадоў. Шмат маіх аднагодкаў, аднакласнікаў ужо няма ў жывых. Памерлі Леанід і Мікалай Шульгаты – сыны старасты. У 2007 годзе памерла мая стрыечная сястра Вера Салянка. Дажываюць свой век апошнія сведкі Другой сусветнай вайны.

### *Заўвага*

Чытачы, якія ўважліва будуць чытаць маю кнігу, магчыма, звернуць увагу на тое, што ў тэксце назіраюцца паўторы. Я зрабіў гэта наўмысна дзеля таго, каб падкрэсліць свой галоўны вывад, што найвялікшым, асноўным злом для Беларусі ў часы акупацыі 1941–1944 гадоў была партызаншчына.

# Пасляслоўе

«Ці дачакаемся мы праўды?» – так называецца адзін з раздзелаў маіх успамінаў і разважанняў. Ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія ведаюць праўду і маглі б яе паведаць, з кожным годам становіцца ўсё менш і менш. Тыя, хто яшчэ з намі, не жадаюць адкрыць акопную праўду. Міты аб вайне: пра ўсенародны ўздым, пра масавы патрыятызм, пра «За Родину, за Сталина» – ім больш даспадобы, ім праўда не патрэбна. У іх адзінае жаданне – спакойна дажыць свой век у гонары і славе.

Пакідаюць гэты свет і тыя людзі, дзяцінства якіх прыпала на гады вайны. Мне ў 1941 годзе споўнілася 7 гадоў. Усю вайну я пражыў ва ўмовах акупацыі і тое-сёе ведаю і помню. У адрозненне ад ветэранаў я жадаю, каб аб Другой сусветнай вайне была напісана праўда, якой бы горкай яна ні была. Часам раздаюцца галасы: «Не дазволім перапісваць гісторыю вайны!» Але ж гісторыя Другой сусветнай вайны адносна Беларусі яшчэ не напісана. Так, існуюць нейкія разрозненыя ласкуты, а ў асноўным гэта прыдуманыя прыгожыя міты.

На шчасце, некаторыя ўдзельнікі Другой сусветнай вайны сталі знакамітымі пісьменнікамі, не спалохаліся напісаць пра суровую акопную праўду вайны. Яны пакінулі для нас і для наступных пакаленняў незабыўныя яркія творы. Гэта Віктар Някрасаў, Грыгорый Бакланаў, Віктар Астаф'еў і наш Васіль Быкаў. Але, хоць яны дэталёва апісалі вайну, гэта не гісторыя, гэта мастацкая ваенная літаратура.

Ёсць і гісторыкі і пісьменнікі, якія праўдзіва асвятляюць гістарычныя падзеі, даносяць да нас праўду пра нашу мінуўшчыну: Леанід Лыч, Віктар Чаропка, Захар Шыбека, Анатоль Тарас, Алег Трусаў, Уладзімір Арлоў і іншыя. З замежных беларусаў, з творамі якіх я знаёміўся, у гэты шэраг я паставіў бы Янку Запрудніка, Юрыя Туронка.

З вялікай цікавасцю я прачытаў кнігі расійскіх гісторыкаў-даследчыкаў Марка Салоніна, Барыса Сакалова, а таксама Віктара Суворава.

На маю думку, веданне намі айчыннай гісторыі знаходзіцца яшчэ ў больш горшым становішчы, чым веданне роднай беларускай мовы. Носьбіты роднай мовы пакуль што ёсць. Гэта ў першую чаргу частка беларускіх пісьменнікаў, журналістаў, мастакоў, навукоўцаў, гэта значная частка моладзі. Ёсць шмат чыноўнікаў, якія добра ведаюць родную мову, але не рызыкуюць размаўляць на ёй, каб не згубіць пасаду, чакаюць свайго часу. Ведаюць і берагуць родную мову частка беларусаў замежжа. Мы павінны ведаць і шанаваць сваю мову, ведаць сваю гісторыю і ганарыцца ёй. Наша гісторыя – адна з багацейшых і самых трагічных.

Хачу выказаць падзяку ўсім, хто дапамагаў мне выдаць кнігу «Нябышына. Вайна». Гэта ў першую чаргу паэт Яўген Гучок. Я рад нашаму з ім знаёмству. А адбылося яно ў 2008 годзе, дзякуючы міліцыі Савецкага РУУС г. Мінска. Гэта якраз быў год 90-годдзя БНР. Дата юбілейная, а ўлада Мінска горад к гэтаму дню не ўпрыгожыла, не прыдала яму святочны выгляд. Я вырашыў выправіць становішча – упрыгожыць кавалак вуліцы Сурганава налепкамі з выявамі гярба Пагоня і бел-чырвона-белага Сцяга. Праца спорылася, я адчуваў натхненне. Але хтосьці з жыхароў суседніх дамоў убачыў, што я займаюся крамольнай справай, і патэлефанаў у міліцыю. Побач з плошчай Бангалор да мяне з двух бакоў па тратуары пад'ехалі два міліцэйскія экіпажы і затрымалі. За гэта мяне аштрафавалі на 5 базавых велічынь, што на той час складала 175 тыся рублёў. Пра мой «подзвіг» напісала газета «Народная Воля», якую чытае Яўген Гучок. Праз гэту заметку мы і пазнаёміліся. Менавіта Яўген Гучок падштурхнуў мяне выдаць кнігу.

Хачу выказаць падзяку журналісту, выдаўцу Віктару Харсіку, які вельмі ўважліва аднёсся да майго рукапісу, адчуў, што напісана праўдзіва і шчыра. Вялікі дзякуй галоўнаму рэдактару «Народнай Волі» Іосіфу Паўлавічу Сярэдзічу і ўсяму рэдакцыйнаму калектыву за публікацыю кнігі на старонках газеты. Мая падзяка Яўгену Лецку, журналісту і краязнаўцу, за тое, што зрабіў маю кнігу «Нябышына. Вайна» сусветна вядомай. Дзякуючы яму яна публікуецца ў часопісе «Беларуская думка», Нью-Ёрк, кнігу можна прачытаць у нумарах часопіса 67 за сакавік, 68 за верасень 2012 года, 69 за сакавік, 70 за верасень 2013 года. Дзякуй Радыё Свабода і яго журналістам за распаўсюд інфармацыі пра маю кнігу і што адбывалася вакол яе.

Вялікі дзякуй усім, хто званіў і дасылаў лісты падтрымкі як асабіста мне, так і ў газету «Народная Воля» і хто абмяркоўваў маю кнігу на форумах у інтэрнэце. Гэта Анатоль Палонскі, журналіст з г. Брэста; гэта Уладзімір Мікалаевіч Парфяновіч, бацька шматразовага чэмпіёна алімпійскіх гульняў, свету, СССР па веславанню Уладзіміра Парфяновіча; гэта Павел Каролік са Слоніма, Мікалай Кукса з Івянца, Кастусь Шыталь з Докшыц, Мікола Канаховіч з Пружан, Васілій Шабалтас з Асіповіч, Канстанцін Сярдзюк з Бабруйска, Э. і Ф. Тобіны са Смалявіч, Дзяніс Рабянок з Калінкавіч, Леанід Аксельбант з Мінска, Уладзімір Кузаўко з Брэста, Генадзь Качаргін з Віцебска, І. Лашко з Косава, В. Ямбаеў з Магілёва, Міхась Крыловіч з Мінска, Анатоль Мотуз з Брэста і дзесяткі іншых. Тут прысутнічае ўся геаграфія Беларусі.

Вялікі дзякуй Анатолю Беламу (памёр 14.11.2011 г. Вечная яму памяць), Анатолю Валахановічу, сябрам клуба «Спадчына», што яны ацанілі маю працу і ўзнагародзілі Граматай.

Вялікі дзякуй маім замежным чытачам: Наталлі Бондар, г. Жытомір, Украïна; Марыне Кайзер-Баброўскай, г. Алма-Аты, Казахстан; Валерыю Дашкоўскаму, г. Чыта, Расія; Ларысе Пфунд, Германія і іншым.

Знайшліся аматары, якія перакладаюць кнігу «Нябышына. Вайна» на рускую мову. Адзін з іх: Паша Лебеда. Вось што ён напісаў пра кнігу:

> «Меня эта простая книга потрясла... своей правдой той войны, когда самыми большими врагами белорусов были партизаны и полицаи. Именно так об этом говорили нам, детям, старшие, пережившие войну».

І яшчэ Паша Лебеда напісаў пра маю кнігу: «Здесь доля золота в сотни раз превышает долю пустой породы».

Хачу сказаць вялікі дзякуй усім тым маім прыхільнікам, чытачам маіх успамінаў «Нябышына. Вайна», хто проста паціснуў мне руку і сказаў усяго некалькі слоў у маю падтрымку. Я нават уявіць сабе такое не мог, што шаноўны акадэмік, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі паціснe мне руку і скажа: «Дзякуй за смеласць». Усяго два словы, але якія значымыя для мяне – яны прыдалі мне ўпэўненасці ў сваёй праўдзе, якую я выклаў у кнізе «Нябышына. Вайна».

Гэта адбылося ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Якуба Коласа Акадэміі навук у красавіку 2010 года. Там была сустрэча з айцом

Аляксандрам Надсанам, на якой удзельнічаў Радзім Гарэцкі і прысутнічаў я.

Алег Анатольевіч Трусаў, кандыдат гістарычных навук, старшыня Таварыства беларускай мовы, сказаў пра маю кнігу наступнае: «Лепшага пра вайну, чым гэта кніга, не чытаў».

Мастак Алесь Цыркуноў завітаў да мяне на кватэру, каб атрымаць кнігу «Нябышына. Вайна». Я быў рад гэтаму знаёмству.

Хачу выказаць падзяку паэту Генадзю Мікалаевічу Бураўкіну, які падтрымаў мяне і ў нашай размове даў мне некалькі слушных парад, калі я і надалей прадоўжу штосьці пісаць.

Мая падзяка Васілю Цімафеевічу Якавенку за падтрымку.

Не магу не выказаць падзяку і сваім апанентам: Анатолію Адоньеву, Аляксандру Пестракову, Івану Пярэдню, ветэранам, якія пратэставалі супраць маіх успамінаў і «Народнай Волі». Стаяць у пікеце – гэта не той узрост, нават калі яны і «няўдзельнікі». Сваімі пратэстамі, тэлепаказамі, скаргамі, інтэрв'ю, артыкуламі яны зрабілі добры «піяр» маёй кнізе. Пра яе даведаліся ўсе, нават лянівыя. Дабавілася шмат цікавага матэрыялу, які дае магчымасць дапоўніць кнігу.

І апошняе. Хачу вярнуцца да папярэджання, якое атрымала «Народная Воля». Мяне здзівіла тая валтузня вакол маёй кнігі: скаргі, экспертызы, суды... Я ж напісаў не навуковую працу, не манаграфію, не доктарскую дысертацыю, не падручнік для школ і ВНУ. Гэта ўсяго толькі ўспаміны і разважанні шараговага грамадзяніна. Чаму такі перапалох? Такія заўвагі можна знайсці ў любой кнізе, газеце, часопісу і ўсё забараніць, пазачыняць. І да чаго тады мы прыйдзем?

*Ілля Копыл*

# Коратка пра аўтара



Ілля Копыл падчас прэзентацыі першага выдання сваёй кніжкі (20 студзеня 2010 г.)

*Ілля Копыл нарадзіўся 2 жніўня 1934 г. у вёсцы Нябышына Бягомльскага раёна Мінскай вобласці (зараз Докшыцкі раён Віцебскай вобласці).*

*Бацька Пілiп Гілярaвіч Копыл да ліпеня 1941 г. працаваў старшынёй мясцовага калгаса. Маці Копыл Еўдакія Кузьмінічна працавала ў калгасе на розных работах. У сям'і, акрамя Іллі, было тры сына. Мікалай (1922 г. н.) загінуў у сакавіку 1944 г. у партызанскім атрадзе. Сяргей (1926 г. н.) памёр у блакадным Ленінградзе. Андрэй (1929 г. н.) трагічна загінуў на працы 4.02.1984 г.*

*У 1944 г. Ілля паступіў у 1-ы клас Нябышынскай сямігадовай школы, якую скончыў у 1951 г. У 1954 г. закончыў Бягомльскую сярэднюю школу і паступіў у Мінскае артылерыйска-мінамётнае вучылішча. З 1957 па 1961 гг. служыў у артылерыі Прыволжскай ваеннай акругі (у Саратаўскай вобласці). З 1961 па 1981 гг. праходзіў службу ў Ракетных войсках стратэгічнага назначэння – РВСН. У 1965–1970 гг. вучыўся ў Растоўскім вышэйшым каманднa-інжынерным вучылішчы. У снежні 1981 г. зволены ў запас па выслузе і ўзросту (47 год).*

*З 1983 па 1997 гг. працаваў на інжынерных пасадах у Ваенным прадстаўніцтве Мінскага электра-механічнага завода. У студзені 1990 г. быў вылучаны калектывам цэха № 8 завода кандыдатам у дэпутаты Мінгарсавета. Перадвыбарчую агітацыю правёў пад Бел-Чырвона-Белым Сцягам. Заняў 3-е месца з 6. 1 чэрвеня 1990 г. выйшаў з шэрагаў КПСС (за 15 месяцаў да ГКЧП).*

*Мае двух сыноў. Жонка Ніна Міхайлаўна памёрла ў 2003 г.*

*Ілля Копыл друкаваўся ў газетах «Свабода», «Навіны», «Народная Воля». Пісаў на розныя тэмы, мае больш за 50 артыкулаў. Больш за 100 лістоў адаслаў на Радыё Свабода.*

СОДЕРЖАНИЕ

*«Замест птушыных песень...»* . . . . . . . . . . 3
*Прадмова аўтара* . . . . . . . . . . 6

## Частка 1.
# УСПАМІНЫ

1. Перад вайной . . . . . . . . . . 7
2. Пачатак вайны . . . . . . . . . . 8
3. Новы паварот у вайне . . . . . . . . . . 9
4. Роспуск калгаса . . . . . . . . . . 10
5. Першая сустрэча з немцамі . . . . . . . . . . 13
6. Хрышчэнне . . . . . . . . . . 14
7. Першы раз у першы клас . . . . . . . . . . 14
8. Прымакі . . . . . . . . . . 15
9. Наша вёска ва ўмовах акупацыі . . . . . . . . . . 16
10. Начны візіт . . . . . . . . . . 18
11. Аперацыя «Мост» . . . . . . . . . . 19
12. Першая ахвяра вайны . . . . . . . . . . 20
13. Зноў партызаны . . . . . . . . . . 21
14. Запылалі вёскі . . . . . . . . . . 22
15. Стараста . . . . . . . . . . 23
16. Аперацыя «Котбус» . . . . . . . . . . 24
17. Смерць партызана . . . . . . . . . . 28
18. Малыя дзеткі – малыя бедкі?! . . . . . . . . . . 30
19. Трагедыя ў вёсцы . . . . . . . . . . 31
20. Канец блакады . . . . . . . . . . 33
21. У Нямеччыне . . . . . . . . . . 34
22. Радзіёнаўцы . . . . . . . . . . 38
23. У нашу сям'ю прыйшла бяда . . . . . . . . . . 45
24. Зноў блакада . . . . . . . . . . 50
25. Вызваленне . . . . . . . . . . 52
26. Вяртанне дадому . . . . . . . . . . 54
27. Мой бацька пайшоў на фронт . . . . . . . . . . 56
28. Выпадковыя ахвяры . . . . . . . . . . 57
29. Я адмовіўся помсціць . . . . . . . . . . 60
30. Жыццё працягваецца . . . . . . . . . . 61
31. Другі раз у першы клас . . . . . . . . . . 63

32. Хвароба за хваробай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
33. Чакаем Сяргея . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
34. Дзень Перамогі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
35. Я трапляю ў лагер . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
36. Нам будуюць хату . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
37. Гуманітарка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
38. Весці з Манчжурыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74

## Частка 2.
## РАЗВАЖАННІ

1. Беларусы ў Другой сусветнай вайне . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
2. Міты пра партызанскі рух у Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . 79
3. Расклад сіл на акупаванай тэрыторыі Беларусі . . . . . . . . . 89
4. Структуры грамадзянскай адміністрацыі ва ўмовах акупацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
5. Страты Беларусі ў Другой сусветнай вайне . . . . . . . . . . . . 141
6. Ці дачакаемся мы праўды? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
7. Рэха вайны (30 год пасля...) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174

## Частка 3.
## РЭЗАНАНС

Кніга выйшла з друку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179
Прэзентацыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
Публікацыя кнігі ў «Народнай Волі» . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
Два інтэрв'ю ў «Белгазеце» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
Водгукі на пікет ветэранаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223

*Пасляслоўе* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 281
*Коратка пра аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 285

*Навукова-папулярнае выданне*

**Копыл** Ілля Піліпавіч

# Нябышына

## Акупацыя вачыма падлетка

Падпісана да друку 06.01.2014. Фармат 60x90/16.
Папера афсетная. Ум. друк. арк. 18,00. Ул.-выд. арк. 15,14.
Наклад 500 асобнікаў.

Выдаўца
Baltkrievijas Vestures un Kulturas Instituts
(г. Рыга, Латвія)



Кніга І. Копыла упершыню была выдадзена за яго кошт ў 2009 г. накладам 100 асобўнікаў. Потым яе перадрукавала газета «Народная воля».

Нягледзячы на тое, што гэтая кніга не навуковае даследаванне і не публіцыстычны твор, шмат якія былыя наменклатуршчыкі, ветэраны савецкіх узброеных сіл і карных ворганаў абурыліся на аўтара.

Як ведама, самая страшная сіла ў свеце – праўда! Адсюль і абурэнне гэтых прыслужнікаў камуністычнага рэжыму.

Адмыслова для новага выдання аўтар напісаў частку пад назвай «Рэзананс», у якой зрабіў аналіз хлуслівых аргументаў і выдумак сучасных ворагаў працоўнага беларускага народу.



ISBN 978-9984-897-11-0

9 789984 897110

НЯБЫШЫНА • АКУПАЦЫЯ ВАЧЫМА ПАДЛЕТКА